
Яўген Міранович

Найноўшая гісторыя Беларусі



БЕЛАРУСКАЕ ГІСТАРЫЧНАЕ ТАВАРЫСТВА

Яўген Міранавіч

Кайнаўская гісторыя Беларусі

Санкт-Пецярбург
«Неўскі прасцяг»
2003

УДК 947.6«18-20»
ББК 63.3 (4Беі)
М 63

Навуковы рэдактар
Аляксандар Краўцэвіч,
доктар гістарычных навук

Падбор ілюстрацый
Уладзімера Ляхоўскага

Мірановіч Я.
М 63 Найноўшая гісторыя Беларусі / Я.Мірановіч; Навук. рэд. А.Краўцэвіч. — СПб. Неўскі прасцяг, 2003. — 243 с.: іл.
ISBN 5-94716-032-3

Аўтар разглядае гісторыю беларускай нацыі ад канца XIX стагоддзя да нашых дзён. Ён сцісла перадае асаблівасці кожнага з этапаў гістарычнага шляху, які прайшлі беларусы за гэты час, шукае адказ на пытанне, чаму лёс народа стаўся менавіта такім, а не інакшым.

Для ўсіх, хто цікавіцца айчыннай гісторыяй.

УДК 947.6«18-20»
ББК 63.3 (4Беі)

ISBN 5-94716-032-3

© Мірановіч Я., 2003.

ЗМЕСТ

Прадмова навуковага рэдактара 7

УСТУП 9

РАЗДЗЕЛ 1. Беларусь у складзе Расеі 13
Фармаванне беларускай нацыянальнай ідэі 14
Насельніцтва Беларусі ў пачатку XX стагоддзя 23
Час вайны, міграцыі і рэвалюцыі (1914—1917) 25

РАЗДЗЕЛ 2. Змаганне за сваю дзяржаўнасць 33
Беларуская Народная Рэспубліка 34
Стварэнне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі . . 40
Польска-савецкая вайна. Падзел Беларусі 43

РАЗДЗЕЛ 3. Савецкая Беларусь (1921—1939) 53
Нэп і беларусізацыя краіны 54
Барацьба супраць "нацыянал-дэмакратызму" 66
Калектывізацыя 69
У сацыялізм — праз Курапаты 75

РАЗДЗЕЛ 4. Беларусы ў II Рэчы Паспалітай 77
Грамадства і гаспадарка 78
Прагматыкі і партызаны 81
Грамадаўская рэвалюцыя 87
Камуністы і прыхільнікі лаяльнасці 93
Стаўленне санацыйнага лагера да беларускага пытання 99

РАЗДЗЕЛ 5. Яднанне пад савецкім скіпетрам (1939—1941) . . . 105
Ад імя народа Заходняй Беларусі 106
Усталяванне савецкай сістэмы ўлады ў Заходняй Беларусі 112
Эканамічная палітыка 113
Асветная, культурная і канфесійная палітыка 117
Арышты і дэпартацыі 121

РАЗДЗЕЛ 6. Нямецкая акупацыя Беларусі 125
Адступленне Чырвонай Арміі 126
Нямецкая акупацыйная палітыка 130
Партызанскі рух 147
Беларуская цэнтральная рада 153
Ваенныя страты 157

РАЗДЗЕЛ 7. Уніфікацыя палітычнай і гаспадарчай сістэмы БССР (1944—1956) 161
Карэктаванне межаў і перасяленні 162
Аднаўленне гаспадаркі 164
Калектывізацыя Заходняй Беларусі 167
Рэпрэсіі не спыняюцца 170
Беларуская культура перыяду пасляваеннага сталінізму 174
Школьніцтва 177

РАЗДЗЕЛ 8. Ударніцтва ў пабудове камунізму (1956—1990) . . 179
Рэфармаванне сталінізму 180
Пабудова цяжкай прамысловасці 183
Дабрабыт эпохі Машэрава 185
Нарастанне гаспадарчага крызісу 191
Наступствы катастрофы на Чарнобыльскай АЭС 192
Русіфікацыя 196

РАЗДЗЕЛ 9. Суверэнная Беларусь 199
Дэмакратычная апазіцыя і нацыянальнае адраджэнне 200
Структурныя перамены 1989—1995 гадоў 209
Куды вядзе Беларусь Аляксандар Лукашэнка? 225

Асноўная літаратура 240

Прадмова навуковага рэдактара

Аўтар гэтай кнігі — беларус, грамадзянін Польшчы, прафесар Беластоцкага універсітэта, асоба, кроўна павязаная з беларускай культурай, і гісторык, які атрымаў адукацыю ў польскім універсітэце. Польскую Народную Рэспубліку нездарма называлі самым вясёлым баракам у савецкім лагеры. Універсітэты гэтай краіны захавалі некаторую аўтаномію і, калі параўноўваць з савецкімі калегамі, значна менш былі падданыя ідэалагічнаму дыктату камуністаў.

Працы па найноўшай гісторыі Беларусі, напісаныя савецкімі гісторыкамі за гады існавання БССР, не маюць нічога агульнага (а калі маюць, то вельмі мала) з рэальнай гісторыяй краіны. Тыя працы ствараліся пад пільным ідэалагічным кантролем апарату камуністычнай партыі і павінны былі апяваць савецкую рэчаіснасць і адвечнае імкненне беларусаў да яднання з Расеяй. З тае прычыны абсалютная большасць падобных твораў станавілася макулатурай адразу пасля выхаду з друкарскай машыны. З тае самае прычыны вялікая "армія" дыпламаваных беларускіх гісторыкаў найноўшага часу (каля тысячы дактароў і кандыдатаў навук) не здолела стварыць ніводнай навуковай сінтэзы гісторыі краіны XX стагоддзя.

Яўген Мірановіч цалкам свабодны ад савецкіх ідэалагічных штампаў, прапагандысцкай тэрміналогіі і ўвогуле ад стылю мыслення савецкага чалавека. Адметнасцю аўтарскага стылю з'яўляецца "непрыўкрашанасць" інтэрпрэтацыі беларускай гісторыі. Падкрэслена сухая, "аб'ектывісцкая" будова тэксту спрацавала як прадуманы літаратурны прыём, які толькі ўзмацняе напругу і эмацыйнае ўздзеянне аўтарскага выкладу. Чытач не мае сумненняў, што аўтар не толькі спрабуе паказаць як развіваліся падзеі, але з глыбокім зацікаўленнем і хваляваннем шукае адказу на пытанне: "Чаму так сталася?" Гэтае хваляванне, аднак, не перашкаджае лагічнаму навуковаму аналізу, які афармляецца ў адстароненую, нават халаднаватую канстатацыю.

Абазнаны чытач не з усім пагодзіцца, у прыватнасці з некаторымі ацэнкамі апошніх падзеяў у краіне. Але галоўнае ў кнізе тое, што яна ўяўляе сабою твор новай суб'ектнай гістарыяграфіі незалежнай Беларусі.

Аляксандар Краўцэвіч

доктар гістарычных навук,
Старшыня выканкама
Беларускага гістарычнага таварыства

Уступ

У польскай гістарыяграфіі гісторыя Беларусі на фоне іншых суседзяў Польшчы займае надзвычай мала месца. У школьных падручніках Полацкае княства, якое паспяхова супраціўлялася інтэграцыі з сярэднявечнай дзяржавай Кіеўскай Руссю, нават не згадваецца. Цягам некалькіх стагоддзяў Беларусь уваходзіла ў склад Рэчы Паспалітай. У свядомасці палякаў Вялікае Княства Літоўскае часта атаясамліваецца адно толькі з дзяржавай літоўцаў, хоць літоўцамі (ліцьвінамі) ў XVI стагоддзі называлі беларускіх князёў і баяраў, а старабеларуская мова была дзяржаўнай і на ёй вялося ўсё справаводства. У XIX стагоддзі тэрмін "Рэч Паспалітая" абазначаў тое ж, што і "Польшча", таму ўзнікненне на пераломе XIX і XX стагоддзяў беларускага нацыянальнага руху пераважнай большасцю польскіх элітаў успрымалася як ненатуральная з'ява і расейская інтрыга. Падобным чынам да гэтага пытання ставіліся расейскія ўлады, уважаючы яго за польскую выдумку.

Падзеі 1918—1920 гадоў надта выразна паказалі, што беларускія і польскія нацыянальныя інтарэсы ўзаемасупярэчныя. Беларускія нацыянальныя і палітычныя памкненні таксама нельга было пагадзіць з расейскімі імперскімі інтарэсамі, якія ажыццяўлялі бальшавікі.

Абвешчаная ў 1918 годзе беларуская дзяржаўнасць існавала больш як ідэя, чым рэальная палітычная з'ява. Аднак у свядомасці беларускіх элітаў яна набыла трывалы характар. На падзеленай у выніку Рыжскае дамовы тэрыторыі стварыліся розныя ўмовы нацыянальнага развіцця. Большасць беларускіх палітычных арганізацыяў, якія дзейнічалі ў II Рэчы Паспалітай, не адмовіліся ад думкі пра незалежную і аб'яднаную Беларусь. Некалькі гадоў ліберальнага бальшавіцкага кіравання ў 20-х гадах спрычыніліся да таго, што на тэрыторыі Савецкай Беларусі стварылася амаль беларуская нацыянальная дзяржава. Беларускія дзеячы са згоды цэнтральных савецкіх уладаў маглі ажыццяўляць найбольш смелыя планы, аб якіх марылі пад час I Усебеларускага з'езда ў снежні 1917 года. Іх дасягненняў у галіне беларусізацыі не ўдалося цалкам знішчыць у 30-х

гадах, калі знішчаліся ўсе, хто меў хоць якое дачыненне да беларускай нацыянальнай ідэі.

У Беларусі некалькі дзесяткаў гадоў змагаюцца між сабою два погляды на форму нацыянальнага існавання. Кожная канцэпцыя дзяржаўнай і нацыянальнай самастойнасці разыходзіцца з мацнейшай прарасейскай арыентацыяй, якая працягвае існаваць у нязмененай форме ад часоў стваральніка ідэі "заходнерусізму" Міхаіла Каяловіча. Расейска-праваслаўную супольнасць ён ставіў вышэй за беларускую нацыянальную. З вядомых прычынаў прарасейская арыентацыя падтрымоўвалася маскоўскімі ўладнымі цэнтрамі. Праяўлялася гэта ў кадравай палітыцы, прапагандзе і асабліва ў выхаванні маладых пакаленняў беларусаў. У дванаццацітамовай "Беларускай савецкай энцыклапедыі" дарма шукаць прозвішчы людзей, якія ўсякім спосабам выказваліся за незалежную Беларусь. Гэтыя людзі не згадваюцца таксама ў школьных падручніках, іх імёнамі не называлі ні вуліцы, ні гарадскія плошчы.

У свядомасці грамадзянаў рэспублікі замацаваўся такі вобраз свету, у якім усё добрае прыходзіць з Усходу, а дрэннае — з Захаду. Феадалізм, войны, голад, расстрэлы прыносілі палякі, французы, немцы, і толькі супольнае змаганне з расейскім народам дазваляла беларусам скінуць чужое панаванне. Такую ідэю прапагандаваў самы папулярны аўтар школьных падручнікаў па гісторыі БССР Лаўрэн Абэцэдарскі. Пасля некалькіх дзесяцігоддзяў унушэнняў нават калгас станавіўся апорай грамадскага і цывілізацыйнага парадку — даваў працу, патрэбныя для жыцця сродкі і бяспеку.

Ідэалізаваная прапагандай і школай карціна савецкай улады давяла да таго, што напрыканцы 80-х гадоў шмат хто з недаверам успрыняў паведамленні прэсы аб сталінскім генацыдзе, свядомым знішчэнні беларускай мовы і культуры камуністычнымі героямі, імёны якіх упрыгожвалі назвы вуліцаў, заводаў, калгасаў. Крытыка камунізму пасля 1990 года для мільёнаў савецкіх грамадзянаў падалася аспрэчваннем дасягненняў іхнага жыцця. Зародкавая дэмакратыя была творам Захаду. Разам з яе надыходам апусцелі паліцы крамаў, з'явіліся няпэўнасць заўтрашняга дня, палітычны хаос, разбурэнне ўсёй герархіі неаспрэчных каштоўнасцяў.

У гэтакай сітуацыі беларускім нацыянальным элітам пашан-

цавала дасягнуць значна болей, чым іхным папярэднікам у 1918 годзе. Беларусь дэ-юрэ стала незалежнай дзяржавай, суверэнітэт якой быў прызнаны ў свеце. Аднак вось ужо некалькі гадоў адбываецца адваротны працэс, некалькі гадоў прэзідэнт Аляксандар Лукашэнка намагаецца абмежаваць суверэнітэт дзяржавы. Тым не менш ліквідаваць становішча, якое склалася ў 1991 годзе, да гэтай пары не ўдалося. Беларусь і надалей застаецца незалежнай дзяржавай, хоць гэта не толькі заслуга яе грамадзянаў, але і вынік сітуацыі ў Расеі і міжнароднай кан'юнктуры.

Раздзел 1

Беларусь у складзе Расеі

Фармаванне беларускай нацыянальнай ідэі

Пры канцы XVIII стагоддзя большасць беларускай шляхты падпала пад уплывы паланізацыі. Хоць прадстаўнікі гэтага грамадскага пласта называлі сябе ліцьвінамі — насельнікамі Вялікага Княства Літоўскага, аднак думалі палітычнымі катэгорыямі Рэчы Паспалітай, гэтаксама як мазавецкая ці малапольская шляхта. Каталіцкае веравызнанне, мова, культура рабілі іх падобнымі да польскай эліты і заадно адрознівалі іх ад тутэйшага люду. Старабеларуская літаратурная мова, на якой калісьці былі створаны статуты Вялікага Княства Літоўскага, у сапраўднасці стала мёртвай мовай. Рознымі беларускімі гаворкамі карысталіся сялянства, местачковае насельніцтва і дробная шляхта. У выніку падзелаў Рэчы Паспалітай і далучэння ўсіх беларускіх зямляў да Расеі ў 1795 годзе, афіцыйнай дзяржаўнай мовай стала расейская, але фактычна да 1863 года ў публічным ужытку ў гарадах пераважала польская. Грамадскае падвышэнне асобаў плебейскага паходжання найчасцей рабіла іх палякамі або расейцамі.

Многае паказвае на тое, што ў перыяд паўстання 1863 года ў колах польскіх элітаў панавала даволі распаўсюджанае перакананне, што беларусы ёсць украінным (kresowym) польскім людам. Царская адміністрацыя ў сваю чаргу прыняла тэзіс, што беларусы — гэта "истинно русский народ", і рабіла шмат намаганняў, каб гэтая тэорыя стала рэчаіснасцю. Гэта не значыць, што ў другой палове XIX стагоддзя не было паняцця "беларус", "беларусы", "беларуская мова". Наадварот, гэтымі тэрмінамі ахвотна карысталіся не толькі расейская адміністрацыя, але і навука, культура, асвета. Беларускасць, аднак, выступала ў такім разе ў кантэксце акрэсленай геаграфічна-культурнай прасторы, выключна як адзін з рэгіянальных кампанентаў расейскай супольнасці.

Беларускае пісьменства XIX стагоддзя, асабліва перыяду паўстання 1863 года, стваралася галоўным чынам у асяроддзі каталіцкай шляхты, спасылалася на польскую традыцыю змагання з Расеяй, ідэалізавала каталіцтва і колішнюю Рэч Паспалітую, прапагандавала супольнасць палітычных інтарэсаў Польшчы і

Беларусі ў якасці яе правінцыі[1]. Гэтая творчасць уплывала адно хіба на каталіцкае насельніцтва, якое складала ўсяго 20 % агульнай колькасці жыхароў Беларусі. Адначасова непрыхільны тон тагачаснай публіцыстыкі аблягчаў расейскім уладам мабілізацыю тутэйшых праваслаўных элітаў да процідзеяння гэтым тэндэнцыям.

У другой палове XIX стагоддзя развіваліся дзве беларускія інтэлектуальныя плыні, што адлюстроўвалі тагачасныя рэлігійныя падзелы. Каталікі і праваслаўныя жылі быццам бы ва ўзаемнай духовай адасобленасці, якую, дарэчы, падтрымоўвалі расейскія улады, і нацыянальная ідэя гэтых двух канфесійных асяроддзяў развівалася рознымі шляхамі. Сярод праваслаўных вельмі папулярнай была ідэя заходнерусізму, вельмі блізкая да царскай дактрыны расейскага народа, які складалі "велікарусы" (расейцы), "маларусы" (украінцы) і "заходнерусы" (беларусы). Галоўны ідэолаг гэтага руху — Міхаіл Каяловіч — патрабаваў увесці беларускую мову ў дзяржаўныя школы і ўрадавыя ўстановы ў Беларусі. Прапанаваў ён таксама правядзенне радыкальнай аграрнай рэформы, а ў яе выніку — падзел вялікай зямельнай уласнасці і перадачу зямлі сялянам. Гэты апошні пастулат Каяловіча не быў доказам яго грамадскага радыкалізму, а толькі вынікам разважанняў "заходнерусаў" вакол нацыянальных пытанняў[2]. Выходзілі яны з перадумовы, што вялікая зямельная ўласнасць у Беларусі знаходзіцца перш за ўсё ў руках палякаў, а тых лічылі чужаземцамі, якія непрыхільна, а то і варожа ставяцца да беларусаў. Разглядалася нават — асабліва пад час паўстання 1863 года — магчымасць перасялення палякаў "у Польшчу", гэта значыць, у межы Царства Польскага. Палякамі, паводле Каяловіча, лічыліся ўсе каталікі, што жылі ў Беларусі. Не дапускаў ён магчымасці ўзнікнення нацыянальнай катэгорыі беларусаў-каталікоў. "Заходнерусы" лічылі, што беларусы, якія перайшлі ў каталіцтва, самі адракліся ад сваёй нацыянальнасці і сталі палякамі.

Пасля задушэння паўстання 1863 года "заходнерускі" рух з прычыны свайго грамадскага радыкалізму стаў не надта выгад-

[1] Turonek J. Wacław Iwanowski i odrodzenie Białorusi. Warszawa, 1992. S. 21.

[2] Цьвікевіч А. "Западно-руссизм": Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в. Менск, 1993. С. 166—169.

ным саюзнікам для царскіх уладаў і таму неўзабаве быў выведзены на ўзбочыну грамадска-палітычнага жыцця. Аднак выступаў ён ад імя больш як 70 % жыхароў Беларусі і гэты факт асноўным чынам паўплываў на працэс фармавання беларускай нацыянальнай ідэалогіі ў канцы XIX стагоддзя. Заходнерусізм паспрыяў таму, што каталіцкія эліты перасталі думаць пра Беларусь ў катэгорыях традыцыі Рэчы Паспалітай, і стаў прычынай адарвання беларускай ідэі ад псіхалагічна-культурнага польскага кантэксту.

Крыніцы беларускага нацыянальнага адраджэння ў каталіцкім асяроддзі, гэтаксама як і ў праваслаўным, трэба шукаць у сярэдзіне XIX стагоддзя. Найчасцей пачыналася яно з зацікаўлення сыноў апалячанай шляхты гісторыяй свайго роду, мясцовасці, даследаваннем культуры тутэйшага насельніцтва. Паводле іх меркаванняў, аспрэчванне тэзіса аб асіміляцыі беларускай шляхты азначала б ухваленне тэорыі "заходнерусаў", якая ўсіх каталікоў на беларускай зямлі лічыла чужым элементам. Многія інтэлігенты шляхоцка-каталіцкага паходжання, якія пачыналі даследаваць мінулае, усведамлялі наяўнасць блізкіх культурна-моўных сувязяў уласнага роду з мясцовым сялянствам. Не перастаралі яны быць палякамі, але яшчэ больш ахвотна спасылаліся на легенды Вялікага Княства Літоўскага, міфы аб "тутэйшасці", "краёвасці". Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч (1808—1884) пісаў, што адчуваў сябе чалавекам польскай культуры і адначасова ўсведамляў сваё літоўскае (беларускае) паходжанне. Будучы шляхцічам, ён не мог увайсці ў тую сферу культуры, у якой апынуліся сялянскія масы. Такіх праблемаў не было ў інтэлігенцыі, якая адарвалася ад засценка і ягонай традыцыі. Францішак Багушэвіч (1840—1900) не адчуваў ніякіх эмацыйных сувязяў з зародкавай нацыянальнай ідэяй, аднак з прычыны салідарнасці з сялянскім асяроддзем напісаў вядомы заклік да беларусаў: "Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не умёрлі!" Як і Дунін-Марцінкевіч, ён пісаў па-беларуску, але адрозна ад таго беларускую мову назваў "сваёй".

Пры канцы XIX стагоддзя з'явілася новае пакаленне беларускай інтэлігенцыі, нацыянальная свядомасць якога склалася пераважна не ў выніку працяглых роздумаў, а шляхам выхавання. У 1898 годзе вучні менскай гімназіі Іван і Антон Луцкевічы арганізавалі нефармальную групу з мэтай вывучэння

гісторыі, этнаграфіі і беларускай грамадскай думкі. Супольна з пісьменнікам Казімірам Кастравіцкім яны збіралі кніжкі і ўсялякія іншыя публікацыі на згаданыя тэмы. Іх бацька — Іван Луцкевіч — сябраваў з Дуніным-Марцінкевічам і часта гасцяваў у яго доме. Беларускасць маладых Луцкевічаў, будучых дзеячоў нацыянальнага руху, вызначыў выбар іхных бацькоў.

На пачатку 80-х гадоў XIX стагоддзя беларускія студэнты, якія вучыліся ў Пецярбургу, заснавалі некалькі гурткоў сацыялістычнага і рэвалюцыйнага характару. Найчасцей былі яны беларускімі структурамі ў расейскім нарадавольніцкім руху. У 1883—1884 гадах пецярбургскія студэнты выпусцілі некалькі адозваў, адрасаваных жыхарам Беларусі. Напісаны яны былі на расейскай мове, а іх загалоўкі — "Да беларускай моладзі", "Да беларускай інтэлігенцыі", "Пасланне да землякоў-беларусаў" — сведчаць пра эвалюцыю нацыянальных поглядаў у коле "заходнерусаў". Аўтары гэтых публікацыяў, якія падпісваліся псеўданімамі "Шчыры беларус" ці "Даніла Баравік", пераконвалі беларусаў, што ў беларускага народа ёсць свае інтарэсы, іншыя, чым у расейцаў і палякаў, што Беларусь як краіна мае свае прыкметы, такія, як этнаграфія, мова, менталітэт і культура насельніцтва. У адозве "Да беларускай інтэлігенцыі", што распаўсюджвалася ў Беларусі пад канец 1883 года, яе аўтары пісалі, што народ, які калісьці страціў сваю эліту і выстаяў перад паланізацыяй і русіфікацыяй, заслугоўвае таго, каб стаць свабодным ад чужых паноў і манархаў. У выдадзеных беларускімі нарадавольцамі ў 1884 годзе двух нумарах часопіса "Гоман" былі сфармуляваны іх палітычныя і нацыянальныя пастулаты. Будучыню Беларусі яны бачылі ў дэмакратычнай Расеі, якая была б федэрацыяй шматлікіх нацый. Беларусы — адзін з элементаў гэтага хаўрусу народаў — мелі атрымаць права "вырашаць аб сваім лёсе". Пастулат аўтаноміі для Беларусі ў складзе расейскай дзяржаўнасці катэгарычна аспрэчваўся расейскімі сацыялістамі з "Народнай волі" як недарэчны, які стварае новую нацыю — беларускую.

Зусім іншую пазіцыю ў стаўленні да беларускіх нацыянальных памкненняў мелі польскія сацыялісты. Згодна з пастановаю III з'езда Польскай сацыялістычнай партыі (ПСП) ад чэрвеня 1895 года, гэтая партыя намервалася падтрымоўваць сепаратысцкія рухі народаў, якія насялялі Расейскую імперыю.

З дапамогаю ПСП у 1896 годзе ў Кракаве ўдалося выдаць і перапраўіць кантрабандай у Беларусь другое выданне "Дудкі беларускай" Францішка Багушэвіча — своеасаблівай ідэалагічнай інструкцыі для беларускага нацыянальнага руху.

На пачатку XX стагоддзя цэнтрам беларускага інтэлектуальнага жыцця быў Пецярбург. У вышэйшых школах сталіцы Расеі вучылася шмат маладых беларусаў. Бальшыню іх складалі людзі шляхоцкага паходжання. Атмасфера ў расейскім студэнцкім асяроддзі спрыяла стварэнню розных арганізацый, якія адмоўна ставіліся да тагачаснай рэчаіснасці. Апрача згаданых беларускіх нарадавольцаў, неўзабаве з'явіліся нефармальныя суполкі, што гуртавалі студэнтаў з каталіцкага асяроддзя. Гэтаксама як і нарадавольцы, былі яны сацыялістамі. Ад папярэднікаў розніліся тым, што не выказвалі энтузіязму наконт якой-колечы формы сувязі Беларусі з Расеяй.

У 1902 годзе з ініцыятывы Вацлава Іваноўскага была створана Беларуская рэвалюцыйная партыя (БРП). Няшмат вядома аб праграме гэтай арганізацыі. З адозвы БРП "Да інтэлігенцыі", выдадзенай восенню 1902 года на польскай мове, вынікае, што партыя аддавала перавагу асветнай працы з беларускім народам. Прыметнік "рэвалюцыйная" ў назове арганізацыі найперш адлюстроўваў моду, якая панавала ў студэнцкім асяроддзі, бо ніякага перавароту гэтая партыя рабіць не намервалася. Неадкладнай задачай было прызнана пашырэнне асветы на роднай мове і ведаў пра мінулае свайго народа. У 1903 годзе сузаснавальнікі БРП браты Іван і Антон Луцкевічы давялі да падзелу ў партыі і стварылі сваю арганізацыю — Беларускую рэвалюцыйную грамаду (БРГ). Вацлаў Іваноўскі ў сваю чаргу заснаваў Круг беларускай народнай прасветы і культуры і паклаў пачатак сістэматычнаму выданню літаратуры на беларускай мове.

І з'езд БРГ, які адбыўся ў Вільні ў снежні 1903 года прыняў праграму, набліжаную да праграмы расейскай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў (эсэраў), якая вырасла на глебе нарадавольніцкай традыцыі. Нацыянальнае пытанне ставілася ў праграме не надта выразна. Партыя патрабавала, каб усе народы Расеі атрымалі свабоду, але не акрэслівала, як зрабілі гэта выдаўцы "Гоману", межаў гэтай свабоды. Пастулат аўтаноміі для Беларусі да 1905 года БРГ не прапагандаваўся. Гэтая справа падзяляла БРГ і ПСП. Польскія сацыялісты выказваліся ў тым

часе за нейкую форму самастойнага дзяржаўнага існавання Беларусі, вядома, у хаўрусе з Польшчай. Узнікненне БРГ і яе праграма паказваюць на загладжванне адрозненняў паміж рэвалюцыйнай плынню, што паўстала з заходнерусізму, і беларускімі рэвалюцыянерамі каталіцка-шляхоцкага паходжання. На пачатку XX стагоддзя ў беларускім руху выразна дамінавала прарасейская арыентацыя.

Аднак найбольш пякучай справай у Беларусі было не так нацыянальнае, як аграрнае пытанне. Правадыры БРГ бачылі ў сялянстве сілу, якая магла б ажыццявіць нацыянальныя ідэі. Справа будучай уласнасці зямлі розніла БРГ не толькі ад ПСП, але і ад расейскіх эсэраў. Польскія сацыялісты, пераканаяыя ў тым, што вялікая зямельная ўласнасць у большасці належыць палякам, не падымалі гэтай праблемы. Яе падзел паміж сялянамі прапанавалі разгледзець у больш спрыяльных палітычных умовах. Эсэры, гэтаксама як і ў выпадку ўсёй Расеі, выказваліся за перадачу зямлі сялянскім камунам. Дзеячы Беларускай рэвалюцыйнай партыі былі прыхільнікамі перадачы яе ў карыстанне паасобным земляробам.

Рэвалюцыя 1905 года ў Расейскай імперыі паспрыяла пашырэнню ўплываў паасобных сацыялістычных партый на тэрыторыі Беларусі. Беларуская рэвалюцыйная грамада, якая ў канцы 1904 года памяняла назоў на Беларускую сацыялістычную грамаду (БСГ), вяла сваю дзейнасць найперш у сялянскім асяроддзі. У гарадах Беларусі дамінавалі расейскія, жыдоўскія і польскія сацыялістычныя арганізацыі. У 1905 годзе БСГ вярнулася да гоманскай ідэі аўтаноміі для Беларусі ў складзе дэмакратычнай і федэратыўнай Расеі. Кожны народ, які ўваходзіў у федэрацыю — паводле БСГ — павінны мець свой парламент, выбіраць сабе чыноўнікаў, гаварыць і пісаць на сваёй мове. Выкананню гэтага апошняга пастулата мусіла паспрыяць заснаванне партыяй у Менску пры канцы 1905 года сваёй друкарні.

У студзені 1906 года II з'езд БСГ даручыў далейшае кіраванне партыяй Вацлаву Іваноўскаму, Аляксандру Бурбісу і братам Луцкевічам. Новая праграма гэтай арганізацыі прадугледжвала змаганне за ператварэнне Расеі ў дэмакратычную і федэратыўную рэспубліку і за дзяржаўную аўтаномію Беларусі — у яе складзе і з парламентам у Вільні.

17 кастрычніка 1905 года цар Мікалай II адмяніў усе забаро-

ны, якія тармазілі развіццё нацыянальных моваў у Расейскай імперыі. Для арганізаваных палітычных структураў у Беларусі адкрываліся шырэйшыя магчымасці прапагандаваць свае ідэі ў народзе. 1 верасня 1906 года пабачыла свет першая легальная беларуская газета "Наша Доля". Выйшла яна накладам 10 тысяч паасобнікаў, у іх ліку 6 тысяч было надрукавана кірылічным шрыфтам для праваслаўных і 4 тысячы — лацінкай для каталікоў. Першы нумар выклікаў сенсацыю і вялікую цікавасць сярод віленскіх элітаў. За два дні ў Вільні было прададзена 3 тысячы паасобнікаў, 5 тысяч — трапіла ў правінцыю, а рэшту канфіскавала паліцыя. Чарговыя нумары выдання таксама канфіскавалі з прычыны радыкалізму прапагандаваных на яго старонках поглядаў на грамадскія справы. Толькі два з шасці выдадзеных нумароў дайшлі да чытачоў. Неафіцыйна "Наша Доля" была органам БСГ, а рэдагавалі яе лідэры партыі Іван і Антон Луцкевічы, Казімір Кастравіцкі (Карусь Каганец), Алаіза Пашкевіч (Цётка), Францішак Умястоўскі і, праўдападобна, Вацлаў Іваноўскі[3]. Прадбачачы заняпад газеты, браты Луцкевічы спачатку спрабавалі змякчыць тон больш радыкальных публікацый уласнымі палемічнымі артыкуламі, а пасля заснавалі новы легальны беларускі штотыднёвік "Наша Ніва", накіраваны ў большай ступені на прапагандаванне асветнай працы з народам, чым інструкцый для рэвалюцыянераў. "Наша Ніва", становячыся цэнтрам масавай грамадскай інфармацыі, дала пачатак сапраўднаму рэнесансу інтэлектуальнага жыцця ў Беларусі, інспіравала творчасць цэлай плеяды пісьменнікаў беларускага адраджэння — Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Алеся Гаруна, Міхася Арла, Сяргея Палуяна, Змітрака Бядулі. Штотыднёвік у 1906—1915 гадах быў найбольш значным асяродкам беларускага нацыянальнага жыцця. У рэдакцыі працавалі самыя выдатныя беларускія літаратары, публіцысты і палітычныя дзеячы. Іх творчасць даходзіла ва ўсе куткі Беларусі і за яе межы, нават да беларускіх эмігрантаў у Амерыцы. Выданне да 1912 года друкавалася кірыліцай і лацінкай, пазней — толькі кірыліцай. Беларуская ідэя дзякуючы "Нашай Ніве" перастала быць элітарнай з'явай і станавілася

[3] Traczuk J. Prasa białoruska w II Rzeczypospolitej (1918—1939). Bibliografia // Studia polono-slavica-orientalia. Acta literaria. T. XIII. Warszawa, 1992. S. 196.

паўсюднай. Рэдакцыя ў сваю чаргу паслядоўна прапагандавала канцэпцыю беларускай нацыянальнай, культурнай і духовай супольнасці, асобнай ад польскай і расейскай.

Пасля 1910 г. пачалі з'яўляцца іншыя беларускія выданні: з сатырычным ухілам — "Пялун", "Крапіва" або адрасаваныя да сялянаў, напрыклад "Хатка", выдаваная Аляксандрам Уласавым. Ідэалагічную канкурэнцыю для сацыялістычнай "Нашай Нівы" стараўся стварыць заснаваны ў 1913 годзе каталіцкі штотыднёвік "Беларус", які фінансава падтрымоўвала княгіня Магдалена Радзівіл. "Беларус" паклаў аснову пад будову падмуркаў беларускай кансерватыўнай думкі, якая была адказам на пашырэнне сацыялізму сярод моладзі. З прычыны пазнейшых палітычных падзеяў працэс гэты быў спынены.

Выбары ў расейскую Дзяржаўную Думу ў 1907 годзе сталі паказчыкам уплываў і папулярнасці розных партыяў, якія дзейнічалі ў Беларусі. Апрача ўсерасейскіх прыхільных ураду груповак, такіх, як "Союз 17 октября", сваіх кандыдатаў вылучыла таксама заснаванае ў 1906 годзе "Русское окраинное общество", ідэалогія якога з'яўлялася новай формай заходнерусізму. Гэтым групоўкам дасталося ў Беларусі 36 дэпутацкіх мандатаў (80,5 %). Паразу на выбарах пацярпеў блок сацыялістычных партыяў, які складалі БСГ, ПСП, Усеагульны жыдоўскі рабочы саюз (Бунд) і Расейская сацыял-дэмакратычная рабочая партыя (РСДРП). Сацыялісты не атрымалі ніводнага мандата.

Выбарчая няўдача стала прычынай спынення дзейнасці Беларускай сацыялістычнай грамады. Сяляне, у якіх беларускія сацыялісты шукалі падтрымкі, прагаласавалі за заходнерускія групоўкі. БСГ гуртавала пераважна людзей, якія паходзілі з шляхоцкіх і чыноўніцкіх колаў. Не ўмелі яны паўплываць на свядомасць вясковага насельніцтва, якое заставалася пад уплывам праваслаўнай царквы і ўрадавай прапаганды, распаўсюджванай школай, арміяй, установамі і лаяльнымі ў дачыненні да царызму заходнерускімі арганізацыямі. Бальшыня лідэраў БСГ абмежавала сваю актыўнасць да асветнай працы сярод масаў.

У 1906—1907 гадах у пецярбургскай выдавецкай суполцы "Загляне сонца і ў наша аконца" выйшлі тры падручнікі па беларускай мове. У 1907 годзе з'явіліся першыя прыватныя школкі, у якіх навучанне вялося на беларускай мове. Немагчы-

ма вызначыць памеры гэтай з'явы, але гэта не былі адзінкавыя выпадкі. Восенню 1907 года адбыўся з'езд настаўнікаў гэтых школ, які заснаваў нелегальны Беларускі настаўніцкі саюз.

У Пецярбургу, Вільні, Менску паўставалі многія новыя арганізацыі — літаратурныя, культурныя, асветныя, выдавецкія суполкі. У 1907—1912 гадах толькі рэдакцыя "Нашай Нівы" выпусціла 31 кніжку, у іх ліку 12 надрукаваных лацінкай. У Вільні неўзабаве паўсталі новыя выдавецтвы — "Наша хата", "Палачанін" і Беларускае выдавецкае таварыства (БВТ). Гэтае апошняе, якім загадваў Вацлаў Іваноўскі, адкрыла нават сваю кнігарню — адмысловы асяродак распаўсюджвання беларускай літаратуры. Апрача твораў прыгожага пісьменства, гістарычнай літаратуры і падручнікаў БВТ рыхтавалася друкаваць кніжачкі для набажэнства і Святое Пісьмо на беларускай мове.

Актыўнасць нешматлікай беларускай інтэлігенцыі была настолькі відавочнай, што выклікала процідзеянне расейскіх нацыяналістычных груповак. Расейскія газеты, якія выдаваліся ў Менску і Вільні, — "Белорусский вестник", "Минское слово" і заходнеруская "Белорусская жизнь" (з 1911 года — "Северо-Западная жизнь") — вялі няспынную ідэалагічную вайну з "Нашай Нівай". Выдаўцы "Северо-Западной жизни", папраўдзе, не аспрэчвалі існавання беларускай нацыянальнасці, але пераконвалі, што беларускай літаратурнай мовай, культурнай мовай беларусаў, ёсць мова Гогаля і Пушкіна. Друкаванне кніжак і перыядычных выданняў на беларускай мове яны называлі польска-каталіцкай інтрыгай.

Беларускія нацыянальныя памкненні з недаверам успрымаліся і некаторымі польскімі асяроддзямі. "Кур'ер літэўскі" ("Kurier Litewski"), "Пшэглёнд віленьскі" ("Przegląd Wileński"), а таксама іншыя польскія перыядычныя выданні не раз пісалі, што "Наша Ніва" і кніжкі на беларускай мове выдаюцца за дзяржаўныя грошы, а канчатковай мэтай гэтых старанняў з'яўляецца русіфікацыя народа, які мае схільнасць да польскай культуры. "Сумнеўнай ёсць справа, — пісаў В.Чачот, — што сённяшні люд ацаніў бы дабрадзейства, якое хочуць яму зрабіць нацыяналісты, навучаючы яго ўласнай гаворцы замест культурнай польскай мовы"[4]. Беларускую мову ў віленскім польскім друку часта называлі "грубай мовай", а яе распаўсюджванне — "адцяг-

[4] Czeczot W. Około kwestyi białoruskiej // Litwa i Ruś. 1913. Z. 4.

ваннем простага люду ад польскасці". Польскія публіцысты прынцыпова прылічалі беларусаў-каталікоў да польскай нацыі. Паўсюднай была боязь, што развіццё беларускага руху можа пагражаць польскай зямельнай уласнасці ў Беларусі.

Саюзнікамі беларускай інтэлігенцыі не былі і сяляне, ад імя якіх рэвалюцыянеры і пазітывісты фармулявалі свае пастулаты. Слабасць беларускіх эканамічна прывілеяваных пластоў — мяшчанства, землеўласнікаў, інтэлектуальнай эліты (якія звычайна былі істотнай умовай развіцця культуры і нацыянальнай ідэалогіі) была прычынай кволасці беларускіх патрабаванняў на фоне актыўных польскіх і расейскіх уплываў. Плебейскі характар беларускай супольнасці стаў прычынай таго, што грамадскія, а не нацыянальныя пытанні вызначалі яе свядомасць.

Насельніцтва Беларусі ў пачатку XX стагоддзя

У 1897 годзе быў праведзены першы перапіс насельніцтва Расейскай імперыі. Яго вынікі абвясцілі толькі ў 1905 годзе. У пяці губернях Паўночна-Заходняга краю — Магілеўскай, Мінскай, Віцебскай, Віленскай і Гарадзенскай — жыло 8 518 247 чалавек, у іх ліку 5 408 420 беларусаў (63,5 %), 1 202 129 жыдоў (14,1 %), 492 921 расеец (5,8 %), 424 236 палякаў (5,0 %), 377 487 украінцаў (4,4 %), 288 921 летувіс (3,4 %), 272 775 латышоў (3,2 %), 27 311 немцаў (0,3 %), 8 448 татараў (0,1 %), 19 658 чалавек іншых нацыянальнасцяў (0,2 %). Амаль 480 тысяч беларусаў жылі па-за межамі пяці названых губерняў, галоўным чынам на Смаленшчыне і Чарнігаўшчыне. Беларускай мовай у найбольшай ступені карысталася насельніцтва Магілеўскай (82,4 %) і Мінскай (76 %) губерняў. На гэтай мове размаўляла 56 % жыхароў Віленскай, 52 % Віцебскай і 42 % Гарадзенскай губерняў. Рассяленне беларускамоўнага насельніцтва было таксама нераўнамернае і ў паасобных губернях. У Віленскай губерні, напрыклад, у Вілейскім павеце яно складала 86,9 % насельнікаў, а ў Віленскім павеце — толькі 26 %. Таксама ў Сакольскім павеце Гарадзенскай губерні беларускамоўнае насельніцтва складала 83,9 % ад агульнай колькасці жыхароў, а ў суседнім Беластоцкім павеце гэтая катэгорыя насельніцтва займала трэцяе месца (26,1 %) следам за палякамі (34,2 %) і жыдамі (28,3 %). Беларускай мовай карысталася

амаль 90 % насельніцтва Красненскага павета Смаленскай губерні і 70 % Сумскага павета Чарнігаўскай губерні.

Рэлігійная структура насельніцтва Беларусі ў пэўнай ступені адрознівалася ад моўнай. Праваслаўныя складалі 70,4 % усіх жыхароў, каталікі — 13,5 %, юдэі — 14,0 %, а вернікі іншых канфесіяў — 2,1 %.

Пераважная большасць беларускага насельніцтва — 85,5 % — жыла ў вёсках. Астатнія найчасцей былі жыхарамі малых мястэчак. У губернскіх цэнтрах жыло толькі 2,6 % беларусаў. У гарадах на тэрыторыі Беларусі дамінавала жыдоўскае насельніцтва, якое складала 53,5 % ад усіх гараджан[5].

Паводле перапісу 1897 года найбольш палякаў жыло ў Гарадзенскай і Віленскай губернях, а ў некаторых паветах яны складалі большасць. Аднак у Менскай, Віцебскай і Магілеўскай губернях іх удзел у агульнай структуры насельніцтва складаў толькі 2,3 %. Сярод польскамоўнага люду, асабліва ў названых губернях, пераважала шляхта. З 153 тысяч чалавек, якія належалі да гэтага грамадскага стану, 43,3 % лічылі сваёй роднай мовай беларускую, 33,8 % — польскую і 19,1 % — расейскую. У ліку амаль паўмільённай масы расейцаў толькі 5 % складалі земляробы, а чыноўнікі і іх сем'і — 51,8 %. Расейскую мову прызналі роднай 61,5 % праваслаўных, астатнія паказалі на беларускую.

У ліку 5,4 млн чалавек, якія размаўлялі па-беларуску, 81 % складалі праваслаўныя, 18,5 % — каталікі, 0,4 % — стараверы, 0,03 % — лютэране. Амаль 40 % чыноўнікаў і 60 % настаўнікаў усіх тыпаў школ назвалі сябе беларускамоўнымі. Можна меркаваць, што значная частка святароў, чыноўнікаў, настаўнікаў разумела сваю беларускасць у катэгорыях заходнерусізму, а не паводле канцэпцыі, прапагандаванай "Нашай Нівай". У выпадку шляхты моўны крытэр праўдападобна не вызначаў пытання нацыянальнай свядомасці асобаў, якія належалі да гэтага грамадскага стану.

[5] Весці Акадэміі навук БССР. Серыя грамадскіх навук. № 1. 1987. С. 63.

Час вайны, міграцыі і рэвалюцыі (1914—1917)

Першая сусветная вайна з гледзішча беларускіх палітычных і нацыянальных інтарэсаў мела для Беларусі трагічныя наступствы. Заспела яна беларускія эліты без выразнай канцэпцыі дзеяння на выпадак парушэння тагачаснага геапалітычнага парадку, а само грамадства — на шляху фармавання нацыі. Вайна, аднак, сталася каталізатарам перамен у свядомасці сялянскіх масаў. Яна разбурыла іх ізаляваны ад вонкавага свету лад жыцця. Дамінаванне элементаў натуральнай гаспадаркі ў беларускай вёсцы не змушала сялян кантактавацца з светам, які знаходзіўся па-за межамі найбліжэйшай мясцовасці. Праўда, гэтыя ўмовы ахоўвалі сялянскае асяроддзе ад уплываў чужога атачэння і яго асіміляцыйнага ўздзеяння, але адначасова перашкаджалі кантактам з нацыянальнай інтэлігенцыяй. Вайна выгнала з сваіх сядзібаў мільёны людзей, давяла да канфрантацыі з чужым светам і надзяліла досведам, якога не ведалі іхныя продкі.

Беларусь ад першых дзён вайны стала прыфрантавой паласой. У жніўні 1914 года на яе тэрыторыі было ўведзена ваеннае становішча, забаронены публічныя сходы, гандаль газетамі і кніжкамі без дазволу ўладаў. Тым часам арганізаваліся шматлікія расейска-патрыятычныя маніфестацыі і набажэнствы. Неўзабаве тут размясцілася паўтарамільённая расейская армія. У самым Менску раскватаравалі 150 тысяч салдат. У армію былі мабілізаваныя сотні тысяч жыхароў Беларусі[6].

З увядзеннем ваеннага становішча большасць беларускіх арганізацый спыніла сваю дзейнасць. Выходзілі, аднак, два перыядычныя выданні — "Наша Ніва" і "Беларус". "Наша Ніва" да мабілізацыі і прапагандысцкай падрыхтоўкі паставілася без энтузіязму, змяшчала публікацыі, якія паказвалі лютасць і бессэнсоўнасць вайны. Стаўленне каталіцка-кансерватыўнага "Беларуса" да дзеянняў расейскіх уладаў было лаяльнае, падкрэсліваліся іх намаганні, накіраваныя на гарантаванне бяспекі краіне і яе насельнікам.

---

[6] Запруднік Я. Беларусь на гістарычных скрыжаваннях. Мінск, 1996. С. 77.

Параза расейскіх войскаў ва Усходняй Прусіі пры канцы жніўня 1914 года схіліла ўлады да перагляду палітыкі ў заходніх губернях, да змякчэння некаторых абмежаванняў ваеннага становішча і пошукаў падтрымкі з боку элітаў — прадстаўнікоў паасобных нацыянальнасцяў. У красавіку 1915 года віленскія губернскія ўлады дазволілі заснаваць Беларускае таварыства помачы пацярпелым ад вайны (БТППВ), кіраўніком якога стаў Вацлаў Іваноўскі, а намеснікамі Антон Луцкевіч і Вацлаў Ластоўскі. Неўзабаве аддзелы Таварыства былі створаныя ў Менску, Вілейцы, Друскеніках, Полацку, Горадні. У выдадзенай у чэрвені 1915 года ўлётцы "Да грамадзян Беларусі" БТППВ заклікала насельніцтва прыйсці на помач асобам, якія страцілі маёмасць. Пры канцы 1916 года, ужо пад нямецкай акупацыяй, у Вільні быў створаны Беларускі клуб — арганізацыя накшталт дыскусійнага форуму для асобаў, якія мелі розныя палітычныя погляды. Клуб перш за ўсё стаў месцам абмеркавання спрэчных пытанняў у справе будучыні Беларусі. У 1916 годзе віленскія беларусы мелі свой тэатральны калектыў — Беларускую драматычную дружыну, якой кіраваў Францішак Аляхновіч, кнігарню і бібліятэку. Заснавалі і новыя арганізацыі — Беларускі настаўніцкі саюз, Беларускае навуковае таварыства, Таварыства дапамогі бедным дзецям "Золак".

Асяродкамі беларускага нацыянальнага руху былі таксама школы. У канцы 1916 года іх налічвалася толькі восем. Праз некалькі месяцаў працавала ўжо 50 школ, 46 з іх знаходзіліся ў Беластоцка-Гарадзенскай школьнай акрузе. Аднак гэта была невялікая колькасць у параўнанні з польскім школьніцтвам, якое мела ў сваім распараджэнні сотні школ на тэрыторыі Віленшчыны і Гарадзеншчыны. Развіццё беларускага школьніцтва моцна тармазілася каталіцкім духавенствам, якое найчасцей агітавала за тое, каб дзяцей пасылалі ў польскія школы. Лік беларускіх школ павялічыўся да 350 толькі ў 1918 годзе, калі з Расеі пачалі вяртацца праваслаўныя бежанцы і настаўнікі, якія працавалі ў расейскай асвеце да 1915 года. Семінарыя ў Свіслачы, хоць і выпусціла больш за 100 настаўнікаў, была не ў стане кардынальна развязаць кадравае пытанне беларускага школьніцтва.

19 снежня 1915 года ў Вільні выйшаў "Універсал Канфедэрацыі Вялікага Княства Літоўскага", надрукаваны на беларускай,

летувіскай, жыдоўскай і польскай мовах. Ягоныя аўтары — браты Іван і Антон Луцкевічы. "Універсал" яны напісалі ў паразуменні з некалькімі прадстаўнікамі згаданых народаў. Потым канцэпцыяй аднаўлення Вялікага Княства Літоўскага як самастойнай дзяржавы спрабавалі зацікавіць немцаў і цэнтры польскага і летувіскага палітычнага жыцця. Іх прапановы не знайшлі, аднак, ніякага водгуку ў адрасатаў. І палякі, і летувісы выказваліся за аднаўленне сваіх нацыянальных дзяржаў, а немцы ў сваю чаргу дзяржаўнае ўладкаванне Беларусі звязалі з вынікамі вайны.

Беларускае пытанне ўпершыню з'явілася на міжнароднай арэне ў красавіку 1916 года пад час канферэнцыі прадстаўнікоў паняволеных Расеяй народаў у Лазане. У выніку захадаў прысутных на канферэнцыі беларускіх палітыкаў Івана Луцкевіча і Вацлава Ластоўскага быў вынесены пастулат палітычнай і культурнай аўтаноміі для Беларусі ў складзе расейскай дзяржавы. У студзені 1917 года ў Стакгольме адбылася яшчэ адна такая канферэнцыя, дзе таксама прысутнічалі беларускія прадстаўнікі.

Сітуацыя ў Беларусі на ўсходнім баку лініі фронту была звязана з хадою падзеяў у Расеі. І хоць у 1915—1916 гадах у Менску і Петраградзе дзейнічалі структуры Беларускага таварыства помачы пацярпелым ад вайны і выходзілі штотыднёвікі "Светач" і "Дзянніца", аднак іх уздзеянне на беларускае грамадства было нязначнае. Стварэнне месцаў працы, кравецкіх, пчалярскіх і агародніцкіх курсаў для бежанцаў ды наладжванне гульняў для іхных дзяцей — гэта ўся дзейнасць, якую дзеячам БТППВ дазвалялі расейскія ўлады. З іншага боку, служба ў расейскай арміі дала сотням тысяч беларускіх сялянаў паскораную палітычную адукацыю. Яны сталі відавочцамі паступовага падзення аўтарытэту ўлады, арміі і расейскай дзяржавы. Лютаўская рэвалюцыя падштурхнула да дзеяння грамадскія і нацыянальныя групоўкі, якія яшчэ некалькі гадоў таму былі далёкія ад ідэалаў, з якімі цяпер атаясамліваліся.

У Менску і многіх іншых гарадах Беларусі падзенне царызму ўспрымалася з энтузіязмам. Усе чакалі скорага заканчэння вайны. Антываенную атмасферу згушчаў факт прысутнасці ў Беларусі амаль паўтарамільённай расейскай арміі. Для насельніцтва знаходжанне такой вялікай колькасці войска было надта вялі-

кім цяжарам, а для расейскіх салдатаў вайна, пасля некалькіх спробаў выгнання немцаў, цалкам страціла сэнс. У Менску і наваколлі стаяла больш за 150 тысяч салдатаў. Кантроль над такой масай войска стараліся пераняць бальшавікі, якія, гэтаксама як ва ўсёй Расеі, пачалі ствараць саветы рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў. Беларусь заставалася часткай расейскага палітычнага тэатра, а беларускі нацыянальны рух (хоць пасля Лютаўскай рэвалюцыі развіваўся надта інтэнсіўна) знаходзіўся ўсяго толькі на ўзбочыне галоўнага рэчышча падзеяў 1917 года.

На пачатку сакавіка 1917 года, пасля дзесяцігадовага перапынку аднавіла дзейнасць Беларуская сацыялістычная грамада. Яе адраджэнне адбылося на аснове структураў БТППВ. Найболей прыхільнікаў адноўленай партыі знаходзілася ў Менску, Петраградзе, Маскве, Віцебску, Бабруйску. За некалькі тыдняў дзейнасці БСГ удалося згуртаваць некалькі сотняў супольнікаў, пераважна прадстаўнікоў інтэлігенцыі. Спрыялі гэтаму палітычныя абставіны, а найперш атмасфера свабоды і папулярнасць лозунгаў аб праве народаў Расеі на захаванне сваёй тоеснасці. На канферэнцыі БСГ 25 сакавіка 1917 года паўторна была вынесена прапанова ператварыць Расею ў федэратыўную дзяржаву і даць Беларусі аўтаномію з краёвай радай як органам заканадаўчай улады. Апрача таго, быў сфармуляваны шэраг прапаноў па правядзенні грамадскіх рэформаў: перадача сялянам панскай зямлі, адмена прымусовай вайсковай службы і замена яе народнай міліцыяй, нацыяналізацыя ўстаноў асветы. На канферэнцыі БСГ прысутнічалі прадстаўнікі Беларускай партыі народных сацыялістаў (БПНС) і некалькіх меншых галіновых арганізацый. З гэтае прычыны ўдзельнікі канферэнцыі абвясцілі сябе І з'ездам беларускіх нацыянальных арганізацый і абралі выканаўчы орган — Беларускі нацыянальны камітэт (БНК), які ўзначаліў буйны землеўласнік Раман Скірмунт. Управу БНК складалі Павел Аляксюк, Браніслаў Тарашкевіч, ксёндз Вінцэнт Гадлеўскі, Казімір Кастравіцкі, Усевалад Фальскі, Зміцер Жылуновіч, Аркадзь Смоліч, Іван Краскоўскі, Лявон Дубейкаўскі[7]. БНК атрымаў паўнамоцтвы прымаць у свой склад прадстаўнікоў новастворaных беларускіх арганізацый.

[7] Найдзюк Я., Касяк І. Беларусь учора і сяньня. Менск, 1993. С. 151.

Поруч з БСГ і БПНС дзейнічалі ўжо іншыя беларускія партыі, якія таксама распрацоўвалі розныя праекты наконт будучыні. У Маскве паўстала Беларуская народная грамада, у Петраградзе — каталіцкая Хрысціянская дэмакратычная злучнасць, у Віцебску — Беларускі народны саюз, у Магілеве — Беларускі нацыянальны камітэт, у Гомелі — Саюз беларускай дэмакратыі. Большасць гэтых арганізацый мела сваіх прадстаўнікоў у БНК.

У красавіку 1917 года дэлегацыя БНК на чале з Раманам Скірмунтам накіравалася ў Петраград, каб падаць Часоваму ўраду прапановы наконт аўтаноміі Беларусі. Дэмакратычныя ўлады Расеі, гэтаксама як раней царскія, не лічылі, аднак, беларусаў асобным народам і адмовіліся весці перамовы на гэтую тэму. У такой сітуацыі сацыялісты БСГ, якія пераважалі ў беларускім нацыянальным руху, пачалі шукаць паразумення з расейскімі радыкаламі — эсэрамі і бальшавікамі. Нават сваю прапагандысцкую рыторыку прыпадобнілі да той, якой карысталіся рэвалюцыянеры партыі Леніна.

На з'ездзе БСГ у Петраградзе ў чэрвені 1917 года старшынёю партыі быў абраны Зміцер Жылуновіч. Сваёй канчатковай мэтай БСГ абвясціла ўвядзенне сацыялістычнага парадку ў Беларусі "праз развіццё класавай барацьбы і сацыяльную рэвалюцыю". Гэта абазначала падзел у беларускім руху, бо для часткі кіраўніцтва БНК — Скірмунта, Аляксюка, ксяндза Гадлеўскага — чужымі былі погляды сацыялістаў. У атмасферы пашырэння радыкалізацыі грамадскіх настрояў павялічваліся палітычны капітал БСГ і лік сяброў партыі. У сярэдзіне 1917 года іх было ўжо больш за 5 тысяч. Некаторыя былі адначасова супольнікамі расейскіх сацыялістычных груповак. У такой сітуацыі скліканы ў Менску 8 ліпеня 1917 года II з'езд беларускіх партый і арганізацый праходзіў пад знакам дамінавання БСГ. З'езд распусціў Беларускі нацыянальны камітэт з прычыны ягонай кансерватыўнасці і стварыў Цэнтральную раду беларускіх арганізацый і партый, якая мелася прадстаўляць "поўнасцю дэмакратычныя" арганізацыі, што ў тагачасных умовах азначала самыя левыя групоўкі[8].

У пераломны момант гісторыі, калі акрэсліваліся перспекты-

[8] Ігнатоўскі У. Гісторыя Беларусі ў XIX і ў пачатку XX сталецьця. Менск, 1926. С. 239.

вы атрымаць хаця б аўтаномію і патрабавалася кансалідацыя ўсіх беларускіх груповак, класавыя інтарэсы ўзялі верх над нацыянальнымі.

Улетку 1917 года палітычная сітуацыя ў Менску адлюстроўвала стан настрояў у іншых гарадах Расеі. Гаспадарчы хаос, масы дэмаралізаваных салдатаў, над якімі страцілі кантроль генералы і Часовы ўрад, ды вострая бальшавіцкая рыторыка аб патрэбе сілай пераняць "пралетарыятам" уладу сталі прычынай далейшай радыкалізацыі грамадскіх настрояў. Уплывала гэта і на беларускі рух. У верасні 1917 года частка сяброў БСГ перайшла на бальшавіцкі бок. Усё больш і больш партыя падпадала пад грамадскія настроі і траціла нацыянальную тоеснасць. Толькі чарговы з'езд БСГ у кастрычніку 1917 года спыніў працэс уліцця гэтай самай вялікай беларускай арганізацыі ў рэчышча ўсерасейскай рэвалюцыі. З'езд выбраў старшынёю і ягонымі намеснікамі больш памяркоўных палітыкаў — Язэпа Дылу, Аляксандра Прушынскага і Аркадзя Смоліча, якія дзеля нацыянальнага інтарэсу згодныя былі вярнуцца да супрацоўніцтва з партыямі несацыялістычных накірункаў. Неўзабаве пасля з'езду БСГ было склікана паседжанне Цэнтральнай рады беларускіх арганізацый і партый, якую ўжо на другі дзень перайменавалі на Вялікую беларускую раду (ВБР). Пад час паседжання ВБР, якое працягвалася ад 16 да 24 кастрычніка, яе склад быў папоўнены прадстаўнікамі вайсковых і самаўрадавых асяроддзяў. Старшынёю выканаўчага камітэта стаў член БСГ Вячаслаў Адамовіч, а ў яго склад увайшлі дзеячы хрысціянскадэмакратычнай плыні Эдуард Будзька і Павел Аляксюк. ВБР вызначыла сабе ролю найвышэйшага органа часовай улады аўтаномнай Беларусі.

5 лістапада ў Менску адбыўся з'езд воінаў-беларусаў Заходняга фронту, які намерыўся падпарадкавацца ВБР і ад яе імя пачаць фармаванне сваіх узброеных сілаў. З гэтай мэтай была створана Цэнтральная беларуская вайсковая рада (ЦБВР), якая бесперашкодна працягвала дзейнасць таксама пасля захопу ўлады ў Беларусі бальшавікамі. У снежні 1917 года прайшоў з'езд беларусаў-вайскоўцаў Паўночнага фронту ў Віцебску. Ва ўмовах палітычнага хаосу і бальшавіцкай дэкларацыі аб праве народаў на самавызначэнне стварэнне беларускіх структур у расейскай арміі лічылася цалкам натуральнай з'явай, тым больш

што меліся яны прадстаўляць Беларусь у складзе Расеі. З'езды воінаў-беларусаў праходзілі ў лістападзе і снежні 1917 года таксама ў ваенных акругах па-за межамі Беларусі — у Кіеве, Адэсе, Смаленску, Гельсінгфорсе (Хельсінкі). Усюды прымаліся дэкларацыі ў падтрымку аўтаноміі Беларусі ў складзе федэратыўнай расейскай дзяржавы і заявы аб гатоўнасці спрыяць намаганням ЦБВР у справе фармавання беларускага войска. Некаторыя камандзіры, не чакаючы дазволу расейскіх начальнікаў, самі пачыналі ствараць беларускія нацыянальныя часціны.

Бальшавіцкім пераваротам у Беларусі кіравалі людзі звонку — Карл Ландар, Міхаіл Фрунзе, Вільгельм Кнорын, Аляксандар Мяснікоў. Менскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў практычна без барацьбы захапіў уладу ў горадзе і ўсталяваў кантроль над мясцовымі ваеннымі гарнізонамі. У лістападзе амаль усе вайсковыя фармаванні ў Беларусі апынуліся пад кантролем бальшавіцкага Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта Заходняга фронту. Здзейснілася гэта шляхам замены царскіх генералаў малодшымі афіцэрамі, якія былі верныя новай уладзе і атрымалі падвышэнне па службе.

Вялікая беларуская рада праігнаравала бальшавіцкі пераварот і паставілася да яго як да чарговай змены ўлады ў расейскай эліце і заадно палічыла яго знакам паглыблення няўстойлівасці палітычнай сітуацыі ў Расеі. ВБР прызнала новы ўрад у Петраградзе, але адмовілася прызнаць легальнай палітычнай уладай дзейны ў Менску Выканаўчы камітэт Заходняй вобласці і фронту, якім кіраваў Аляксандар Мяснікоў. Бальшавіцкі камітэт ВБР трактавала як палітычнае ўтварэнне, падпарадкаванае адно толькі камандуючаму расейскай арміі, якая стаяла ў Беларусі[9]. Дзеля ўпарадкавання спраў у краіне Рада намерылася склікаць 5 снежня Усебеларускі з'езд, які б шырока прадстаўляў усе беларускія грамадскія і палітычныя групоўкі. З'езд, згодна з намерам ВБР, павінны быў акрэсліць парадак уладкавання аўтаномнай Беларусі. Справа дзяржаўнай незалежнасці не абмяркоўвалася ніводнай сур'ёзнай беларускай палітычнай сілай.

---

[9] Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. Ч. 2. Мінск, 1995. С. 53.

Раздзел 2

Змаганне за сваю дзяржаўнасць

Беларуская Народная Рэспубліка

І Усебеларускі з'езд быў скліканы ў Менску са згоды і пры фінансавай падтрымцы Народнага камісарыята па справах нацыянальнасцяў, якім кіраваў Іосіф Сталін. Частка дэлегатаў (300 чалавек) сабралася 5 снежня 1917 года, афіцыйна з'езд пачаўся на два дні пазней. З розных куткоў Беларусі, а таксама з Расеі і Украіны, прыбывалі дэлегаты беларускіх вайсковых фармаванняў, губернскіх земстваў, павятовых і валасных самаўрадаў, прафсаюзаў, бежанскіх камітэтаў. Агулам да 14 снежня зарэгістраваліся 1872 дэлегаты. У іх ліку пераважалі вайскоўцы, настаўнікі і чыноўнікі. У з'ездзе ўзялі ўдзел больш за 700 афіцэраў і унтэр-афіцэраў усіх расейскіх гарнізонаў. Пераважная большасць дэлегатаў паходзіла з сялян. Старшынёй з'езда быў абраны прадстаўнік Цэнтральнай беларускай вайсковай рады Іван Серада. Да 14 снежня працягваліся працэдурныя ўзгадненні паміж прыхільнікамі розных палітычных плыняў і распрацоўка дакументаў, якія меркавалася разгледзець. Для дэлегатаў праводзіліся лекцыі па гісторыі і актуальнай сітуацыі ў краіне. На паседжаннях прадстаўнікі Віленшчыны, Гарадзеншчыны, Віцебшчыны і Меншчыны рашуча выказваліся за палітычную аўтаномію Беларусі. Дэлегаты Магілеўшчыны, Смаленшчыны і вельмі ўплывовыя прадстаўнікі беларускіх сацыялістычных партый Петраграда стаялі за адзінства расейскай дзяржавы і гарантаванне беларусам толькі свабоды культурнага развіцця. 17 снежня з'езд прыняў рэзалюцыю, у якой сцвярджалася, што "замацоўваючы свае правы на самавызначэнне, абвешчанае расейскай рэвалюцыяй, і сцвярджаючы рэспубліканскі лад у межах Беларускай зямлі, дзеля паратунку роднага краю і засцярогі яго ад падзелу і адлучэння ад Расейскай дэмакратычнай федэратыўнай рэспублікі, Першы Усебеларускі З'езд ухваляе: неадкладна ўтварыць са свайго складу орган краёвай улады ў асобе Усебеларускай Рады сялянскіх, салдацкіх і рабочых дэпутатаў, які часова становіцца на чале кіравання Краем, уступаючы ў справавыя зносіны з цэнтральнаю ўладаю, адказ-

най перад Саветам рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў"[1]. З'езд паспрабаваў усталяваць беларускую савецкую ўладу без ведама абласнога выканаўчага камітэта Заходняй вобласці і фронту. 17 снежня каля поўначы будынак, у якім праходзіў з'езд, быў ачэплены падраздзяленнямі Заходняга фронту. На загад Мяснікова прэзідыум з'езда быў арыштаваны, а дэлегаты разагнаныя салдатамі. Бальшавікі занялі таксама сядзібы Вялікай беларускай рады, Цэнтральнай беларускай вайсковай рады і Беларускай сацыялістычнай грамады. Беларускія вайскоўцы зусім не былі падрыхтаваныя да барацьбы з расейскімі бальшавікамі. Дарэчы, раней яны выказвалі волю супрацоўнічаць з імі.

На думку некаторых гісторыкаў, разгон з'езда бальшавікамі быў выяўленнем самавольства менскіх рэзідэнтаў Савета Народных Камісараў, дзеяннем, якое супярэчыла мэтам цэнтральных уладаў. Сапраўднай прычынай, пісаў беларускі гісторык з Варшавы Юры Туронак, было імкненне з'езда стварыць свае органы савецкай улады замест прэтэндуючых на яе чужых камісараў, якія, гэтаксама як Мураўёў ці Керанскі, не прызнавалі беларускага народа і яго права на самавызначэнне[2]. Савецкія гісторыкі І Усебеларускі з'езд паслядоўна называлі антысавецкім, які імкнуўся ўстанавіць буржуазную рэспубліку і адлучыць яе ад Савецкай Расеі.

З'езд яшчэ да разгону паспеў выбраць Раду, якая засядала 18 снежня 1917 года і стварыла сталае нацыянальнае прадстаўніцтва — Выканаўчы камітэт Рады Усебеларускага з'езда. Старшынёю Выканаўчага камітэта і кіраўніком ведамства замежных спраў стаў Язэп Варонка, ваенныя справы былі даручаны Сымону Рак-Міхайлоўскаму, а нутраныя — Івану Серадзе. У Выканкам з 11 чалавек неўзабаве былі ўлучаныя прадстаўнікі нацыянальных меншасцяў: паляк Аляксандар Прыстар, жыды Гутман і Зарубавель (Віткін), летувіс Мічуліс і расеец Злобін. Такім чынам у Менску стварыліся быццам бы два ўрады: яўны — савецкі і нелегальны — беларускі. Галоўная слабасць Выканаўчага камітэта палягала ў адсутнасці фінансавых сродкаў хоць на якую дзейнасць. Выканкам не мог нават забяспечыць

[1] Белорусская Рада. 1917. № 12.

[2] Turonek J. Wacław Iwanowski... S. 73.

харчамі вайсковыя падраздзяленні, якія падпарадкаваліся яму як палітычнай уладзе ў Беларусі.

У студзені 1918 года пачаліся сутычкі паміж раскінутымі па ўсёй Беларусі падраздзяленнямі 1-га польскага корпуса генерала Юзафа Доўбар-Мусніцкага з часцінамі расейскай арміі Заходняга фронту, якія кантраляваліся бальшавікамі. У бальшавіцкай прапагандзе ўсе палітычныя сілы, якія аспрэчвалі іх права на ўладу, былі абвінавачаныя ў спрыянні палякам. За выдуманае супрацоўніцтва з палякамі 31 студзеня ў Менску былі арыштаваныя кіраўнікі Цэнтральнай беларускай вайсковай рады Канстанцін Езавітаў, Васіль Захарка і Язэп Мамонька. Гэта стала прычынай далейшай дэзарганізацыі працэсу стварэння беларускіх вайсковых структураў. Бальшавікі распусцілі бальшыню беларускіх фармаванняў у сваёй арміі, салдатаў разаслалі па дамах або па іншых падраздзяленнях па-за межамі Беларусі.

У лютым 1918 года ў Берасці пачаліся мірныя перамовы паміж Савецкай Расеяй і Нямеччынай. Па жаданні старшыні расейскай дэлегацыі Льва Троцкага прадстаўнікі беларускага Выканкама не былі дапушчаныя немцамі на мірную канферэнцыю. Справа дзяржаўнай прыналежнасці Беларусі не знаходзілася ў коле іх зацікаўленняў. Немцы патрабавалі ад Расеі хуткай сплаты кантрыбуцыі, а ў сувязі з замаруджваннем расейскімі прадстаўнікамі падпісання адпаведных дакументаў 18 лютага нямецкая армія пачала наступаць на ўсход і дайшла да Дзвіны і Дняпра, заняўшы амаль усю Беларусь.

Немцы лічылі гэты абшар часткай тэрыторыі Расеі, часова ён быў для іх закладам за вымаганую кантрыбуцыю. І менавіта таму яны самі імкнуліся спагнаць з Беларусі частку пабораў, якія, на іх погляд, была ім павінная Расея.

Пачуўшы пра набліжэнне нямецкіх войскаў, бальшавікі ўцяклі з Менска. Расейскае войска, паралізаванае пацыфісцкай прапагандай, нават не думала супраціўляцца немцам. У ахопленым эвакуацыйным хаосам Менску змагацца за ўладу пачалі спехам арганізаваныя малалікія польскія падраздзяленні і рэшткі беларускіх фармаванняў. Палякі занялі пакінутыя бальшавікамі ваенныя склады і ўзброілі некалькі сотняў добраахвотнікаў. Вызваленым з турмы кіраўнікам Цэнтральнай беларускай вайсковай рады таксама ўдалося згуртаваць колькі сотняў жаўнераў, ахвотных змагацца за стратэгічныя аб'екты ў гора-

дзе. Крыху большыя сілы, галоўным чынам розныя вартаўнічыя службы, былі на расейскім баку. Змаганне ўсіх з усімі, якое працягвалася больш за дзесяць гадзін, было перапынена ўваходам у сталіцу 21 лютага нямецкіх войскаў.

21 лютага Выканаўчы камітэт Рады І Усебеларускага з'езда выдаў Першую Устаўную грамату да народаў Беларусі, у якой абвясціў сябе найвышэйшай цывільнай уладай у Беларусі. Спасылаючыся на права народаў на самавызначэнне, аўтары граматы сцвярджалі, што ўлада ў Беларусі павінна фармавацца згодна з воляю народаў, якія насяляюць краіну. Гэты прынцып мусіць ажыццяўляцца шляхам дэмакратычных выбараў ва Усебеларускі Устаноўчы Сойм. Выканкам стварыў Народны Сакратарыят Беларусі, а яго старшынёю прызначыў Язэпа Варонку. У грамаце ўпершыню не згадвалася пра аўтаномію і неабходнасць заставацца ў складзе расейскай федэрацыі. Яе тэкст на беларускай і расейскай мовах быў расклеены па ўсім Менску.

Беларускія дзеянні не мелі рэальнага значэння, бо ўся ўлада ў Беларусі знаходзілася ў руках камандавання нямецкай арміі. 22 лютага яно загадала польскім падраздзяленням пакінуць Менск, а беларускім — скласці зброю. Каб не ўскладняць дачыненні з Расеяй, немцы не прызналі беларускага ўрада, занялі сядзібу Народнага Сакратарыята, рэквізавалі ягоную маёмасць, скінулі з будынкаў беларускія нацыянальныя сцягі і забаранілі ўрадоўцам пакідаць горад. Аднак пры канцы лютага дайшло да перамоваў паміж Сакратарыятам і нямецкай вайсковай адміністрацыяй, у выніку якіх акупанты прызналі ўрад Варонкі прадстаўніцтвам беларускага несельніцтва. Немцы дазволілі Сакратарыяту весці легальную дзейнасць на тэрыторыі Меншчыны, галоўным чынам у галіне стварэння мясцовай адміністрацыі, школьніцтва і выдавецкай справы.

9 сакавіка Выканаўчы камітэт Рады І Усебеларускага з'езда выдаў Другую Устаўную грамату, у якой сцвярджалася, што "пасля трох з паловаю вякоў няволі ізноў на ўвесь свет кажа беларускі народ аб тым, што ён жыве і будзе жыць"[3]. Выканкам абвесціў узнікненне Беларускай Народнай Рэспублікі, вызначыў яе межы і часовы лад. Беларуская дзяржава — паводле

[3] Арлоў У., Сагановіч Г. Дзесяць вякоў беларускай гісторыі (862—1918): Падзеі. Даты. Ілюстрацыі. Вільня, 2002. С. 219.

граматы — павінна размясціцца "ў рубяжах рассялення і лічэбнай перавагі беларускага народа". Да часу правядзення свабодных выбараў ва Устаноўчы Сойм выканаўчая ўлада мела належаць Народнаму Сакратарыяту.

Паколькі Выканкам быў легальным, прызнаным немцамі прадстаўніцтвам насельніцтва Беларусі, яго структуры пачалі хутка разрастацца. Гарнуліся да яго найперш земскія і гарадскія самаўрады, якія пабачылі рэальную сілу, здольную стрымаць рабаўніцтва нямецкага войска. 18 сакавіка Выканкам абвесціў сябе Радай Беларускай Народнай Рэспублікі і ўзяў на сябе функцыі часовай заканадаўчай улады. Захоп амаль усёй тэрыторыі Беларусі немцамі дазволіў аб'яднаць намаганні дзеячоў двух цэнтраў — віленскага і менскага. Браты Іван і Антон Луцкевічы і Вацлаў Ластоўскі, якія ўсю нямецкую акупацыю знаходзіліся ў Вільні, канчаткова адмовіліся ад планаў стварэння канфедэратыўнай летувіска-беларускай дзяржавы. Прыклад Летувы, якая 16 лютага абвясціла незалежнасць, стаў таксама пэўным штуршком для віленскіх беларускіх дзеячоў. Апрача таго, яны меркавалі, што немцы будуць падтрымоўваць беларусаў так, як і летувісаў. 18 сакавіка Віленская беларуская рада далучылася да Рады Беларускай Народнай Рэспублікі.

Павялічаная на прадстаўнікоў ад усіх земляў і грамадскіх плыняў Рада БНР 25 сакавіка 1918 года абвесціла незалежнасць Беларусі. У яе склад меліся ўваходзіць Магілеўшчына, Меншчына, Віцебшчына, Гарадзеншчына (з Беластокам), беларускія часткі Віленшчыны, Смаленшчыны і Чарнігаўшчыны. Пастанова пра абвяшчэнне незалежнасці не была прынятая Радаю аднадушна. Многія яе супольнікі выступалі супраць перапынення сувязяў з Расеяй. Аднак бальшыня схіляліся да драматычнай спробы будаваць сваю дзяржаўнасць, спадзеючыся на падтрымку немцаў. 25 красавіка правадыры Рады на чале з Іванам Серадой выслалі нямецкаму кайзеру Вільгельму II тэлеграму з падзякай за вызваленне Беларусі і прапановай заключыць нямецка-беларускі хаўрус. Апрача Серады тэлеграму падпісалі Раман Скірмунт, які быў ініцыятарам гэтай дыпламатычнай акцыі, Павел Аляксюк, Антон Аўсянік, Язэп Лёсік і Пётра Крэчэўскі. Немцы не далі адказу на беларускія прапановы. Раптоўная змена арыентацыі з прарасейскай на пранямецкую выклікала востры канфлікт унутры беларускага руху. З гэтае

прычыны ў адстаўку пайшоў кабінет Язэпа Варонкі, а самая вялікая беларуская арганізацыя — Беларуская сацыялістычная грамада — распалася на тры партыі: Беларускую партыю сацыялістаў-рэвалюцыянераў (БПСР), Беларускую сацыял-дэмакратычную партыю (БСДП) і Беларускую партыю сацыялістаў-федэралістаў (БПСФ). "Рэвалюцыянеры" выказваліся за супрацоўніцтва з Расеяй і бальшавікамі, "федэралісты" хацелі саюза з Расеяй, але не мелі ахвоты кантактавацца з бальшавікамі, а "сацыял-дэмакраты", выразна не фармулюючы свайго стаўлення да Расеі, засяродзіліся на ратаванні аўтарытэту Рады і стварэнні нацыянальнага войска.

Новы старшыня Народнага Сакратарыята Раман Скірмунт гатовы быў далей шукаць шляхі паразумення з немцамі, але Рада блакавала ўсялякія ініцыятывы ў гэтым кірунку. Немцы з свайго боку не рабілі ніякіх істотных саступак на карысць беларусаў. Наадварот, рашуча тармазілі ўсялякія ініцыятывы ў стварэнні беларускіх вайсковых, паліцэйскіх ці ваенізаваных структураў[4]. Немцы баяліся, што гэта можа ўзмацніць стыхійны партызанскі сялянскі рух, арганізаваны з мэтаю абароны ад рабавання маёмасці, якое ажыццяўлялі нямецкія салдаты ў рамках спагнання кантрыбуцыі, накладзенай на Расею ў Берасці.

У кастрычніку 1918 года прэм'ер-міністрам урада стаў Антон Луцкевіч. З прычыны адсутнасці ўмоваў для ажыццяўлення палітыкі на тэрыторыі сваёй краіны ён засяродзіўся на дыпламатычнай дзейнасці, галоўным чынам на пошуках сярод суседзяў альянтаў, прыхільных ідэі незалежнай Беларусі. Кіраўніка ведамства вайсковых справаў палкоўніка Канстанціна Езавітава ён накіраваў у Коўна і Варшаву, а сам паехаў у Кіеў. Не знайшоўшы ў сталіцах новастворaных дзяржаў ніякіх абяцанняў падтрымкі, Луцкевіч прыняў запрашэнне Леніна на перамовы ў Маскве. Невядома, якая адбылася там размова, аднак Луцкевіч ужо больш не спрабаваў дамаўляцца з бальшавікамі.

Пры канцы лістапада 1918 года немцы сталі эвакуяваць свае войскі з Беларусі. Пакінутыя імі тэрыторыі займала Чырвоная Армія. 10 снежня бальшавікі былі ўжо ў Менску. За два дні да таго ў Вільню выбраліся Рада БНР і ўрад Антона Луцкевіча.

---

[4] Łatyszonek O. Białoruskie formacje wojskowe 1917—1923. Białystok, 1995. S. 79.

У Беларусі не было ніякіх войскаў, якія б спрабавалі супраціўляцца нешматлікім савецкім падраздзяленням, бо немцы намнога больш паспяхова расправіліся з беларускімі вайсковымі структурамі, чым бальшавікі.

Стварэнне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі

Беларуская Народная Рэспубліка хоць існавала ў большай ступені як ідэя, чым рэальна дзейнае палітычнае ўтварэнне, стала аднак каталізатарам, які давёў да стварэння беларускай савецкай дзяржавы. За такую форму нацыянальнага ўладкавання выказваўся таксама І Усебеларускі з'езд, да таго як быў разагнаны. З такімі патрабаваннямі выступалі беларускія бальшавікі, якія дзейнічалі ў розных секцыях Расейскай камуністычнай партыі (бальшавікоў). Аднак воля беларусаў мела другараднае значэнне. Рахады наконт узнікнення новых утварэнняў у выглядзе беларускай або летувіска-беларускай савецкіх дзяржаў дыктаваліся надзённымі патрэбамі савецкай палітыкі. Экспарт рэвалюцыі ў Еўропу вымагаў перш за ўсё прапагандысцкага ўвасаблення бальшавіцкіх лозунгаў аб праве народаў на самавызначэнне. З гэтае прычыны трэба было нейтралізаваць урад БНР, які разаслаў свае дыпламатычныя місіі ў многія еўрапейскія краіны.

8 снежня 1918 года савецкія ўлады пракламавалі ў Маскве стварэнне "Літоўскай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі". У яе межах апынуліся амаль усе беларускія землі. Аднак неўзабаве яны адышлі ад гэтай задумы, і ўжо ў сярэдзіне снежня Цэнтральны Камітэт РКП(б) разглядаў праект стварэння асобных — летувіскай і беларускай — рэспублік. 25 снежня ў часе сустрэчы Іосіфа Сталіна, тады камісара па справах нацыянальнасцяў, і старшыні Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РКП(б) Аляксандра Мяснікова былі вызначаны межы абедзвюх дзяржаў[5]. Беларусь — паводле Сталіна — меліся складаць Гарадзенская, Менская і Смаленская, а Летуву — Ковенская і Віленская губерні. Праз тры дні пасля сустрэчы Сталін па тэле-

[5] Хрестоматия по истории БССР. Минск. 1984. С. 63 (стэнаграма размовы Сталіна з Мясніковым).

графе загадаў далучыць да Беларусі Магілеўшчыну і Віцебшчыну. VI Паўночна-Заходняя канферэнцыя РКП(б), якая адбылася 30 снежня ў Смаленску, пераўтварылася ў I з'езд Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі, які ў гэты ж дзень абвесціў рэзалюцыю аб стварэнні Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі (БССР). "Каб забяспечыць свабоду працоўным масам і адраджаючымся народам і процістаўіцца акружаючым нас бандам наймітаў змрочных сіл імперыялізму, — пісалася ў рэзалюцыі, — VI Абласная канферэнцыя бальшавікоў лічыць неабходным стварэнне самастойнай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларускай"[6].

1 студзеня 1919 года аб сваім існаванні заявіў Часовы рабочасялянскі савецкі ўрад Беларусі. У выдадзеным маніфесце ён заклікаў народ Беларусі на барацьбу з "прадажнымі буржуямі, купцамі, памешчыкамі, фабрыкантамі і духаўнікамі", прадстаўнікамі якіх былі Рада БНР ды слугуючыя ёй нямецкія, польскія і ўкраінскія акупанты[7]. Змест маніфеста, як і вага абвінавачанняў, былі доказам таго, што бальшавікі лічылі БНР важным канкурэнтам за ўладу ў Беларусі. Маніфест адначасова прызнаваў непраўдзівымі ўсе законы, пастановы і распараджэнні ўладаў БНР. Кіраўніком савецкага ўрада быў прызначаны беларускі камуніст Зміцер Жылуновіч, але фармаванне Народнага камісарыята нутраных спраў было даручана армяніну Аляксандру Мяснікову, які 17 снежня 1917 года разганяў I Усебеларускі з'езд. Ва ўрад уваходзілі 8 беларускіх і 11 расейскіх камуністаў.

3 лютага Усебеларускі з'езд Саветаў пастанавіў заснаваць федэратыўны саюз з Савецкай Расеяй і абвесціў канстытуцыю БССР пад назвай "Дэкларацыя правоў працоўнага і эксплуатуемага народа". За колькі дзён да таго Цэнтральны Камітэт РКП(б) паменшыў тэрыторыю Беларусі, адарваўшы ад яе Смаленскую, Віцебскую і Магілеўскую губерні і далучыўшы іх да Расеі. Неўзабаве яны палічылі непатрэбным і існаванне абрэзанай тэрытарыяльна Беларусі. Адпаведныя пастановы аб яе ліквідацыі "ад імя беларускіх рабочых і сялян" прыняў Усебела-

---

[6] Из истории установления Советской власти в Белоруссии и образования БССР // Документы и материалы по истории Белоруссии. Минск. 1954. Т. 4. С. 444—445.

[7] Тамсама. С. 447—449.

рускі з'езд Саветаў, абвяшчаючы 16 лютага 1919 года волю далучэння БССР да "Літоўска-Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі" (ЛітБел). Беларускія камуністы на чале з Зміцерам Жылуновічам былі арыштаваныя, бо пратэставалі супраць новых падзелаў краіны. Ва ўрадзе ЛітБела не было ніводнага беларуса. Летувіска-беларуская савецкая дзяржава была федэраваная з Расеяй. У выглядзе наднацыянальнай арганізацыі яна мелася перашкодзіць адраджэнню незалежніцкіх памкненняў беларусаў і летувісаў, але разам з тым само яе існаванне давала савецкім уладам козыр у рукі як доказ іх паслядоўнай рэалізацыі прынцыпу аб праве народаў на самавызначэнне.

Да канца лютага большасць беларускіх земляў заняла Чырвоная Армія. 13 сакавіка з часткі савецкіх узброеных сілаў была створана "Літоўска-Беларуская армія", але мабілізаваных у Беларусі найчасцей пасылалі на ўсходні або паўднёвы фронт. Сама назва "Літоўска-Беларуская армія" не мела нічога супольнага з яе этнічным скла дам, бо ў пераважнай ступені яе складалі расейскія салдаты.

На занятым абшары Беларусі бальшавікі спехам арганізавалі саветы сялянскіх дэпутатаў, якія пачалі дзяліць вялікую зямельную ўласнасць. Многія землеўласнікі, якія раней падтрымоўвалі ідэю незалежнай беларускай дзяржаўнасці, памянялі сваю арыентацыю і падтрымку ўласных інтарэсаў сталі шукаць у Польшчы. Большасць, баючыся рэпрэсіяў, палічылі за лепшае выехаць туды. На месцы нацыяналізаваных зямельных маёнткаў ствараліся сельскагаспадарчыя камуны. Іх супольнікамі пераважна былі людзі, якія раней належалі да фальваркавай службы. Сяляне не атрымоўвалі нічога і, апрача таго, змушаныя былі забяспечваць чырвонаармейцаў харчамі і фуражом, выконваць для войска транспартныя паслугі. Мабілізацыя ў Чырвоную Армію чарговага штогадовага кантынгенту навабранцаў падштурхоўвала маладых людзей да ўцёкаў у лясы, спрыяла стварэнню аддзелаў, якія адважваліся на партызанскую барацьбу з чырвонаармейцамі, якіх пасылалі ў вёскі для рэквізіцыі збожжа, коней, свіней[8].

[8] Стужынская Н. Зялёнадубцы і іншыя // Літаратура і мастацтва. 11 снежня 1994. № 50.

Польска-савецкая вайна. Падзел Беларусі

17 лютага 1919 года дайшло да першых польска-савецкіх сутычак. У сакавіку польскае войска апынулася на лініі рэк Піна — Ясельда. 21 красавіка пасля трохдзённых баёў была занятая Вільня. На другі дзень была абвешчаная адозва начальніка польскіх войскаў Юзафа Пілсудскага "Да насельніцтва былога Вялікага Княства Літоўскага". "Польскае войска нясе Вам усім вольнасць і свабоду", — запэўніваў Ю.Пілсудскі. Ён дакляраваў таксама, што створыць магчымасці развязваць нацыянальныя і канфесійныя пытанні без усялякага гвалту і націску з боку Польшчы. Апрача Ю.Пілсудскага свае адозвы і загады на польскай і беларускай мовах выдалі генералы Эдвард Рыдз-Сміглы і Станіслаў Шаптыцкі. З загаду Э.Рыдз-Сміглага вынікала, што афіцыйнай мовай мелася быць польская, а ўсе распараджэнні ўладаў трэба перакладаць на беларускую мову. У кантактах з уладамі дапускалася ўжыванне беларускай мовы. У сітуацыі далейшай канфрантацыі з Савецкай Расеяй польскія ўлады імкнуліся здабыць прыхільнасць беларусаў. Для часткі палітыкаў, якія стваралі структуры БНР, Юзаф Пілсудскі, вядомы прыхільнік федэралізму, уяўляўся магчымым прыяцелем беларускай незалежнасці.

8 жніўня польскія войскі занялі Менск, у верасні апанавалі лінію Любань—Барысаў—Полацк—Дзвінск. Большасць беларускіх земляў апынулася пад польскім кантролем. Беларускі друк у Менску і Вільні пісаў аб гістарычнай супольнасці палякаў і беларусаў, дзякаваў за вызваленне Беларусі з-пад расейскага імперыялізму, выказваў спадзяванні на дапамогу Ю.Пілсудскага ў пабудове незалежнай беларускай дзяржавы. Старшыня Часовага беларускага нацыянальнага камітэта ў Менску Аляксандар Прушынскі (Алесь Гарун), вітаючы начальніка польскай дзяржавы і дзякуючы яму за вызваленне Горадні, Вільні і Менска, прыгадаў, што ў няволі застаюцца прыналежныя Беларускай Народнай Рэспубліцы гарады Віцебск, Магілеў, Смаленск. Пілсудскі ў Менску, як раней у Вільні, запэўніваў, што "зямлі гэтай нічога гвалтам навязана не будзе"[9]. Пасля некалькіх ме-

[9] Piłsudski J. Pisma-Mowy-Rozkazy. T. V. Warszawa, 1933. S. 34.

сяцаў дачыненняў з бальшавікамі запэўніванні кіраўніка польскай дзяржавы выклікалі сярод беларускіх дзеячоў эйфарыю. Шмат хто паверыў, што незалежнасць можна атрымаць як падарунак. 20 верасня 1919 года Канвент старэйшын Рады БНР паслаў ліст Ю. Пілсудскаму, у якім інфармаваў пра аднаўленне дзейнасці органаў Беларускай Народнай Рэспублікі. Ад ліпеня ў Вільні дзейнічала Беларуская вайсковая камісія, якая чакала дазволу польскага камандавання на стварэнне беларускага войска. У Парыжы 1 ліпеня 1919 г. прэм'ер урада БНР Антон Луцкевіч і прэм'ер польскага ўрада Ігнацы Падарэўскі ўзгаднілі новы праект федэрацыйнага пагаднення абедзвюх дзяржаў, які прадугледжваў супольную замежную палітыку і супольнае камандаванне ўзброенымі сіламі.

Поспехі польскага войска ўлетку 1919 года, асабліва федэрацыйныя дэкларацыі Пілсудскага, якія гэтак аптымістычна ўспрымаліся ў Менску і Вільні, занепакоілі савецкі ўрад. Выклікана гэта было рэальным шансам узнікнення федэрацыі народаў пад эгідай Польшчы, здольнай супрацьстаяць расейскаму і нямецкаму імперыялізму. Менавіта таму бальшавікі спехам фактычна ліквідавалі "Літоўска-Беларускую Савецкую Сацыялістычную Рэспубліку" і прапанавалі палякам мір "з вечнай граніцай на Дзвіне, Вуле і Бярэзіне"[10]. Ленін аддаваў амаль усю Беларусь наўзамен спынення ваенных дзеянняў. Прапановы гэтыя не раз выносіліся пад час мірных перамоваў восенню 1919 года ў Мікашэвічах. Адначасова савецкія ўлады падтрымоўвалі ўсялякія дзеянні, накіраваныя на дэстабілізацыю сітуацыі ў тылах польскага войска. Увосень 1919 года ў Смаленску была падпісана дамова паміж Беларускай партыяй сацыялістаў-рэвалюцыянераў і Расейскай камуністычнай партыяй (бальшавікоў) у справе арганізацыі беларускіх паўстанцкіх аддзелаў на занятых палякамі тэрыторыях. Дамова прадугледжвала, што ў выпадку апанавання Беларусі Чырвонай Арміяй будзе створана беларуская савецкая дзяржава, а ўлада перададзеная эсэрам і мясцовым камуністам.

Польская палітыка ў Беларусі аблягчала эсэрам выкананне гэтай дамовы. Энтузіязм, выкліканы дэкларацыямі Юзафа Пілсудскага, неўзабаве патух з прычыны дзеянняў польскага войска і адміністрацыі цывільнага кіраўніцтва ўсходніх земляў

[10] Turonek J. Wacław Iwanowski... S. 81.

(ЦКУЗ). Рэчаіснасць у Беларусі пад польскім панаваннем у 1919—1920 гадах часам не на шмат рознілася ад вобразу, маляванага бальшавіцкай прапагандай. Паводле ацэнкі II аддзела Генеральнага штаба Войска Польскага, першапачатковы беларускі энтузіязм неўзабаве пераходзіў у антыпатыю і ўрэшце ператвараўся ў нянавісць да ўсяго польскага. Камісар ЦКУЗ Ежы Асмалоўскі на пасады ва ўсіх установах прызначыў мясцовых абшарнікаў, якія лічылі сябе палякамі. Тыя выкарыстоўвалі ўладу перш за ўсё для расправы з сялянамі і такім чынам рэагавалі на вынікі савецкай акупацыі. Павятовымі старастамі прынцыпова ставілі абшарнікаў, войтамі ў гмінах прызначалі толькі палякаў і каталікоў; часта гэта былі асобы, якіх ненавідзела мясцовае беларускае насельніцтва. Гвалт і рэквізіцыі з боку вайсковых падраздзяленняў, жандармерыі і паліцыі згладжвалі адмоўныя ўражанні, набытыя за савецкім панаваннем[11]. Рабаванне, тэрор і расстрэлы падазроных у прыхільнасці да камунізму надавалі польскай прысутнасці рысы акупацыйнай улады[12]. Асяродкамі камунізму лічыліся праваслаўныя цэрквы і жыдоўскія сінагогі. Паспешліва і безумоўна перадавалі каталікам храмы, якія больш за сто гадоў знаходзіліся ў валоданні праваслаўных. Адбывалася гэта і ў тых мясцінах, дзе палякі складалі нязначны працэнт агульнага ліку жыхароў. Беларускую інтэлігенцыю адштурхоўвала нішчэнне ўсіх праяваў адраджэння нацыянальнага жыцця. Пад рэквізіцыі і суды траплялі незалежныя беларускія газеты, у Менску забаронена было ставіць на сцэне п'есы папулярных беларускіх пісьменнікаў — Янкі Купалы і Каруся Каганца. Прапаганда на старонках часопіса "Straż Kresowa", якой займаўся Камітэт абароны крэсаў, развеяла ілюзіі нават найбольшых прыхільнікаў хаўрусу з Польшчай. "Федэрацыйная канцэпцыя, — пісаў польскі гісторык Юзаф Левандоўскі, — мела на сваім баку ўвесь бельведэрскі лагер і падтрымку Юзафа Пілсудскага, але ў войску, якое фармавалася як нацыянальная армія, разуменне гэтых імкненняў было нязначнае. Войска спантанна і на кожным кроку ажыццяўляла палітыку, якая адпавядала канцэпцыі інкарпарацыі"[13].

---

[11] Krótki zarys zagadnienia białoruskiego. Opracowanie II Oddziału Sztabu Generalnego. Warszawa, 1928. S. 86—88.

[12] Łuckiewicz A. Okupacja polska na Białorusi. Wilno, 1920. S. 9—19.

[13] Lewandowski J. Mitohistoria // Słowo. Wyd. Uniwersytetu Uppsala, 1988. № 36. S. 22.

Стаўленне да Польшчы і палякаў раз'яднала беларускіх палітыкаў. Паводзіны войска і адміністрацыі ажыўлялі ідэю заходнерусізму. У Радзе БНР рашучыя антыпольскія пазіцыі займалі дзеячы БПСР і БПСФ. Частка палітыкаў гэтых партыяў, асабліва федэралісты, не былі прыхільнікамі паразумення з саветамі, але ў той сітуацыі аднолькавым ліхам лічылі падпісанне якіх-колечы пагадненняў і з заходнім і з усходнім суседам, бо бачылі ў дзеяннях кожнага з іх ажыццяўленне іхных імперыялісцкіх памкненняў.

Аднак паразумення з палякамі шукалі дзеячы, згуртаваныя вакол прэм'ера ўрада БНР Антона Луцкевіча. Не давяралі яны бальшавікам і спадзяваліся ў выпадку перамогі Польшчы на выкананне абяцанняў кіраўніка польскай дзяржавы, дадзеных у Вільні і Менску. 20 лістапада ў часе сустрэчы А.Луцкевіча з Ю.Пілсудскім было ўзгоднена, што Рада БНР пераўтворыцца ў Нацыянальную беларускую раду, што абазначала б замену яе статусу з дзяржаўнага прадстаўніцтва на нацыянальнае. Гэтая дамоўленасць быў адкінутая большасцю сяброў Рады. Прыхільнікі захавання незалежнасці Беларусі — Вацлаў Ластоўскі, Пётра Крэчэўскі, Васіль Захарка, Аляксандар Цвікевіч, Тамаш Грыб — намерыліся адклікаць Антона Луцкевіча з пасады прэм'ер-міністра і такім чынам пазбавіць яго паўнамоцтваў выступаць ад імя Рады БНР. Прыхільнікі Луцкевіча на чале з Паўлам Алексюком прапанавалі стварыць "дырэкторыю", якая выконвала б ролю нацыянальнага прадстаўніцтва і вяла далейшыя перамовы з палякамі. 13 снежня 1919 года бальшыня сяброў Рады абрала новым прэм'ер-міністрам Вацлава Ластоўскага і абвесціла сябе Народнай Радай БНР, старшынёй якой стаў Пётра Крэчэўскі. Астатнія, прыхільнікі супрацоўніцтва з Польшчай, абвесцілі сябе Найвышэйшай Радай БНР і на пасадзе прэм'ер-міністра пакінулі Антона Луцкевіча. Старшынёй Найвышэйшай Рады стаў Іван Серада. Некалькі дзён у Менску існавалі два беларускія ўрады і дзве рады, якія выступалі ад імя беларускага народа. Неўзабаве ўрад В. Ластоўскага і частка сяброў Народнай Рады былі арыштаваныя палякамі. Пасля вызвалення з турмы бальшыня іх падалася ў Коўну, дзе яны атрымалі статус эміграцыйнага ўрада і сродкі на вядзенне нелегальнай дзейнасці на тэрыторыі Польшчы. Антон Луцкевіч і сябры Найвышэйшай Рады пераехалі ў Вільню. То быў канец надзеі на развязанне беларускіх праблемаў пры падтрымцы Польшчы. Папраўдзе

яшчэ 24 сакавіка 1920 года Вацлаў Іваноўскі, у якога былі паўнамоцтвы Найвышэйшай Рады, заключыў з Леанам Васілеўскім, які прадстаўляў кіраўніка польскай дзяржавы, пагадненне ў справе ўрэгулявання польска-беларускага жыцця на Меншчыне, але ўжо не было адпаведнай атмасферы і — як высветлілася — часу на ажыццяўленне падпісаных абавязацельстваў. "У ідэі польска-беларускага супрацоўніцтва, — пісаў Юры Туронак, — былі, аднак, з абодвух бакоў многія праціўнікі. Была яна новай з'явай і з гэтае прычыны мала зразумелай. Абсалютная бальшыня абшарнікаў у Беларусі патрабавала не канфедэрацыі, але яе інкарпарацыі ў склад Польшчы, згаджалася з магчымасцю пайсці ў будучыні на пэўныя культурныя саступкі беларусам, аднак абуралася з прычыны трактавання іх як палітычнага партнёра. (...) Гэтай ідэі супрацьпастаўлялася таксама прапаганда беларускіх эсэраў, якія не раз выкарыстоўвалі скандальныя і безадказныя паводзіны войска і польскай адміністрацыі і, спасылаючыся на лозунг незалежнасці краіны, абвінавачвалі абаронцаў гэтага супрацоўніцтва ў згодніцтве перад Польшчай і здрадзе нацыянальным інтарэсам"[14].

У ліпені 1920 года Беларусь зноў была занятая Чырвонай Арміяй. 12 ліпеня бальшавікі падпісалі пагадненне з летувіскім урадам, у адпаведнасці з якім Віленшчына і Гарадзеншчына былі перададзеныя Летуве. Пагадненне гарантавала нейтралітэт Летувы на час савецка-польскай вайны, а ў выніку — бяспеку правага фланга войскаў Заходняга фронту, якія наступалі ў кірунку да Варшавы. Адначасова амаль мільённая маса беларусаў у межах Летувы стварала Савецкай Расеі перспектыву ўплываць на нутраную сітуацыю ў гэтай краіне.

31 ліпеня дзейны яшчэ Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Літвы і Беларусі паўторна абвесціў незалежнасць Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Утвораны ў гэты ж час Ваенна-рэвалюцыйны камітэт (у складзе Аляксандра Чарвякова, Вільгельма Кнорына, Язэпа Адамовіча) выконваў функцыі беларускага савецкага ўрада. У дэкларацыі ЦК КП(б)ЛіБ аб абвяшчэнні "незалежнай БССР" гаварылася, што межы Беларусі з буржуазнымі дзяржавамі будуць вызначаны паводле этнаграфічнага крытэру, а з сацыялістычнай Расеяй

[14] Turonek J. Wacław Iwanowski... S. 84.

і Украінай — "згодна з воляй беларускага народа"[15]. У склад створанай у адпаведнасці з гэтым дакументам дзяржавы ўваходзіла толькі 18 паветаў. Яе тэрыторыя зусім нязначна выходзіла за межы Меншчыны. У кастрычніку 1920 года большая частка тэрыторыі Беларусі разам з Менскам была зноў занятая польскім войскам. Пасля падпісання прэлімінарнае дамовы ў Рызе 12 паветаў, якія ўваходзілі ў склад БССР, апынуліся ў межах Рэчы Паспалітай. На савецкім баку засталася невялічкая рэспубліка з 6 паветаў колішняй Менскай губерні.

У часе польска-савецкай вайны значная частка беларускіх палітыкаў, ведаючы з уласнага вопыту бальшавіцкае панаванне ў 1919 годзе, не спяшалася заключаць якія-колечы пагадненні з А.Чарвяковым і В.Кнорыным. Разам з польскай арміяй адышлі ў горад Лодзь Беларуская вайсковая камісія і падначаленыя ёй падраздзяленні. Незалежна ад БВК ад імя беларускага ўрада Антона Луцкевіча на польскім баку змагаўся аддзел пад камандаваннем генерала Станіслава Булак-Балаховіча. 12 кастрычніка Павел Аляксюк які выконваў абавязкі старшыні Беларускага палітычнага камітэта, падпісаў пагадненне з генералам Булак-Балаховічам, згодна з якім Камітэт меўся весці вярбоўку ў беларускае войска. Яго камандзірам мусіў быць Булак-Балаховіч. З свайго боку ён абавязваўся дапамагаць дзейнаму ад імя ўрада А.Луцкевіча камітэту пераймаць цывільную ўладу на занятых ягоным войскам абшарах Беларусі.

Генерал Булак-Балаховіч, паралізуючы тылы Чырвонай Арміі, выдатна паспрыяў польскім войскам у контрнаступе ў верасні 1920 года. Спрабаваў ён, згодна з сакрэтнай дамоўленасцю з Ю.Пілсудскім, ваяваць з Савецкай Расеяй і пасля замірэння на польска-савецкім фронце ў кастрычніку 1920 года. Увосень армія генерала Булак-Балаховіча налічвала амаль 15 тысяч салдат. 10 лістапада ягоныя аддзелы вызвалілі Мазыр і рыхтаваліся да наступу на Менск і Гомель. У Мазыры С.Булак-Балаховіч пракламаваў незалежнасць Беларускай Народнай Рэспублікі, сябе абвесціў "начальнікам Беларускай Дзяржавы", а Беларускі палітычны камітэт — урадам БНР, адмаўляючыся такім чынам падпарадкавацца дзейным ужо цэнтрам улады — урадам А.Луцкевіча ў Варшаве і В.Ластоўскага ў Коўне. Прэм'ер-міністрам

[15] Из истории гражданской войны в СССР. Сб. док. и материалов. Т. 3. Минск, 1961. С. 320.

новага ўрада стаў Вячаслаў Адамовіч. Ад імя свайго кабінета ён выдаў маніфест да беларускага народа, у якім гаварылася пра далейшую барацьбу за незалежнасць Беларусі ў хаўрусе з Польшчай, правядзенне аграрнай рэформы разам з адчужэннем вялікай зямельнай уласнасці і скліканне нацыянальнага прадстаўніцтва дзеля акрэслення дзяржаўнага ладу[16]. Пасля баёў, якія цягнуліся некалькі дзён, аддзелы генерала С.Булак-Балаховіча пад націскам Чырвонай Арміі мусілі адступіць на тэрыторыю Польшчы, дзе і былі інтэрніраваныя.

Тым часам змаганне за незалежнасць Беларусі шырока разгарнулася таксама ў Слуцкім павеце. У сярэдзіне лістапада адбыўся з'езд Случчыны. Дэлегаты ад палітычных партый, сялянскіх саветаў, грамадска-культурных арганізацый прызналі Случчыну часткай Беларускай Народнай Рэспублікі і намерыліся змагацца за яе незалежнасць. Яны спадзяваліся, што іх змаганне будзе пачаткам акцыі, якая ахопіць усю Беларусь. На працягу двух дзён Радзе Случчыны ўдалося сфармаваць два стралковыя палкі. Да іх далучыўся беларускі батальён з Беласточчыны пад камандаваннем Міколы Дзямідава. На гэтай аснове была створана Слуцкая брыгада, якая налічвала блізу 4 тысяч салдат. 30 лістапада пачаліся баі з Чырвонай Арміяй, вынік якіх, з прычыны значнай перавагі расейцаў, можна было прадбачыць. Аднак ваенныя дзеянні, галоўным чынам партызанскага характару, доўжыліся амаль да канца снежня 1920 года. Слуцкія паўстанцы, гэтаксама як раней армія генерала С.Булак-Балаховіча, адышлі на тэрыторыю Польшчы, дзе таксама былі інтэрніраваныя.

Пры канцы 1920 года ў прыфрантавой паласе з абодвух бакоў дэмаркацыйнай лініі дзейнічала больш за дзесяць беларускіх партызанскіх аддзелаў, якія выступалі пад супольным найменнем "Зялёны Дуб". Са згоды і пры падтрымцы польскай выведкі партызаны рабілі напады на кантраляваную савецкім войскам тэрыторыю, а ў выпадку небяспекі адыходзілі ў Польшчу. І хоць лозунгам "Зялёнага Дуба" была барацьба за незалежную Беларусь у этнаграфічных межах, аднак, здаецца, мела яна ўсяго прапагандысцкае значэнне. Многія беларускія афіцэры, якія ўдзельнічалі ў вайне з бальшавікамі на пачатку 1921 года, замірэнне на польска-савецкай мяжы лічылі часовым становішчам.

[16] Łatyszonek O. Białoruskie formacje wojskowe... S. 156.

У гэтым перакананні праўдападобна ўмацоўвалі іх прадстаўнікі польскай выведкі, якія пастаўлялі ім зброю і сродкі на ўтрыманне аддзелаў. Пасля падпісання 18 сакавіка 1921 года Рыжскай мірнай дамовы частка камандзіраў "Зялёнага Дуба" прызнала беларускі эміграцыйны ўрад Вацлава Ластоўскага адзіным прадстаўніцтвам беларускага народа. Многія памянялі фронт: спынілі антысавецкую партызанскую дзейнасць і далучыліся да антыпольскага руху, які арганізаваў ковенскі цэнтр на тэрыторыі Гарадзеншчыны і Віленшчыны.

Улетку 1921 года польскія ўлады ў адпаведнасці з Рыжскай мірнай дамовай, забаранілі беларусам весці якія-колечы дзеянні супраць СССР з тэрыторыі Польшчы. У рамках ліквідацыі антысавецкіх цэнтраў у межах польскай дзяржавы на Гарадзеншчыне яны зачынілі беларускія школы і забаранілі выдаваць газеты на беларускай мове.

У кастрычніку 1920 года польскае войска пад камандаваннем генерала Люцыяна Жалігоўскага заняло Віленшчыну, якая ад ліпеня знаходзілася ў межах Летувы. Пераможаныя летувісы, зацікаўленыя ў аслабленні Польшчы, сталі тады прыхільнікамі беларускага незалежніцкага руху.

На тэрыторыі абвешчанай генералам Л.Жалігоўскім гэтак званай Сярэдняй Літвы Вацлаў Іваноўскі і Браніслаў Тарашкевіч атрымалі высокія пасады ў польскай адміністрацыі — Часовай кіравальнай камісіі. Аднак віленскі Беларускі нацыянальны камітэт не выказаў падтрымкі іхнае місіі. Па-за тэрыторыяй Сярэдняй Літвы ўсюды, куды вярталася польская адміністрацыя, зачынялі беларускія школы. Дый на тэрыторыі Віленшчыны беларускае школьніцтва існавала толькі да тае пары, пакуль у складзе Часовай кіравальнай камісіі былі В.Іваноўскі і Б.Тарашкевіч.

13 лістапада 1920 года ўрад БНР Вацлава Ластоўскага падпісаў з урадам Летувы пагадненне аб узаемнай падтрымцы дзеля "стрымання польскага імперыялізму". За фінансавую дапамогу і падтрымку на міжнароднай арэне ўрад Ластоўскага абавязаўся перадаць у распараджэнне летувіскага галоўнага камандавання ўсе беларускія вайсковыя часціны, якія знаходзіліся на тэрыторыі Летувы. Паабяцаў ён таксама паўплываць на беларусаў, каб у выпадку рэферэндуму ў справе дзяржаўнай прыналежнасці гэтай тэрыторыі яны галасавалі за карысны для Летувы вынік. Урад В. Ластоўскага праз пасрэдніцтва летувіскага ўрада атры-

маў таксама 40 мільёнаў марак крэдыту ад Нямеччыны на фінансавую падтрымку партызанскіх аддзелаў, якія мелі змагацца з Польшчай у выпадку яе вайны з Летувой.

Пад час мірных перамоваў, якія ішлі ў Рызе з восені 1920 года, беларусаў не прадстаўляў ніводзін палітычны цэнтр. Лёс Беларусі вызначаўся без беларусаў. Паводле ўдзельніка перамоваў з польскага боку Станіслава Грабскага, савецкі ўрад узамен за саступкі на тэрыторыі Украіны прапанаваў Польшчы большую частку Беларусі разам з усёй Меншчынай. Баючыся залішне вялікай колькасці праваслаўнага насельніцтва ў межах Рэчы Паспалітай, Станіслаў Грабскі, прадстаўляючы нацыянал-дэмакратычную палітычную думку, адстойваў мяжу ўздоўж Дзвіны, ад латышска-савецкай граніцы ў кірунку сярэдняга цячэння Прыпяці[17]. Такі выгляд мяжы з СССР, нават пры добрым стаўленні польскага боку, касаваў магчымасць ажыццяўлення якіх-колечы федэрацыйных планаў, спрыяў нацыянал-дэмакратычнай канцэпцыі інкарпарацыйнай палітыкі.

Рыжская мірная дамова нанесла вялікі ўдар па беларускіх палітыках Найвышэйшай Рады БНР і Беларускага палітычнага камітэта, якія паслядоўна выказваліся за аб'яднанне беларускіх земляў і стварэнне федэрацыі з Польшчай. Акцыя генерала С.Булак-Балаховіча ў Мазыры і Слуцкі збройны чын не змянілі стаўлення польскага ўрада і парламента да выканання пагадненняў, падпісаных з бальшавікамі ў кастрычніку 1920 года і пацверджаных Рыжскай мірнаю дамовай. Гэтая дамова, якая падзяліла Беларусь, ніколі не была ўхваленая ніводным уплывовым беларускім цэнтрам у Польшчы. Яна стварыла сітуацыю супярэчнасці польска-беларускіх інтарэсаў і вялікія магчымасці ўздзеяння на гэтыя судачыненні з боку Масквы.

[17] Grabski S. W Mińsku i Rydze // Więź. 1988. № 11—12. S. 173—174.

Раздзел 3

Савецкая Беларусь (1921—1939)

Нэп і беларусізацыя краіны

Адзін з пунктаў Рыжскай мірнай дамовы, падпісанай Польшчай і Расеяй 18 сакавіка 1921 года, прадугледжваў прызнанне абодвума бакамі "незалежнасці Беларусі і Украіны". Тэрыторыя "незалежнай Беларусі" ахоплівала 59,6 тысячы квадратных кіламетраў. Яе складалі 6 паветаў Менскай губерні — Бабруйскі, Мазырскі, Слуцкі, Ігуменскі, Барысаўскі і Менскі. На гэтым абшары жыло 1,6 мільёна людзей. Абрэзаная з усходу і захаду Беларусь была своеасаблівым дзяржаўным утварэннем. Хоць палітычна і эканамічна яна поўнасцю апынулася ў залежнасці ад Расеі, аднак фармальна з'яўлялася суб'ектам міжнароднага права.

Прызначаны сакратаром Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі (бальш авікоў) Беларусі Вільгельм Кнорын імкнуўся быць галавой беларускай савецкай дзяржавы ў значна шырэйшых межах, чым Менская губерня. У лістападзе 1920 года ён спрабаваў дамагчыся ў Маскве вяртання тых паветаў Віцебскай, Смаленскай і Гомельскай губерняў, у якіх жылі беларусы. Рашучая адмова цэнтральнага кіраўніцтва бальшавіцкай партыі весці размовы на гэтую тэму рабіла беспадстаўнымі далейшыя захады расейскіх камуністаў, якія кіравалі БССР, наконт пашырэння межаў апошняй. Дыскусія на гэтую тэму стала магчымай на пачатку 1921 года, калі была падпісана Саюзная рабоча-сялянская дамова паміж Расейскай Савецкай Федэратыўнай Сацыялістычнай Рэспублікай (РСФСР) і Беларускай ССР. Абодва бакі, "грунтуючыся на праве народаў на самавызначэнне, намерыліся аб'яднаць сілы ў абарончых мэтах і справе дзяржаўнага будаўніцтва". Пагадненне ўводзіла супольныя для абедзвюх дзяржаў народныя камісарыяты (міністэрствы): ваенных і марскіх спраў, міжнароднага гандлю, фінансаў, працы, шляхоў зносінаў, пошты і тэлеграфа[1]. На практыцы гэта азначала залежнасць адміністрацыі на тэрыторыі Беларускай ССР ад цэнтральных уладаў у Маскве яшчэ да ўзнікнення Саюза Савецкіх

[1]История советской Конституции 1917—1957: Сб. док. Минск, 1957. С. 265—266.

Сацыялістычных Рэспублік (СССР). Дамова аб ваенным і эканамічным саюзе адкрывала, аднак, камуністам, якія кіравалі ў Менску, магчымасць патрабаваць пашырэння тэрыторыі БССР коштам населеных беларусамі земляў, што знаходзіліся ў межах Расеі. Масква, перасоўваючы расейска-беларускую мяжу на ўсход, не траціла кантролю над усёй тэрыторыяй. Адначасова яна магла здабыць давер беларускай інтэлігенцыі і эміграцыйных палітыкаў, якія ставілі пад сумнеў як сапраўднасць беларускай дзяржавы, так і шчырасць савецкай нацыянальнай палітыкі.

У кастрычніку 1922 года Пленум Цэнтральнага Камітэта Расейскай камуністычнай партыі (бальшавікоў) прыняў рашэнне пра стварэнне СССР. 30 снежня з'езд Саветаў савецкіх рэспублік Беларусі, Украіны, Расеі і Закаўказзя абвесціў адпаведную дэкларацыю — юрыдычны акт, які спрыяў аднаўленню расейскай імперыі з новым ідэалагічным фасадам.

У сакавіку 1923 года VII з'езд КП(б)Б прыняў пастанову, у якой адзначалася, што для адраджэння Беларусі неабходным з'яўляецца ўлучэнне ў яе склад суседніх раёнаў "згодна з іх гістарычнай, эканамічнай і нацыянальна-культурнай спецыфікай"[2]. Змест гэтага дакумента раней быў узгоднены з ЦК РКП(б). Адпаведныя пастановы перадалі ў ЦК РКП(б) таксама з'езды Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў Гомеля і Віцебска. Аб'яднаннем беларускіх земляў, якія знаходзіліся на ўсходнім баку "рыжскай" мяжы, ствараласа бачнасць інтэрнацыяналісцкага характару бальшавіцкай улады. 7 сакавіка 1924 года Прэзідыум Усесаюзнага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта выдаў дэкрэт пра перадачу Беларусі 15 паветаў Віцебскай, Смаленскай і Гомельскай губерняў з пераважна беларускім насельніцтвам. У выніку тэрыторыя рэспублікі падвоілася і пасля ўзбуйнення складала 110,5 тысячы квадратных кіламетраў. Лік насельніцтва перасягнуў 4 мільёны.

У снежні 1926 года да БССР былі далучаныя яшчэ Гомельскі і Рэчыцкі паветы. Такім чынам яна павялічылася да 125 тысяч квадратных кіламетраў, а лік насельніцтва — да 5 мільёнаў. Паводле перапісу 1926 года беларусы складалі 80,6 % агульнай колькасці насельніцтва краіны, жыды — 8,2 %, расейцы — 7,7 %, палякі — 2,0 %, іншыя нацыянальнасці — 1,5 %.

---

[2] Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Минск, 1983. Т. 1. С. 95.

Саюзная дамова ад 30 снежня 1922 года ўводзіла супольнае грамадзянства для жыхароў усіх рэспублік. 31 студзеня 1924 года з'езд Саветаў СССР прыняў канстытуцыю, якая сталася асноўным законам на саюзнай тэрыторыі. З гэтай пары юрыдычныя акты паасобных рэспублік не маглі быць у супярэчнасці з Канстытуцыяй СССР.

Канстытуцыя БССР была ўхваленая з некаторым спазненнем параўнальна з астатнімі саюзнымі рэспублікамі, толькі ў 1927 годзе, бо беларускія камуністы, падбадзёраныя адносна ліберальнай нацыянальнай палітыкай цэнтральных уладаў, хацелі пазбегнуць запісу пра дыктатуру пралетарыяту, прызнаючы такую фармулёўку нелагічнай у рэспубліцы, дзе больш за 80 % насельніцтва складалі сяляне. Неўзабаве іх сталі дакараць за гэты грэх у часе расправы з гэтак званай нацдэмаўшчынай.

Канстытуцыя БССР фармальна перадавала ўладу Саветам рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў. Права выбіраць у Саветы — дзейнае і пасіўнае — мелі рабочыя, сяляне і салдаты. Гэтых пр' воў былі пазбаўлены духоўныя, прыватныя гандляры, прадпрымальнікі, якія наймалі рабочую сілу, колішнія чыноўнікі і паліцыянты, асобы, якія бралі ўдзел у палітычнай дзейнасці ў 1917—1921 гадах на баку праціўнікаў бальшавіцкага рэжыму.

На пачатку 20-х гадоў у Беларусі ўвесь час дзейнічала некалькі партый сацыялістычнага кірунку, якія звычайна ўхвалялі бальшавіцкі парадак. Самай уплывовай і шматлікай (больш за 20 тысяч сяброў) была Беларуская партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў. Варта прыгадаць, што Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі пры канцы 1921 года налічвала ўсяго 1,5 тысячы сяброў, а праз чатыры гады — 6,6 тысячы[3]. БПСР мела свае структуры перш за ўсё ў сялянскім асяроддзі, дзе ўплывы камуністаў былі мізэрныя. Да таго ж лідэры гэтай партыі ўдзельнічалі ў эміграцыйным урадзе ў Коўне, арганізоўвалі партызанскі рух на тэрыторыі II Рэчы Паспалітай. Другой партыяй, якая карысталася сапраўднай грамадскай падтрымкай, быў Усеагульны жыдоўскі рабочы саюз (Бунд). Па ліку сяброў Бунд перасягаў нават БПСР. Юрыдычны парадак СССР

[3] Głogowska H. Białoruś 1914—1929. Kultura pod presją polityki. Białystok, 1996. S. 92—93.

не прадугледжваў існавання, акрамя бальшавіцкай партыі, ніякіх іншых палітычных арганізацый, нягледзячы на іх характар, ідэалогію і грамадскую падтрымку. Найхутчэй распушчаны быў Бунд. 25 сакавіка 1921 года нечарговы з'езд гэтай партыі прыняў пастанову аб самароспуску. Згодна з заклікам кіраўніцтва Бунду частка жыдоўскіх сацыялістаў папоўніла шэрагі КП(б)Б.

У выніку рашэнняў Цэнтральнага Бюро ЦК КП(б)Б на пачатку 1921 года былі праведзеныя масавыя арышты дзеячаў БПСР. У турмах апынуліся 860 самых актыўных сяброў партыі. Такім менавіта спосабам бальшавікі вызваліліся ад апошняй добра арганізаванай палітычнай канкурэнцыі ў Беларусі. Аднак фармальна БПСР "самараспусцілася" ў ходзе легальнага з'езду партыі ў Менску 8 чэрвеня 1924 года. Апошні з'езд беларускіх эсэраў прызнаў, што існаванне іхнай партыі расколвае супольны фронт працоўных масаў, тармозіць развіццё сацыялістычнай рэвалюцыі, перашкаджае ўмацаванню савецкага ладу і спрыяе контррэвалюцыі. З'езд выказаў волю, ад імя ўсіх сяброў партыі, уступіць у шэрагі бальшавіцкай арганізацыі і далей супольна весці барацьбу з капіталізмам за сацыяльныя і нацыянальныя правы люду Беларусі. Змест пастановаў апошняга з'езду БПСР ёсць доказам таго, што былі яны напісаныя калі не ў Цэнтральным Бюро ЦК КП(б)Б, дык пад кантролем гэтай установы.

У ліпені 1923 года была абвешчаная амністыя для дзеячоў і сяброў небальшавіцкіх арганізацыяў, якія дзейнічалі ў Беларусі ў 1918—1921 гадах. Гэта дазволіла зарэгістраваць усіх магчымых праціўнікаў савецкай улады, каб праз некалькі гадоў прасцей было іх фізічна ліквідаваць. Аднак у 1923-ім і наступных гадах ніхто не быў арыштаваны, нават за ўдзел у антысавецкіх узброеных фармаваннях, таму выспявала перакананне пра паступовую дэмакратызацыю камуністычнай сістэмы.

Пасля шасці гадоў нямецка-расейскай і польска-расейскай войнаў у выніку шматлікіх акупацый гаспадарка Беларусі ляжала ў руінах. Многія прадпрыемствы разам з працоўнымі калектывамі ў 1915 годзе былі вывезеныя ўглыб Расеі. Рэквізіцыі коней, кароў і валоў, свіней і збожжа, якія ажыццяўляліся ўсімі арміямі, прывялі да голаду ў некалькіх раёнах Беларусі. Несумнеўна, ратункам для сельскай гаспадаркі, якая дамінавала ў краіне, быў адыход бальшавікоў ад ваеннага камунізму і абвяшчэнне Леніным у сакавіку 1923 года новай эканамічнай

палітыкі (нэп). У прамысловасці лібералізацыя метадаў гаспадарання выклікала толькі хаос. Некампетэнтнасць новых уладаў у галіне гаспадаркі стала прычынай таго, што частка заводаў вырабляла зусім непатрэбную рынку прадукцыю або бяздзейнічала ў чаканні сыравіны і паліва. Увядзенне прынцыпу калектыўнага кіравання, якое мела прадухіліць карупцыю і раскраданне маёмасці, давяло да паўсюднай безадказнасці кадраў, якія кіравалі скарбовай уласнасцю. Каб спыніць далейшую дэзарганізацыю прамысловага сектару, спрабавалі прышчапіць сацыялістычнай форме ўласнасці элементы капіталістычных прынцыпаў гаспадарання. Паасобныя прадпрыемствы атрымалі самастойнасць у справах кіравання, выбару віду вытворчасці і збыту. Нерэнтабельныя малыя дзяржаўныя прадпрыемствы закрываліся або здаваліся ў арэнду прыватным асобам[4].

Стаўка на дробную вытворчасць і дробны гандаль сталася незвычайна паспяховым метадам ажыўлення гаспадаркі, асабліва наладжвання эканамічных сувязяў паміж горадам і вёскай. Ні прыватная дробная вытворчасць, ні такі ж гандаль не патрабавалі вялікіх дзяржаўных капіталаўкладанняў. Самае галоўнае палягала ў тым, што гэтыя сектары маглі прапанаваць свае тавары вясковаму насельніцтву ўзамен за харчы. Гэта спрыяла зацікаўленасці сялянаў у развіцці таварна-грашовых дачыненняў і ўзнікненню рынку ўзаемных кантактаў розных сектараў гаспадаркі і рэгіёнаў краіны. Аднак гэты стан не мог існаваць надта доўга, бо эфектыўнасць працы і заробкі ў прыватных прадпрыемствах няўхільна павялічваліся, а на дзяржаўных назіраліся якраз супрацьлеглыя тэндэнцыі, колькасць страйкаў на сацыяльнай глебе набывала некантраляваныя памеры. На некаторых фабрыках, асабліва тэкстыльных, рабочыя раскрадалі да паловы прадукцыі. Эканамічная рэчаіснасць стаяла ў выразнай супярэчнасці з ідэалогіяй, якую прапагандавалі новыя ўладары, і выклікала пытанні пра сэнс бальшавіцкай рэвалюцыі.

У сярэдзіне 1925 года дзяржаўныя ўлады зрабілі карэктаванне галоўных палажэнняў нэпа і ўзялі курс на гэтак званую інтэнсіфікацыю працы. Дзяржаўным прадпрыемствам былі вызначаныя памеры тыднёвай, месячнай і гадавой вытворчасці.

[4] История рабочего класса Белорусской ССР. Минск, 1985. Т. 2. С. 190.

Залежнасць прыбытку працоўных калектываў выключна ад велічыні вытворчасці, вельмі хутка спрычынілася да зніжэння якасці выраблянай прадукцыі. Часта гэта былі машыны і абсталяванне, што ў канчатковым выніку рабіла гаспадарку нерэнтабельнай. Марнатраўства людской працы, сыравіны і паліва давяло да дэмаралізацыі работнікаў як у сферы вытворчасці, так і кіравання.

Паводле дадзеных 1923 года на тэрыторыі БССР дзейнічалі 10 367 суб'ектаў па-за сельскагаспадарчым сектарам, 65 % з іх належалі прыватным асобам[5]. Аднак прыватныя прадпрыемствы давалі працу напалову меншай колькасці чалавек, чым дзяржаўныя. Іх лік няўхільна і хутка павялічваўся. У 1926 годзе 58 тысяч прыватных прадпрыемстваў давалі працу толькі 10 тысячам найманых работнікаў. Уласнікі прадпрыемстваў разам з сем'ямі працавалі найчасцей у сваіх фірмах, а іхныя дамы і гаспадарчыя будынкі былі месцамі працы.

Шпаркае развіццё прыватнага прадпрымальніцтва пачалося ў 1925 годзе, калі змякчылі падатковыя тарыфы для ўласнікаў малых гандлёвых і вытворчых прадпрыемстваў. У верасні 1926 года Савет Народных Камісараў СССР пастанавіў "максімальна абцяжарыць падаткамі прыватны капітал" і пачаць нацыяналізаваць прыватную вытворчасць і гандаль. У прынцыпе гэта быў канец нэпа і пачатак сталінскай палітыкі уніфікацыі гаспадарчага жыцця. У 1925 годзе максімальнае падаткавае абцяжаранне ўласнікаў прыватных прадпрыемстваў складала 25 % ад прыбытку. Пры канцы 1926 года яно павялічылася да 45 %, і разам з іншымі адлічэннямі дзяржава забірала ў рамеснікаў і дробных купцоў амаль 70 % іх прыбытку. Вынікам гэтых захадаў было раптоўнае падзенне ўдзелу прыватнага сектару ў валавым прадукце краіны. У 1926 годзе прыватны сектар забяспечваў 49 % прамысловай вытворчасці БССР, а праз год гэты паказнік скараціўся да 28 %[6].

Аднаўленне сельскай гаспадаркі, у якой было занята амаль 80 % насельнікаў БССР, праходзіла значна хутчэй, чым прамысловасці. Поспехі ў гэтай галіне забяспечыла захаванне індывідуальных сялянскіх гаспадарак. Вялікія панскія маёнткі

---

[5] Статистический ежегодник. 1923—1924. Минск, 1925. С. 3.

[6] Нарысы гісторыі Беларусі. Ч. 2. С. 88.

былі падзеленыя паміж фальварковай службай і навакольнымі сялянамі. Агулам сялянскім гаспадаркам перадалі больш за 1 мільён гектараў зямлі. Узбуйненне гаспадарак сталася прычынай павелічэння вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі, прызначанай на рынак. Нацыяналізацыя абшарніцкай зямлі ў 1919—1920 гадах палягала ў перадачы яе ў карыстанне сялянам і парабкам. Аднак надзелы зямлі нельга было прадаваць або перадаваць у іншыя рукі, бо новыя гаспадары былі толькі яе карыстальнікамі. Зямля далей заставалася дзяржаўнай уласнасцю. Зямельны кодэкс БССР ад 1923 года даваў права карыстацца зямлёю ўсім грамадзянам рэспублікі, апрача асобаў, якія выкарыстоўвалі ў працы найманую сілу. Згодна з дзейным законам, сяляне, аддаўшы дзяржаве абавязковыя падаткі, маглі свабодна распараджацца лішкамі сваёй вытворчасці. Нормы гэтых паставак да 1928 года не былі надта высокімі і не абцяжарвалі празмерна сялянскія гаспадаркі.

У 1925—1928 гадах у рэспубліцы праводзілася камасацыя* сельскагаспадарчых угоддзяў, якая ліквідавала раздробненасць гаспадарак, што перашкаджала рацыянальнай апрацоўцы зямлі. Узніклыя пасля гэтай рэформы кампактныя гаспадаркі велічынёю на дзесяць і болей гектараў давалі шанец стварэння ў Беларусі сучаснай сельскай гаспадаркі. Аўтара гэтай рэформы наркама земляробства Змітра Прышчэпава пазней абвінавацілі ў спрыянні кулацкім гаспадаркам.

Ва ўмовах гаспадарчага лібералізму эпохі нэпа некаторыя сялянскія гаспадаркі хутка ўзбуйняліся за кошт уласнасці тых сялянаў, якія не вытрымалі канкурэнцыі на рынку і, прадаўшы зямлю, пераязджалі ў гарады, дзе ўладкоўваліся на працу ў прамысловасці. У 1929 годзе на тэрыторыі Беларусі 81 тысяча сельскагаспадарчых работнікаў працавала ў якасці найманай сілы ў багатых сялянаў. Для 34 % іх гэтая праца была адзінай крыніцай утрымання. Уласнікі буйных гаспадарак (да некалькіх дзесяткаў гектараў), імкнучыся ўнікнуць нялюбага ўладам найму рабочай сілы, часта здавалі ў арэнду мала- або беззямельным сялянам частку сваёй зямлі ўзамен за арэндную плату натурай ці грашыма, якая вылічалася прапарцыйна атрыманаму плёну. Тое не было, аднак, масавай з'явай, бо сяляне, якія ў

* Камасацыя — ліквідацыя цераспалосіцы: гаспадар замест некалькіх асобных участкаў зямлі атрымліваў кампактны зямельны надзел у адным месцы.

1920-х гадах мелі буйныя гаспадаркі, складалі нязначны працэнт у структуры сельскагаспадарчай уласнасці БССР.

У 20-х гадах беларускія камуністы вялі палітыку спрыяння развіццю буйных сялянскіх гаспадарак. Напрыклад, зніжалі падаткі для тых сялянаў, якія вырошчвалі сыравіну для прамысловасці — лён, каноплі, цукровыя буракі. Падатковыя льготы давалі таксама сялянам, якія правялі меліярацыю і рабілі капіталаўкладанні дзеля паляпшэння якасці зямлі.

Павелічэнню заможнасці сялянскіх гаспадарак спрыяла ўзнікненне розных сельскагаспадарчых таварыстваў. Ствараліся яны нізамі і былі дазволеныя савецкімі законамі гэтай эпохі. У 1929 годзе налічвалася больш за 3 тысячы розных таварыстваў, якія гуртавалі блізу 340 тысяч сяброў[7]. Гэта былі крэдытныя, меліярацыйныя і машынныя таварыствы, якія ствараліся галоўным чынам дзеля назапашвання сродкаў для інвестыцый у сельскую гаспадарку.

На базе сельскагаспадарчай вытворчасці хутка развівалася харчовая прамысловасць, дзе ў 1929 годзе працавала блізу 30 % работнікаў, занятых у сельскагаспадарчым сектары.

З 1918 года існавалі таксама сельскагаспадарчыя камуны, якія ствараліся на базе зліквідаваных панскіх маёнткаў. Там, куды ў 1919 годзе дайшла польская армія, камуны былі распушчаныя. На ўсходзе Беларусі яны існавалі ў якасці "народных маёнткаў" — супольнасці фальварковай службы, дэмабілізаваных салдатаў, беззямельных і бяздомных сялянаў. Камуны сталіся нерэнтабельнымі, і для іх жыццядзейнасці патрабавалася фінансавая падтрымка дзяржаўнага бюджэту.

У 1927 годзе ўлады пачалі калектывізацыю, выкарыстоўваючы дзеля гэтага адно толькі эканамічныя элементы. Ствараліся саўгасы — дзяржаўныя гаспадаркі, якія мелі паказаць сялянам перавагу працы ва ўмовах сацыялістычнай эканомікі. Паўстала 277 саўгасаў, у якіх знайшлі занятак 15 тысяч працаўнікоў. Саўгасы прынцыпова ствараліся на самых урадлівых землях, на базе былых маёнткаў, забяспечваліся трактарамі і сучаснымі сельскагаспадарчымі машынамі, у іх ствараласа ўся інфраструктура гаспадаркі. Роўнем жыцця і ўмовамі працы рабочых

[7] Белорусская ССР в цифрах: К 10-летию существования БССР (1919—1929). Минск, 1929. С. 410—415.

яны мусілі заахвоціць сялянаў добраахвотна ладзіць калектыўныя гаспадаркі. Некаторыя калгасы ў першых гадах свайго існавання былі нават рэнтабельнымі гаспадаркамі. Аднак неўзабаве выявілася, што без адміністрацыйна-паліцэйскага прымусу правядзенне калектывізацыі ўсё адно немагчымае. Сяляне не былі зацікаўленыя ў ліквідацыі ўласных гаспадарак.

У 1928 годзе лідэр бальшавіцкай партыі і кіраўнік савецкай дзяржавы Іосіф Сталін вырашыў паскорыць працэс індустрыялізацыі краіны. Каб здабыць сродкі на інвестыцыі, быў павялічаны экспарт збожжа. Следам за гэтым павялічваліся нормы абавязковых паставак па коштах, значна ніжэйшых, чым рынкавыя. Супраціў вясковага насельніцтва, якое не хацела задарма аддаваць збожжа, адгукнуўся для яго новай хваляй рэпрэсіяў. Прапагандысцкая кампанія, якая ганьбавала кулацтва, асабліва эксплуатацыю вясковай беднаты, пачалася ўлетку 1928 года і была прэлюдыяй да калектывізацыі вёскі без уліку прынцыпу добраахвотнасці і рэнтабельнасці. Агітацыю праводзілі не толькі функцыянеры бальшавіцкай партыі і камсамола, але і мабілізаваныя на гэта калектывы рабочых, мастакоў, настаўнікаў і літаратараў. Селянін, у якога была добрая гаспадарка, станавіўся сімвалам ліха, эксплуататарства і распусты.

Перыяд нэпа — гэта не толькі лібералізацыя ў гаспадарцы. То быў час нябачанага ні раней, ні пазней развіцця культуры, палітыкі беларусізацыі ўсіх галінаў публічнага жыцця, якая ішла згары. Першапачаткова намаганні беларускіх камуністаў — Аляксандра Чарвякова, Зміцера Жылуновіча, Усевалада Ігнатоўскага — дзеля стварэння адукацыйнай сістэмы на роднай мове разбіваліся аб супраціў бальшавікоў-прыхадняў, якія пераважалі ў дзяржаўных структурах. Нешматлікія беларускія бальшавікі, якія займалі кіраўнічыя пасады ў Менску, успрымалі перамогу савецкай улады як пачатак раўнапраўя культураў народаў Расейскай імперыі. Іх праціўнікі не прызнавалі нацыянальнай самастойнасці беларусаў, выказваліся за захаванне цэласнасці Расеі і былі супраць стварэння беларускай дзяржаўнасці. Беларусы, зрэшты, складалі толькі блізу 20 % сярод сяброў КП(б)Б. Канчаткова праблема развязалася на X з'ездзе РКП(б) у сакавіку 1921 года, на якім Ленін абвесціў свой план новай эканамічнай палітыкі. На з'ездзе з трыбуны прагучалі абвінавачанні, што ў Менску мясцовыя камуністы штучна ствараюць беларускую нацыянальнасць. Нечакана за

беларусаў заступіўся народны камісар па справах нацыянальнасцяў Іосіф Сталін, які ад імя партыйных уладаў заявіў пра беспадстаўнасць абвінавачанняў, бо беларускі народ існуе і карыстаецца сваёй мовай, адрознай ад расейскай, і таму культура беларускага народа можа развівацца толькі на грунце гэтай мовы. У такой сітуацыі сярод бальшавіцкага кіраўніцтва ў Менску нават заўзятыя праціўнікі якіх-колечы саступак на карысць беларусаў мусілі ўлічыць афіцыйную пазіцыю партыі, выкладзеную ў выступленні Сталіна на X з'ездзе. Пад час чарговых канферэнцый і з'ездаў Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі ўжо не ставілася пытанне пра неабходнасць беларусізацыі, а толькі разглядаліся метады яе ажыццяўлення. На VII з'ездзе КП(б)Б у сакавіку 1923 года старшыні Савета Народных Камісараў БССР Аляксандру Чарвякову ўдалося давесці да прыняцця рэзалюцыі, якая сцвярджала, што беларуская мова з'яўляецца адзінай дзяржаўнай мовай на тэрыторыі рэспублікі[8]. Школьныя, універсітэцкія, выдавецкія і навукова-даследчыя ўстановы павінны былі весці працу на беларускай мове. Партыйны апарат, дзяржаўная адміністрацыя і часціны Чырвонай Арміі, якія дыслакаваліся на тэрыторыі Беларусі, мусілі таксама перавесці сваю працу з расейскай мовы на беларускую. Згодна з рашэннем Пленума ЦК КП(б)Б, чыноўнікі дзяржаўнай адміністрацыі і работнікі партыйнага апарату павінны былі звяртацца да грамадзянаў па-беларуску. На практыцы выканаць гэтыя рашэнні было складана, таму ў 1925 годзе паасобным ведамствам былі вызначаныя канчатковыя тэрміны ажыццяўлення пастановаў партыі. Савету Народных Камісараў, Цэнтральнаму Выканаўчаму Камітэту ды ведамствам асветы і сельскай гаспадаркі было загадана на працягу года поўнасцю перайсці на беларускую мову. Двухгадовы тэрмін вызначаны быў ведамствам нутраных справаў і юстыцыі, трохгадовы — для аховы здароўя, фінансаў і ваенных справаў.

На падставе захадаў, прынятых беларускай секцыяй бальшавіцкай партыі, у БССР стваралася шчыльная сетка дзённых і вечаровых курсаў па вывучэнні беларускай мовы. На гэтай мове працавалі школы, тэатры, выдаваліся кніжкі і газеты. У сярэ-

[8] Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК (1918—1927). Минск, 1973. Т. 1. С. 96—97.

дзіне 20-х гадоў беларуская мова заўсёды гучала на мітынгах, арганізаваных уладамі, і на партыйных сходах.

Улады БССР рабілі шматлікія захады для ліквідацыі непісьменнасці і развіцці школьніцтва ўсіх роўняў. У 1921 годзе ў Менску быў адчынены Беларускі дзяржаўны універсітэт, у 1922 — Інстытут беларускае культуры, які ў 1928 годзе быў ператвораны ў Беларускую акадэмію навук. У 1930/31 навучальным годзе працавала 18 педагагічных тэхнікумаў (пачалі стварацца з 1921 года на месцы дарэвалюцыйных настаўніцкіх інстытутаў і семінарыяў). Да 1932 года паўсталі 32 вышэйшыя навучальныя ўстановы. У 1926 годзе палова грамадзянаў умела чытаць і пісаць, а да канца 20-х гадоў непісьменныя складалі менш за 20 % грамадства.

Змянілася таксама стаўленне грамадзянаў расейскай, жыдоўскай і польскай нацыянальнасцяў да беларускай мовы і культуры. Беларуская мова перастала быць сялянскай гаворкай, стала мовай дзяржаўнай. З практычных прычынаў валоданне беларускай мовай рабілася пільнай патрэбай. Аднак згодна з дзейным законам грамадзяне маглі звяртацца да партыйных і адміністрацыйных уладаў на мовах ідыш, польскай і расейскай. У 1926 годзе на тэрыторыі рэспублікі працавала 146 школ з навучаннем на мове ідыш, 118 — на польскай мове і 118 — на расейскай. Настаўнікаў для гэтых школ рыхтавалі Дзяржаўны універсітэт у Менску і некалькі педагагічных інстытутаў[9].

Палітыка беларусізацыі БССР змяніла таксама стаўленне да гэтай дзяржавы палітыкаў, якія ўваходзілі ў склад эміграцыйных структураў Беларускай Народнай Рэспублікі і беларускіх дзеячаў у Польшчы. На савецкія пазіцыі перайшлі амаль усе айчынныя інтэлектуалы, якія раней удзельнічалі ў стварэнні БНР. Яны атрымалі прэстыжныя пасады — загадчыкаў кафедраў Белдзяржуніверсітэта, Акадэміі навук, навуковых, выдавецкіх і літаратурных інстытуцый. Яны стваралі беларускую нацыянальную рэчаіснасць, рабілі тое, пра што марылі, засноўваючы Беларускую сацыялістычную грамаду ды іншыя партыі да 1920 года. Тыя, што засталіся на эміграцыі ў Нямеччыне, Чэхаславакіі і Летуве, мелі толькі кіраўнічыя пасады ў дзяржа-

[9] Запруднік Я. Беларусь на гістарычных скрыжаваннях. Мінск, 1996. С. 92.

ве, якой дэ-факта не існавала, і ніякіх перспектываў уздзеяння на сітуацыю ў краіне. Беларускія дзеячы, якія апынуліся на тэрыторыі II Рэчы Паспалітай, неўзабаве пераканаліся, што атрымаць ад польскіх уладаў якіх саступак на карысць беларускай культуры немагчыма. У палітыкаў Беларускай сялянска-работніцкай грамады былі важныя аргументы за тое, каб зрабіць сваю партыю рухам на карысць аб'яднання беларускіх земляў у рамках савецкай дзяржаўнасці.

Беларускія камуністы дазвалялі эміграцыйным дзеячам, вядомым сваімі антысавецкімі поглядамі, публікавацца на старонках сваіх выданняў. У Менску друкаваліся артыкулы пра падзеі 1917—1920 гадоў, у якіх факты і іх інтэрпрэтацыя не супадалі з бальшавіцкім асвятленнем гэтага перыяду. Улады БССР сістэматычна і ў рознай форме заахвочвалі эмігрантаў вярнуцца ў Беларусь і далучыцца да працы на карысць бацькаўшчыны і нацыянальнай культуры. Чарговы з'езд БПСР у 1924 годзе, які прыняў пастанову пра самароспуск партыі, быў таксама прапагандысцкай акцыяй, якая мела пераканаць беларусаў у замежжы, што няма лепшай дарогі да ажыццяўлення нацыянальных мэтаў, як праз шэрагі бальшавіцкай партыі.

Сярод прыхільнікаў ліквідацыі структураў БНР і далучэння да будовы беларускай савецкай дзяржавы апынуўся Аляксандар Цвікевіч, які з красавіка 1923 года выконваў абавязкі прэм'ер-міністра эміграцыйнага ўрада ў Коўне. Пад час Усебеларускай канферэнцыі, якая адбылася ў Берліне 12—16 кастрычніка 1925 года з удзелам прадстаўніка беларускага савецкага ўрада Зміцера Жылуновіча, Цвікевіч выступіў з тэзісам пра неабходнасць трывалага замацавання Беларусі ў структурах СССР. Сітуацыя беларусаў, якія апынуліся ў межах Польшчы, — казаў Цвікевіч, — паказвае, што для савецкай арыентацыі няма ніякай альтэрнатывы. А існаванне структураў БНР аслабляе і падрывае аўтарытэт беларускага савецкага ўрада[10]. Цвікевіч разам з некалькімі прадстаўнікамі эміграцыйнага ўрада падалі ў адстаўку і пераехалі ў Менск. Экс-прэм'ер быў прызначаны старшынёю Таварыства культурных сувязяў Савецкай Беларусі з замежжам.

---

[10] Іваноў М. Нацыянальная палітыка ў БССР і беларускае зменавехаўства 20-х гадоў // Studia polsko-litewsko-białoruskie. Warszawa, 1988. S. 148—149.

Налета ў Менск на навуковую канферэнцыю прыбыў Вацлаў Ластоўскі, які ў эміграцыйных колах карыстаўся велізарным аўтарытэтам. Улады БССР падрыхтавалі яму спецыяльную праграму знаходжання на радзіме. Пад уражаннем пераменаў, якія здзяйсняліся ў краіне, Ластоўскі намерыўся асталявацца ў Менску. Спачатку ён быў прызначаны дырэктарам Беларускага дзяржаўнага музея, а пасля працаваў неадменным сакратаром Беларускай акадэміі навук. Прыклад Цвікевіча і Ластоўскага заахвоціў шмат каго з беларускіх эмігрантаў вярнуцца на радзіму. Праз колькі гадоў, калі памянялася нацыянальная палітыка Сталіна, яны першыя былі абвінавачаны ў нацыяналізме, варожасці да народа і савецкай улады.

Барацьба супраць "нацыянал-дэмакратызму"

У 1925 годзе з'явіліся першыя спробы замарудзіць працэс нацыянальнага ад' аджэння. У кастрычніку гэтага года на пленуме ЦК КП(б)Б была прынята пастанова "Аб нацыянальнай палітыцы", у якой далейшае працягванне нэпа і звязанае з гэтым развіццё капіталізму ў гаспадарцы прызнавалася немэтазгодным, бо яно ўмацоўвала буржуазную ідэалогію, якая ў Беларусі выяўлялася ростам нацыянал-дэмакратычных настрояў. Гэтая з'ява, сцвярджалася ў пастанове, ахапіла не толькі дробную буржуазію, інтэлігентаў і сялянаў, але і частку камуністаў. Пленум заклікаў партыю на барацьбу дзеля забеспячэння выканання "бальшавіцкай нацыянальнай палітыкі". У 1925 годзе больш за палову партыйнага апарату складалі бальшавікі, якія прыехалі сюды з Расеі. Да гэтай пары, пакуль не было выразных указанняў з Масквы, самі яны не мелі магчымасці прынцыпова памяняць палітыку партыі ў нацыянальных пытаннях.

Рэзалюцыя ЦК КП(б)Б ад сакавіка 1926 года "Аб працы сярод інтэлігенцыі" была чарговым дакументам, які сведчыў пра рэвізію ранейшай палітыкі. У рэзалюцыі сцвярджалася, што далейшая крышталізацыя нацыянал-дэмакратычных настрояў вядзе да адмаўлення інтэлігенцыяй тэорыі класавай барацьбы, зраўнання грамадскага значэння рабочага класа і сялянаў (кулакоў) ды росту беларускага нацыяналізму, асабліва ў дачыненні да нацыянальных меншасцяў. У дакуменце адзначалася

непралетарскае паходжанне беларускай інтэлігенцыі і яе сямейныя сувязі з кулацкім асяроддзем. Асабліва небяспечнай для савецкай улады прызнавалася прысутнасць такой інтэлігенцыі ў кіраўнічых органах КП(б)Б.

У студзені і кастрычніку 1927 года адбыліся два чарговыя з'езды КП(б)Б, якія далі пачатак адкрытаму змаганню з беларускай культурай і інтэлігенцыяй. На студзеньскім — X з'ездзе — прыхільнікі гэтак званай нацыянал-дэмакратычнай плыні, якія выказваліся за захаванне беларускага культурнага аблічча рэспублікі, былі названы шавіністамі і контррэвалюцыянерамі, што ў бальшавіцкай тэрміналогіі абазначала абвінавачанне ў самым вялікім злачынстве супраць савецкай улады. Заўзятым прыхільнікам гэтай акцыі быў першы сакратар ЦК Аляксандар Крыніцкі, які пазней і сам стаў ахвярай сталінскіх рэпрэсій.

Да 1929 года ствараліся толькі ідэалагічныя і прапагандысцкія падставы для расправы над беларускімі інстытуцыямі нацыянальнага жыцця і творцамі беларускай культуры. У траўні 1929 года на загад Сталіна ў Менск прыбыла Цэнтральная камісія партыйнага кантролю Усесаюзнай камуністычнай партыі (бальшавікоў). Пасля двухмесячнага кантролю камісія абвінаваціла кіраўніцтва КП(б)Б у дапушчэнні да грамадскага жыцця эміграцыйных палітыкаў і асобаў, якія раней былі сябрамі "буржуазных" партый, а таксама ў адсутнасці рашучасці ў змаганні з "нацдэмаўшчынай". Сталін не давяраў беларускім камуністам, якія апрача дэкларацый пра асуджэнне інтэлігенцыі на практыцы не рабілі амаль нічога, каб спыніць працэс развіцця нацыянальнага жыцця. Менавіта таму аб "небяспецы", якая пагражала савецкай уладзе ў Беларусі, мусілі заяўляць прысланыя з Расеі і Украіны бальшавікі.

Пастанова пра расправу над беларускім "нацыянал-дэмакратызмам" была прынятая ў Маскве на канферэнцыі Усесаюзнай камуністычнай партыі (бальшавікоў) [ВКП(б)]. Тады быў сфармуляваны загад выкараніць з шэрагаў КП(б)Б хісткіх і няпэўных асобаў, прыхільнікаў дапушчэння да грамадскага жыцця "нацыянал-дэмакратаў". Сталін, намагаючыся зрабіць гаспадарчае, палітычнае і ідэалагічнае жыццё на тэрыторыі ўсяго СССР аднародным, не мог дапусціць існавання якіх-небудзь істотных фактараў, якія б сведчылі пра беларускую адасобленасць. Гэта было б перашкодай на шляху да таталітарнай уніфікацыі, якая пачалася пры канцы 20-х гадоў.

У сярэдзіне 1929 года пачалася нахабная і бязлітасная прапагандысцкая кампанія супраць беларускай інтэлігенцыі. Работнікі Беларускай акадэміі навук і народных камісарыятаў земляробства і асветы былі абвінавачаныя ў прапагандзе нацыяналізму. Многіх адміністрацыйнымі метадамі змусілі пакінуць працу і кіраўнічыя дзяржаўныя пасады.

Арышты творцаў беларускай культуры і арганізатараў нацыянальнага жыцця пачаліся пасля правядзення кадравых зменаў. У студзені 1930 года першым сакратаром ЦК КП(б)Б стаў Канстанцін Гей, які абвінаваціў прыхільнікаў захавання нацыянальнага характару рэспублікі ў імкненні да адбудовы капіталізму, удзеле ў польскай агентуры і спробе штучнага супрацьпастаўлення беларускай культуры расейскай. У чэрвені Дзяржаўнае палітычнае ўпраўленне БССР, якім кіраваў Рыгор Рапапорт, "выкрыла" існаванне контррэвалюцыйнай, антысавецкай арганізацыі — Саюза вызвалення Беларусі. Была гэта першая вялікая правакацыя чэкістаў, накіраваная супроць беларускай інтэлігенцыі. Тады арыштавалі 108 чалавек, галоўным чынам прафесараў Беларускай акадэміі навук і Белдзяржуніверсітэта ў Менску, супрацоўнікаў і кіраўнікоў Наркамата асветы, літаратараў, дырэктараў навуковых і выдавецкіх арганізацый, гісторыкаў і дзеячоў, якія ў 1918—1920 гадах удзельнічалі ў стварэнні Беларускай Народнай Рэспублікі, а таксама арганізатараў беларускага нацыянальнага жыцця ў БССР у 20-х гадах[11]. У ліку арыштаваных апынуліся Вацлаў Ластоўскі, Аляксандар Цвікевіч, Язэп Лёсік, Аркадзь Смоліч, Іван Серада, Антон Баліцкі, Зміцер Жылуновіч, Усевалад Ігнатоўскі, самыя выдатныя прадстаўнікі беларускай літаратуры. Янка Купала, абвінавачаны ў кіраванні гэтай прыдуманай органамі дзяржбяспекі арганізацыяй, спрабаваў скончыць жыццё самагубствам.

Цэнтр Саюза вызвалення Беларусі, паводле бальшавіцкай прапаганды, знаходзіўся ў Беларускай акадэміі навук, і яе прэзідэнта Усевалада Ігнатоўскага абвінавацілі ў кіраўніцтве адной з групаў нацыянал-дэмакратаў. Ігнатоўскі не перанёс прыніжэння і паклёпаў. 4 лютага 1931 года ён скончыў жыццё самагубствам.

---

[11] Васілеўская Н. Абвінавачваецца ў нацыянал-дэмакратызме. Мінск, 1995. С. 46—49; Калубовіч А. "Айцы" БССР і іхны лёс. Кліўленд, 1985. С. 47—48.

У выніку працэсу, які доўжыўся ад снежня 1930 да сакавіка 1931 года, найбольш жорстка былі пакараныя камуністы — канструктары дзяржаўнай палітыкі нацыянальнага адраджэння ў 20-х гадах Зміцер Жылуновіч, Аляксандар Адамовіч, Антон Баліцкі, Пётра Ільючонак, Зміцер Прышчэпаў. Іх асудзілі да 10 гадоў канцэнтрацыйных лагераў. 86 абвінавачаных атрымалі па 3—5 гадоў зняволення або высылкі, а некалькіх асобаў часова апраўдалі. У 1933—1937 гадах у выніку перагляду старых і вынясення новых прысудаў большыня абвінавачаных у прыналежнасці да Саюза вызвалення Беларусі была асуджана да пакарання смерцю.

Расправа з беларускай нацыянальнай элітай адбывалася пад беспасярэднім наглядам Цэнтральнага Камітэта ВКП(б). Падобным чынам вялі змаганне і з украінскай інтэлігенцыяй: гэтым жа часам савецкія органы "выкрылі" ў Харкаве Саюз вызвалення Украіны.

У наступныя гады барацьба з гэтак званым нацыянал-дэмакратызмам перанеслася з Менска на правінцыю, дзе яе спалучалі з уціхамірваннем сялянаў, што супраціўляліся калектывізацыі. Прычынай арышту ў правінцыйным мястэчку магла быць, напрыклад, наяўнасць кніжкі "Гісторыя Беларусі" Усевалада Ігнатоўскага, выдадзеная некалькі гадоў таму, калі яе аўтар быў наркамам асветы БССР.

У рамках змагання з нацыянал-дэмакратызмам абноўленыя кадры Інстытута мовазнаўства Беларускай акадэміі навук распрацавалі новыя прынцыпы правапісу беларускай мовы, зацверджаныя ў жніўні 1933 года Саветам Народных Камісараў БССР. Пад прэтэкстам ачышчэння беларускай мовы ад "буржуазных вульгарызмаў" Акадэмія навук наблізіла да расейскай мовы не толькі правапіс, але і марфалогію з сінтаксісам. Русіфікацыйнаю палёгкай мелася стаць і замена беларускіх словаў расейскімі. Ад 30-х гадоў пачала скарачацца колькасць школ з беларускай мовай навучання, асабліва ў гарадах. У дзяржаўнай і партыйнай адміністрацыі беларуская мова паўсюль замянялася на расейскую.

Калектывізацыя

У 1925 годзе пад час XIV з'езду ВКП(б) Сталін заявіў, што для канчатковай перамогі сацыялізму ў свеце неабходнай з'яўляецца індустрыялізацыя Савецкага Саюза. Мілітарысцкія пла-

ны Сталіна вызначалі галоўныя кірункі развіцця прамысловасці. У асноўным планавалася пашырэнне машынабудавання і металаапрацоўкі, неабходных для тэхнічнага забеспячэння арміі, якая мусіла падтрымоўваць "пралетарскія рэвалюцыі" ў свеце. Планаваныя гіганцкія гаспадарчыя мерапрыемствы патрабавалі мабілізацыі сродкаў унутры СССР, бо крэдыты ад замежнага капіталу, супраць якога планавалася выкарыстаць гэты мілітарны патэнцыял, былі немагчымыя. Падатковы ціск на прыватных прадпрымальнікаў у 1926—1928 гадах неўзабаве давёў гэты сектар гаспадаркі да заняпаду. Шматразовае падвышэнне сялянам нормаў абавязковых паставак збожжа, якое экспартавалася дзеля атрымання валюты, неабходнай для куплі за мяжой машын і абсталявання, давяло да змяншэння зацікаўленасці сялянаў у прадукцыйнасці працы. А гэта ў сваю чаргу адмоўна паўплывала на валавую вытворчасць у сельскай гаспадарцы. Выкананне планаў Сталіна, азначанае чарговымі пяцігодкамі, патрабавала ўвядзення прынцыпу дармовай працы, рабскай сістэмы, хуткага перамяшчэння рабочай сілы па ўсёй тэрыторыі СССР на загад кіраўнічых цэнтраў, якія каардынавалі бальшавіцкую гаспадарчую стратэгію.

У 1930—1940 гадах у Беларусі паўстала больш за тысячу новых прадпрыемстваў, сярод якіх блізу 400 працавала на ваенна-прамысловы комплекс Савецкага Саюза. Вытворчасць астатніх толькі часткова прызначалася для спажывецкіх мэтаў. Большасць была зарыентаваная на рэалізацыю чарговых інвестыцый або замарожвалася ў якасці мілітарных рэзерваў.

Другой мэтай індустрыялізацыі апрача пабудовы ваенна-прамысловага комплексу была змена структуры грамадства шляхам павелічэння колькасці рабочага класа за кошт нялюбага камуністам сялянства. На працягу дзесяці гадоў індустрыялізацыі колькасць рабочых у Беларусі павялічылася ў тры разы. У 1939 годзе рабочыя разам з сем'ямі складалі 22 % жыхароў рэспублікі. Гэта былі перш за ўсё сяляне, якіх выгнала з вёсак палітыка калектывізацыі.

Становішча рабочага класа ў СССР у перыяд індустрыялізацыі — адна з найгорш вывучаных тэмаў. За вялікім прапагандысцкім матэрыялам амаль не відаць праўды. Нізкія заробкі рабочых у БССР змушалі жанчын таксама займацца цяжкою працай. Ім перш за ўсё прапаноўваліся месцы ў галіне машынабудавання і металаапрацоўкі. Камуністычная прапаганда

стварыла асаблівую мадэль раўнапраўя і эмансіпацыі савецкай жанчыны, якая працуе ў традыцыйна мужчынскіх прафесіях. Жанчына з кавальскім молатам або за рулём калгаснага трактара сімвалізавала роўнасць савецкіх грамадзян у доступе да ўсіх прафесій. Такім спосабам рыхтавалі кадры для прамысловасці ў выпадку абвяшчэння ўсеагульнай мабілізацыі.

Раптоўны наплыў вясковага насельніцтва ў гарады ў 30-х гадах выклікаў вялікія жыллёвыя праблемы. Новых рабочых пасялялі ў бараках, дзе ў адным памяшканні найчасцей кватаравалі па дзве сям'і. Пры шырокай сістэме пастаяннага нагляду за грамадзянамі гэта забяспечвала органам НКВД поўны кантроль пралетарскага асяроддзя.

У перыяд сталінскай мадэрнізацыі савецкай гаспадаркі ў 30-х гадах найболей пацярпела сялянства. Калектывізацыя стала другім этапам грамадзянскай вайны, якую гэтым разам вялі супраць самай вялікай групы ўласнікаў. У Беларусі калектывізацыя пачалася пры канцы 1929 года. Бальшыня беларускіх камуністаў, у іх ліку народны камісар земляробства Зміцер Прышчэпаў, не былі прыхільнікамі сталінскай сельскагаспадарчай рэформы. З гэтае прычыны калектывізацыя дасягнула пэўных тэмпаў толькі пасля іх арышту і прысуду за спрыянне "нацыянал-дэмакратызму". У сярэдзіне 1929 года толькі 1,4% сельскагаспадарчых угоддзяў належала калгасам і саўгасам. Да канца года гэты паказнік павялічыўся да 10 % — у выніку добраахвотнай перадачы сялянамі зямлі ў саўгасы. На працягу некалькіх месяцаў савецкая прапаганда здолела пераканаць частку сялянаў у тым, што праца ў саўгасах будзе лягчэйшая і больш прыбытковая, чым на ўласных гаспадарках.

Ад пачатку 1930 года новыя камісары БССР, якімі былі прысланыя з Масквы дзеячы або падвышаныя мясцовыя партыйныя актывісты, шчыра выконвалі самыя абсурдныя дырэктывы Крамля. У лютым 1930 года Бюро ЦК КП(б)Б пастанавіла калектывізаваць да веснавой сяўбы 80 % сялянскіх гаспадарак. Такі быў адказ бальшавікоў — кіраўнікоў Беларусі на пастанову ЦК ВКП(б) "Аб тэмпе калектывізацыі і мерах дапамогі дзяржавы калгаснаму будаўніцтву"[12]. Новыя ўлады БССР намерва-

[12] Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Минск, 1984. Т. 2. С. 190—194.

ліся за месяц поўнасцю змяніць структуру зямельнай уласнасці на тэрыторыі рэспублікі і дасягнуць такіх тэмпаў калектывізацыі, якіх нават не чакаў маскоўскі цэнтр. Шляхам гвалту і тэрору да сакавіка 1930 года было канфіскавана 58 % сялянскай зямлі. Разам з зямлёй канфіскоўвалі ўсю жывёлу — коней, кароў, свіней і нават свойскую птушку. Натуральнай рэакцыяй сялянаў сталі масавы зарэз жывёлы ды хаванне запасаў мяса. Улады трактавалі такія паводзіны як праяву кулацкай контррэвалюцыі, што пацягнула за сабой усе наступствы, якія вынікалі з прынятых уладамі надзвычайных мераў.

Рэквізаваную сялянскую жывёлу ў саўгасах і калгасах таксама масава рэзалі з прычыны адсутнасці корму і адпаведных будынкаў. У першыя тры месяцы 1930 года БССР страціла чвэрць усяго пагалоўя коней, кароў і свіней. Шэсць тысяч сялянаў, якія пратэставалі супраць калектывізацыі, былі высланыя ў Сібір. Далейшая калектывізацыя ў гэтакім тэмпе пагражала развалам савецкай гаспадаркі і таму на пачатку красавіка 1930 года ў маскоўскай "Праўдзе" з'явіўся артыкул Сталіна, у якім партыйныя актывісты абвінавачваліся ў "здрадзе бальшавіцкім прынцыпам па аграрным пытанні". Сталін асуджаў прымус і адсутнасць усведамлення сялянамі мэтазгоднасці калектывізацыі. Крыху пазней, спасылаючыся на павучанні Сталіна, у памылках і "перагібах" прызнаўся Цэнтральны Камітэт ВКП(б). Кампанія асуджэння метадаў і людзей, якія прычынілі шкоду сельскай гаспадарцы на пачатку 1930 года, выклікала непрадугледжаную бальшавікамі з'яву. Сяляне і партыйны апарат у глыбінцы ўспрынялі яе як санкцыю на выхад з калгасаў і саўгасаў. У красавіку і траўні больш за 370 тысяч раней калектывізаваных гаспадарак вярнулася ў валоданне да сялянаў. У чэрвені дзяржаве або сельскагаспадарчым камунам у Беларусі належала толькі 11 % угоддзяў. Толькі пагалоўе свойскай жывёлы немагчыма было гэтак жа хутка аднавіць.

Савецкая ўлада, аднак, не адмовілася ад калектывізацыі і намерылася ажыццявіць яе метадамі, якія не руйнавалі ўсёй гаспадаркі. Летам зноў пачалі заганяць сялянаў у калгасы. Спачатку складаўся спіс інвентару, які потым рэквізаваўся разам з зямлёй. У снежні 1930 года працэнт калектывізаванай зямлі павялічыўся да 15 %, галоўным чынам за кошт найбольшых і самых прадукцыйных гаспадарак, а ў наступным годзе — да

50 %. У ліпені 1931 года ЦК КП(б)Б прызначыў канчатковы тэрмін завяршэння калектывізацыі беларускай вёскі — снежань 1932 года. XIV з'езд партыі бальшавікоў Беларусі назваў калгаснікаў галоўнай апорай савецкай улады[13].

Разам з хадою калектывізацыі нарастаў супраціў сялянаў, якія стараліся абараніць сваю маёмасць. Многія земляробы ўжо мелі нагоду спазнаць умовы жыцця і працы калгаснікаў. Таму яны бараніліся ад лёсу, на які асудзіла іх савецкая ўлада. У 1932 годзе, нягледзячы на безупынны націск уладаў, плошчы калгаснай і саўгаснай зямлі не павялічыліся. Для ажыццяўлення планаў бальшавіцкай партыі патрабаваліся іншыя захады. Ад 1933 года пачалі пераследваць аднаасобнікаў. Іх падвяргалі штрафам з розных надуманых прычынаў, ператрусам. Гэтакія метады змусілі частку сялянаў уступіць у калгасы або ўцячы ў горад, але былі заслабым стымулам, каб зрабіць гэтыя з'явы масавымі.

Разам з правядзеннем калектывізацыі хутка паніжалася прадукцыйнасць сельскагаспадарчай вытворчасці як у галіне вырошчвання збожжавых культур, так і ў жывёлагадоўлі. Дзяржава, ажыццяўляючы план развіцця машынабудаўнічай прамысловасці, патрабавала дармовых харчоў. Часта ад калгасаў забіралі нават тое зерне, якое прызначалася на сяўбу. Заробкі калгаснікаў, якія выдавалі пераважна натурай, не дазвалялі селяніну пракарміць сям'ю, пазбаўленую кавалка сваёй зямлі. Таму крадзеж харчоў стаў масавай з'явай. Каб спыніць празмернае змяншэнне нацыяналізаванай маёмасці, 7 жніўня 1932 года Савет Народных Камісараў СССР прыняў пастанову "Аб ахове маёмасці дзяржаўных прадпрыемстваў, калгасаў і кааперацыі і ўмацаванні грамадскай (сацыялістычнай) уласнасці", якую падпісаў Сталін. Згодна з пастановай савецкага ўрада, за крадзеж калгаснай уласнасці суды павінны былі асуджаць вінаватых да расстрэлу з канфіскацыяй ўсёй маёмасці. У паасобных выпадках кару змякчалі, але мінімальны прысуд не мог быць меншы за 10 гадоў турэмнага зняволення. Прысуды да вышэйшай меры пакарання выносіліся за крадзеж нават некалькіх каласкоў збожжа на дзяржаўным полі, таму пастанову бальшавіцкіх камісараў паўсюль называлі "законам пяці кала-

[13] Победа колхозного строя в Белорусской ССР. Минск, 1981. С. 201.

соў". У адпаведнасці з гэтым законам у Беларусі ў 1933—1934 гадах засуджаных было амаль 11 тысяч чалавек.

Паралельна з уступленнем у сілу "закону пяці каласоў" былі павялічаныя зборы харчоў з калгасаў і аднаасобнікаў. Грамадскі кошт сталінскай аграрнай рэформы ў Беларусі быў папраўдзе меншы, чым у Расеі і Украіне, дзе ад голаду памерла некалькі мільёнаў чалавек, аднак і тут пацярпелі некалькі тысяч ахвяраў, а метады калектывізацыі шматлікіх яшчэ ўпартых сялянскіх аднаасобных гаспадарак сталі больш жорсткімі. Згодна з указаннямі бальшавіцкага кіраўніцтва, дзеля паскарэння калектывізацыі ў вёскі былі накіраваныя найбольш фанатычныя партыйныя работнікі і камсамольцы — прадстаўнікі рабочага класа. Яны прызначаліся на кіраўнічыя пасады ў калгасах і саўгасах і карысталіся шырокімі паўнамоцтвамі як, напрыклад, правам накіроўваць у суд зыскі з патрабаваннем пакараць абвінавачаных у парушэнні савецкага заканадаўства. Іх агратэхнічныя веды былі надта сціплыя, а распараджэнні часта супярэчылі прынцыпам рацыянальнага гаспадарання.

Дзеля ўдасканалення працэсаў калектывізацыі на раённым роўні былі створаны палітычныя аддзелы КП(б)Б, якія меліся наглядаць за ўсімі ўстановамі, абавязанымі спрыяць арганізацыі калгасаў. У снежні 1934 года больш за 72 % зямлі належала калгасам, а на год пазней — 85 %. У выніку гэтага рэфармавання ўраджайнасць збожжа з аднаго гектара на калгасным полі ўпала ў 1936 годзе да 4,5 цэнтнера. Масавыя рэпрэсіі ахапілі самых багатых і найбольш прадпрымальных сялянаў. Высылка іх ў канцэнтрацыйныя лагеры толькі адмоўна паўплывала на харчовы баланс краіны. У 1939 годзе 10 % сельскагаспадарчых угоддзяў усё яшчэ знаходзілася ва ўладанні аднаасобных сялянскіх гаспадарак.

У 1937—1938 гадах калгаснікам былі выдзеленыя невялікія зямельныя ўчасткі для вырошчвання бульбы і гародніны. Ураджай з гэтых участкаў не аднойчы дазваляў праіснаваць сялянскім сем'ям. Заробак калгаснікаў у 1928 годзе складаў 12 рублёў і быў у тры разы меншы за аклад рабочых у прамысловасці.

Калектывізацыя давяла да таго, што юрыдычнае становішча сялянаў нагадвала сітуацыю да адмены прыгонніцтва ў Расейскай імперыі ў 1861 годзе. Бальшавікі напрыканцы 30-х гадоў вярнулі амаль усе элементы расейскага феадальнага права. Ся-

ляне былі пазбаўленыя права на зямлю, пашпартоў, права на свабодную змену месца жыхарства. Іх тысячамі вывозілі ў вызначаныя месцы прымусовай працы. Розніца палягала толькі ў тым, што гаспадарамі іхнага лёсу былі не феадалы, а толькі суды, якія аб'яўлялі прысуды "ад імя працоўнага народа гарадоў і вёсак".

У сацыялізм — праз Курапаты

Рэпрэсіі і генацыд 30-х гадоў у Беларусі, як і на тэрыторыі ўсяго СССР, мелі дактрынёрскі характар і былі вынікам самой сутнасці марксісцка-ленінскай тэорыі класавай барацьбы. Беларусь, у якой амаль 90 % насельніцтва складалі сяляне, аб'ектыўна рабілася аб'ектам бальшавіцкага гвалту. Пазбаўленне ўласнасці такой вялікай колькасці ўласнікаў не магло абысціся без ахвяраў. На XVII з'ездзе ВКП(б) у лютым 1934 года Сталін зрэшты не хаваў, што рэпрэсіі і гвалт могуць стаць элементам сацыялістычнага будаўніцтва. Больш за тое, ні індустрыялізацыя, ні калектывізацыя не ажыццявіліся б без папярэдняга ўсталявання таталітарнай сістэмы.

У снежні 1934 года пастановай Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта СССР былі ўведзеныя новыя прынцыпы следства супраць абвінавачаных у тэрарызме. Хто ёсць тэрарыстам і які ўчынак лічыць тэрактам — вызначалі функцыянеры Народнага камісарыята нутраных спраў (НКВД). "Тэрарыстаў" судзіла спецыяльная камісія ў структурах НКВД. Час следства быў скарочаны да 10 дзён, а прысуд выконвалі неадкладна. У 1937 годзе такія ж прынцыпы дастасоўвалі да асобаў, абвінавачаных у дыверсіі і шкодніцтве савецкай уладзе. Узрост асуджаных, якіх можна было пакараць смерцю, паніжаўся да 12 гадоў. Функцыянеры НКВД атрымалі права катаваць падазроных у шкодніцтве. Данос пра антысавецкія сімпатыі быў дастатковай падставай, каб асудзіць чалавека да пакарання смерцю.

Беларусь была толькі адной з многіх рэспублік, праз якую пракацілася хваля нечуванага гвалту і злачынстваў, пад якую часта траплялі зусім выпадковыя ахвяры. У 1937—1938 гадах работнікаў НКВД узнагароджвалі ордэнамі і падвышалі па службе за колькасць выяўленых "ворагаў народа". Аддзяленні НКВД спаборнічалі паміж сабою ў забойствах людзей, якіх пазбаўлялі жыцця без судовага разбору і зачытання ім абвінаваў-

чага прысуду. У Курапацкім лесе пад Менскам у 1937—1941 гадах, паводле розных ацэнак, было забіта ад 100 да 250 тысяч чалавек. Ахвярамі ў большасці сталі сяляне Меншчыны і зняволеныя з усёй Беларусі, якія трапілі ў кіпцюры менскага НКВД. Людзей забіралі з дамоў уначы і пасля занясення ў спіс "ворагаў народа" везлі на расправу ў Курапацкі лес[14].

У 1937—1938 гадах расстрэльвалі амаль усіх, хто меў хоць якое дачыненне да беларускага нацыянальнага руху, асветы, навукі, культуры. Загінулі ўсе раней абвінавачаныя ў прыналежнасці да Саюза вызвалення Беларусі. Гэтым разам іх абвінавацілі ў шпіянажы на карысць Польшчы. Страцілі жыццё 90 % работнікаў Беларускай акадэміі навук, большасць выкладчыкаў Дзяржаўнага універсітэта ў Менску, работнікаў Тэатра оперы і балета, Дзяржаўнай філармоніі. Загінулі амаль усе арганізатары беларускага палітычнага, навуковага і культурнага жыцця 20-х гадоў. З 238 беларускіх літаратараў эпоху Сталіна перажылі толькі 20 творцаў. З бібліятэк была выключана большасць літаратурных твораў на беларускай мове.

Ад тэрору не ўсцерагліся таксама галоўныя каты і арганізатары масавых рэпрэсій у Беларусі. У красавіку 1939 года ваенны трыбунал войск НКВД СССР Беларускай акругі асудзіў да пакарання смерцю шэраг высокапастаўленых супрацоўнікаў гэтага ведамства на тэрыторыі Беларусі — Стаяноўскага, Каўфмана, Ягодзіна. Расстралялі і былых наркамаў нутраных спраў БССР Закоўскага, Бермана, Наседкіна — тых, хто стваралі ідэалагічную і прапагандысцкую аснову для бальшавіцкага тэрору.

Невядома, колькі жыхароў БССР страцілі жыцці ў 1937—1941 гадах, колькі магіл, гэтакіх, як у Курапатах, з'явілася тады на тэрыторыі рэспублікі. Колькі людзей жыло на гэтым абшары ў чэрвені 1941 года, калі пачалася нямецка-савецкая вайна, — таксама невядома.

---

[14] Курапаты. Менск. 1994. С. 10—26.

Раздзел 4

Беларусы ў II Рэчы Паспалітай

Грамадства і гаспадарка

Паводле перапісу насельніцтва 1921 года, у Польшчы на тэрыторыі Беластоцкага, Наваградскага, Палескага і Віленскага ваяводстваў пражывалі 1,035 млн беларусаў. Ніхто, аднак, з сур'ёзных гісторыкаў ні ў міжваенны перыяд, ні пазней не лічыў гэты лік праўдзівым. Дзяржаўныя ўлады імкнуліся паказаць польскі характар земляў, размешчаных на захад ад рыжскай мяжы, таму ў часе перапісу рабіліся розныя маніпуляцыі, каб паказаць там як найменшую колькасць беларускага насельніцтва. Паводле польскага гісторыка Анджэя Жарноўскага, у II Рэчы Паспалітай жыло блізу 1,7 млн беларусаў[1]. Паводле падлікаў Ежы Тамашэўскага, на тэрыторыі чатырох паўночна-ўсходніх ваяводстваў было сама меней 1,95 млн чалавек беларускай нацыянальнасці, у тым ліку ў Палескім ваяводстве — 654 тысячы, Наваградскім — 616 тысяч, Віленскім — 407 тысяч, Беластоцкім — 269 тысяч[2].

Гэтаксама як і ў БССР, сярод беларусаў, што жылі ў польскай дзяржаве, пераважную большасць складала сялянства. Больш за 90 % беларускага насельніцтва ўтрымлівалася з працы на зямлі. Для 7 % крыніцай утрымання была наёмная праца. Работнікі беларускай нацыянальнасці звычайна выконвалі працу, якая не патрабавала кваліфікацыі, — у сельскай гаспадарцы, рыбалоўстве, лесаводстве або ў якасці хатняй прыслугі. Пасадаў лепей аплатных, але якія патрабавалі пэўнай адукацыі, беларусы звычайна не атрымлівалі. У некаторых галінах гаспадаркі, асабліва кантраляваных дзяржавай (напрыклад на транспарце, у сувязі, грамадскіх установах), — беларусаў не бралі на працу з палітычных меркаванняў: адміністрацыя баялася з іх боку сабатажу або дыверсійных дзеянняў.

Прамысловасць на тэрыторыі чатырох паўночна-ўсходніх вая-

---

[1] Żarnowski A. Społeczeństwo Drugiej Rzeczypospolitej 1918—1939. Warszawa, 1973. S. 373.

[2] Tomaszewski J. Robotnicy Białorusini w latach 1919—1939 w Polsce // Acta Baltico-Slavica. 1967. S. 94—95, 105.

водстваў была цесна звязаная з сельскай гаспадаркай. Тут працавала 149 спіртзаводаў, 8 бровараў, 27 крухмальных заводаў, 44 смалакурні, 87 цагельняў, 34 малочныя заводы, 298 млыноў, 82 тартакі. Былі гэта невялікія прадпрыемствы, на якіх сацыяльнае заканадаўства ўжывалася толькі ў сімвалічных памерах. Формы працы і заробкі рабочым вызначаліся паводле меркавання працадаўцы.

Беларусы складалі самую вялікую групу работнікаў у абшарніцкіх маёнтках. Найчасцей працавалі там цэлымі сем'ямі. Жонка даіла кароў, даглядала жывёлу, дзеці пасвілі свіней або выконвалі іншыя хатнія і палявыя работы. Наўзамен уладальнік маёнтка даваў ім прытулак, кавалак зямлі для вырошчвання бульбы, іншай гародніны ды плаціў натураю — малаком і свойскай птушкай. Ва ўмовах адсутнасці іншай працы беззямельныя сяляне найчасцей былі поўнасцю залежныя ад працадаўцы.

Большасць работ на палях, сенажацях, у лясах выконвалі сезонныя работнікі, найчасцей навакольныя сяляне, якія такім спосабам зараблялі грошы, каб заплаціць падатак, або адрабляліпазычаную ў пана муку, збожжа, бульбу, нястача якіх, асабліва напрадвесні, была паўсюднай з'явай.

Рамеснікі і дробныя гандляры беларускага паходжання гуртаваліся галоўным чынам у пасёлках і малых мястэчках. Рамяство звычайна дапаўняла іхныя даходы з невялікай гаспадаркі. У кожнай вёсцы былі таксама сяляне, якія апрача працы на сваёй гаспадарцы выконвалі кавальскія, сталярскія, цяслярскія, кравецкія, ткацкія, шавецкія паслугі.

Беларуская інтэлігенцыя на абшары чатырох паўночна-ўсходніх ваяводстваў II Рэчы Паспалітай была нешматлікай. Адсутнічалі ўмовы, якія спрыялі б росту гэтай грамадскай групы. З палітычных матываў беларусаў вельмі рэдка бралі на працу ў адміністрацыю ды іншыя дзяржаўныя ўстановы. Беларускае школьніцтва існавала толькі ў сімвалічных памерах. Магчымасці паступаць у польскія сярэднія школы і вышэйшыя навучальныя ўстановы былі для беларускай моладзі абмежаваны фінансавымі абставінамі. Таму гэтая грамадская праслойка з цягам часу скарачалася. Частка беларускай інтэлігенцыі шукала паратунку, ўладкоўваючыся на працу ў гандлі і дробнай вытворчасці або выконваючы працу, характэрную для ніжэйшых пластоў грамадства. Многія займаліся палітыкай, мерка-

валі скінуць лад, які давёў іх да прыніжанага становішча. Уплыў беларускай інтэлігенцыі на сялянства тады быў невялікі, бо не існавала для такога ўздзеяння інстытуцый ў выглядзе школаў, друку, культурных установаў.

Беларускія абшарнікі складалі зусім нешматлікую групу. На тэрыторыі чатырох паўночна-ўсходніх ваяводстваў 84,4 % маёнткаў належалі палякам і толькі 4,1 % — беларусам. У Беластоцкім ваяводстве беларусамі былі толькі 2,4 % уладальнікаў маёнткаў (мелі больш за 50 гектараў зямлі), у Віленскім — 8,2 %, Навагрудскім — 8,2 %, Палескім — 17,8 %. Абшарніцкая ўласнасць складала значную частку ў аграрнай структуры згаданых ваяводстваў. У Палескім ваяводстве яна займала 50,8 % зямельнай плошчы, у Навагрудскім — 35,1 %, Віленскім — 32 %, Беластоцкім — 18,1 %[3].

Самыя вялікія маёнткі налічвалі па некалькі дзесяткаў тысяч гектараў.

Вялікую частку плошчы на гэтай тэрыторыі (больш за 40 %) займалі непрыдатныя землі, пашы, лясы, балоты. Такой аграрнай структуры спадарожнічалі архаічныя метады гаспадарання. У сялянскіх гаспадарках зямлю апрацоўвалі гэтакімі ж спосабамі, як і стагоддзі таму. Абшарнікі значную частку сваёй зямлі здавалі ў арэнду за частку ўраджаю. Грошы ў гэтых выпадках ужываліся рэдка. Рэліктам мінулага былі таксама сервітуты*. Аднак для мала- і беззямельных сялянаў яны давалі шанец утрымоўваць некалькі свіней ці кароў. Таму ў ліквідацыі гэтага права былі зацікаўленыя толькі больш-менш заможныя сяляне і ўладальнікі фальваркаў. Для іх пэўную вартасць мелі галоўным чынам лясныя сервітуты, якія дазвалялі прадаваць драўніну.

Ровень тэхнікі і ўраджай ў Заходняй Беларусі былі самымі нізкімі ў Польшчы. Па вёсках панавала амаль натуральнае гаспадаранне. Сяляне большасць патрэбных у штодзённым жыцці рэчаў выраблялі самі: бялізну, вопратку, абутак, сельскагаспадарчыя прылады, хатняе абсталяванне, посуд. Льняное па-

[3] Roszkowski W. Gospodarcza rola większej własności ziemskiej w Polsce 1918—1939. Warszawa, 1986. S. 49—57.

* Сервітуты — права сялянаў карыстацца панскімі ўгоддзямі, якія раней былі абшчыннымі землямі.

латно — асноўны матэрыял для шыцця вопраткі — ткалі амаль у кожнай хаце. У якасці летняга абутку паўсюль насілі лыкавыя лапці. Асноўнымі харчовымі прадуктамі былі капуста, бульба і хлеб, які пяклі з мукі, змеленай у жорнах. Ужывалі соль найгоршага гатунку, а цукар быў рэдкасцю ў сялянскай хаце і ўсюды замяняўся сахарынам, які кантрабандысты перапраўлялі ў Польшчу праз летувіскую мяжу. Разнастаіла небагатае сялянскае меню рыба, якая ў вялікай колькасці вадзілася тут у шматлікіх рэках і рэчках, азёрах, сажалках. Ураджай з 5—10-гектарнай гаспадаркі з цяжкасцю дазваляў пратрымацца звычайна шматлікай сялянскай сям'і. Голад на гэтай тэрыторыі, асабліва ў пераджніўны час, пастаянна спадарожнічаў насельніцтву.

Грошы ў тагачаснай гаспадарцы не іграліе вялікае ролі. Яны былі патрэбныя для аплаты падаткаў і куплі неабходных тавараў: запалак, газы, солі. Асноўным капіталам былі зямля і жывёла. Калі сялянам патрабаваліся грошы, тады яны прадавалі каня або карову, у крайнім выпадку — кавалак зямлі[4].

Прагматыкі і партызаны

Грамадскія, палітычныя, эканамічныя і нацыянальныя дачыненні на тэрыторыі чатырох паўночна-ўсходніх ваяводстваў стваралі атмасферу калоніі. Метады польскага кіравання на землях, населеных беларусамі, ад самага пачатку не спрыялі ўсталяванню карэктных стасункаў паміж дзяржаўнай уладай і мясцовым насельніцтвам. Разам з замацаваннем дзяржаўных структураў пачалася ліквідацыя беларускага школьніцтва, разбурэнне або адбіранне цэркваў, пераслед падазроных у спрыянні камунізму. У Польшчы перамагла нацыянал-дэмакратычная канцэпцыя нацыянальнай палітыкі, і на практыцы сталі ажыццяўляцца найгоршыя і самыя брутальныя метады асіміляцыі славянскіх меншасцяў. Ва ўмовах парламенцкага кіравання (1921—1926), аднак, не рэалізавалася ніводная кампактная праграма нацыянальнай палітыкі. Гэтыя пытанні належалі да кампетэнцыі чатырох ведамстваў: Міністэрства нутраных спраўў, Міністэрства вайсковых спраўў, Міністэрства замежных

[4] Tomaszewski J. Z dziejów Polesia. Zarys stosunków społeczno-ekonomicznych. Warszawa, 1963. S. 69—73.

справаў і Міністэрства веравызнанняў і публічнай асветы. За гэты перыяд дзесяць разоў змяніліся ўрады, а кіраўнікі названых ведамстваў мяняліся яшчэ часцей. Таму палітыка на паўночна-ўсходніх крэсах вызначалася перш за ўсё лакальнай адміністрацыяй, якая лічыла беларусаў элементам ніжэйшай катэгорыі, адсталым, прымітыўным, які лёгка можна апалячыць. Адміністрацыйныя кадры папаўняліся чыноўнікамі з цэнтральных ваяводстваў. У Беларусь часта прысылалі людзей, якія не праявілі сябе на папярэдняй пасадзе або скампраметавалі. Гэтая адміністрацыя ажыццяўляла перш за ўсё такую палітыку, якой чакалі мясцовыя абшарнікі і якая не заўсёды адпавядала інтарэсам польскай дзяржавы.

Тым часам, каб зменшыць грамадскую напругу, патрэбавалася аграрная рэформа. Аднак кожнае дзеянне ў гэтым кірунку скарачала б памеры ўласнасці, якая заставалася ў польскіх руках. Таму на аснове закона ад 20 снежня 1920 г. сюды прывезлі пасяленцаў з цэнтральнай часткі Польшчы — асаднікаў. Перасяляліся галоўным чынам былыя жаўнеры і афіцэры, якіх надзялялі зямлёй і падтрымоўвалі крэдытамі на асваенне гаспадаркі. Асаднікі меліся ўплываць на беларускае асяроддзе ў кірунку яго асіміляцыі, быць апірышчам мясцовай адміністрацыі і тым фактарам, які тармазіў бы антыдзяржаўныя выступленні. Асаднікі найчасцей выконвалі абавязкі солтысаў, войтаў, лаўнікаў (засядацеляў). Часта на новае месца жыхарства яны прыязджалі з пісталетам або карабінам. Калі патрабавалася — абавязаныя былі дапамагаць войску, паліцыі, лясной ахове, браць удзел у аблавах на партызанаў.

Каланізацыя "крэсаў", паводле планаў дзяржаўных уладаў, мела на мэце аб'яднаць іх з Польшчай, зменшыць зямельны голад у цэнтральных рэгіёнах краіны, стварыць адпаведныя тылы на выпадак канфлікту з СССР. Але хоць на беларускія землі і перасялілі некалькі дзесяткаў тысяч людзей, палітычныя і гаспадарчыя вынікі асадніцтва былі малазначныя. Асаднікі не змянілі нацыянальнага аблічча гэтага рэгіёна. Іх прысутнасць даводзіла часам толькі да напругі ў дачыненнях з мясцовым беларускім насельніцтвам.

Пасля падпісання Рыжскай мірнай дамовы ўлады хутка давялі да заняпаду беларускае школьніцтва на Віленшчыне. Урад спыніў фінансавую падтрымку, бо існаванне гэтых школаў палі-

чыў супярэчным інтарэсам дзяржавы. Пад уплывам агітацыі польскіх нацыяналістычных груповак у беларусаў забралі большасць асветных установаў. У іншых ваяводствах беларускія школы былі зліквідаваныя на пачатку 1921 года.

Беларускія палітыкі не маглі прымірыцца з той рэчаіснасцю, якую на населенай беларусамі тэрыторыі стваралі польскія ўлады. Дзеячы, раней звязаныя з Найвышэйшай Радаю — Браніслаў Тарашкевіч, Антон Луцкевіч, Сымон Рак-Міхайлоўскі, ксёндз Адам Станкевіч, Аркадзь Смоліч, Лявон Дубейкаўскі, Эдуард Будзька, Фабіян Ярэміч — лічылі, што ва ўмовах няспраўджаных нацыянальных памкненняў, паразы ў галіне пабудовы сваёй дзяржавы і падзелу Беларусі трэба прынамсі шукаць магчымасці для захавання беларускай нацыі. Яны зыходзілі з таго, што змаганне з польскай дзяржавай можа толькі пагоршыць сітуацыю беларусаў і ў гэтых умовах самым галоўным павінна быць асветная праца сярод люду — змаганне за асвету на роднай мове, стварэнне вытворчых кааператываў, удзел у парламенцкіх выбарах. Браніслаў Тарашкевіч быў перакананы, што парламентарызм і польская дэмакратыя створаць беларусам магчымасць паўнакроўнага нацыянальнага жыцця[5]. Прыхільнікі пошукаў пагаднення з палякамі называлі сябе рэалістамі і прагматыкамі. Увесну 1921 года яны стварылі Беларускі палітычны камітэт (БПК), які змагаўся з уплывамі эміграцыйнага ўрада Вацлава Ластоўскага на тэрыторыі Рэчы Паспалітай. Камітэт быў неафіцыйнай арганізацыяй. Інтарэсы гэтай групы афіцыйна прадстаўляў віленскі Беларускі нацыянальны камітэт (БНК).

У сакавіку 1922 года дэлегацыю Беларускага палітычнага камітэта на чале з Тарашкевічам прыняў кіраўнік дзяржавы Юзаф Пілсудскі і прэм'ер-міністр Антоній Панікоўскі. Беларусы азнаёмілі галоўных асобаў дзяржавы з планам у галіне развіцця асветы на роднай мове. Яны патрабавалі стварыць пры Міністэрстве асветы ўстанову па справах беларускага школьніцтва, вылучыць Віленскай беларускай гімназіі датацыю, адкрыць беларускую настаўніцкую семінарыю ды ахапіць усіх беларускіх дзяцей навучаннем на роднай мове. Аднак польскія ўлады не мелі чаго прапанаваць беларусам апрача галантнасці і абяцанняў пацікавіцца справамі беларускай асветы.

---

[5] Тарашкевіч Б. Аўтабіяграфія // Спадчына. 1996. № 4. С. 111.

У красавіку 1922 года дзеячы Беларускага палітычнага камітэта заснавалі Палітычную камісію, якую складалі Браніслаў Тарашкевіч, Антон Луцкевіч і Вячаслаў Багдановіч. Камісія мелася распрацаваць прынцыпы працы афіцыйнага Беларускага нацыянальнага камітэта на глебе польскай дзяржаўнасці, а найперш — падрыхтоўкі да парламенцкіх выбараў. Адпаведна сваім перакананням дзеячы БПК хацелі змагацца за беларускія нацыянальныя інтарэсы ў Польшчы, скарыстоўваючы дэмакратычныя механізмы дзяржавы.

Іншую пазіцыю ў стаўленні да польскай дзяржавы займалі дзеячы, верныя эміграцыйнаму ўраду БНР у Коўне. 26 верасня 1921 года з ініцыятывы прэм'ера ўрада Вацлава Ластоўскага ў Празе была склікана Беларуская нацыянальна-палітычная канферэнцыя з удзелам прадстаўнікоў Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў (БПСР), Беларускай партыі сацыялістаў-федэралістаў, Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі і беспартыйных дзеячоў. Амаль палову ўдзельнікаў канферэнцыі (18) складалі дэлегаты БПСР. На працягу пяці дзён удзельнікі канферэнцыі распрацавалі план дзеяння ў новых палітычных умовах. У прынятай заключнай рэзалюцыі было сказана, што Беларусь павінна быць непадзельнай і незалежнай дзяржавай. Адзінай легальнай уладай з'яўляецца ўрад БНР, які атрымаў мандат ад Рады. Рыжскую дамову ўдзельнікі канферэнцыі назвалі трактатам аб падзеле, а парадак па абодвух баках рыжскай мяжы — акупацыяй Беларусі дзвюма суседнімі дзяржавамі. У рэзалюцыі "ўсе актыўныя беларускія сілы" заклікаліся да барацьбы ўсімі магчымымі сродкамі "супраць падзелу Беларусі". "Кожнага, хто прызнае рыжскую дамову, трэба лічыць ворагам беларускага народа", — заявілі ўдзельнікі канферэнцыі[6].

Беручы пад увагу — як было сказана ў рэзалюцыі — асабліва нялюдскі пераслед беларускай культуры, інтэлігенцыі і нацыянальных дзеячоў у польскай акупацыйнай зоне, яны пастанавілі выслаць пратэст у Лігу Нацый з патрабаваннем адкінуць "польскі імперыялізм на лінію рэк Нарвы і Буга". З'езд прадстаўнікоў беларускіх сацыялістычных партый у Празе ўхваліў таксама рэзалюцыю ў справе дзейнасці генерала Станіслава Бу-

[6] Krótki zarys zagadnienia białoruskiego. S. 152—154.

лак-Балаховіча, які быў названы аферыстам і узурпатарам ды абвінавачаны ў злачынствах і рабунках беларускага ды жыдоўскага мірнага насельніцтва.

Хоць усе прынятыя ў Празе дакументы аднолькава ацэньвалі польскую і савецкую акупацыю, партызанскі рух на практыцы быў арганізаваны толькі на заходнім баку рыжскай мяжы. Праўдападобна, так рабілася з волі летувіскіх і нямецкіх пратэктараў урада Ластоўскага. Менавіта Нямеччына і Летува падтрымоўвалі фінансава і забяспечвалі зброяй і амуніцыяй новастварэныя беларускія партызанскія аддзелы. Больш за тое, галоўная палітычная сіла ў эміграцыйным урадзе — эсэры традыцыйна праяўлялі заходнерускія тэндэнцыі. Пачатак бальшавіцкай палітыкі беларусізацыі ў БССР спрыяў трактаванню іх як патэнцыйных хаўруснікаў беларускай справы.

На пачатку 1922 года з малалікіх узброеных групаў ствараліся буйнейшыя падраздзяленні, якія меліся пачаць паўстанцкую кампанію ў выпадку польска-летувіскага канфлікту. Увесь партызанскі рух кантраляваўся эсэрамі, якія дзейнічалі ў згодзе з урадам Ластоўскага. Адпаведна з дырэктывай Паўстанцкага камітэта дакладна неакрэсленага складу беларускія вайсковыя структуры павінны былі ў канспірацыйных мэтах весці дзейнасць як асветныя гурткі, кааперацыйныя арганізацыі, царкоўныя брацтвы. Вайсковая вертыкаль эсэраўскай арганізацыі мела назоў "Брацтва беларусаў". Некаторыя камандзіры, каб падкрэсліць сялянскі характар руху, карысталіся найменнем "Брацтва сялянаў-беларусаў"[7]. Побач з эсэраўскай арганізацыяй дзейнічаў таксама арыентаваны на Менск Саюз сялянскай самааховы.

Беларускай паўстанцкай арганізацыяй у Польшчы кіраваў Галоўны беларускі штаб, які меў шчыльныя сувязі з штабам летувіскай арміі. Галоўнаму беларускаму штабу падначальваліся камандаванні чатырох паўстанцкіх групаў з штабамі ў Аранах, Уцянах, Мерачы і, праўдападобна, у Вільні. Штабы паасобных групаў мусілі весці арганізацыйную, палітычную, выведкавую і аперацыйную дзейнасць. У рамках аперацыйнай дзейнасці рыхтаваліся планы дыверсійна-сабатажных акцый у дачыненні да стратэгічных аб'ектаў — мастоў, віядукаў, вак-

[7] Kalina J. Bractwo Włościan Białorusinów // Białoruskie Zeszyty Historyczne. 1994. № 1. S. 38.

залаў, тэлефонных і тэлеграфных станцый, а таксама наступальныя дзеянні супраць аддзелаў польскага войска. З Летувы паўстанцам паступала зброя, амуніцыя, выбуховыя матэрыялы, грошы. Камандзір чацвертай групы Вячаслаў Разумовіч ("Хмара"), чый штаб знаходзіўся ў Мерачы, кіраваў канспірацыйнай структурай якая мела налічваць 8 тысяч чалавек[8]. Большасць яе ўдзельнікаў займалася земляробствам і ніколі не брала ўдзелу ў арганізаваных мясцовымі камандзірамі акцыях. Праўдападобна, патэнцыйныя паўстанцы не надта добра арыентаваліся, у якім палітычным кантэксце адбывалася іхная канспірацыйная дзейнасць. У выдаваным камандзірам аддзела з ваколіц Белавежскай пушчы Германам Шыманюком ("Скамарохам") часопісе "Беларускі партызан" пісалася найперш пра лютасць і здзек польскага боку з беларусаў. Удзел у партызанскім руху быў абаронай і адначасова помстай за крыўды, нанесеныя народу. Дзяржаўная ідэя ў змесце гэтых публікацый была ледзьве прыкметная.

Структуры беларускай паўстанцкай арганізацыі ствараліся галоўным чынам з думкай пра ўдзел у польска-летувіскай вайне, дзейнасць беларускіх канспіратараў абмяжоўвалася непрадбачанымі Галоўным штабам акцыямі, якія наладжвалі мясцовыя камандзіры. Гэта былі перш за ўсё напады на пастарункі паліцыі, цягнікі, склады, крамы, леснічоўкі, двары. Злоўленых у аблавах партызанаў часта засуджвалі да вышэйшай меры пакарання. Першая экзекуцыя схопленых партызанаў атрада Германа Шыманюка адбылася 24 траўня 1922 года.

15 сакавіка 1923 года Рада Лігі Нацый прызнала ўсходнія межы Польшчы з СССР і Летувою. Перспектыва польска-летувіскай вайны стала нерэальнай. Гэта спрычынілася да адмовы летувіскага ўрада падтрымоўваць беларускі цэнтр у Коўне. Змена летувіскай палітыкі выклікала неабходнасць пераносу структураў БНР у Прагу. Сталіца Чэхаславакіі ў другой палове 20-х гадоў стала цэнтрам беларускай палітычнай эміграцыі.

У новай палітычнай сітуацыі канспірацыйныя беларускія структуры на тэрыторыі II Рэчы Паспалітай, якія ствараліся з восені 1921 года, пачалі неўзабаве распадацца. Паліцыі ўдалося

[8] Straża A. Ataman Chmara-Razumowicz — biografia białoruskiego irredentysty. Warszawa, 1928. S. 20.

арыштаваць арганізатараў беларускага руху на Гарадзеншчыне і Беласточчыне. У траўні 1923 года ў Беластоку адбыўся працэс 45 канспіратараў, у іх ліку двух дэпутатаў польскага парламента — Сяргея Барана і Сымона Якавюка. Упадак беларускага партызанскага руху быў таксама вынікам здрады некаторых камандзіраў. Вячаслаў Разумовіч ад восені 1922 года супрацоўнічаў з польскай паліцыяй і контрвыведкай, дапамагаў у ліквідацыі беларускага падполля[9].

У 1923 годзе частка колішняй эсэраўскай канспірацыі апынулася пад кантролем прысланых з Менску або Масквы эмісараў. На базе, між іншага, групаў, якія раней дзейнічалі ў рамках Брацтва беларусаў і Саюза сялянскай самааховы ствараліся структуры Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі.

Грамадаўская рэвалюцыя

1924 год характарызаваўся самай вялікай напругай беларускіх выступленняў супраць польскай улады. Гэта былі як дзеянні, інспіраваныя камуністычнымі арганізацыямі, так і звычайная рэакцыя на паводзіны адміністрацыі, паліцыі і войска.

Палітыка польскага ўрада вагалася паміж дзвюма тэндэнцыямі: з аднаго боку ўжываліся меры рэпрэсіўнага характару, з другога — вяліся нясмелыя пошукі палітычных спосабаў развязання канфліктаў. Партызанскі рух ліквідаваўся з дапамогаю рашучых ваенных дзеянняў[10]. Стварэнне новай вайсковай структуры — Корпуса аховы памежжа (КАП), камандзіры якога атрымалі паўнамоцтвы весці контрвыведкавую і паліцыйную дзейнасць, масавыя арышты, якія адбываліся ў 1923—1925 гадах, абмежавалі развіццё ўсялякіх формаў нелегальнай дзейнасці, але поўнасцю яе не зліквідавалі.

Урад абмяркоўваў таксама некалькі эканамічных і палітычных праектаў, якія мелі стварыць шанец нармалізацыі сітуацыі ў паўночна-ўсходніх ваяводствах. Першым такія захады зрабіў прэм'ер Уладзіслаў Сікорскі. На яго загад Канстанты Срокаўскі ўвесну 1923 года зрабіў даклад пра сітуацыю беларускага на-

[9] Archiwum Akt Nowych w Warszawie, zespół Ministerstwa spraw zagranicznych. Sygn. 6315. K. 12—13.

[10] Tomaszewski J. Rzeczpospolita wielu narodów. Warszawa, 1985. S. 114.

сельніцтва. Улетку 1923 года Палітычны камітэт Рады Міністраў падрыхтаваў закон аб дзяржаўнай мове. Закон дапускаў магчымасць карыстацца беларускай мовай у судах і школах, ва ўстановах панавала польская мова. Адстаўка ўрада Сікорскага спыніла працу ў кірунку пошукаў палітычнага развязання праблемаў на тэрыторыі, населенай беларусамі. Палітыку Сікорскага ў нацыянальным пытанні намагаўся працягваць урад Уладзіслава Грабскага. Апрача стварэння згаданага Корпусу аховы памежжа кабінет Грабскага падрыхтаваў гэтак званыя моўныя законы. Яны былі ўхваленыя Сеймам у якасці закону 31 ліпеня 1924 года. Каб зняць напругу ва ўсходніх ваяводствах дазвалялася арганізоўваць дзвюхмоўныя школы, у якіх можна было навучацца беларускай і ўкраінскай мовам у польскіх школах. Гэты закон развязаў пытанне толькі ў фармальным плане. Інтэрпрэтацыйныя акты да гэтага закону на практыцы рабілі немагчымым хоць якое развіццё беларускага школьніцтва. У заходняй частцы Беластоцкага ваяводства (у Беластоцкім, Бельскім і Сакольскім паветах) наогул было юрыдычна забаронена ствараць школы з навучаннем беларускай мове. Праз год пасля ўвядзення закону двухмільённая беларуская меншасць мела 3 школы з выкладаннем прадметаў на роднай мове (425 вучняў) і 19 дзвюхмоўных, у якіх роднай мове вучыліся 1 683 вучні. Усіх дзяцей, якія гаварылі па-беларуску і наведвалі ўсеагульныя школы, было больш за 125 тысяч. На кожную тысячу беларускіх дзетак толькі 3,5 мелі магчымасць вывучаць родную мову.

Каб адцягнуць беларусаў ад партызанскага руху, урад Грабскага разглядаў магчымасць правядзення аграрнай рэформы з улікам інтарэсаў няпольскага насельніцтва. Абмяркоўваўся нават намер увядзення беларускай мовы ва ўстановах тых паветаў, у якіх пераважную колькасць грамадзян складалі беларусы[11]. Прыхільнікам палітычнага развязання ва ўрадзе Грабскага быў Станіслаў Тугут. Ён прапанаваў перадаць беларусам парцэляваную зямлю, правесці дэмакратычныя муніцыпальныя выбары ва ўсходніх ваяводствах і адкрыць мясцоваму насельніцтву шырэйшы доступ да дзяржаўных і муніцыпальных устаноў.

---

[11] Chojnowski A. Koncepcje polityki narodowościowej rządów polskich w latach 1921—1939. Wrocław—Warszawa—Kraków—Gdańsk, 1979. S. 31.

Аднак на практыцы дзеля дасягнення нармалізацыі на ўсходзе краіны большае значэнне надавалася дзеянням КАПа і паліцыі, чым увядзенню неабходных мераў эканамічнага і палітычнага характару. Каб памяняць звычкі крэсавай адміністрацыі, патрабавалася вялікая рашучасць цэнтральнага ўрада. Воля паасобных міністраў рацыяналізаваць нацыянальную палітыку была малазначным фактарам і не паўплывала на ўвядзенне асноўных зменаў у гэтай галіне. Бязлітаснае спагнанне падаткаў, паліцыйны тэрор і самаўпраўства чыноўнікаў толькі спрыялі росту папулярнасці прасавецкіх арганізацый, асабліва КПЗБ.

У канцы 1924 года Камінтэрн памяняў палітыку ў дачыненні да Польшчы. Ён адмовіўся ад маланкавых партызанскіх акцый, якія хоць і парушалі ўстойлівае становішча ва ўсходніх ваяводствах, аднак вялі да вынішчэння патэнцыйных рэвалюцыйных кадраў у выніку шораз больш паспяховай барацьбы польскай дзяржбяспекі з падпольнымі структурамі. Стратэгічныя планы Камінтэрна прадугледжвалі падрыхтоўку "працоўных масаў" да сусветнай рэвалюцыі. Найбольш паспяховым метадам падрыхтоўкі было прызнана ўздзеянне на грамадства праз пасярэдніцтва легальна дзейных грамадскіх, палітычных, культурных, асветных і гаспадарчых арганізацый. Дзеля гэтага трэба было ініцыяваць іх стварэнне або забяспечыць кантроль над створанымі ўжо структурамі.

На парламенцкіх выбарах у лістападзе 1922 года беларускія групоўкі, аб'яднаныя ў Беларускі цэнтральны выбарчы камітэт, атрымалі 11 мандатаў у Сейме і 3 — у Сенаце Рэчы Паспалітай. Дэпутаты абедзвюх палатаў польскага парламента заснавалі Беларускі пасольскі клуб, які ўзначаліў Браніслаў Тарашкевіч. Разам з Сымонам Рак-Міхайлоўскім і Фабіянам Ярэмічам ён прадстаўляў беларускіх сацыял-дэмакратаў. Дэпутатам Сейма стаў таксама прадстаўнік беларускай хрысціянскай дэмакратыі ксёндз Адам Станкевіч. Самую шматлікую групу беларускіх парламентароў складалі беспартыйныя — Аляксандар Уласаў, Вячаслаў Багдановіч, Міхась Какановіч, Аляксандар Назарэўскі.

Згодна з раней абранай палітычнай арыентацыяй Тарашкевіч спрабаваў атрымаць палітычныя і культурныя канцэсіі на карысць беларусаў з дапамогаю дэмакратычных механізмаў польскай дзяржавы. У студзені 1923 года дэпутаты, згуртаваныя ў Беларускім пасольскім клубе, вынеслі на разгляд праект культурнай аўтаноміі для беларусаў. Яны прапанавалі стварыць

краёвы парламент у Вільні, даць дазвол на ўжыванне беларускай мовы ў школах і судах, правесці аграрную рэформу і перадаць зямлю мясцовым сялянам, спыніць вайсковае асадніцтва, стварыць ваенізаваныя фармаванні на прынцыпе грамадзянскай тэрытарыяльнай абароны замест гарнізонаў, якія сваёй прысутнасцю правакавалі антыдзяржаўныя выступленні. Беларускія парламентары патрабавалі таксама вярнуць Праваслаўнай царкве храмы, якія ў 1919—1922 гадах былі перамененыя на касцёлы. У тагачасных умовах гэтыя патрабаванні аказаліся нерэальнымі і поўнасцю ігнараваліся польскай парламентарнай большасцю і чарговымі ўрадамі.

Тарашкевіча не спынялі абвінавачванні ў паланафільстве з боку розных беларускіх арганізацый. Ён дамагаўся, каб парламентары захавалі лаяльнасць у стаўленні да польскай дзяржавы. У верасні 1923 года Тарашкевіч вёў размовы з кандыдатам на пасаду прэм'ер-міністра Станіславам Тугутам. Ад імя Беларускага пасольскага клуба абяцаў падтрымку для новага ўрада наўзамен спыненне вайсковага асадніцтва, прад'яўленне зняволеным беларусам абвінаваўчых актаў, стварэння ў ведамстве асветы пасады намесніка міністра па справах беларускага школьніцтва, адстаўкі навагрудскага ваяводы і замены яго на чыноўніка беларускай нацыянальнасці, стварэння адной школьнай акругі для земляў, заселеных беларусамі, і даручэння абавязкаў намесніка куратара чалавеку паходжаннем з гэтага асяроддзя, адкрыцця гімназіі і дзвюх беларускіх настаўніцкіх семінарыяў і прысваення ім статуса публічных школаў. Стварыць урад Тугуту не ўдалося, а як міністр без партфеля ва ўрадзе Уладзіслава Грабскага ён няшмат мог зрабіць, бо астатнія міністры да беларускіх пытанняў ставіліся непрыхільна.

Адсутнасць якіх-колечы саступак з польскага боку, хаця б на карысць беларускай культуры або асветы, адсутнасць нават жэстаў, якія б давалі надзею на змену палітыкі ў будучым, сталі прычынай адыходу часткі беларускіх парламентароў ад дакляраванай раней лаяльнасці ў стаўленні да ўрада і інстытуцый польскай дзяржавы. Увосень 1923 года Сымон Рак-Міхайлоўскі, Васіль Рагуля і Пётра Мятла стварылі асобны дэпутацкі гурток Беларускіх незалежных сацыялістаў[12]. У адрозненне

[12] Gomółka K. Białorusini w II Rzeczypospolitej // Zeszyty Naukowe Politechniki Gdańskiej. Ekonomia. № 31. Gdańsk, 1992. S. 64.

ад Браніслава Тарашкевіча парламенцкую трыбуну яны выкарыстоўвалі для канстатацыі таго, што рабілася на беларускіх землях.

Весткі, што прыходзілі з БССР пра развіццё нацыянальнага жыцця, паказвалі прыхільнікам прапольскай арыентацыі на іх палітычныя пралікі. У 1925 годзе нішто яшчэ не сведчыла, што праз некалькі гадоў беларуская культура і яе стваральнікі стануць першымі ахвярамі сталінскага таталітарызму.

Змена палітычнай арыентацыі Браніслава Тарашкевіча выспявала даволі доўга. У сярэдзіне ліпеня 1925 года ён раіўся наконт гэтай справы ў Гдыні з Аляксандрам Цвікевічам, які неўзабаве адмовіўся ад усіх пасадаў ва ўрадзе БНР і выехаў у Менск[13]. Тарашкевіч жа разам з Сымонам Рак-Міхайлоўскім, Пётрам Мятлой, Паўлам Валошыным і Юр'ем Сабалеўскім выйшлі з Беларускага пасольскага клуба і заснавалі новы клуб Беларускай сялянска-работніцкай грамады (БСРГ). Пад час выступленняў у Сейме і на старонках друку Тарашкевіч тлумачыў, што стаўка на атрыманне аўтаноміі для "Белай Русі" ад польскага ўрада памылковая. "У нас такіх ілюзій няма. Мы раз назаўсёды ад гэтых усіх ілюзій былі вылечаны"[14], — падкрэсліваў правадыр Грамады. Аднак ён ніколі дэталёва не ўдакладняў канчатковую мэту, за якую хоча змагацца разам з створанай на базе клуба палітычнай партыяй. Затое часта паўтараў пра "саюз рабочых і сялянаў польскіх і беларускіх" і "незалежнасць Белай Русі ў цеснай сувязі з народамі, якія рашыліся на новую грамадскую структуру". Гэтая новая структура была толькі ў народаў СССР.

Дэпутаты Грамады, адрозна ад калегаў з Беларускага пасольскага клуба, перасталі шукаць пагаднення з польскай парламенцкай большасцю і кампрамісных развязак з паасобнымі кабінетамі. Яны казалі перш за ўсё пра цёмныя бакі крэсавай рэчаіснасці, рэлікты феадалізму, злоўжыванні адміністрацыі, нахабнасць паліцыі, вычварнасць судовых працэсаў над беларусамі. Тарашкевіч наважыўся на поўнае супрацоўніцтва з каму-

[13] Тарашкевіч Б. Аўтабіяграфія // Спадчына. 1996. № 3. С. 138.

[14] Цыт. паводле: Bergman A. Rzecz o Bronisławie Taraszkiewiczu. Warszawa, 1977. S. 101.

ністамі, стаў сябрам КПЗБ і нават быў удзельнікам III Канферэнцыі гэтай партыі, якая адбывалася ў лістападзе 1925 года ў Маскве.

Да майскага дзяржаўнага пераварота (1926 г.) Грамада была малалікай арганізацыяй. Пасля года існавання, у чэрвені 1926 года, яна гуртавала 569 сяброў. А ў лістападзе гэтага ж года БСРГ налічвала ўжо 62 тысячы, у снежні — больш за 100 тысяч сяброў. Раптоўны рост колькасці сяброў гэтай партыі быў выкліканы, з аднаго боку, настроямі, якія панавалі ў беларускім асяроддзі, з другога — паводзінамі пасля майскага пераварота мясцовага дзяржаўнага апарату, які чакаў інструкцыяў, баяўся рабіць нейкія захады, якія маглі б супярэчыць намерам новай урадавай каманды. Пасіўнасць мясцовых уладаў дала правадырам Грамады шанец стварыць партыйныя структуры ва ўсіх паветах, дзе жылі беларусы.

Стыхійнасць грамадаўскага руху і адначасова легальныя метады дзейнасці — заснаванне чытальняў, бібліятэк, структураў Таварыства беларускай школы, сельскагаспадарчых кааператываў, пазыковых касаў, самадзейных калектываў і выдавецтваў — выклікалі бездапаможнасць паліцыі і крэсавай адміністрацыі.

Пераважнай большыні беларускіх сялянаў Грамада давала надзею на змены, была сілай, якая заступілася за іхныя чалавечыя і грамадзянскія правы, стала партыяй, якая ўголас сказала пра польскую крэсавую ўладу тое, што пра яе думала большасць беларусаў. Была арганізаванай формай пратэсту супраць прыніжальнай рэчаіснасці. Тактыка правадыроў цікавіла нямногіх. Людзі давяралі ім і ўлучаліся ў розныя формы дзейнасці, прапанаваныя партыяй.

Дзеячы Грамады перанялі кантроль над Таварыствам беларускай школы, Беларускім навуковым таварыствам, Беларускім выдавецкім таварыствам, віленскім Беларускім нацыянальным камітэтам, Беларускім кааператыўным банкам, Беларускім студэнцкім саюзам. Іншыя беларускія партыі на той час заставаліся ў цені БСРГ.

13 лістапада 1926 года дэпутаты ад польскага Народна-нацыянальнага саюза ўнеслі ў Сейме прапанову неадкладна забараніць Грамаду, а баявыя дружыны Польскай сацыялістычнай партыі актыўна далучаліся да разгону мітынгаў і сходаў,

арганізаваных гэтай партыяй[15]. Роспуск Грамады перадвызначыла пазіцыя крэсавых абшарнікаў, асабліва Аляксандра Мейштовіча, тагачаснага міністра юстыцыі. Уначы з 14 на 15 студзеня 1927 года кіраўнікі партыі, а заадно дэпутаты польскага Сейма былі арыштаваныя. Зняволенне парламентароў супярэчыла законам, якія гарантавалі ім недатыкальнасць у часе выканання дэпутацкіх абавязкаў. Парламенцкая большасць ухваліла арышты і забарону Грамады.

Зняволенне правадыроў Грамады і забарона партыі не выклікалі ніякай рэакцыі ні ў Менску, ні ў Маскве. У кіраўніцтве ВКП(б) ужо распрацоўвалі планы расправы з беларускім нацыянал-дэмакратызмам. Тарашкевіч, Рак-Міхайлоўскі, Мятла, Валошын, Сабалеўскі ды іншыя лідэры Грамады пакінулі прапольскую арыентацыю і захапіліся тым, што рабілася ў Савецкай Беларусі ў галіне развіцця нацыянальнага руху. Прадстаўлялі яны самую дасканалую форму нацыянал-дэмакратызму. На думку некаторых беларускіх гісторыкаў, правадыры БСРГ былі першымі ахвярамі бальшавіцкай расправы з беларускім нацыянальным рухам. Многае паказвае на тое, што агенты Камінтэрна дапамаглі польскаму боку атрымаць доказы супрацоўніцтва лідэраў Грамады з савецкімі палітычнымі цэнтрамі[16].

Асуджаныя правадыры Грамады пасля некалькіх гадоў знаходжання ў польскіх турмах былі перададзеныя ўладам СССР у рамках абмену палітвязнямі. Яны загінулі пад час масавых рэпрэсій у 1937—1938 гадах, абвінавачаныя ў шпіёнскай дзейнасці на карысць Польшчы.

Камуністы і прыхільнікі лаяльнасці

Дзейнасць Грамады спрабаваў працягваць Беларускі дэпутацкі сялянска-работніцкі клуб "Змаганне", створаны пры спрыянні камуністаў у сярэдзіне 1928 года. Галоўную ролю ў гэтай арганізацыі адыгрывалі дэпутаты Ігнат Дварчанін, Язэп Гаўрылік, Флягонт Валынец. Адрозна ад Грамады "Змаганне" на загад Камінтэрна пачало барацьбу з іншымі беларускімі ар-

[15] Сідаровіч К. Па жыццёвых сцежках // Лёс аднаго пакалення: Успаміны. Беласток, 1996. С. 9.

[16] Лазько Р. Хто знішчыў Грамаду // Беларуская мінуўшчына. 1994. № 2. С. 47—48.

ганізацыямі ў Польшчы, абвінавачваючы іх у нацыяналізме, згодніцтве і кулацтве. Дварчаніну не ўдалося дамагчыся поспеху Тарашкевіча і стварыць такі ж магутны грамадскі рух, якім была Грамада. Гэтаму перашкаджала апатыя, якая апанавала беларусаў пасля забароны дзейнасці Грамады. Да таго ж улады, якія пільна сачылі за праявамі беларускай актыўнасці, паспяхова тармазілі развіццё "Змагання".

У лістападзе 1925 года пасля выхаду групы Тарашкевіча з Беларускага пасольскага клуба дэпутаты Фабіян Ярэміч і Васіль Рагуля стварылі партыю Беларускі сялянскі саюз (БСС). Ён меўся быць процівагай і альтэрнатывай левай Грамадзе. БСС у сваёй праграме змяшчаў усе ранейшыя патрабаванні Беларускага пасольскага клуба. Дальнабачнай мэтай БСС была незалежная Беларусь, бліжэйшай — культурная аўтаномія для беларусаў у складзе Польшчы.

У 1926 годзе дзеячы БСС разам з беларускімі хрысціянскімі дэмакратамі стварылі Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры (БІГІК), які ставіў сабе за мэту змену эканамічнай сітуацыі беларускага насельніцтва. Нягледзячы на супрацьдзеянне ўладаў, да 1930 года паўстала 60 аддзяленняў інстытута ў розных мясцінах Віленскага і Навагрудскага ваяводстваў. Пад апекай БІГІК працавала 37 бібліятэк. Дзеячы інстытута падтрымоўвалі развіццё рамяства, заснаванне сельскагаспадарчых кааператываў, стварэнне машынных станцый на вёсках, разгарнулі сельскагаспадарчую асвету, прапагандавалі меліярацыю, у выніку якой сяляне маглі прыдбаць дадатковыя плошчы ўгоддзяў. Інстытут праіснаваў да студзеня 1937 года і быў распушчаны на загад віленскага ваяводы на падставе фальшывага абвінавачання ў антыдзяржаўнай дзейнасці.

Найбольш памяркоўную праграму сярод беларускіх партыяў, якія існавалі ў II Рэчы Паспалітай, мела Беларуская хрысціянская дэмакратыя. Гэтая арганізацыя дзейнічала з 1917 года пад назовам Хрысціянскай дэмакратычнай злучнасці, пазней — Беларускай хрысціянска-дэмакратычнай злучнасці. Цэнтрам беларускага хрысціянска-дэмакратычнага руху стала Вільня. Дзейнасць хрысціянскай дэмакратыі абапіралася перш за ўсё на каталіцкае духавенства і касцельныя арганізацыі. Самымі вядомымі дзеячамі гэтага руху былі ксяндзы Адам Станкевіч, Вінцэнт Гадлеўскі, Люцыян Хвецька. Хрысціянскія дэмакраты

лічылі хрысціянскую рэлігію асновай грамадскага парадку. У нацыянальных пытаннях яны падкрэслівалі права кожнага народа на самавызначэнне. Зыходзячы з гэтага, патрабавалі свабоду беларусам у Польшчы на прынцыпе канстытуцыйнай роўнасці ўсіх грамадзян. Яны патрабавалі таксама правядзення аграрнай рэформы, усталявання больш справядлівага грамадскага ладу і шырокага доступу да асветы на роднай мове. Хрысціянскія дэмакраты крытычна ставіліся да БССР не толькі за атэізацыю, але і за філасофскія асновы яе грамадска-юрыдычнага парадку, у аснове якога ляжала класавая барацьба і дыктатура пралетарыяту.

У 1926 годзе партыя прыняла назоў Беларускай хрысціянскай дэмакратыі і стала не толькі каталіцкай, але і агульнанацыянальнай палітычнай арганізацыяй. Галоўнай мэтай БХД стала стварэнне аб'яднанай і незалежнай дзяржавы. Да Каталіцкага касцёлу і Праваслаўнай царквы ставіліся патрабаванні ўвядзення набажэнства і казанняў на нацыянальнай мове, беларусізацыі праваслаўнай і каталіцкай духоўных семінарый у Вільні.

Супраць дзейнасці БХД выступалі дзяржаўныя і касцельныя ўлады. Дзяржаўная адміністрацыя не магла сцярпець удзелу святароў у станаўленні беларускай нацыянальнай свядомасці сярод каталікоў. У польскай дзяржаве Касцёлу была адведзена іншая роля — пашырэнне сярод беларускага люду польскасці. Таму з гледзішча польскіх уладаў прапаведванне Божага слова на беларускай мове было зусім непатрэбнае. Друкаваны орган БХД "Крыніца" паўсюль канфіскоўваўся, а ксяндзы, якія ладзілі казанні па-беларуску, цярпелі паліцыйны пераслед[17].

У 1926 годзе віленскі архібіскуп Рамуальд Ялбжыкоўскі адмысловым цыркулярам забараніў каталікам чытаць беларускую "Крыніцу", а духавенству — чытаць казанні па-беларуску і быць сябрамі БХД. Пры канцы 20-х гадоў стала практыкай пераводзіць ксяндзоў беларускай нацыянальнасці ў цэнтральныя ваяводствы і замяняць іх ранейшыя пасады на польскіх духоўных.

У 1935 годзе Рада БХД перайменавала партыю на Беларускае нацыянальнае аб'яднанне, фармальна адмаўляючыся ад канфесійнага характару.

[17] Станкевіч А. Беларускі хрысьціянскі рух. Вільня, 1939. С. 180.

Праваслаўнае беларускае дэмакратычнае аб'яднанне (ПБДА), якое дзейнічала ў 1927—1931 гадах, спрабавала браць прыклад з БХД. У праграме ПБДА рэлігійныя акцэнты пераважалі над нацыянальнымі. Партыя найперш імкнулася абараняць інтарэсы праваслаўя, пратэставала супраць стаўлення Царквы ў залежнасць ад дзяржаўнай улады, адбірання храмаў і царкоўнай маёмасці, патрабавала ажыццяўлення прынцыпу роўнасці ўсіх веравызнанняў. Забеспячэнне культурных і моўных правоў беларусаў прадугледжвалася ў праграме партыі толькі ў будучыні.

Іншую канцэпцыю змагання за беларускія нацыянальныя інтарэсы мела група дзеячоў, якія гуртаваліся вакол Антона Луцкевіча і Радаслава Астроўскага. Абодва палітыкі былі калісьці звязаныя з Грамадой, але ў часе судовага працэсу іхныя сувязі з пасланцамі Камінтэрна не былі даказаныя. У 1930 годзе з некалькіх невялікіх грамадскіх, асветных і выдавецкіх арганізацый яны стварылі таварыства, якое называлася Цэнтральны саюз культурных і гаспадарчых арганізацый (у скароце — Цэнтрасаюз) і пачалі выдаваць газету "Наперад". Цэнтрасаюз і яго кіраўніцтва неўзабаве сталі называць "беларускай санацыяй", "паланафіламі". Іх атакавалі хрысціянскія дэмакраты, камуністы ды іншыя беларускія групоўкі за згодніцтва і кантакты з урадавымі коламі. Дзеячы Цэнтрасаюза зыходзілі з таго, што ў дадзены момант адзіным паратункам для беларускіх арганізацый з'яўляецца аб'яднанне на глебе культурна-асветнай працы з народам. Яны адмаўляліся ад палітычных пастулатаў і барацьбы з польскімі ўладамі на населеных беларусамі землях. Луцкевіч увесь час бачыў магчымасць рэалізацыі беларускіх нацыянальных памкненняў у палітычных умовах II Рэчы Паспалітай. Ён быў перакананы, што змаганне з Грамадой ды іншымі беларускімі арганізацыямі, якое вёў урад, адбывалася ў кантэксце барацьбы з камунізмам. Цэнтрасаюз займаўся заснаваннем бібліятэк і чытальняў на вёсках, распаўсюджваннем літаратуры ў серыі "Сялянская бібліятэка", змест якой быў дастасаваны да інтэлектуальнага роўню карыстальнікаў і якая адукоўвала іх у галіне сельскай гаспадаркі і беларускай культуры.

А.Луцкевіч імкнуўся стварыць праўрадавы беларускі цэнтр, альтэрнатыўны да віленскага Беларускага нацыянальнага каміт-

тэта, у якім пераважалі дзеячы БХД. Яму ўдалося далучыць да Цэнтрасаюза Беларускі студэнцкі саюз, Беларускае навуковае таварыства, Беларускі настаўніцкі саюз, Беларускае дабрачыннае таварыства, Беларускі гаспадарчы саюз, Аб'яднанне беларускіх жанчын, бацькоўскія камітэты беларускіх гімназій у Вільні, Наваградку і Клецку. Імпазантнай была таксама выдавецкая дзейнасць Цэнтрасаюза. Аднак гэтая арганізацыя, як і ўсе іншыя беларускія партыі пасля 1927 года, не мела значнай грамадскай падтрымкі.

З Цэнтрасаюзам супрацоўнічаў іншы грамадовец — Фабіян Акінчыц. У траўні 1931 года ён, аднак, адышоў ад арганізацыі Луцкевіча, абвінавачваючы яго ў прыхаваным спрыянні камунізму. Неўзабаве Акінчыц пачаў ствараць сваю партыю — Віленскую беларускую групу "Адраджэнне". На старонках выдаванага ім "Народнага звона" заклікаў беларусаў быць лаяльнымі ў дачыненні да польскай дзяржавы, асуджаў беларускіх камуністычных дзеячоў за здраду нацыянальным ідэалам. Не знаходзячы грамадскай падтрымкі, Акінчыц на нейкі час спыніў сваю дзейнасць. У 1936 годзе ён разам з Уладзіславам Казлоўскім стварыў Беларускую нацыянал-сацыялістычную партыю (БНСП) і пачаў выдаваць газету "Новы шлях". Восенню 1935 годзе апублікаваў на яе старонках праграму партыі, якая была спробай перанесці нямецкую фашысцкую ідэалогію на беларускі грунт. У сапраўднасці БНСП, апрача назову, мела нямшмат супольнага з партыяй Гітлера. Такая прапанова для сялянскага грамадства выглядала досыць кур'ёзна. І ўсё ж пры канцы 30-х гадоў з'явіўся план увядзення ў гульню за Беларусь яшчэ аднаго фактару — гітлераўскай Нямеччыны.

БНСП апрача лозунгаў пра нацыянальнае адраджэнне, аб'яднанне ўсіх этнічных беларускіх земляў і перадачу панскай ды калгаснай зямлі беларускім сялянам заяўляла таксама пра нацыяналізацыю лясоў і натуральных рэсурсаў ды змаганне за прыняцце пад увагу беларускіх нацыянальных інтарэсаў праваслаўным і каталіцкім духавенствам.

У арганізацыі Акінчыца і Казлоўскага амаль не было грамадскай базы. Мабыць, таму як адзіная беларуская партыя яна пратрымалася да 1939 года. Астатнія беларускія арганізацыі або былі распушчаныя ўладамі ў другой палове 30-х гадоў, або спынілі дзейнасць у выніку самазнішчальных падзелаў, якія,

зрэшты, інспіраваліся дзейнасцю польскіх дзяржаўных чыннікаў[18].

Найбольш уплывовай і моцнай партыяй, якая дзейнічала ў беларускім асяроддзі, стала Камуністычная партыя Заходняй Беларусі (КПЗБ). Яна была аўтаномнай арганізацыяй у складзе Камуністычнай партыі Польшчы (КПП), якая была ў поўнай залежнасці ад Камуністычнага інтэрнацыянала (Камінтэрна) з сядзібай у Маскве. Хоць КПЗБ выслаўляла інтарэсы Савецкага Саюза, яна мела сярод беларусаў некалькі тысяч прыхільнікаў. Яе галоўным козырам было адмаўленне польскай дзяржаўнасці. Сяляне пра камуністаў ведалі толькі тое, што яны з'яўляюцца прыхільнікамі Расеі (СССР паўсюль трактаваўся як сінонім і працяг Расеі), якая ў культурным, рэлігійным і псіхалагічным плане для беларускай праваслаўнай грамадскасці была бліжэйшая, чым Польшча. Праваслаўным называў сябе амаль кожны заўзяты беларускі атэіст. Пра тое, што рабілася на ўсходнім баку рыжскай мяжы, амаль не было вядома. Весткі пра калектывізацыю ўспрымаліся найчасцей як выдумкі польскай прапаганды. Бальшыню сяброў КПЗБ складалі беларускія сяляне. У партыі былі таксама палякі, жыды, расейцы, якія жылі на тэрыторыі чатырох паўночна-ўсходніх ваяводстваў II Рэчы Паспалітай. Прыналежнасць тысяч сялянаў да камуністычнай партыі, якая абвяшчала дыктатуру пралетарыяту і калектывізацыю зямлі, можна параўнаць з удзелам у жыцці рэлігійнай секты. Адмаўленне рэчаіснасці стварала для сяброў партыі прыцягальную мадэль паводзінаў у дачыненні да зненавіджанай сістэмы. Папулярнасць КПЗБ была не вынікам прывабнасці яе праграмы, а вынікам эканамічнай сітуацыі і псіхалагічных патрэбаў беларускага сялянства. У аграрным пытанні КПЗБ, зрэшты, не мела аніякае праграмы. Лозунгі, якія заклікалі сялянаў не плаціць падаткаў, не пагашаць даўгоў, не адрабляць шарваркаў, з увагай успрымаліся беларускім насельніцтвам, бо жыло яно ў складаных сацыяльных абставінах. Аднак гэтыя заклікі былі немагчымыя для выканання, бо спробы ажыццявіць іх выклікалі рэпрэсіі з боку дзяржаўнага апарату.

Адрозна ад беларускіх партыяў КПЗБ мела сродкі на прапаганду і сістэматычную працу. Таму нават зняволенне правады-

[18] Gomółka K. Polityka rządów polskich wobec mniejszości białoruskiej w latach 1918—1939 // Białoruskie Zeszyty Historyczne. 1995. № 4. S. 112.

роў партыі не спыняла яе дзейнасці. Ізаляваных дзеячоў звычайна замянялі новыя.

Згодна з дырэктывамі Камінтэрна, КПЗБ імкнулася пранікнуць ва ўсе беларускія грамадскія, палітычныя, гаспадарчыя, асветныя і культурныя арганізацыі. Прысутнасць камуністаў у структурах такіх арганізацый найчасцей была прычынай іх ліквідацыі. Гэты метад улады выкарыстоўвалі з такім размахам, што ў 1937 годзе беларускае нацыянальнае жыццё ў Польшчы практычна замерла. У 1938 годзе КПЗБ як секцыя Камуністычнай партыі Польшчы была Камінтэрнам распушчаная, а яе правадыры, якія апынуліся на тэрыторыі СССР, абвінавачаныя ў супрацоўніцтве з польскай выведкай.

Стаўленне санацыйнага лагера да беларускага пытання

Пасля травеньскага дзяржаўнага перавароту 1926 года былі зроблены спробы правесці рэвізію ранейшай палітыкі дзяржавы ў дачыненні да нацыянальных меншасцяў. Некалькі палітыкаў з атачэння Юзафа Пілсудскага, сярод іх Тадэвуш Галуўка, Леан Васілеўскі, Казімеж Младзяноўскі прапанавалі, каб малаэфектыўную палітыку нацыянальнай асіміляцыі замяніць на палітыку дзяржаўнай асіміляцыі, якая больш выгадная для дзяржавы і не выклікае вялікага супраціву з боку меншасцяў. Гэтая палітыка мелася сфармаваць у грамадзянаў няпольскай нацыянальнасці перакананне, што Польшча з'яўляецца таксама і іхнай айчынай. Начальнік Усходняга аддзялення Міністэрства замежных спраўў Тадэвуш Галуўка прапанаваў, каб у дачыненні да беларусаў дзяржава дзейнічала шляхам стварэння школаў з беларускай мовай навучання, культурных установаў, беларусізацыі Царквы[19]. Гэтыя дзеянні маглі зрабіць беларусаў устойлівымі да расейскіх уплываў і знішчыць прыцягальнасць уздзеяння Менскага цэнтра як у культурным, так і ў палітычным плане. 18 жніўня 1926 года міністр нутраных спраўў Казімеж Младзяноўскі вынес на разгляд "Дырэктывы ў справе стаўлення ўрадавых уладаў да нацыянальных меншасцяў".

[19] Garlicki A. Od maja do Brześcia. Warszawa, 1985. S. 34—35.

Младзяноўскі прапанаваў правядзенне аграрнай рэформы з улікам інтарэсаў беларускага і ўкраінскага насельніцтва, стварэнне магчымасці пашырэння асветы на нацыянальных мовах гэтых меншасцяў, хуткую нармалізацыю юрыдычнага статусу Праваслаўнай царквы.

Увосень 1926 года, у перыяд бурнага развіцця структураў Грамады, Леан Васілеўскі прапанаваў праект "Аб справе беларускай палітыкі польскага ўрада ў цяперашні момант". Ён дэкларараваў неадкладную змену палітыкі ў дачыненні да беларускага школьніцтва, стварэнне настаўніцкай семінарыі для беларусаў, прыйманне на працу ў публічных школах настаўнікаў беларускай нацыянальнасці, распрацоўку адпаведных праграмаў і падручнікаў для школаў з беларускай мовай навучання, дапамогу беларускай моладзі ў доступе да польскіх вышэйшых навучальных установаў, падтрымку беларускім культурна-асветным і выдавецкім установам.

Для ажыццяўлення палітыкі дзяржаўнай асіміляцыі, прапанаванай некаторымі прадстаўнікамі пілсудчыцкага лагера, патрабавалася фінансавае забеспячэнне, прыхільнасць крэсавай адміністрацыі і згода Юзафа Пілсудскага. Аднак ніводзін з гэтых фактараў не праявіўся. Пілсудскі лічыў, што польскія інтарэсы на крэсах найбольш надзейна забяспечаць войска і польская школа. Ён быў рашучым прыхільнікам захавання польскай мовы як адзінай дзяржаўнай, абараняў ідэю вайсковага асадніцтва, а большую надзею на захаванне спакою на ўсходзе ускладаў на паліцыю, чым на задавальненне беларускіх культурных і асветных патрабаванняў.

Расправа над Грамадой была дзеяннем, згодным са спадзяваннямі польскіх нацыянал-дэмакратаў і абшарнікаў паўночна-ўсходніх ваяводстваў. Ліквідацыя грамадаўскага руху, хоць і адсоўвала небяспеку некантраляванае хады падзеяў, аднак узмацняла антыдзяржаўныя настроі. Увесну 1927 года ўрад зрабіў некалькі жэстаў з мэтай разрадзіць пэўную напругу і адцягнуць беларускую інтэлігенцыю ад прасавецкіх палітычных структураў. Дзяржаўныя чыноўнікі хацелі, каб склалася ўражанне, што лаяльнасць да польскай дзяржавы стварае беларусам лепшыя перспектывы, чым разлік на Менск. У 1927 годзе міністр веравызнанняў і публічнай асветы Густаў Дабруцкі ўвёў абавязковае вывучэнне беларускай мовы ў польскіх гімназіях на землях, населеных беларусамі, надаў статус публічных шко-

лаў для дзвюх беларускіх гімназій — у Вільні і Навагрудку, дазволіў стварыць 26 школ з беларускай мовай навучання і 49 — дзвюхмоўных. На загад міністра Дабруцкага пачалася падрыхтоўка праграмаў і падручнікаў для школаў з беларускай мовай навучання. Беларуская мова пасля некалькіх гадоў перапынку зноў была ўведзеная ў Віленскую духоўную праваслаўную семінарыю. Апрача таго, Апеляцыйны суд панізіў гады турэмнага зняволення для асуджаных правадыроў Грамады. У муніцыпальных выбарах беларусы атрымалі блізу 20 % месцаў у гарадскіх і гмінных радах.

Аднак хваля энтузіязму, выкліканая вясною 1927 года новай палітыкай уладаў у дачыненні да беларусаў, неўзабаве сышла. У 1928 годзе ўрад спыніў далейшыя спробы развязаць беларускае пытанне, а лакальная адміністрацыя атрымала права самастойна фармаваць нацыянальную палітыку. Не стварыліся запланаваныя новыя беларускія школы, закрылася гімназія ў Радашкавічах, а палітычныя спробы развязаць праблему ўсё часцей замяняліся рэпрэсіямі ў дачыненні да сапраўдных і ўяўных камуністаў. Гэтым зменам спрыялі весткі з БССР, дзе пачалося змаганне з беларускім нацыянальным рухам. З гледзішча прыхільнікаў нацыянальнай асіміляцыі тое, што рабілася ў Савецкай Беларусі, было карысным для Польшчы. У такой сітуацыі спынялася ўздзеянне на беларускую інтэлігенцыю ў Польшчы канкурэнцыйнага Менскага цэнтра, які самым сваім існаваннем тармазіў рэалізацыю ўсялякіх асіміляцыйных планаў. На ўсходнім баку рыжскай мяжы пашыралася зона расейскіх уплываў, якой трэба было процістаўіць суцэльную культурную і нацыянальную польскую прастору.

На пачатку 30-х гадоў характар дзеянняў дзяржавы ў дачыненні да беларусаў вызначалі ўжо такія палітыкі санацыйнага лагера, як міністр нутраных спраў Феліцыян Славой-Складкоўскі ці палескі ваявода Вацлаў Костэк-Бярнацкі. Апошні ў красавіку 1933 года прапанаваў надзяліць урад надзвычайнымі паўнамоцтвамі, якія дазволілі б ачысціць Польшчу ад "адкідаў грамадства і шкоднікаў", дзейнасць якіх перашкаджала хуткай асіміляцыі беларускіх масаў[20]. У лістападзе 1933 года праект

[20] Archiwum Akt Nowych (AAN), zespół MSW. Sygn. 706/1. Справаздача палескага ваяводы за красавік 1933 года (Sprawozdanie wojewody poleskiego z kwietnia 1933 r.).

развязання беларускага пытання на сваёй тэрыторыі падаў навагрудскі ваявода Стэфан Свідэрскі. Ягоны план прадугледжваў паступовае абмежаванне колькасці дзейных беларускіх культурных, асветных, гаспадарчых і палітычных установаў ды недапушчэнне стварэння новых. Праект ваяводы Свідэрскага пасля ўхвалення міністрам нутраных справаў Славоем-Складкоўскім быў перададзены на рэалізацыю паасобным старастам. У 1934 годзе была ліквідавана Навагрудская беларуская гімназія, а ў некалькіх школах забаранілі карыстацца беларускай мовай.

Асіміляцыйную палітыку ў дачыненні да беларусаў каардынавалі Камітэт па справах нацыянальнасцяў і Навуковая камісія па вывучэнні ўсходніх земляў. Абедзве ўстановы рэкамендавалі выхоўванне "несвядомага беларускага люду" лаяльнымі грамадзянамі. Па-свойму такое выхоўванне разумела крэсавая паліцыя. Арышты і здзекі з сялянаў, якія падазраваліся ў дзейнасці на шкоду дзяржаве, давалі найчасцей не той вынік, што планаваўся. Страх быў паўсюдным пачуццём у дачыненні да польскага паліцыянта, чыноўніка, суддзі і настаўніка[21].

У кастрычніку 1936 года Міністэрства нутраных справаў падрыхтавала праект паскарэння нацыянальнай асіміляцыі беларусаў. На пачатку снежня гэтага ж года забаранілі дзейнасць Таварыства беларускай школы, а 22 студзеня 1937 года — Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры. Фармальна да студзеня 1938 года ў Вільні існаваў яшчэ Беларускі нацыянальны камітэт, але і гэтую арганізацыю спачатку абвінавацілі ў нанясенні шкоды ў галіне абароны і адзінства польскай дзяржавы, а пасля распусцілі. У 1938 годзе ў Польшчы фактычна не было ніводнай рэальнай беларускай арганізацыі. Партыя Акінчыца хоць фармальна існавала, аднак была зусім незаўважнай у грамадскім жыцці. Напярэдадні Другой сусветнай вайны польскі ўрад зрабіў занадта шмат, каб на беларускім баку на доўгія гады зніклі ўсялякія прапановы супрацоўніцтва з палякамі. Прынятая амаль усімі польскімі ўрадамі тэза, якая адмаўляла існаванне беларусаў як палітычнага фактару, сталася згубнай для дзяржавы.

Пасля ліквідацыі нацыянальнага руху праблемай стала існа-

[21] Геніюш Л. Споведзь. Мінск, 1993. С. 12—24.

ванне Праваслаўнай царквы, якая не надта пасавала да тэзы пра польскасць усходніх "крэсаў". У 1924 годзе ўраду ўдалося давесці да абвяшчэння аўтакефаліі і гэтакім чынам вывесці праваслаўе ў Польшчы з-пад юрысдыкцыі Маскоўскага патрыярхату. Аднак увядзенне аўтакефаліі адбылося насуперак прынятым працэдурам. Яна адкрыта крытыкавалася часткай епіскапаў і праваслаўнага духавенства ў Польшчы. Праваслаўная царква ў выніку навязвання ёй чарговых юрыдычных актаў, якія рэгулявалі яе нутраное жыццё, апынулася ў поўнай залежнасці ад адміністрацыйных уладаў.

У 20-х гадах адбывалася шмат судовых працэсаў паміж Каталіцкім касцёлам і Праваслаўнаю царквою за храмы, могілкі, зямлю, якія раней належалі вуніятам. Да 1937 года дзяржаўныя ўлады ў стаўленні да маёмасных спрэчак паміж абедзвюма Цэрквамі паводзілі сябе даволі памяркоўна. У 1937 годзе маршал Эдвард Рыдз-Сміглы пачаў, аднак, новы этап дзяржаўнай палітыкі ў дачыненні да Праваслаўнай царквы, які меў паскорыць паланізацыю яе вернікаў. Там, дзе праваслаўнае насельніцтва лічылася падаткім на польскія ўплывы (Віленшчына, Гарадзеншчына, Беласточчына), намерыліся пашырыць іх шляхам паланізацыі рэлігійнага і прыцаркоўнага жыцця. Там, дзе насельніцтва адкідала польскую культуру і мову ў царкоўным жыцці (Холмшчына, Валынь), было задумана прымусіць яго "вярнуцца да веры бацькоў" шляхам разбурэння храмаў і забароны святарам выконваць душпастырскую паслугу. Улетку 1938 года знішчылі або адабралі ў праваслаўных блізу 100 сакральных аб'ектаў, што выклікала нават пратэсты Лігі Нацый[22].

На беларускім грунце станоўчы вынік дала палітыка фармавання польскай нацыянальнай свядомасці сярод праваслаўных пры дапамозе царкоўных структураў. Маладыя святары, выпускнікі тэалагічнага аддзялення Варшаўскага універсітэта, сталі сапраўднымі місіянерамі польскасці сярод беларусаў. У сярэдзіне 30-х гадоў з ініцыятывы дзяржаўных уладаў паўстаў арганізаваны рух "праваслаўных палякаў". У 1935 годзе ў Беластоку было створана Таварыства праваслаўных палякаў імя Юзафа Пілсудскага. На другі год такія таварыствы паўсталі

[22] Stawecki P. Następcy komendanta. Wojsko a polityka wewnętrzna Drugiej Rzeczypospolitej. Warszawa, 1969. S. 190—196.

ў Горадні, Слоніме, Ваўкавыску і Навагрудку. Неўзабаве цэнтрам гэтага руху стала Горадня — сядзіба епіскапа Савы (Саветава), які апекаваўся ім. 1 лютага 1938 года, у дзень імянінаў прэзідэнта Ігнацы Масціцкага, гарадзенскае Таварыства праваслаўных палякаў намерылася далучыцца да Лагера нацыянальнага аб'яднання. Епіскап Сава загадаў падначаленаму яму духавенству навучыцца польскай мове і браць удзел у дзейнасці польскіх палітычных і грамадскіх арганізацый. Пачаліся працы па падрыхтоўцы літургіі на польскай мове. На жаданне дзяржаўных уладаў на Гарадзеншчыне, Беласточчыне і Віленшчыне былі чынены спробы ўвядзення казанняў на польскай мове і спявання царкоўнымі хорамі на заканчэнне літургіі польскіх патрыятычных песняў. Такія дзеянні вялі толькі да кампраметацыі кліру. Вернікі тады найчасцей масава пакідалі храмы.

У лістападзе 1938 года ў епіскапскі сан былі прыведзеныя два вайсковыя капеланы ў званні палкоўнікаў, якія лічылі сябе палякамі: Цімафей (Ежы Шрэтэр) і Мацвей (Канстанцін Сямашка). Гэтыя епіскапы разам з гарадзенскім епіскапам Савам пачалі інтэнсіўную працу на карысць змены культурнага аблічча Праваслаўнай царквы ў Польшчы. Вайна спыніла працэс пераўтварэння Праваслаўнай царквы ў Польшчы ў чыннік, які дапамагаў насаджваць польскае нацыянальнае жыццё ў паўночна-ўсходніх ваяводствах II Рэчы Паспалітай.

Раздзел 5

Яднанне пад савецкім скіпетрам (1939–1941)

Ад імя народа Заходняй Беларусі

Паводле пагаднення, падпісанага 23 жніўня 1939 года Нямеччынай і Савецкім Саюзам, вядомага пад назовам пакта Рыбентропа—Молатава, межы ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе кардынальна мяняліся. Падпісаны дакумент прадугледжваў вызначэнне заходняй мяжы СССР па лініі рэк Нарвы, Віслы і Сана. На другім баку гэтых рэк мелася знаходзіцца зона нямецкіх уплываў. Аднак гэта было толькі пагадненне, якое вызначала намеры абодвух бакоў. Нягледзячы на польска-нямецкую вайну, якая пачалася 1 верасня 1939 года, і ўступленне Чырвонай Арміі на тэрыторыю II Рэчы Паспалітай, перамовы наконт канчатковага падзелу зонаў уплыву ў Еўропе вяліся далей, і тэрыторыя Польшчы была толькі адным з элементаў палітычнага гандлю.

Нямецка-савецкі трактат аб дружбе і межах за 28 верасня 1939 года вызначаў супольную мяжу абедзвюх дзяржаў. За памяншэнне зоны ўплыву на тэрыторыі Польшчы савецкі бок атрымаў права вызначыць палітычны статус Летувы. Згодна з трактатам, паўночная частка мяжы СССР праходзіла па рэках Пісе, Нарве і Бугу. На савецкім баку апынулася амаль усё даваеннае Беластоцкае ваяводства і Ломжынскі павет, які да 1 верасня 1939 года уваходзіў у склад Варшаўскага ваяводства. З Беластоцкага ваяводства да немцаў адышлі Сувалкаўскі павет і некалькі гмінаў Аўгустоўскага павета.

Уступленне Чырвонай Арміі на тэрыторыю Польшчы 17 верасня 1939 года адбылося пад лозунгамі ўз'яднання беларускіх і ўкраінскіх земляў. Аднак планаваная савецкімі ўладамі заваёва тэрыторыі аж да ракі Віслы сведчыць пра тое, што лозунгі мелі толькі прапагандысцкі характар.

Вялікая перавага савецкіх войскаў над польскімі і загад маршала Рыдз-Сміглага аб унікненні сутычак з бальшавікамі спрыялі хуткаму паходу Чырвонай Арміі на захад. Да большых баёў дайшло пасля некалькіх дзён савецкага паходу ў ваколіцах Сапоцкіна, Далістова, Кадзяўцоў. Двухдзённая бітва за Горадню, якая адбылася 20—21 верасня, была самым вялікім боем на польска-савецкім фронце. 22 верасня Чырвоная Армія ўвайшла

ў Беласток і Берасце. У савецкі палон трапілі некалькі дзесяткаў тысяч польскіх жаўнераў і афіцэраў, якія насуперак міжнародным канвенцыям былі перададзеныя пад юрысдыкцыю савецкай палітычнай паліцыі — НКВД. 25 верасня ў Берасці адбыўся супольны парад савецкіх і нямецкіх войскаў.

Уваход Чырвонай Арміі па-рознаму ўспрымаўся беларускім насельніцтвам паўночна-ўсходніх ваяводстваў II Рэчы Паспалітай. У польскай літаратуры сфармаваўся даволі адназначны вобраз беларуса гэтага перыяду, які ставіў трыумфальныя аркі для прывітання савецкага войска, а пазней дапамагаў камісарам у пераследзе польскага насельніцтва. Процілегласцю беларуса паказваецца найчасцей паляк-патрыёт, які перажываў трагедыю радзімы і сваю ўласную, бо сам стаў першай ахвярай савецкага рэпрэсіўнага апарату. Тым часам рэчаіснасць была больш складаная, а палітычнае стаўленне грамадства да новай улады не адлюстроўвала нацыянальных падзелаў.

Несумнеўна, большыня беларускіх палітыкаў — ад нацыяналістаў да камуністаў — з задавальненнем успрынялі факт далучэння паўночна-ўсходніх тэрыторыяў польскай дзяржавы да Савецкай Беларусі. Кожная беларуская партыя ў II Рэчы Паспалітай у рознай форме ставіла сабе за мэту імкненне да аб'яднання беларускіх земляў. Палітыка польскіх урадаў пры канцы 30-х гадоў была для большыні беларускіх дзеячоў найбольш пераканаўчым аргументам, каб падтрымаць хоць якія змены. Менавіта так успрынялі падзеі пасля 17 верасня 1939 года нават тыя, хто ўцякаў ад бальшавікоў у нямецкую акупацыйную зону. Такая сітуацыя многімі беларускімі палітыкамі ўспрымалася як пераходная. Яны разлічвалі, і не без падставаў, на хуткі нямецка-савецкі канфлікт і дапамогу Нямеччыны ў пабудове беларускай дзяржавы[1].

Трыумфальныя аркі ў гонар Чырвонай Арміі ставіліся ўсюды там, дзе некалі дзейнічалі ячэйкі Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі або дзе грамадства асабліва адчула паліцэйскія рэпрэсіі да 1939 года. У прынцыпе цырымонія прывітання чырвонаармейцаў была аднолькавая ва ўсіх мясцінах, што сведчыць пра наперад падрыхтаваныя сцэнары.

У некалькіх мясцовасцях ад 17 да 25 верасня дайшло да сутычак паміж партызанскімі аддзеламі, арганізаванымі бела-

[1] Туронак Ю. Беларусь пад нямецкай акупацыяй. Мінск, 1993. С. 29.

рускімі і жыдоўскімі камуністамі, і падраздзяленнямі войска, паліцыі і польскіх добраахвотнікаў. Найболей такіх інцыдэнтаў здарылася на Гарадзеншчыне, дзе ўзброеныя групы партызанаў атакавалі маёнткі, пастарункі паліцыі і невялікія вайсковыя фармаванні. Захоп аддзелам беларускіх і жыдоўскіх камуністаў мястэчка Скідзеля і двухдзённая барацьба з высланымі з Гарадні карнікамі — жаўнерамі, паліцыянтамі і польскімі харцэрамі — у савецкай гістарыяграфіі атрымала назоў Скідзельскага паўстання[2]. Да польска-беларускіх сутычак пасля ўступлення Чырвонай Арміі дайшло таксама ў ваколіцах Ліды, Астрыны, Азёраў, Лунны і Зэльвы. Зброя, якой распараджаліся партызаны, а таксама хуткае фармаванне ўзброеных падраздзяленняў паказваюць, што дзеянні ў тылах польскай арміі планаваліся намнога раней. Апрача ваенных структураў, арганізаваных камуністамі, стыхійна стваралася нямала групаў рабаўніцкага кшталту. Пазней удзельнікі гэтых групаў намагаліся дапісаць да сваёй злачыннай дзейнасці рэвалюцыйную ідэалогію. Напады на абшарнікаў, .саднікаў, работнікаў лясной аховы, чыноўнікаў, паліцыянтаў і польскіх настаўнікаў не асуджаліся камандзірамі Чырвонай Арміі ці функцыянерамі НКВД. Наадварот, многія выпадкі гвалту, самасуду, помсты за ранейшыя крыўды адбываліся з іх ведама і дазволу нават пасля поўнага авалодання сітуацыяй савецкімі ўладамі.

Аднак трэба адзначыць, што ў цэлым антыпольскія эксцэсы ў паводзінах беларускага і жыдоўскага насельніцтва былі вялікай рэдкасцю, а шмат хто з польскіх інтэлігентаў і абшарнікаў знаходзілі ў беларускіх хатах схованку ад функцыянераў НКВД. Пераважная большыня беларусаў змену палітычнай сітуацыі ўспрымала з пэўнай асцярогаю і абыякавасцю. Стыхійна не паўставалі ні камітэты для вітання хлебам і соллю савецкіх камандзіраў, ні дыверсійныя аддзелы, а савецкае войска з прычыны свайго выгляду і паводзінаў замест энтузіязму выклікала паўсюднае здзіўленне.

Адразу ж пасля ўступлення Чырвонай Арміі праявілі актыўнасць вызваленыя з турмаў камуністы і дзеячы шматлікіх беларускіх палітычных, грамадскіх і культурных аб'яднанняў. Разам з зменай улады паўсюль чакалася радыкальная перабудова

[2] Wierzbicki M. Powstanie skidelskie 1939 r. // Białoruskie Zeszyty Historyczne. 1997. № 7. S. 75—99.

палітычных і грамадскіх дачыненняў з улікам асноўных інтарэсаў беларускага насельніцтва. Таму ў вёсках і мястэчках часта самастойна ствараліся рэвалюцыйныя сялянскія камітэты, арганізатары якіх пераймалі ролю гаспадароў дадзенай тэрыторыі. На павятовым і ваяводскім роўні на загад камандуючага войскамі Беларускага фронту Міхаіла Кавалёва ад 19 верасня 1939 года былі створаны часовыя ўправы, якія павінны былі заняцца "адбудовай грамадска-гаспадарчага жыцця на тэрыторыі Заходняй Беларусі" і наглядаць за дзейнасцю рэвалюцыйных камітэтаў (рэўкамаў). Часовыя ўправы былі ў прынцыпе органамі савецкай улады, прызначанымі камандзірамі Чырвонай Арміі, падраздзяленнямі НКВД і прысланымі з Савецкага Саюза партыйнымі актывістамі. Як правіла, часовыя ўправы папаўняліся прадстаўнікамі мясцовага беларускага і жыдоўскага, радзей польскага, насельніцтва.

21 верасня Кавалёў выдаў чарговы загад, якім упаўнаважыў часовыя ўправы арганізаваць народную міліцыю і рабочую гвардыю. Неўзабаве народная міліцыя, рабочая гвардыя і рэвалюцыйныя камітэты сталі галоўнымі інструментамі ўвядзення "рэвалюцыйнага парадку" на занятых абшарах. Не чакаючы ніякіх заканадаўчых актаў, рэўкамы пры падтрымцы народнай міліцыі і з маўклівай згоды часовых управаў пачалі рэквізаваць памешчыцкую і царкоўную зямлю. Рэквізавалі і дзялілі паміж парабкаў і малазямельных сялянаў коней, кароў, свіней, якія былі ўласнасцю двароў і плябаній. У гарадах створаныя часовымі ўправамі камісіі пераймалі заводы і вытворчыя ды паслуговыя прадпрыемствы, уладальнікі якіх наймалі рабочую сілу. Многія прадпрыемствы, гэтаксама як і памешчыцкія маёнткі, былі пакінутыя ўладальнікамі, якія ўцяклі, калі даведаліся пра надыход Чырвонай Арміі. Частка тых, якія засталіся, была арыштаваная ў першыя дні новай улады.

Рэўкамы і народная міліцыя, апанаваныя мясцовымі камуністамі, нават без загадаў часовых управаў ажыццяўлялі ўсе савецкія канцэпцыі грамадскага ладу. Абшарнікаў, духавенства, багатае мяшчанства, былых функцыянераў польскай дзяржавы, а таксама багатых сялянаў яны лічылі ворагамі савецкай улады. Усе названыя грамадскія станы, апрача хіба духавенства і сялянаў, былі польскай нацыянальнасці. У міліцыі, гвардыі і рэўкамах пераважалі беларусы і жыды. У такой сітуацыі складалася ўражанне нацыянальнага канфлікту, хоць пад рэпрэсіі

з боку навастварaных органаў падпадалі таксама беларускае кулацтва і інтэлігенцыя, праваслаўны клір, а таксама жыдоўскія гандляры і фабрыканты. Апошнія ў адрозненне ад польскіх прадпрымальнікаў нават не мелі куды ўцякаць ад бальшавікоў. У іх выпадку антысеміцкая фобія ў нямецкай акупацыйнай зоне была гэтаксама небяспечная, як камуністычная класавая барацьба на ўсходзе.

Становішча, якое склалася на занятых пасля 17 верасня 1939 года Чырвонай Арміяй землях, патрабавала, прынамсі, фармальнага юрыдычнага афармлення. Савецкія ўлады намерыліся паказаць свету, што іхная палітыка — гэта ажыццяўленне волі народаў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Тое, што здзейснена Чырвонай Арміяй, павінна было карыстацца паўсюднай падтрымкай насельніцтва занятых зямляў. Спектакль ладзіўся з уласцівым бальшавікам размахам, без увагі на рэальную сітуацыю і настроі грамадства.

5 кастрычніка 1939 года Часовая ўправа горада Беластока звярнулася да ўпр авaў астатніх гарадоў з заклікам склікаць Народны сход Заходняй Беларусі, які мусіць вызначыць дзяржаўную будучыню гэтага краю і яго грамадска-палітычны лад. Падрыхтоўкай сходу заняўся спецыяльна створаны Арганізацыйны камітэт, які распрацаваў парадак вылучэння дэпутатаў. Права прапанаваць сваіх кандыдатаў у дэпутаты атрымалі часовыя ўправы, рэвалюцыйныя сялянскія камітэты, падраздзяленні рабочай гвардыі і народнай міліцыі ды сходы працоўных калектываў. Згодна з абвешчаным "Парадкам арганізацыі выбараў дэпутатаў Народнага сходу Заходняй Беларусі" мелі яны выбірацца "ўсеагульным, роўным і тайным" галасаваннем.

Выбары ў Народны сход адбыліся 22 кастрычніка. Яны суправаджаліся паказным энтузіязмам на ладжаных уладамі мітынгах і дэманстрацыях. Некамуністычныя арганізацыі, як польскія і жыдоўскія, так і беларускія, нават пад час гэтых "усеагульных" выбараў не спрабавалі заяўляць аб сваёй прысутнасці. Паводле афіцыйных савецкіх звестак, у выбарах удзельнічалі 2 672 тысячы жыхароў Заходняй Беларусі — 96,7 % выбаршчыкаў. Больш за 90 % аддалі свае галасы за кандыдатаў, вызначаных сялянскімі камітэтамі, часовымі ўправамі, рабочай гвардыяй. Паводле гэтых жа крыніц, было абрана 926 дэпутатаў, у іх ліку 621 беларус, 127 палякаў, 72 жыды, 43 рускія, 53 украінцы і 10 прадстаўнікоў іншых нацый. Народны

сход, які адбыўся ў Беластоку, выказаўся за ўстанаўленне савецкай улады на ўсёй тэрыторыі Заходняй Беларусі, а праз дзень аднагалосна прыняў дэкларацыю аб далучэнні гэтых земляў да БССР[3]. Фармальнае ўлучэнне Заходняй Беларусі ў склад БССР адбылося 14 лістапада, калі прашэнне дэпутатаў, якое змяшчалася ў дэкларацыі Народнага сходу, разглядалася Вярхоўным Саветам БССР. Раней такую пастанову прыняў Вярхоўны Савет СССР.

30 кастрычніка Народны сход выканаў яшчэ адну дырэктыву бальшавіцкіх уладаў — прыняў дэкларацыю аб канфіскацыі панскіх земляў разам з усёй рухомай і нерухомай маёмасцю. Адпаведна гэтым жа законам канфіскавалася зямля каталіцкіх і праваслаўных манаскіх ордэнаў і асобаў, якія да 17 верасня 1939 года займалі высокія дзяржаўныя пасады. У сапраўднасці гэтая дэкларацыя санкцыянавала ўсё тое, што здарылася ў першыя дні савецкага панавання.

У выніку вайны і палітычных зменаў у Еўропе восенню 1939 года тэрыторыя БССР павялічылася больш чым на 100 тыс. кв. км і насельніцтва на 4,7 млн. У склад Савецкай Беларусі ўвайшлі таксама некаторыя раёны, населеныя толькі палякамі або з перавагай польскага насельніцтва. Новыя межы не адлюстроўвалі праўдзівай нацыянальнай структуры і былі найперш вынікам кампрамісу паміж Сталіным і Гітлерам у ходзе падзелу зонаў уплываў у Еўропе.

У сувязі з планаванай анексіяй Летувы савецкі ўрад дзеля нейтралізацыі спадзяванай адмоўнай рэакцыі летувісаў перадаў ім частку заваяванай тэрыторыі — Віленскую вобласць плошчаю 6,9 тыс. кв. км. У лістападзе 1940 года бальшавікі адрэзалі ад БССР яшчэ 2,6 тыс. кв. км плошчы з 300 тысячамі насельніцтва і перадалі іх Летуве. Пры канцы 1940 года плошча Савецкай Беларусі складала 223 тыс. кв. км і насельніцтва, паводле афіцыйнай статыстыкі, 10,2 млн жыхароў. У сувязі з тым што перапісы насельніцтва тады не праводзіліся, але працягваліся масавыя дэпартацыі ды расстрэлы "ворагаў народа", гэтая лічба, праўдападобна, не адлюстроўвала сапраўднага становішча.

---

[3] Народное (национальное) собрание Западной Белоруссии 28—30 октября 1939 г.: Стеногр. отчет. Минск, 1946. С. 128—130.

Усталяванне савецкай сістэмы ўлады ў Заходняй Беларусі

5 снежня 1939 года Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР правёў новы адміністрацыйны падзел земляў, якія да 17 верасня 1939 года знаходзіліся ў складзе польскай дзяржавы. Было створана пяць вобласцяў: Баранавіцкая, Беластоцкая, Берасцейская, Пінская і Вілейская. Вобласці дзяліліся на раёны згодна з прынцыпам, што кожны раён павінны налічваць 35—50 тысяч жыхароў. На абласным і раённым роўні адміністрацыйную ўладу ажыццяўлялі выканаўчыя камітэты Саветаў дэпутатаў працоўных. Прэзідыум Вярхоўнага Савета зацвярджаў склад аблвыканкамаў, а тыя — райвыканкамаў. Райвыканкамы вызначалі работнікаў вясковых кіраўнічых органаў — сельсаветаў. Аднак толькі ў сакавіку 1940 года ўлада часовых управаў была канчаткова замененая выканаўчымі камітэтамі.

Паралельна з з'яўленнем структураў дзяржаўнай адміністрацыі ствараліся камітэты Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі. У сувязі з тым што камітэты КП(б)Б у дачыненні да выканаўчых камітэтаў Саветаў дэпутатаў працоўных былі вышэйшымі ўстановамі, у іх кіраўнічыя органы прынцыпова прызначалі камуністаў, якія прыбылі сюды з усходу. На пераломе 1939 і 1940 гадоў 4 500 партыйных функцыянераў з Менска і Масквы былі накіраваныя на працу ў заходнія вобласці БССР. Партыйныя ячэйкі папаўняліся галоўным чынам людзьмі, якія да гэтай пары не ўдзельнічалі ў грамадскім жыцці. Неахвотна прымалі ў шэрагі партыі найбольш ідэйных камуністаў, якія раней былі сябрамі распушчанай Камінтэрнам КПЗБ[4]. З усходніх вобласцяў Беларусі прыбыло таксама 6 200 камсамольцаў з мэтай узяць пад ідэалагічную "апеку" моладзь, якая да гэтае пары знаходзілася ў рэчышчы "кулацкіх і буржуазных" уплываў. Апрача дзеячоў КП(б)Б і камсамола ў заходнія вобласці накіроўвалі таксама настаўнікаў, спецыялістаў савецкай адміністрацыі, гаспадаркі і культуры. Агулам да кастрычніка 1940 года была дэлегавана 31 тысяча цывільных работнікаў, каб арганізаваць грамадскае жыццё паводле мадэлі, што існавала ў БССР у 30-х гадах.

[4] Нарысы гісторыі Беларусі. Ч. 2. С. 259.

17 кастрычніка Цэнтральны Камітэт КП(б)Б загадаў прызначаць на кіраўнічыя пасады ў дзяржаўным апараце "мясцовых". У выніку да 21 чэрвеня 1941 года на работу ў аблвыканкамах, райвыканкамах і сельсаветах паступілі 18 060 чалавек, у іх ліку 10 245 палякаў, 4 451 беларус, 3 045 жыдоў і 329 расейцаў. Параўнаўча вялікая лічба палякаў, якія паступілі на працу ў савецкую адміністрацыю, была вынікам іх лепшай адукаванасці, прыдбанай з даваеннага перыяду. Палякі, калі вызваліліся ад першага шоку пасля разбурэння сваёй дзяржавы, таксама шукалі спосабаў пратрымацца ва ўмовах савецкай сістэмы. Прынцыпова, аднак, не бралі на работу людзей, якія да 17 верасня 1939 года працавалі ў дзяржаўнай адміністрацыі. Яны былі заменены новымі людзьмі, часта таксама палякамі, якіх навучалі на кароткатэрміновых курсах для новай наменклатуры. У галіне падбору кадраў нацыянальны крытэр у савецкай сістэме не адыгрываў значнай ролі. У выпадку з беларусамі найчасцей бралі тых, хто да гэтае пары не ўдзельнічаў у грамадскім жыцці. Зрэшты, беларусы ўпершыню апынуліся ва ўсіх дзяржаўных структурах — адміністрацыі, судзе, пракуратуры. Гэта было магчымым таксама таму, што ад іх не патрабавалася адпаведная кваліфікацыя, а толькі акрэсленае грамадскае паходжанне і адпаведнае палітычнае стаўленне да рэчаіснасці. Старшынёю сельсавета, штатным работнікам партыі або інструктарам камсамола часта станавіўся той, у каго было шмат дзяцей, мала зямлі і ў каго замест абраза вісеў партрэт Сталіна.

Эканамічная палітыка

Ад першых месяцаў савецкай улады ў Заходняй Беларусі ўвасабляліся ў жыццё асноўныя лозунгі камуністычнай дактрыны, што разам з ліквідацыяй "варожых грамадскіх класаў" паскарала тэмпы саветызацыі гэтай тэрыторыі. Пасля падзелу панскіх маёнткаў павялічылася плошча дробных гаспадарак. Дадатковыя надзелы даставаліся пераважна беларускім сялянам.

Напрыканцы верасня 1939 года часовыя ўправы і рэвалюцыйныя сельскія камітэты абвяшчалі ў паасобных раёнах перыяд вольніцы — неабмежаванага доступу да лясоў. Гэта спрыяла забеспячэнню сялянаў недаступнай ім да гэтай пары драўнінай, якую выкарыстоўвалі для будаўніцтва і апалу. І хоць новыя адміністрацыйныя структуры ў выглядзе выканаўчых камітэ-

таў адмянілі вольніцу, аднак нелегальны гандаль драўнінай на выгадных для мясцовага насельніцтва ўмовах не спыняўся. Ім займаліся і савецкія афіцэры, і цывільныя службоўцы. У якасці аплатнага сродку найчасцей выкарыстоўвалася гарэлка.

У першыя месяцы савецкай улады выразна палепшылася матэрыяльнае становішча вясковага насельніцтва. На гэта паўплывала галоўным чынам змяншэнне павіннасцяў на карысць дзяржавы і зніжэнне цэнаў на прамысловыя тавары. Даступнасць танных тавараў сталася, аднак, кароткачасовай. Праз некалькі месяцаў, калі вычарпаліся запасы ў польскіх складах, перанятых савецкімі ўладамі, і калі былі абмежаваныя пастаўкі прамысловых тавараў з глыбі СССР, з'явіліся тут забытыя ўжо чэргі. У 1940 годзе можна было лёгка зарабіць грошы, але цяжка было за іх нешта купіць. Таннасць палатна, цукерак, газы, прадметаў шырокага спажывання была прычынай таго, што вясковае насельніцтва шмат часу праводзіла ў чэргах перад крамамі, якія знаходзіліся ў раённых або абласных цэнтрах.

Вялікая колькасць войска, што дыслакавалася ў памежных раёнах, выклікала падвышаны попыт на харчовыя прадукты і гэтым самым стварала сялянам магчымасць заробку. Аднак плацілі ім грашыма, якія не гарантавалі магчымасці купіць патрэбныя для гаспадаркі тавары. У сярэдзіне 1940 года у самыя заходнія вобласці СССР пайшлі абарончыя інвестыцыі — на будаўніцтва аэрадромаў, мастоў, віядукаў, пад'язных дарог. У якасці працоўнай сілы выкарыстоўвалася мясцовае насельніцтва. Частку работ на гэтых аб'ектах яно выконвала ў рамках шарваркаў, за частку атрымоўвала грошы. Вайсковае будаўніцтва, з аднаго боку, спрыяла змякчэнню перанаселенасці сельскіх гаспадарак, але з другога — не стварала сталых месцаў работы.

На вайсковыя будаўнічыя пляцоўкі прывозілі таксама зняволеных з глыбі Расеі. Улады не змаглі поўнасцю ізаляваць іх ад мясцовах жыхароў. Расказы тых пра сітуацыю ў СССР — пра калектывізацыю, голад, рэпрэсіі — паступова развенчвалі міф аб рабоча-сялянскай уладзе ў гэтай краіне, які ствараўся левымі арганізацыямі ў міжваенны перыяд і савецкай прапагандай пасля 17 верасня 1939 года. Некаторыя вязні былі асуджаныя да шматгадовага зняволення за крадзеж галоўкі капусты ці некалькіх каласкоў пшаніцы на калгасным полі, бо хацелі выра-

таваць сваіх дзяцей ад голаду. Паявіліся жудасныя аповяды пра галодную смерць і канібалізм на Украіне. На агульны здзіў, нават найбяднейшых сялянаў зняволеныя называлі кулакамі, бо тыя мелі каня, карову і некалькі гектараў зямлі. Савецкія вязні, пераважна калгаснікі, уяўлялі сабе, што Чырвоная Армія, калі перасячэ польскую граніцу, сустрэне запрэжаных у ярмо мясцовых сялянаў, якія цягнуць плугі на панскім полі.

У першых месяцах савецкай улады невыноснай была не велічыня падатку або шарварку, але спосаб іх спагнання. Шарваркі часта ладзіліся пад час самых важных царкоўных святаў, калі людзі ішлі на набажэнства. У многіх раёнах збожжанарыхтоўчыя планы загадвалі выканаць яшчэ ў ходзе жніва. Абсурдныя пастановы засланых сюды савецкіх чыноўнікаў прымушалі задумацца нават заўзятых прыхільнікаў новай улады.

Найбольш жахлівай сталася барацьба з кулацтвам, якая з асаблівым размахам пачалася пры канцы 1940 года. Кулаком лічылі кожнага, у каго было больш за дзесяць гектараў зямлі, некалькі коней і кароў або дахоўка на доме замест саламянай страхі. Патэнцыйна ў гэтую групу можна было занесці бальшыню сялянаў. Змаганне з кулацтвам стала адным з этапаў на шляху да калектывізацыі. Бальшавікі ў гэтай галіне былі ўжо даволі спрактыкаваныя і таму стварэнне калгасаў у заходніх вобласцях Беларусі хацелі правесці больш плаўна, каб не выклікаць такіх, як на ўсходзе, грамадскіх і эканамічных узрушэнняў. Найбольш інтэнсіўна калектывізацыю праводзілі на былой польска-савецкай мяжы. Да канца 1940 года на тэрыторыі пяці новадалучаных вобласцяў было створана 646 калгасаў, а да чэрвеня 1941 г. — 1 115. За гэты час лік сялянскіх гаспадарак скараціўся толькі на 7 %.

Самымі павольнымі тэмпамі калектывізацыя ішла ў Беластоцкай вобласці. Тут калгасы арганізоўвалі толькі на землях, населеных беларусамі, — створана было толькі 18 калектыўных гаспадарак. На захад ад Беластока, на этнічна польскіх землях, калектывізацыю не праводзілі. Вылучаўся хіба калгас у Ломжынскім раёне, у якім працавалі пераважна работнікі жыдоўскай нацыянальнасці. Мабыць, іншае стаўленне да населеных палякамі земляў вынікала з планаў Сталіна стварыць польскую аўтаномную вобласць у якасці зародку польскай савецкай рэспублікі. Будаўніцтва аэрадромаў у памежнай зоне паказвала,

што яны прызначаліся не толькі для абароны і што існуючае палітычнае становішча ў Маскве лічылася часовым.

У калектыўных гаспадарках Беласточчыны большасць палявых работ выконвалі тады жанчыны. Мужчынаў вывозілі будаваць дарогі, масты, аэрадромы. Заробкам за працадзень на калгасным полі была міска пшаніцы ёмістасцю адзін літр. Найчасцей сельскагаспадарчымі кааператывамі кіравалі прысланыя з СССР камсамольскія актывісты. Іх агратэхнічныя веды і спосаб кіравання сталіся прычынай таго, што калгасы выглядалі пародыяй гаспадарання.

Не зважаючы на эскалацыю запалохвання сялянаў шляхам чарговага вывазу багацейшых сем'яў у глыб Расеі, павелічэння падаткаў ды іншых павіннасцяў на карысць дзяржавы, тэмпы калектывізацыі не паскараліся. У красавіку 1941 года Цэнтральны Камітэт ВКП(б) вызначыў максімальныя нормы плошчы сялянскіх гаспадарак у заходніх вобласцях БССР памерам 10, 12, 15 гектараў залежна ад класу зямлі. Раней было забаронена наймаць рабочую сілу або здаваць зямлю ў арэнду. Невядома, як доўга дзейнічаў бы гэты закон, але ён, несумнеўна, быў больш лагодны за сістэму, якая панавала на ўсходзе Беларусі.

Паралельна з калектывізацыяй вёскі пачалася акцыя стварэння рамесніцкіх кааператываў, якая ліквідавала местачковую дробную вытворчасць, паслугі і гандаль. У выніку знішчэння структуры дробнага гандлю пагоршылася таксама сістэма забеспячэння гарадскога насельніцтва прадуктамі. Адзяржаўлены гандаль неўзабаве прывёў да перманентнай нястачы тавараў і чэргаў ля крамаў.

Некалькі дзесяткаў тысяч рамеснікаў былі накіраваныя на працу ва Усходнюю Беларусь, дзе былі прынятыя на работу на заводы Менска, Оршы, Гомеля, Віцебска. У выніку прытоку рабочай сілы з заходніх вобласцяў некаторыя прадпрыемствы ў гэтых гарадах ад сярэдзіны 1940 года мусілі працаваць на тры змены. Адначасова з ідэалагічных прычынаў рабілі намаганні, каб знайсці дадатковыя працоўныя месцы ў заходняй частцы краіны. Тут таксама амаль адзіным спосабам было ўвядзенне трохзменнай сістэмы працы. Такім чынам, без ніякіх інвестыцый некаторыя заводы Беластока, Горадні, Баранавічаў, Берасця ўтрая павялічылі колькасць працоўных месцаў, беручы на работу беспрацоўных, сялянаў і колішніх рамеснікаў.

Асветная, культурная і канфесійная палітыка

У адпаведнасці з пастановай Савета Народных Камісараў БССР "Аб метадах арганізацыі асветы ў заходніх абласцях Беларускай Рэспублікі" ад снежня 1939 года раённыя ўлады былі абавязаны ствараць школы з такой мовай выкладання, якая адпавядала б нацыянальнаму складу дадзенай тэрыторыі і спадзяванням насельніцтва. Пры канцы 1939 года ў выніку рэарганізацыі структуры школьніцтва павялічылася колькасць няпоўных сярэдніх школаў на 713. Паводле дадзеных Наркамата асветы БССР ад жніўня 1940 года ў 1939/40 навучальным годзе ў заходніх вобласцях працавалі 5 633 школы, у іх ліку з беларускай мовай навучання — 4 268, польскай — 923, расейскай — 173, ідыш — 150, летувіскай — 61, украінскай — 49[5]. Сетка школаў у прынцыпе адпавядала нацыянальнаму складу насельніцтва. У Беластоцкай вобласці, дзе бальшыню насельніцтва складалі палякі, 58,7 % школ працавала на польскай мове, а на беларускай — 33,8 %, ідыш — 4,5 %, расейскай — 1,7 %, летувіскай — 1,3 %. Для беларускамоўных каталікоў Сакольскага раёна і некаторых раёнаў Гарадзеншчыны былі створаны польскія школы на той падставе (як і ў часы польскай адміністрацыі), што пра нацыянальнасць на гэтай тэрыторыі сведчыць веравызнанне.

Арганізаваная ў 1939 годзе сетка школаў з нацыянальнымі мовамі выкладання не была вынікам заклапочанасці савецкіх уладаў ні развіццём гэтых моваў, ні пашанай да культуры тутэйшага насельніцтва. На тэрыторыі Усходняй Беларусі школьніцтва ў той час працавала пераважна на базе расейскай мовы. Палітыка ў заходніх вобласцях краіны вынікала з пэўнай кан'юнктуры. У сувязі з планаваным далучэннем прыбалтыйскіх краінаў бальшавікі імкнуліся даказаць, што савецкая ўлада не пагражае нічым нацыянальным інтарэсам, а яе інтэрнацыянальны характар не падлягае сумневу. У 1940/41 навучальным годзе сістэматычна скарачалася колькасць школ з беларускай мовай, якая замянялася на расейскую. Кіраўнікамі школьнай адміністрацыі і дырэктарамі школаў прызначалі людзей ра-

[5] Народное образование в БССР. 1928—1941 // Сб. док. и материалов. Минск, 1980. Т. 2. С. 359—362.

сейскага паходжання, якія не ведалі ні беларускай, ні польскай, ні жыдоўскай моваў. Напрыклад, у Беластоку было 13 польскіх школаў, у якіх дырэктарамі было адзінаццаць прысланых з Расеі і двое мясцовых рабочых[6]. Ва ўсіх тыпах школаў было ўведзена вывучэнне гісторыі СССР, а выкладалі гэты прадмет перш за ўсё партыйныя актывісты, якія прыехалі з Расеі, Усходняй Беларусі і Украіны. Спачатку ва ўсіх нацыянальных школах абавязкова выкладалася беларуская мова, а з восені 1940 года — расейская.

У адпаведнасці з пастановай Наркаматата асветы БССР школьніцтва ў памеры сямі класаў на тэрыторыі ўсёй рэспублікі было бясплатнае і абавязковае. Улады дбалі, каб апошняе патрабаванне бацькі выконвалі няўхільна. У сувязі з гэтым савецкія школы наведвалі на 25 % дзяцей больш, чым польскія ўстановы адукацыі да 1939 года. З мэтай ліквідацыі непісьменнасці арганізоўвалі курсы чытання і пісання для старэйшай моладзі і дарослых.

Каб забяспечыць школьніцтва адпаведнымі кадрамі, у Беластоку быў створаны педагагічны інстытут, у Баранавічах, Горадні і Пінску — інстытуты навучання настаўнікаў, а ў Берасці, Маладзечне, Навагрудку і Лідзе — настаўніцкія курсы. Даваенная польская гімназія і настаўніцкія курсы для асобаў рабочага і сялянскага паходжання лічыліся дастатковай адукацыяй, каб атрымаць працу ў школе. У заходнія вобласці было пераведзена з Усходняй Беларусі больш за 700 настаўнікаў. Школьная адміністрацыя ўхілялася, аднак, браць на працу ў якасці настаўнікаў асобаў, якія працавалі ў польскай асвеце да 1939 года.

Да кастрычніка 1940 года ў школах на тэрыторыі заходніх абласцяў БССР былі надрукаваны і распаўсюджаны 64 найменні падручнікаў на расейскай мове, 44 — на польскай, 43 — на ідыш і 39 — на беларускай. Падручнікі былі адным з фактараў, якія спрыялі пераводу выкладання з беларускай мовы на расейскую. Сістэма падрыхтоўкі настаўнікаў на расейскай мове, выдавецкая і кадравая палітыка ў школах паказвалі, што савецкія ўлады імкнуліся уніфікаваць сістэму навучання ва ўсёй БССР паводле мадэлі, якая панавала на ўсходзе рэспублікі.

[6] Jackiewicz S. Oświata narodowa na Białorusi Zachodniej w latach 1939—1941 // Społeczeństwo białoruskie, litewskie i polskie na ziemiach północno-wschodnich II Rzeczypospolitej w latach 1939—1941. Warszawa, 1995. S. 163.

А гэта азначала непазбежную русіфікацыю асветы і ў заходніх вобласцях.

Савецкая асветная сістэма перш за ўсё павінна была фармаваць перакананне ў вышэйшасці камуністычных стандартаў жыцця над усялякімі формамі, якія існуюць у капіталістычных краінах. Папаўненнем традыцыйных школьных ведаў былі курсы грамадзянскай адукацыі, якія наладжвалі спецыяльна падрыхтаваныя групы агітатараў на заводах, у вясковых клубах, у вышэйшых навучальных установах. У вёсках і мястэчках арганізоўвалі хаты-чытальні, дамы сацыялістычнай культуры або чырвоныя куткі, у якіх збіраліся экспанаты-доказы адвечнага імкнення жыхароў дадзенай мясцовасці да савецкай сістэмы.

Савецкія ўлады шмат увагі аддавалі культурнай актывізацыі грамадства, асабліва самадзейнасці. У кожнай вялікай вёсцы працавалі гурткі самадзейнікаў, ладзіліся дэкламатарскія конкурсы і фестывалі рэвалюцыйнай песні. Для абслугі святкаванняў, якія значыліся ў савецкім календары, прыцягвалі лепшых музыкантаў, танцораў і спевакоў.

Самым надзейным сродкам дзеля прапаганды савецкай мадэлі жыцця і камуністычных вартасцяў было кіно. У гарадах Заходняй Беларусі ў 1939—1941 гадах колькасць кінатэатраў павялічылася ўтрая. Асаблівая роля ў галіне ідэалагізацыі вясковага жыхарства належала перасоўным кінаўстаноўкам. Бальшыня сялянаў бачыла рухомы вобраз на сцяне ўпершыню. Кінакарціна як тэхнічная з'ява так моцна ўздзейнічала на ўяўленне, што на яе дэманстрацыю сыходзіліся сяляне з аддаленых вёсак. Гэта была для іх вялікая інтэлектуальная прыгода, якую падаравала савецкая ўлада. Героі экрана, якія ігралі ролі чэкістаў часоў бальшавіцкай рэвалюцыі, перадавікоў індустрыялізацыі і калектывізацыі, станавіліся маральнымі ўзорамі для мясцовай моладзі.

Падобную ролю мелі выконваць літаратура і друк. У кожным раёне была свая газета. Спачатку большасць рэспубліканскіх, абласных і раённых перыядычных выданняў выдавалася на беларускай мове. Пад канец 1940 года ў друку пачала пераважаць расейская мова. Выходзіла таксама 8 газет на польскай мове, у іх ліку дзве рэспубліканскія — "Піянер" (Pionier) і "Сцяг свабоды" (Sztandar Wolności). Словы "свабода, вольнасць" красавалі таксама і ў загалоўках дзвюх польскамоўных

лакальных газет — раённай "Свабодная Ломжа" (Wolna Łomża) і беластоцкай абласной "Вольная праца" (Wolna Praca).

Пад час уступлення Чырвонай Арміі на тэрыторыю II Рэчы Паспалітай здарыўся шэраг выпадкаў разбурэння цэркваў, касцёлаў, сінагог і манастыроў савецкімі салдатамі і мясцовымі партызанамі. Загінулі некалькі дзесяткаў святароў розных канфесій. У першыя месяцы савецкай улады, апрача канфіскацыі зямлі, бальшавікі не арганізоўвалі масавых акцыяў супраць храмаў і рэлігійных супольняў. Набажэнствы ў цэрквах, касцёлах, сінагогах звычайна адбываліся без перашкодаў.

Увесну 1940 года бальшавікі і ў рэлігійнай сферы пачалі праводзіць палітыку, падобную да той, якую дзесяцігоддзямі ўкаранялі ў Савецкім Саюзе. Яны зыходзілі з таго гледзішча, што інтэграцыя краіны патрабавала ліквідацыі канкурэнтных светапоглядаў і ідэалогій. У сакавіку 1940 года забаранілі выкладаць рэлігію ў школах. Неўзабаве шмат каго з святароў розных веравызнанняў арыштавалі і абвінавацілі ў супрацоўніцтве з польскімі ўладамі да 1939 года. Найбольшыя рэпрэсіі зазнаў праваслаўны клір, бо беларусы, якія складалі бальшыню вернікаў гэтага веравызнання, былі прызнаныя найбольш падаткімі светапоглядна пераарыентацыі. Часта арыштаваных духоўных замянялі на асобаў, паводзіны якіх абражалі святарскі чын. Гэта быў адзін з метадаў кампраметацыі рэлігіі і інстытуцый Царквы ў вачах вернікаў. Бальшыня святароў была пазбаўленая права карыстацца прыхадскімі дамамі, якія перадавалі ў распараджэнне арміі, райвыканкамаў ці сельсаветаў. Некаторых святароў абкладалі такімі падаткамі, што яны нават з дапамогай вернікаў свайго прыходу не маглі заплаціць. Неўзабаве канфесійныя супольні мусілі плаціць таксама арэнду за карыстанне сакральнымі аб'ектамі — цэрквамі, касцёламі, сінагогамі. Памеры арэндной платы вызначалі райвыканкамы залежна ад таго, ці планавалася перадаць дадзены сакральны аб'ект нейкай савецкай установе, ці не. У першым выпадку вызначаліся вялікія аплаты, несувымерныя з фінансавымі магчымасцямі прыхаджанаў. Запазычанасць абазначала неадкладную канфіскацыю храма. Такім чынам цэрквы, касцёлы, сінагогі ператваралі ў кінатэатры, дамы народнай культуры, участкі НКВД, стайні, майстэрні, фабрыкі, казармы або турмы[7].

[7] Sword K. Polityka wyznaniowa władz sowieckich na terenie Białorusi Zachodniej w latach 1939—1941 // Społeczeństwo białoruskie, litewskie i polskie... S. 150.

Бальшыня духоўных мела, аднак, магчымасць весці большменш нармальную душпастырскую дзейнасць. Улады ўвялі толькі пэўныя абмежаванні ў выкананні рэлігійных паслугаў. Была катэгарычна забаронена ўсялякая рэлігійная дзейнасць па-за сценамі храма. Забаранілі таксама, каб клір па-за царквой паказваўся публічна ў рызе, каб званілі царкоўныя званы пад час рэлігійных урачыстасцяў.

Многія райвыканкамы вызначылі кліру на сваёй тэрыторыі такі сама шарварак, як і для сялянаў. Фізічная праца духавенства лічылася перавыхаваннем "паразітычных элементаў". У сапраўднасці гэта была форма прыніжэння кліру. У другой палове 1940 года паўсюль назіраліся выпадкі парушэння набажэнства камсамольцамі і салдатамі. Урыванне групы маладых камуністаў у царкву пад час нядзельнага набажэнства на практыцы азначала спыненне традыцыйнага літургічнага парадку. У траўні 1940 года шлюбы, хрышчэнні і пахаванні, здзейсненыя ў цэрквах, сінагогах і касцёлах, у святле дзяржаўных законаў перасталі мець якое-небудзь значэнне.

У школах, на прадпрыемствах і вясковых сходах шмат увагі надавалася атэістычнай прапагандзе. Грамадству прапаноўвалі плойму кніжак, брашураў, афішаў, лістовак антырэлігійнага зместу. Улюбёным заняткам прысланых з усходу настаўнікаў было прымушэнне дзяцей прасіць цукерак спачатку ў Бога, перад іконай, а пасля ў Сталіна, перад ягоным партрэтам. Эмпірычным шляхам яны пераконвалі дзяцей, што толькі Сталін уладны даць людзям усё, што ім трэба, адгукацца на іх патрэбы, караць вінаватых. Школа пераносіла ўсялякія атрыбуты Бога на правадыра сусветнага камуністычнага руху.

Арышты і дэпартацыі

У адпаведнасці з савецкім заканадаўствам прыналежнасць да некаторых грамадскіх станаў і прафесійных групаў лічылася злачынствам. Уладальнікі прадпрыемстваў, якія наймалі рабочую сілу, абшарнікі, багатыя сяляне, клір, паводле азначэнняў савецкага заканадаўства, — гэта "контррэвалюцыйны, антысавецкі і антысацыялістычны элемент". Таксама ўсялякія фармальныя сувязі паасобных людзей з структурамі буржуазнай дзяржавы, а датычыла гэта найперш вайскоўцаў, паліцыянтаў, турэмшчыкаў, лясной аховы, чыноўнікаў, кваліфікаваліся таксама як сувязі з "ворагамі народа". Злачынцамі, паводле савец-

кага права, былі таксама сябры "буржуазных", "кулацкіх" і "контррэвалюцыйных" палітычных партыяў. На практыцы гэта датычыла ўсіх асобаў, якія да 1939 года ўдзельнічалі ў палітычным жыцці па-за структурамі камуністычных арганізацый. Савецкая рэчаіснасць 30-х гадоў паказала, што пералічаныя "злачынствы" не падлягалі даўнасці. Пашырэнне ў 1939 годзе межаў СССР на захад азначала таксама ўвядзенне на далучаных абшарах савецкага заканадаўства.

На тэрыторыі заходніх вобласцяў БССР пад пагрозай знішчэння апынулася шмат асобаў, якія належалі да "злачынных" станаў. Перад вайною грамадскую эліту на гэтым абшары складалі пераважна палякі і ў сувязі з гэтым яны пад час укаранення савецкай законнасці пацярпелі найболей. Рэпрэсіі пры ўдзеле вайскоўцаў Чырвонай Арміі і функцыянераў НКВД пачаліся ад першых дзён усталявання савецкай улады. Да сярэдзіны кастрычніка 1939 года арыштавалі амаль 3,5 тысячы чалавек, галоўным чынам гэта былі палітычныя дзеячы, паліцыянты, памежнікі і чынавенства.

На тэрыторыі заходніх вобласцяў Беларусі і Украіны Чырвоная Армія ўзяла ў палон 14 736 польскіх афіцэраў, паліцыянтаў, жандараў, турэмнікаў і супрацоўнікаў выведкі. Амаль 97 % палонных складалі палякі. Іншыя нацыянальныя групы ў гэтых прафесіях мелі нязначны працэнт. Ваеннапалонных армія перадала органам НКВД. У адпаведнасці з распараджэннем шэфа гэтага ведамства Лаўрэнція Берыі ад 25 сакавіка 1940 года ўсе асобы, затрыманыя ў заходніх вобласцях Беларусі і Украіны, з прычыны закаранелай варожасці да савецкай улады павінны быць асуджаныя ў неадкладным парадку і расстраляныя. Функцыянеры, якія разглядалі справы арыштаваных афіцэраў, абшарнікаў, фабрыкантаў, чыноўнікаў, перадваенных палітычных дзеячоў, былі вызваленыя ад абавязку кантактаваць з абвінавачанымі, слухаць іх паказанні, знаёміць іх з абвінаваўчымі актамі і зачытваць прысуды. Палітбюро ЦК ВКП(б) ухваліла прапановы Берыі, вызначаючы такім чынам лёс арыштаваных. Фармальна, аднак, прысуды выдавала тройка работнікаў Менскага НКВД: Усевалад Мяркулаў, Амяк Кабулаў, Баштакоў[8].

Рашэннем Берыі ад 5 снежня 1939 года з заходніх вобласцяў

[8] Chackiewicz A. Aresztowania i deportacje społeczeństwa zachodnich obwodów Białorusi (1939—1941) // Społeczeństwo białoruskie, litewskie i polskie... S. 121.

Беларусі высяленню падлягалі работнікі лясной аховы і вайсковыя асаднікі. Першыя абвінавачваліся ў вайсковым навучанні і падрыхтоўцы да ўдзелу ў ваенных дзеяннях супраць СССР, другія — у захопе чужой уласнасці па волі буржуазнага польскага ўрада і ў прыхільнасці ды адданасці гэтаму ўраду. На загад кіраўніка НКВД БССР Лаўрэнція Цанавы ад 25 снежня 1939 года да 5 студзеня 1940 года раённыя выканаўчыя камітэты склалі спісы сем'яў асаднікаў і работнікаў лясной аховы. Каб прадухіліць спробы ўцёкаў або супраціву, аперацыя высялення гэтых групаў насельніцтва рыхтавалася амаль як ваенная акцыя. У паасобных раёнах і вобласцях наперад былі прызначаныя кіраўнікі аперацыі і акрэсленыя іх паўнамоцтвы. Звычайна кіраванне акцыяй па высяленні перадавалася шэфам НКВД дадзенага роўню. У распараджэнне палітычнай міліцыі ў Заходнюю Беларусь з усходніх вобласцяў прыслалі 2 тысячы работнікаў гэтага ведамства і амаль 7 тысяч чырвонаармейцаў і міліцыянтаў. Былі створаны 4 тысячы аперацыйных групаў, якія меліся браць удзел у ажыццяўленні перасяленчай акцыі. Усяляк дапамагаць у правядзенні гэтай аперацыі абавязаны былі таксама кіраўніцтвы ўсіх інстанцый партыі і камсамола. Былі падрыхтаваныя адпаведныя чыгуначныя эшалоны, а нагляд за імі ўсклалі на работнікаў НКВД.

На пачатку лютага Цанава пераслаў Берыю і першаму сакратару ЦК КП(б)Б Панцеляймону Панамарэнку камплектныя спісы людзей, якія падлягалі дэпартацыі. У іх была 51 тысяча прозвішчаў. Акцыя пачалася ўранку 10 лютага 1940 года ва ўсіх раёнах адначасова. На працягу гэтага дня ў вагоны пагрузілі 50 тысяч чалавек. Не трапіліся толькі тыя, каго ў той дзень не было дома, і цяжка хворыя. Раней падрыхтаваныя гаспадарчыя групы заняліся вопісам маёмасці, якая засталася ад вывезеных асаднікаў і работнікаў лясной аховы.

У сакавіку НКВД пачаў падрыхтоўку да другой высяленчай аперацыі, накіраванай гэтым разам супраць сем'яў асобаў, якія апынуліся ў лагерах, турмах, уцяклі за мяжу, арыштаваных раней паліцыянтаў, жандараў, фабрыкантаў, абшарнікаў, дзеячоў некамуністычных палітычных партый. Другі этап высялення адбыўся 13 красавіка 1940 года. У Сібір і Казахстан у гэты дзень выслалі з Беларусі 24 тысячы чалавек.

29 чэрвеня 1940 года быў праведзены трэці этап высялення, скіраваны супраць тых, што ўцяклі з нямецкай акупацыйнай зоны. Пад яго трапілі як палякі, так і беларусы ды расейцы,

а найперш жыды, якія складалі амаль 90 % уцекачоў. Многія з іх належалі да гэтак званага эксплуататарскага класа і гэта яны галоўным чынам былі дэпартаваныя ў ходзе трэцяй аперацыі. З Беларусі тады выселілі 23 тысячы чалавек. Матывавалася гэта тым, што сярод уцекачоў з захаду маглі апынуцца нямецкія шпіёны. Дзеля прафілактыкі з памежнай зоны былі вывезеныя ўсе падазроныя.

Апошняя вялікая аперацыя масавага высялення адбылася 19 чэрвеня 1941 года. У вагоны грузілі тады галоўным чынам дзеячоў некамуністычных грамадскіх і палітычных арганізацыяў, якія дзейнічалі як у польскім, так і ў беларускім, расейскім і жыдоўскім асяроддзях. Дэпартавалі тады 22 тысячы чалавек.

Высяленні і дэпартацыі не абмежаваліся тымі чатырма аднадзённымі аперацыямі НКВД, скіраванымі супраць асобаў, грамадскі або прафесійны статус якіх кваліфікавалі паводле савецкага заканадаўства, як "ворагі народа". Сістэматычна праводзілі арышты асобаў, падазроных у прыналежнасці да нелегальных або антысавецкіх арганізацыяў. Віну часта вызначаў данос суседа або сваяка, які жадаў пазбыцца дадзенай асобы. У такіх справах не вялі ніякага следства, а падазроных высылалі ў Сібір або Казахстан.

Пачатак калектывізацыі азначаў з'яўленне чарговай групы асобаў, асуджаных на дэпартацыю. Датычыла гэта галоўным чынам сялянаў, маёмасны статус якіх або, напрыклад, выгляд дома вылучаліся сярод іншых. На 22 чэрвеня планавалася дэпартацыя некалькіх дзесяткаў тысяч кулакоў ды іх сем'яў, але выбух нямецка-савецкай вайны перашкодзіў ажыццяўленню гэтай аперацыі. Ваенныя дзеянні не спынілі, аднак, эшалонаў з высланымі 19 чэрвеня 1941 года. Машына НКВД старанна выконвала загады свайго цэнтра.

Паводле ацэнкі беларускага гісторыка Аляксандра Хацкевіча, да 20 чэрвеня 1941 года з заходніх вобласцяў Беларусі было вывезена ў Сібір або Казахстан больш за 120 тысяч чалавек[9]. У гэты лік не ўлучаныя больш за 14 тысяч польскіх афіцэраў, якіх забрала НКВД з чырвонаармейскіх лагераў для ваеннапалонных, ні арыштаваныя і асуджаныя перад высяленнем за гаспадарчыя і крымінальныя злачынствы.

[9] Chackiewicz A. Aresztowania i deportacje... S. 137.

Раздзел 6

Нямецкая акупацыя Беларусі

Адступленне Чырвонай Арміі

22 чэрвеня 1941 года нямецкае войска перасекла межы СССР, выклікаючы сярод камандзіраў памежных гарнізонаў вялікую збянтэжанасць. Такі варыянт развіцця падзеяў у штабах Чырвонай Арміі не разглядаўся. Хоць з абодвух бакоў мяжы перад 22 чэрвеня 1941 года была сабраная супастаўная колькасць салдатаў і ваеннай тэхнікі, у тым ліку танкаў, самалётаў, артылерыі, элемент неспадзяванасці забяспечыў у першыя дні вайны поўную перамогу Вэрмахта над Чырвонай Арміяй. Канцэнтрацыя савецкіх узброеных сілаў у памежнай зоне была б абгрунтаванай у выпадку наступлення, аднак сталася зусім непатрэбнай у абарончых дзеяннях, асабліва ў сутыкненні з нямецкай тактыкай клінападобных удараў танкавых войскаў.

У першы дзень вайны толькі на тэрыторыі Беларусі Чырвоная Армія страціла 738 самалётаў, у тым ліку 528 на аэрадромах. З прычыны адсутнасці якіх-небудзь планаў дзеяння на выпадак адступлення, большыня бранятанкавых войскаў і артылерыя аказаліся непрыдатнымі, а пакінутая вайсковая тэхніка папоўніла запасы нямецкага ўзбраення. Да паразы Чырвонай Арміі ў 1941 годзе ў пэўнай ступені спрычынілася знішчэнне афіцэрскага складу, праведзенае ў 1937—1939 гадах органамі сталінскага НКВД. У выніку тактычнымі злучэннямі камандавалі малодшыя афіцэры, зусім бездапаможныя ў канфрантацыі з вопытным у заваёве Еўропы камандным складам Вэрмахта.

За некалькі дзён змагання немцы захапілі ўсе землі, якія калісьці ўваходзілі ў склад II Рэчы Паспалітай. 28 чэрвеня яны занялі сталіцу Беларусі Менск. У ліпені большыня тэрыторыі рэспублікі апынулася пад іх кантролем. Толькі на паўднёва-ўсходніх ускраінах, у наваколлі Гомеля і Мазыра, савецкае войска знаходзілася да 22 жніўня.

Многае паказвае на тое, што пачатак вайны спаралізаваў дзейнасць найвышэйшых структураў кіраўніцтва СССР. Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі працаваў паводле раней распрацаваных інструкцыяў на выпадак вайны з якой-небудзь капіталістычнай краінай. 23 чэрвеня

1941 года ён выдаў партыйным і савецкім арганізацыям прыфрантавых вобласцяў дырэктыву па арганізацыі барацьбы з дыверсантамі і парашутыстамі. ЦК КП(б)Б загадаў, між іншага, арганізаваць кругласутачныя назіранні ваколіцы пешымі патрулямі і коннымі раз'ездамі, якія павінны былі складаць калгаснікі ды жыхары вёсак і мястэчак. Патрулі мусілі ахоўваць масты, чыгуначныя шляхі, тэлеграфныя і тэлефонныя станцыі. У адпаведнасці з дырэктывай ЦК на выпадак выяўлення нямецкіх салдатаў патруль абавязаны быў паведаміць пра іх у найбліжэйшую савецкую вайсковую часціну і, не чакаючы чырвонаармейцаў, пачаць ліквідацыю ворага з дапамогаю ўсялякай даступнай зброі — вілаў, сякераў, калоў, шабляў. Злоўленых дыверсантаў калгаснікі мусілі дастаўляць у вайсковыя часціны для допытаў[1]. Змест згаданай дырэктывы з'яўляецца доказам няведання савецкім кіраўніцтвам ваеннай рэчаіснасці. Кожная спроба выканаць загады ЦК КП(б)Б вяла б жыхароў рэспублікі на бессэнсоўную смерць. 28 чэрвеня Савецкае Інфармбюро паведаміла, што калгаснікі высачылі і ліквідавалі каля энскай вёскі ў Беларусі аддзел парашутыстаў з 50 чалавек, з ліку якіх 32 былі забітыя, а астатнія ўзятыя ў палон[2]. Малаверагодна, што такое магло здарыцца ў часе нямецка-савецкай вайны ў чэрвені 1941 года. Відаць, гэты ўзор паводзінаў савецкага чалавека быў створаны прапагандай у крытычнай сітуацыі, калі "сацыялістычная айчына" апынулася пад пагрозай. Адыход ад такога тыпу паводзінаў успрымаўся як здрада. Маланкавае наступленне нямецкіх войскаў і поўная дэзарганізацыя жыцця ў прыфрантавой зоне давялі да таго, што выкананне савецкіх ваенных законаў, асабліва ў заходніх вобласцях, зрабілася немагчымым.

28 чэрвеня Савет Народных Камісараў СССР і ЦК ВКП(б) выдалі дырэктыву да ўсіх партыйных камітэтаў і органаў выканаўчай улады ў прыфрантавой зоне, у якой паведамлялася, што, не зважаючы на страту Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ды Летувы і Латвіі, Чырвоная Армія змагаецца за кожную пядзю савецкай зямлі. Урад і партыя заклікалі камуністаў рабіць

---

[1] Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941— июль 1944): Документы и материалы. Минск, 1967. Т. 1. С. 48.

[2] Сообщения Советского Информбюро. Минск, 1944. Т. 1. С. 9.

усё, каб аслабіць сілы ворага. Рэкамендавалася весці змаганне за кожны горад, вёску, дом усімі даступнымі сродкамі. Дырэктыва абавязвала ўсе органы савецкай улады забяспечваць і ахоўваць шляхі зносінаў і транспарт для эвакуацыі людзей і маёмасці. У выпадку "вымушанага адступлення" Чырвонай Арміі патрабавалася найперш эвакуяваць сродкі чыгуначнага транспарту — лакаматывы, вагоны, а потым знішчыць усё, што мае хоць якую вартасць. "Не пакінуць ворагу ні кілаграма хлеба, ні літра паліва", — пісалася ў дырэктыве. Калгаснікі павінны былі перадаць жывёлу і збожжа для вывазу органам дзяржаўнай улады. Дырэктыва СНК СССР і ЦК ВКП(б) ускладала на камуністаў, якія былі на захопленай немцамі тэрыторыі, абавязак арганізаваць на месцы партызанскія аддзелы, дыверсійныя групы ды весці барацьбу з варожымі салдатамі "ўсюды і заўсёды". У акупаваных раёнах загадвалі ствараць невыносныя ўмовы для "ворага і яго паплечнікаў", "праследваць і знішчаць іх на кожным кроку", а таксама "перадаваць ваенным судам усіх тых, хто ад страху не судзейнічае справе абароны, не зважаючы на тое, кім яны з'яўляюцца"[3].

Стратэгія савецкага камандавання — пакінуць немцам выпаленую зямлю, магла ў нейкай ступені ажыццявіцца толькі ва Усходняй Беларусі. У першыя дні вайны расейцы страцілі на захадзе ўсялякі кантроль. Абвешчаная мабілізацыя ў Чырвоную Армію мужчынаў 1905—1918 гадоў нараджэння з прычыны сітуацыі на фронце магла праводзіцца толькі ва ўсходняй частцы рэспублікі. З заходніх вобласцяў эвакуяваліся перш за ўсё работнікі партыйнага і дзяржаўнага апарату, якія апынуліся тут пасля 17 верасня 1939 года. У выніку як мабілізацыя, так і эвакуацыя маёмасці ахапілі толькі 4 з 10 вобласцяў БССР — Віцебскую, Магілеўскую, Гомельскую і Палескую. Ад канца чэрвеня да жніўня 1941 года пад мабілізацыю трапілі адсюль амаль 500 тысяч мужчынаў. Армія пераняла таксама 2,5 тысячы грузавікоў і 35 тысяч коней. Гэта толькі ў невялікай ступені кампенсавала страты, якія былі нанесеныя ў першыя дні ваенных дзеянняў у памежнай зоне.

У выніку аб'яўленай савецкімі ўладамі эвакуацыі з усходніх вобласцяў Беларусі было вывезена 1,5 млн чалавек. У гэты лік

[3] Всенародное партизанское движение в Белоруссии. Т. 1. С. 49—51.

не ўвайшлі работнікі заводаў і прамысловых прадпрыемстваў ды дзяржаўных установаў, якіх эвакуявалі ў першую чаргу. Да жніўня 1941 года было вывезена 20 % насельніцтва БССР. А з усходніх вобласцяў — Гомельскай, Магілеўскай, Палескай і Віцебскай — эвакуявалі, паводле савецкіх крыніцаў, ажно 35—37 % жыхароў. З гэтай жа тэрыторыі найбольш вывезлі прамысловага абсталявання (рухавікоў, трансфарматараў, турбагенератараў, станкоў), запасаў каляровых металаў, амаль усе вагоны і лакаматывы. На заходніх тэрыторыях і ў Менскай вобласці прамысловая структура пад час ваенных дзеянняў не была дэзарганізаваная. Невялікія заводы і прадпрыемствы, якія там працавалі, не мелі істотнага значэння для ваеннай гаспадаркі.

Для насельніцтва, якое не паспелі эвакуяваць, наступствы выканання дырэктывы ад 29 чэрвеня ў галіне сельскай гаспадаркі сталіся вельмі цяжкімі. Да канца жніўня з Беларусі было вывезена больш за 700 тысяч галоў свойскай жывёлы. З прычыны складанасцяў у транспартаванні жывой жывёлы некалькі сотняў тысяч галоў кароў, свіней і авечак вывезлі ў выглядзе мяса. Агулам з Гомельскай, Магілеўскай, Віцебскай і Палескай вобласцяў забралі больш за 26 % пагалоўя сельскагаспадарчай жывёлы і 54 % запасаў збожжа. Вялікая колькасць збожжа была спаленая. Пачалося таксама знішчэнне збожжа на палях, але наступленне нямецкіх войскаў на ўсход абмежавала маштаб гэтай акцыі.

Стратэгія выпаленай зямлі прадугледжвала таксама разбурэнне жылых і грамадскіх будынкаў. Яно праводзілася знішчальнымі батальёнамі, якіх у Віцебскай вобласці было 26, у Гомельскай — 19, Палескай — 18, Магілеўскай — 14. У склад батальёнаў уваходзілі камсамольцы і работнікі калгасных упраўленняў, а камандавалі імі работнікі НКВД або члены райкамаў партыі[4]. Разбурэнне жытла павінна было схіліць людзей да эвакуацыі. У выніку дзейнасці знішчальных батальёнаў гарады і пасёлкі пацярпелі нашмат болей, чым ад ваенных дзеянняў.

Акцыя эвакуацыі маёмасці, якая мела ўскладніць забеспячэнне нямецкай арміі і зрабіць немагчымым выкарыстанне ворагам прамысловага патэнцыялу Беларусі, у сапраўднасці толькі пагоршыла становішча насельніцтва акупаванай зоны.

[4] Хрестоматия по истории БССР. 1917—1983. Минск, 1984. С. 270.

У немцаў было дастаткова магчымасцяў забяспечыць сябе неабходнай колькасцю прадуктаў, а мірнае насельніцтва, пазбаўленае харчоў і жытла, апынулася ў адчайным становішчы. Як піша гісторык Юры Туронак, гэтае становішча, выкліканае Сталіным, было грозным прадвесцем бязлітаснай барацьбы, у якой не ўлічваліся інтарэсы насельніцтва. "Ва ўмовах голаду, галечы і адсутнасці даху над галавой куды больш было шанцаў на тое, каб уцягнуць народ у антынямецкія выступленні"[5]. Савецкія ўлады не прызнавалі ніякіх формаў легальнай грамадскай дзейнасці дзеля таго, каб паправіць становішча насельніцтва. Ад пачатку вайны ўсялякая яўная дабрачынная, культурная або асветная дзейнасць на акупаванай тэрыторыі расцэньвалася як праява калабарацыянізму, за што пагражала найвышэйшая мера пакарання, як за ігнараванне абавязку барацьбы з ворагам на акупаванай тэрыторыі.

Нямецкая акупацыйная палітыка

У часе падрыхтоўкі да вайны, на пачатку 1941 года, нямецкае палітычнае і ваеннае кіраўніцтва распрацавала дэталёвы план дзеянняў вайсковых і паліцэйскіх сілаў на захопленых абшарах СССР і гаспадарчага выкарыстання мясцовых рэсурсаў, прамысловай структуры і рабочай сілы. Увесну 1941 года з структураў СС былі вылучаныя спецыяльныя паліцэйскія падраздзяленні — айнзацгрупы (аператыўныя групы) — для пацыфікацыі (замірэння) занятых Вэрмахтам тэрыторыяў і фізічнага знішчэння функцыянераў савецкага апарату ўлады, камуністаў і жыдоў. У загадзе ад 13 траўня 1941 года, падпісаным начальнікам штаба галоўнага камандавання ўзброеных сілаў III Райха Вільгельмам Кайтэлем, афіцэры Вэрмахта атрымалі паўнамоцтвы праводзіць пацыфікацыі і расстрэльваць мірнае насельніцтва на ўсім абшары пад час рэалізацыі плана "Барбароса" ў выпадку падазрэння на наяўнасць з ягонага боку хоць якой пагрозы для бяспекі нямецкага войска. Загад фельдмаршала Кайтэля адначасова здымаў з салдатаў Вэрмахта ўсялякую адказнасць за дзеянні супраць мірнага насельніцтва і заахвочваў да бязлітаснага выкарыстання зброі ў дачыненні да тых жыхароў занятых тэрыторый, якія варожа ставіліся да акупантаў.

[5] Туронак Ю. Беларусь пад нямецкай акупацыяй. С. 47.

Чарговы загад Кайтэля ад 6 чэрвеня 1941 года, накіраваны афіцэрам узброеных сілаў Райха і вядомы як "загад аб камісарах", здымаў абавязак трымацца нормаў міжнароднага права ў дачыненні да савецкіх ваеннапалонных. Ён рэкамендаваў расстрэльваць без суда і тлумачэнняў усіх палітрукоў. Яшчэ да пачатку вайны была запланавана фізічная ліквідацыя палонных салдатаў Чырвонай Арміі. Менавіта таму з ліку 3,3 мільёна ваеннапалонных, якія трапілі ў няволю ўлетку 1941 года, амаль палова памерла ад голаду і знясілення ў лагерах, арганізаваных найчасцей пад адкрытым небам.

Летам 1941 года на тэрыторыі ўсёй акупаванай Беларусі было ўведзена ваеннае кіраванне. Бальшыня тэрыторыі рэспублікі апынулася ў тыле дзеяння групы армій "Цэнтр", штаб якой знаходзіўся ў Баранавічах. Толькі паўднёвыя раёны ўваходзілі ў склад тэрыторыі, якой кіравала камандаванне групы армій "Поўдзень", яно ж кіравала таксама ўсёй Украінай. На тэрыторыі Беларусі была створана сетка палявых камендатураў і падначаленых ім ваенных управаў гарадоў і раёнаў. На кожнай ступені вайсковай адміністрацыі ствараліся спецыяльныя падраздзяленні паліцыі (айнзацгрупы) і гаспадарчыя службы. Астатнія мусілі займацца забеспячэннем войска харчамі і мабілізацыяй мясцовага насельніцтва на працу на карысць ваеннай інфраструктуры.

Хуткі наступ нямецкай арміі на ўсход выклікаў неабходнасць стварэння новых ваенных управаў і паліцэйскіх фармаванняў. Аддзелы айнзацгрупаў на тэрыторыі акупаваных Беларусі і Украіны не паспявалі забіваць сапраўдных і ўяўных праціўнікаў гітлерызму. Выкананне плана ачышчэння тылоў нямецкай арміі ад савецкіх функцыянераў і камуністычных дзеячоў ды вынішчэння жыдоўскага насельніцтва патрабавала вялікіх людскіх рэзерваў. Адсюль вынікала неабходнасць пашырэння паліцэйскага і адміністрацыйнага апарату, які б абапіраўся на мясцовы элемент. Немцы выкарысталі перш за ўсё стан грамадскіх настрояў, выкліканых савецкай палітыкай у заходніх вобласцях у 1939—1941 гадах.

Палякамі наступ нямецкіх войскаў успрымаўся з надзеяй, але і беларусы з заходніх вобласцяў таксама не надта сумавалі. Рапарт дэпартамента нутраных спраў польскага лонданскага ўрада пра сітуацыю на Гарадзеншчыне і Беласточчыне ў другой

палове 1941 года характарызаваў грамадскія настроі адназначна: "Агульны тагачасны настрой сярод польскага насельніцтва — гэта радасць з нагоды вызвалення з-пад бальшавіцкага тэрору і далучэння да рэшты краю. У першыя месяцы акупацыі людзі ставіліся да немцаў бадай што з сімпатыяй, наагул паводзілі сябе стрымана і не бралі ўдзелу ў палітычнай дзейнасці. Здараліся, аднак, выпадкі, асабліва на Беласточчыне, на беларускай тэрыторыі, што частка моладзі фашысцкіх поглядаў, нават многія колішнія сябры незалежніцкіх арганізацый пайшлі на нямецкую службу, ствараючы аддзелы паліцыі. (...) Цяпер амаль усе адміністрацыйныя пасады, апрача хіба кіраўнічых, на якія прызначаліся немцы, апынуліся ў руках палякаў, бо акупант зыходзіў з таго гледішча, што трэба вярнуць на працу тых людзей, якія працавалі ў дадзеных установах да 1939 года. Зрэшты, адсутнасць беларускіх спецыялістаў прымусіла акупанта абаперціся на польскі элемент. (...) Служба бяспекі была даручана Грэншуцу, які размясціў сваіх жаўнераў у асноўным на мяжы акругі, але нагляд за парадкам даручыў мясцовай паліцыі, арганізаванай амаль цалкам з колішніх польскіх паліцыянтаў"[6]. Падобная сітуацыя назіралася на ўсёй тэрыторыі Заходняй Беларусі.

Рапарты дэлегатуры польскага ўрада і Саюза ўзброенай барацьбы паведамлялі пра пагромы жыдоўскага насельніцтва ў розных гарадах Беласточчыны, Гарадзеншчыны і Навагрудчыны і пра многія выпадкі даносаў на беларусаў, якія рабілі палякі з новастворанай адміністрацыі і дапаможнай паліцыі. Часта ў выніку даносаў немцы расстрэльвалі як камуністаў, так і арганізатараў беларускага культурнага ці асветнага жыцця да 1939 года. Гінулі перш за ўсё тыя, хто хоць нейкім чынам ухваляў савецкую ўладу ў 1939—1941 гадах.

У свае маёнткі ў Беларусі вярталіся з Летувы і Генеральнай губерні (акупаванай цэнтральнай Польшчы) былыя землеўласнікі. Некаторыя з іх прыязджалі пад аховай нямецкай паліцыі, прагныя адпомсціць за ўсе крыўды 1939 года і вярнуць маёмасць, перададзеную савецкімі ўладамі мясцовым сялянам. Імкненні абшарнікаў падтрымоўвала мясцовая адміністрацыя,

[6] Archiwum Akt Nowych (AAN), zespół Delegatury Rządu na Kraj. Sygn. 202/II-6. K. 120—121.

якая знаходзілася ў польскіх руках. Такім чынам ствараліся новыя абсягі нацыянальных канфліктаў, якія ўмела распальваліся акупацыйнымі ўладамі.

Для польскага насельніцтва першыя месяцы нямецкай акупацыі на Беларусі былі перыядам вяртання некаторым яго прадстаўнікам эканамічнага, грамадскага і палітычнага значэння, страчанага пасля 17 верасня 1939 года. Актыўны ўдзел у стварэнні адміністрацыі і паліцыі даваў палякам шанец адбудаваць знішчаныя за савецкай уладай кадры, а ў перспектыве спрыяў узнікненню падпольных структураў польскай дзяржавы. У нямецкай адміністрацыі апрача асобаў, якія шукалі працы адно дзеля заробку, працавалі таксама людзі, якія хацелі ўплываць на хаду падзеяў на гэтай тэрыторыі. Таму неўзабаве змаганне за чыноўніцкія пасады паміж палякамі і беларусамі стала элементам рэалізацыі ўласных нацыянальных мэтаў.

Беларусамі пачатак нямецкай акупацыі ўспрымаўся па-рознаму. У Заходняй Беларусі сярод асобаў, якія раней працавалі ў савецкіх асветных і культурных установах ды мясцовай адміністрацыі, панавалі настроі няўпэўненасці і чакання. Работнікамі гэтых установаў былі пераважна мясцовыя людзі, якія не эвакуяваліся ў чэрвені 1941 года, як зрабілі тое прысланыя з усходу савецкія функцыянеры. Гэтым грамадска-прафесійным групоўкам былі нанесены найбольшыя страты ў выніку ліквідацыі камуністычных элементаў у тылах нямецкай арміі, якая праводзілася аддзеламі айнзацгрупаў. Яны ж найбольш пацярпелі таксама ад даносаў людзей з новай адміністрацыі і дапаможнай паліцыі. Беларускія сяляне ў заходніх вобласцях скарысталі змену палітычнай сітуацыі для роспуску нешматлікіх калгасаў і вяртання да аднаасобніцтва, аднак шмат хто з іх быў таксама ўладальнікам зямлі і інвентару, якія раней належалі польскім абшарнікам. У выніку яны апынуліся сярод падазроных у спрыянні савецкай уладзе.

Дзеля адсутнасці досведу і традыцыі працы ў дзяржаўных структурах ды ніжэйшай параўнальна з палякамі адукацыі сярод беларусаў не было адпаведных людскіх рэсурсаў, якія маглі б быць скарыстаныя немцамі пры стварэнні новага парадку на акупаванай тэрыторыі. Перш за ўсё на беларускім баку не было тады групавой матывацыі да супрацоўніцтва з немцамі.

Не мела поспеху таксама спроба дзеячоў, згуртаваных вакол старшыні Беларускага камітэта ў Варшаве Мікалая Шчорса,

стварыць адміністрацыйны корпус з эмігрантаў, якія апынуліся ў Генеральнай губерні і Нямеччыне. Іх дзеянні падтрымоўваліся нямецкай палітычнай паліцыяй. Планавалася паслаць адтуль у Беларусь сотні чыноўнікаў, але завербаваць удалося толькі некалькі дзесяткаў чалавек, якіх уладкавалі на працу ў Менску і гарадах Усходняй Беларусі. Многія з іх атрымалі ўплывовыя пасады ў адміністрацыі і паліцыі.

Паліцыянты і чыноўнікі былі патрэбныя акупантам перш за ўсё на тэрыторыі Усходняй Беларусі. У гэтай частцы краіны людзі чакалі роспуску калгасаў, але такія змены не адбываліся. На думку немцаў, вялікія гаспадаркі маглі лепей забяспечыць харчовыя патрэбы Райха. Насельніцтва абыякава ставілася да лозунгаў аб вызваленні яго з-пад савецкага ярма. Публічныя экзекуцыі, часта выпадковых людзей, якія выконваліся Вэрмахтам і аддзеламі паліцыі, наводзілі на людзей большы жах, чым сталінскія злачынствы 30-х гадоў. Многія жыхары Усходняй Беларусі пазбягалі супрацоўніцтва з акупантамі, бо баяліся хуткага вяртання савецкага парадку. Істотным фактарам, які стрымліваў ад удзелу ў нямецкай сістэме ўлады, было таксама хуткае ўзнікненне савецкіх партызанскіх структураў. Партызаны, выконваючы дырэктывы цэнтральных савецкіх уладаў, лічылі здраднікамі усіх, хто працаваў у акупацыйнай адміністрацыі. У адпаведнасці з указаннямі СНК СССР і ЦК ВКП(б) яны былі абавязаныя знішчаць усіх паплечнікаў акупанта.

Ва Усходняй Беларусі нямецкае вайсковае кіраўніцтва брала на працу ў цывільнай адміністрацыі ранейшых савецкіх чыноўнікаў, а ў дапаможную паліцыю — ахвотнікаў з ліку ваеннапалонных і былых міліцыянтаў[7]. У прынцыпе і былыя чырвонаармейцы, і экс-міліцыянты сумленна выконвалі свае абавязкі для новых работадаўцаў.

Клопаты з прыцягненнем на паліцэйскую службу мясцовага беларускага элементу прымусілі немцаў перавесці ўвосень 1941 года на тэрыторыю Усходняй Беларусі некалькі летувіскіх, латышскіх і ўкраінскіх батальёнаў. Гэтыя фармаванні, асабліва летувіскія часціны, выкарыстоўваліся пад час масавых экзекуцый жыдоўскага насельніцтва і падазраваных у спрыянні савецкаму падполлю беларусаў[8].

---

[7] Туронак Ю. Беларусь пад нямецкай акупацыяй. С. 57.

[8] Нарысы гісторыі Беларусі. Ч. 2. С. 281.

Нямецка-савецкая вайна абнадзейвала беларускіх палітыкаў. Шмат хто з іх у 1939—1941 гадах знаходзіўся на тэрыторыі Нямеччыны або на акупаванай немцамі польскай тэрыторыі. Назіранні і аналіз польскай і савецкай палітыкі ў дачыненні да беларусаў у міжваенны перыяд, прывялі іх да думкі пра неабходнасць шукаць прыхільнікаў беларускай справы сярод гітлераўскіх саноўнікаў. У галовах многіх беларускіх дзеячоў узнікла ілюзія, што немцы могуць дапамагчы аднавіць нацыянальную дзяржаву. Слабасцю беларускай нацыянальнай эліты была яе палітычная раздробленасць, нутраная пасваранасць і нерэальныя амбіцыі лідэраў паасобных групаў. У дачыненні да немцаў яны намагаліся выступаць у ролі патэнцыйных партнёраў, прапаноўвалі гітлераўскім палітыкам палітычныя развязкі, якія, на іх думку, забяспечвалі б інтарэсы як Райха, так і беларускага народа. Немцы ахвотна прымалі прапанаваныя паслугі, аднак не спяшаліся ажыццявіць хоць адзін праект развязання беларускай праблемы, пададзены лідэрамі паасобных групаў.

Пад канец 1939 года немцы заснавалі ў Берліне рэдакцыю беларускага штотыднёвіка "Раніца", публікацыі якога ўнушалі прыхільнасць гітлераўцаў да беларускага народа. Выданне паказвала таксама беларускім дзеячам магчымых нямецкіх партнёраў для перамоваў. У жніўні 1939 года з нямецкай ініцыятывы дайшло да перамоваў прадстаўнікоў Міністэрства замежных справаў III Райха з прэзідэнтам Рады БНР Васілём Захаркам, які жыў у Празе, і эміграцыйным беларускім дзеячом Іванам Ермачэнкам. Стары і знясілены хваробаю Захарка сваім аўтарытэтам толькі адкрыў дарогу амбітнаму Ермачэнку, які неўзабаве ў замежнапалітычным ведамстве Райха прадставіў праект развалу СССР пасля паразы ў вайне з Нямеччынай[9]. Дзеялася гэта насуперак нямецка-савецкаму збліжэнню, з чаго відаць, што Ермачэнка карыстаўся вялікім даверам Берліна, бо ведаў аб радыкальнай змене ўсходняй палітыкі Гітлера, якая неўзабаве мела адбыцца. Праект Ермачэнкі прадугледжваў стварэнне саюзнай з Нямеччынай беларускай дзяржавы.

Летам 1940 года беларусы, якія былі ў Берліне, атрымалі дазвол стварыць Беларускі камітэт самапомачы. Неўзабаве філіі БКС паўсталі ў Познані, Лодзі, Торуні, Ляйпцыгу, Мюнхене,

[9] Найдзюк Я., Касяк І. Беларусь учора і сяньня. Менск, 1993. С. 256.

Празе. Раней немцы дазволілі стварыць такія камітэты ў Варшаве, Кракаве і Белай-Падляшскай. Асноўнымі мэтамі камітэтаў былі арганізацыя грамадскай апекі над беларускім насельніцтвам у нямецкай зоне ўплываў і культурна-асветная дзейнасць. З набліжэннем нямецка-савецкай вайны камітэты станавіліся цэнтрамі палітычнай дзейнасці. Некаторыя дзеячы сталі займацца арганізацыяй выведкавай, прапагандысцкай і дыверсійнай работы на карысць Нямеччыны. Дзеля выканання яе прыцягваліся ваеннапалонныя беларусы, былыя жаўнеры Войска Польскага. Іх навучаннем у лагеры пад Берлінам кіраваў правадыр беларускіх нацыянал-сацыялістаў Фабіян Акінчыц. Такім чынам ён рыхтаваў групу людзей, якіх планаваў скарыстаць у якасці функцыянераў будучай беларускай дзяржавы.

19 чэрвеня 1941 года ў Берліне заснаваўся Беларускі нацыянальны цэнтр (БНЦ), які ўзначаліў шэф Беларускага камітэта ў Варшаве Мікола Шчорс. У кіраўніцтве гэтай арганізацыі былі ксёндз Вінцэнт Гадлеўскі, Часлаў Ханяўка, Анатоль Шкуцька, Вітаўт Тумаш, Мікола Ждановіч, Барыс Стрэльчык, Пятро Ластаўка. Улічыўшы час узнікнення БНЦ, можна меркаваць, што гэта быў орган, які меў намер абвясціць сябе беларускім урадам. Дзеячы БНЦ пераважалі ў камітэтах, складалі рэдакцыйны калектыў "Раніцы", намагаліся стварыць шырэйшае беларускае прадстаўніцтва ў выглядзе Беларускага нацыянальнага фронту, надзеленага заканадаўчымі паўнамоцтвамі.

Па-за БНЦ апынуліся Фабіян Акінчыц, які лічыў, што з дапамогаю немцаў высокай пасады ён даможацца самастойна, і Радаслаў Астроўскі, якому эміграцыйныя дзеячы не маглі дараваць супрацоўніцтва спачатку з камуністамі, а потым з польскімі ўладамі. Астроўскі да пачатку нямецка-савецкай вайны быў старшынёю Беларускага камітэта ў Лодзі.

Ад супрацоўніцтва з немцамі адмовіўся старшыня Рады БНР Васіль Захарка. Ён, адзін з стваральнікаў незалежнай беларускай дзяржаўнасці, не мог змірыцца з стаўленнем III Райха да Беларусі як да аб'екта і не ўхваляў палітычны мінімалізм дзеячоў, якія хадайнічалі перад немцамі аб падтрымцы.

Адразу пасля пачатку вайны з'явілася яшчэ адна група беларускіх дзеячоў, згуртаваных вакол Вацлава Іваноўскага і Янкі Станкевіча. Яны спрабавалі скарыстаць змену палітычнай сітуацыі для абуджэння беларускіх нацыянальных пачуццяў, на-

мерваліся ўвесці як найболей людзей у нямецкую адміністрацыю і з згоды акупанатаў стварыць беларускія мілітарныя фармаванні. Іх асноўнай мэтай была падрыхтоўка беларускага грамадства як маральна, так і арганізацыйна да змагання за сваю дзяржаўнасць. Аднак яны меркавалі, што канчатковыя развязкі ў гэтай вайне будуць неспрыяльныя для Нямеччыны і таму спрабавалі дамовіцца з палякамі і вызначыць нацыянальныя мэты кожнага з бакоў, каб прадухіліць пазнейшы канфлікт. Удзельнікі гэтай групы прапанавалі стварыць пасля вайны польска-беларускую федэрацыю, а заходнюю мяжу Беларусі правесці па лініі Керзана[10]. Аднак гэтая прапанова не падыходзіла польскаму боку, які мог бы падтрымаць беларускія незалежніцкія памкненні толькі тады, калі б яны абмежаваліся тэрыторыяй на ўсход ад рыжскай мяжы.

Планы беларускіх нацыянальных колаў супярэчылі польскім інтарэсам, якія прадстаўлялі палітычныя структуры, падначаленыя эміграцыйнаму ўраду ў Лондане. Супярэчнасць асноўных беларускіх, савецкіх і польскіх інтарэсаў у Беларусі непазбежна вяла да вайны ўсіх з усімі. Канцэпцыя стварэння беларускай дзяржавы ў этнічных межах не супадала ні з мэтамі польскага падполля, якое намагалася вярнуць даваенны статус 1939 года, ні з інтарэсамі савецкага падполля, якое ў сваю чаргу імкнулася аднавіць даваеннае становішча 1941 года. У такіх умовах няўхільным было знішчэнне ўсялякіх праяваў беларускага нацыянальнага жыцця як праз польскае, так і праз савецкае падполле. Немінучы быў таксама польска-савецкі канфлікт за Заходнюю Беларусь.

Напружанне і канфлікты ўмела выкарыстоўвалі немцы. У першыя месяцы акупацыі ўсе выпадкі даносаў і абвінавачанняў у камунізме разглядаліся гітлераўскімі службамі бяспекі ў экстранным парадку. У адпаведнасці з указаннямі галоўнага камандавання ўзброеных сілаў Райха ўсе асобы, абвінавачаныя ў прыхільнасці да бальшавізму, расстрэльваліся без судоў і праверкі праўдзівасці абвінавачанняў. Загінула тады шмат беларусаў, якія паступілі на працу ў новастворануюадміністрацыю. Беларускі бок лічыў гэта арганізаванай акцыяй мясцовых польскіх чыноўнікаў і паліцыянтаў, якія дзейнічаюць у паразумен-

[10] Turonek J. Wacław Iwanowski... S. 108.

ні з падполлем і паводле інструкцый лонданскага ўрада. Беларускія дзеячы і многія асобы, якія ўнікалі супрацоўніцтва з немцамі ў першыя тыдні акупацыі, пачалі помсціць, ужываючы метады, скарыстаныя палякамі. Знішчэнне беларускіх і польскіх элітаў рукамі нямецкай паліцыі цягнулася з розным напружаннем праз усю акупацыю, а інтэнсіўнасць канфлікту распальвалася найчасцей па меры патрэбаў акупацыйных уладаў.

Такой сітуацыі не назіралася на тэрыторыі Усходняй Беларусі, дзе не існавала польскай адміністрацыі і паліцыі, а беларуская нацыянальная эліта была знішчаная яшчэ да вайны. Аднак адсутнасць нацыянальнае напругі не паўплывала на абмежаванне ліку ахвяраў сярод мясцовага мірнага насельніцтва. На ўсходзе нямецкія аперацыйныя аддзелы айнзацгрупаў амаль адразу пачалі знішчаць жыдоўскую інтэлігенцыю. Прафесіі настаўніка, чыноўніка, юрыста, якія часта мелі габраі, былі для іх дастатковай прычынай да расстрэлу. У Менску ды іншых гарадах Усходняй Беларусі вайскоўцы нямецкіх аддзелаў СС з дапамогаю Вэрмахта стваралі лагеры для цывільных грамадзян, у якіх трымалі мужчынаў прызыўнога ўзросту пад выглядам пошуку афіцэраў і камісараў Чырвонай Арміі. Кожны дзень немцы забівалі некалькі сотняў чалавек, выбіраючы свае ахвяры паводле іх вонкавага выгляду.

Не здзейсніліся спадзяванні дзеячоў Беларускага нацыянальнага цэнтра, што немцы паставяцца да іх як да палітычных партнёраў. Праўда, некаторыя з дзеячоў БНЦ, апынуўшыся ў Беларусі, атрымалі кіраўнічыя пасады ў адміністрацыі або ў дапаможнай паліцыі, аднак такі стан іх не задавальняў. Вітаўт Тумаш стаў бургамістрам Менска, а ягоным намеснікам — Адам Дземідэцкі-Дземідовіч. Кіраўніком адміністрацыі Менскага раёна акупанты прызначылі Мечыслава Контаўта, а камендантам дапаможнай паліцыі — Змітра Касмовіча. Дзейнага па-за структурамі БНЦ Радаслава Астроўскага немцы паставілі на чале адміністрацыі Менскай акругі. Некаторыя дзеячы БНЦ былі высланы ў Віцебск і Магілеў. Шэф БНЦ Мікола Шчорс апынуўся ў Беластоку, дзе арганізаваў Беларускі камітэт і пачаў выдаваць газету "Новая дарога".

Такія камітэты неўзабаве пачалі паўставаць у іншых гарадах Беларусі. Яны сталі пасярэднікамі паміж беларускім насельніцтвам і акупацыйнымі ўладамі і заадно цэнтрамі беларускага нацыянальнага жыцця. Хадайніцтвы дзеячоў камітэтаў няраз

засцерагалі людзей ад рэпрэсій, а ў іх шэрагах шукалі прытулку і былыя чыноўнікі савецкага апарату ўлады.

Дазвол на дзейнасць камітэтаў, службу ў нямецкай адміністрацыі і дапаможнай паліцыі, а затым згода на арганізацыю асветнага і культурнага жыцця ды выданне газет — гэта ўсё, што маглі прапанаваць немцы беларускім палітыкам. Планы дзеячоў БНЦ і лідэраў іншых палітычных груповак наконт стварэння ўласнай дзяржавы ў этнічных межах былі перакрэсленыя ў выніку новага адміністрацыйнага падзелу краіны. У адпаведнасці з распараджэннем Гітлера ад 22 ліпеня 1941 года з колішняй Беластоцкай вобласці, з паўночнай часткі Берасцейскай і заходняй часткі Баранавіцкай вобласцяў была створана Беластоцкая акруга, якая ўвайшла ў склад Усходняй Прусіі. Неўзабаве да Генеральнай акругі Летувы былі далучаныя паўночна-заходнія раёны Вілейскай вобласці, а да Райхскамісарыята Украіны — паўднёвыя раёны Гомельскай, Палескай, Пінскай і Берасцейскай вобласцяў з гарадамі Берасцем, Пінскам, Мазыром, Рэчыцай. З большай часткі Баранавіцкай, Вілейскай, Менскай (без усходніх раёнаў), а таксама паўночных раёнаў Берасцейскай і Пінскай вобласцяў БССР немцы стварылі Генеральную акругу Беларусь, якая ўваходзіла ў склад Райхскамісарыята Остлянд з сядзібай у Рызе. Віцебскую, Магілеўскую, большую частку Гомельскай і ўсходнія раёны Менскай вобласцяў уключылі ў зону армейскага тылу. У Генеральнай акрузе Беларусь было цывільнае кіраванне, у зоне армейскага тылу — вайсковае. Па меры поспехаў на фронце немцы планавалі пашырыць цывільнае кіраванне на ўсход, але пасля паразы нямецкіх войскаў пад Масквой вызначаны восенню 1941 года парадак пратрываў да канца акупацыі.

Генеральная акруга Беларусь дзялілася на 11 камісарыятаў: адзін гарадскі ў Менску і дзесяць акруговых — у Баранавічах, Барысаве, Вілейцы, Ганцавічах, Глыбокім, Лідзе, Менску, Навагрудку, Слоніме і Слуцку. Генеральным камісарам акругі Беларусь Гітлер прызначыў Вільгельма Кубэ. Фармальна ён быў таксама начальнікам камандзіраў паліцыі і службы бяспекі на тэрыторыі акругі, але адначасова сам падпарадкоўваўся шэфу паліцыі і райхсфюрэру СС Генрыху Гімлеру.

Цяжка сказаць, якія былі канчатковыя мэты нямецкай палітыкі на тэрыторыі акупаванай Беларусі. Адзіным на гэтую тэму вядомым дакументам з'яўляецца «Генеральны план "Ост"»,

распрацаваны начальнікам аддзела каланізацыі Галоўнага палітычнага ўпраўлення Міністэрства па справах акупаваных усходніх тэрыторый Эргардам Ветцэлем і ўхвалены 27 красавіка 1942 года[11]. Праект Ветцэля ў кіраўнічых колах III Райха разглядаўся як аснова нацыянальнай палітыкі на ўсходзе Еўропы пасля пераможнага заканчэння вайны з Савецкім Саюзам. У дачыненні да беларусаў ён прадугледжваў перасяленне 75 % насельніцтва ў Заходнюю Сібір або на Паўночны Каўказ. Астатнія 25 % беларусаў, асабліва тых, хто меў выразныя нардычныя рысы, Ветцэль прапанаваў перасяліць у Райх у якасці рабочай сілы для прамысловасці, сельскай гаспадаркі і рамесніцтва. Да іх акупанты ставіліся б як да грамадзян Нямеччыны. Адсутнасць выразнай нацыянальнай свядомасці, паводле аўтара праекта, павінна паспрыяць іх паскоранай асіміляцыі. На тэрыторыі Беларусі планавалася пасяліць у будучыні некалькі мільёнаў немцаў і асіміляваных у нямецкай культуры асобаў. Гэтыя змены павінны былі адбыцца на працягу трыццаці гадоў пасля заканчэння вайны.

У нямецкай палітыцы перыяду акупацыі не наглядалася прыкметаў трактавання беларусаў як супольнасці, якая ў будучыні мусіла набыць нейкую форму дзяржаўнага існавання. Беларускіх нацыянальных дзеячоў, якія хадайнічалі перад немцамі аб палітычных канцэсіях, акупанты трактавалі інструментальна, падвышаючы па службе некаторых асобаў па меры сваіх патрэбаў.

Канцэпцый гарантыі бяспекі і стабільнасці нямецкага панавання на тэрыторыі акупаванай Беларусі было некалькі. Генеральны камісар Вільгельм Кубэ быў прыхільнікам развіцця беларускага нацыяналізму ў процівагу савецкім уплывам. Кубэ зыходзіў з таго, што існуе натуральная супярэчлівасць паміж савецкімі інтарэсамі і беларускім рухам, канчатковая мэта якога — стварэнне ўласнай дзяржаўнасці. Згодна з гэтай жа логікай беларускі нацыяналізм не мог быць ухвалены польскім падполлем. У такой сітуацыі немцы, падтрымоўваючы беларускія нацыянальныя імкненні і спадзяванні на стварэнне беларускай дзяржавы, маглі б памяняць настроі і выклікаць цікавасць

[11] Biuletyń Głównej Komisji Badania Zbrodni Niemieckich. Warszawa, 1949. T. V. S. 209—242.

грамадства да ліквідацыі савецкага партызанскага руху. З гэтае прычыны некаторыя пастановы генеральнага камісара ішлі насуперак жудасцям штодзённага жыцця, якія чынілі нямецкая паліцыя і служба бяспекі.

У верасні 1941 года на падлеглай цывільнаму кіраванню тэрыторыі было ўведзена абавязковае навучанне дзяцей ва ўзросце ад 7 да 14 гадоў. Выняткам былі жыдоўскія дзеці, якія разам з бацькамі пакутавалі ў гета на тэрыторыі ўсёй Беларусі. У школах апрача навучання беларускай мове меліся вучыць дзяцей матэматыцы, біялогіі, практычным заняткам, а найперш фармаваць у школьнікаў вобраз Еўропы, у якой рухавіком усялякага прагрэсу і цывілізацыйнага развіцця былі немцы. У чэрвені 1942 года на тэрыторыі з цывільным кіраваннем працавалі блізу 3,5 тысячы школаў з 346 тысячамі вучняў. У частцы школаў навучанне ішло на польскай або расейскай мовах. На тэрыторыі прыбалтыйскіх краінаў і Украіны ўлады дазволілі адкрыццё толькі чатырохкласных школаў, у якіх навука чытання і пісання была спалучаная з авалодваннем прафесіяй.

Стаўка на развіццё беларускага нацыяналізму не знаходзіла, аднак, разумення ў Берліне. Улады Райха больш верылі ў паспяховасць метадаў, ужываных падраздзяленнямі СС і Вэрмахта, чым у палітычныя развязанні. Стварэнне беларускіх школаў і развіццё культурных установаў адбывалася паралельна з генацыдам і рабаўніцтвам маёмасці, якія ўчынялі нямецкія салдаты і паліцыянты. Акупанты з размахам праводзілі акцыю вывазу твораў мастацтва, старажытнай мэблі, каштоўных музейных экспанатаў у Нямеччыну. Рабункі часта наладжваліся як прыватныя мерапрыемствы камандзіраў паасобных часцінаў СС і Вэрмахта. Многія творы мастацтва былі бяздумна знішчаныя салдатамі пад час раскрадання музеяў і палацаў.

Планам беларусізацыі краіны ў значнай ступені перашкаджала адсутнасць адпаведных кадраў. Хоць беларускі фактар карыстаўся падтрымкай цывільных уладаў, аднак не выпадала польскіх чыноўнікаў замяніць беларускімі, бо часта ў беларускім асяроддзі цяжка было знайсці людзей адпаведнае кваліфікацыі ды не абцяжараных камуністычным мінулым, якія б выказалі ахвоту працаваць. Факт удзелу ў савецкай адміністрацыі быў даволі істотным аргументам, які шмат каго стрымліваў ад публічнай дзейнасці, каб не справакаваць даносы з боку па-

тэнцыйных канкурэнтаў. І хоць пры канцы 1941 года пачаліся праверкі на праўдзівасць даносаў, а ў выпадку беспадстаўнага прыпісвання віны — пакаранні даносчыкаў, узаемныя абвінавачванні не спыняліся. Палякі даносілі на беларусаў, беларусы на палякаў, каталікі на праваслаўных, праваслаўныя на каталікоў. Нямецкая акупацыя вызваліла ўсе крыўды: беларускія — даваеннага часу і польскія — перыяду савецкай улады. На гэты багаж узаемных крыўдаў напластаваліся актуальныя мэты палітычных дзеячоў з абодвух бакоў канфлікту. Для палякаў небяспекай станавілася кожная беларуская школа, кожная газета, якая выходзіла на захад ад рыжскай мяжы. Гэтаксама з гледзішча савецкага падполля ўсе беларускія арганізацыі — школы, тэатры, установы, якія існавалі на прасторы ад Беластока да Смаленска, лічыліся праявай здрады Савецкаму Саюзу.

Як ва ўсёй акупаванай немцамі Еўропе, так і ў Беларусі ў найгоршым становішчы апынуліся жыды. І хоць у адпаведнасці з планам выкарыстання жыдоўскіх рамеснікаў у нямецкай гаспадарцы ў Беларусі генацыд значна замарудзіўся, аднак лёс большасці людзей гэтай нацыі быў прадвызначаны. Пасля знішчэння інтэлігенцыі астатніх жыдоў меліся пасылаць на работу на розныя прадпрыемствы ў якасці дармовай рабочай сілы. Менавіта таму ў Райхскамісарыяце Остланд Беларусь была адзінай генеральнай акругай, дзе на пачатку 1942 года пражывала 75 % жыдоў з ліку тых, якія не паспелі эвакуявацца ў чэрвені 1941 года. У Эстоніі, Летуве і Латвіі на той час знішчэнне жыдоў набліжалася да канца. Іншай прычынай замаруджання генацыду жыдоўскага насельніцтва была адсутнасць у Беларусі выразных антысеміцкіх настрояў. Жыды, якія ўцяклі з гета ў лес, стваралі свае партызанскія аддзелы, карыстаючыся дапамогай мясцовага беларускага люду. Больш складаным было становішча жыдоў на тэрыторыі, якая падлягала вайсковаму кіраванню. Там гітлераўцы атаясамлівалі іх з бальшавікамі. Ва Усходняй Беларусі пытанні жыдоўскага насельніцтва знаходзіліся ў асабістай кампетэнцыі камандзіра СС і паліцыі Эрыха фон дэм Баха. У 1942 годзе пры ўдзеле летувіскай і латышскай паліцыі там была зліквідаваная большасць гета. Выратаваліся толькі тыя жыды, што апынуліся на абшарах, кантраляваных савецкімі партызанамі.

У Беластоцкай акрузе (далучанай да Усходняй Прусіі) нямецкія ўлады кіраваліся такой сама логікай, як на тэрыторыі

Заходняй Беларусі. Пасля некалькіх тыдняў антыбеларускага тэрору, арганізаванага палякамі, якія працавалі ў мясцовай адміністрацыі і дапаможнай паліцыі, немцы пачалі падтрымліваць беларусаў. У жніўні 1941 года акупанты дазволілі стварыць Беларускі нацыянальны камітэт, кіраўніцтва якога пераняў дэлегаваны Шчорсам Часлаў Ханяўка. Першапачаткова дзейнасць камітэта абмяжоўвалася наладжваннем сходаў, лекцый, канцэртаў. Увосень 1941 года пачаліся курсы для ахвотных працаваць у адміністрацыі, каб такім чынам выцесніць палякаў[12]. Дзеячы камітэта дамагліся таксама дазволу на эксгумацыю беларусаў, забітых ў выніку даносаў у чэрвені 1941 года, і перапахаванне іх з месцаў экзекуцыі на праваслаўных могілках. У 1942 годзе камітэт стварыў курсы нямецкай мовы, распараджаўся кравецкім кааператывам, хорам, аркестрам, тэатрам, выдаваў газету "Новая дарога", вёў дабрачынную дзейнасць на карысць выселеных жыхароў з ваколіц Белавежскай пушчы. Улетку 1943 года на грамадскай базе камітэта ў Беластоку было створана Беларускае нацыянальнае аб'яднанне (БНА), аддзелы якога паўсталі ў шасці мястэчках акругі. Гэта была арганізацыя з палітычнымі імкненнямі і ўсеагульнага значэння. Адрозна ад камітэтаў, якія мелі лакальны характар і займаліся галоўным чынам сацыяльнымі і культурнымі справамі, БНА апекавалася арганізацыяй ваенізаваных групаў Беларускай самааховы. Яны ствараліся галоўным чынам для супраціву савецкім партызанам, акцыі якіх былі прычынай жудасных нямецкіх рэпрэсій ў дачыненні мірнага насельніцтва. Акупанты спрабавалі выкарыстаць БНА для ўраўнаважання польскіх уплываў у адміністрацыі і дапаможнай паліцыі. Хоць стасункі паміж палякамі і беларусамі рабіліся шораз горшыя, аднак настроі беларускіх масаў не схіляліся ў бок пранямецкіх груповак. Злачынствы і тэрор акупантаў нейтралізавалі адмоўнае ўражанне, якое пакінула па сабе савецкая сістэма. Папулярнасці нацыянальных арганізацый не спрыяла таксама змена сітуацыі на фронце ў другой палове 1943 года. На беларускай зямлі пачыналася ажыўленне камуністычнага падполля.

---

[12] Karlikowski J. Polityka okupacyjna III Rzeszy w okręgu białostockim 1941—1944. Białystok, 1967. S. 46.

Уплывы як камуністычнага, так і нацыянальнага руху датычылі параўнальна невялікай часткі беларускага насельніцтва. Бальшыня беларусаў звычайна хацела толькі выжыць, ухіляючыся ад усяго, што магло б перашкодзіць дасягненню гэтае мэты.

Параза немцаў пад Масквой у 1941 годзе і перспектыва працяглай вайны змусілі іх шукаць розныя варыянты палітыкі дзеля забеспячэння шляхоў зносінаў і гаспадарчай эксплуатацыі заваяваных тэрыторый. Рабіліся адпаведныя захады, каб пашырыць сістэму калабарацыянізму, адцягнуць людзей ад партызанскага руху. З крымінальнікаў і савецкіх ваеннапалонных розных нацыянальнасцяў ствараліся вайсковыя аддзелы, камандзірамі якіх прызначалі нямецкіх афіцэраў. У Беларусі з другой паловы 1943 года дыслакаваліся падраздзяленні гэтак званай Расейскай вызваленчай народнай арміі (РВНА), якой камандаваў брыгадэнфюрэр СС Браніслаў Камінскі. РВНА складалі надзвычай дэмаралізаваныя былыя савецкія салдаты, адзінай мэтай якіх былі рабаванне і забойствы. Падраздзяленні Камінскага выкарыстоўваліся немцамі для пацыфікацыі беларускі вёсак. У жніўні 1944 года яны былі высланыя ў Варшаву, дзе выбухнула антынямецкае паўстанне.

У сярэдзіне 1942 года немцы прынялі тактыку падвышэння па службе правадыроў беларускіх нацыянальных груповак, ствараючы такім чынам ілюзію станоўчага стаўлення да іх дзяржаўных імкненняў. У верасні 1942 года Вільгельм Кубэ выдаў адозву да беларусаў, у якой гарантаваў свабоднае развіццё краіны. Аднак гэта не зрабіла вялікага ўплыву на пазіцыю грамадства. Зацікаўленне праявілі толькі дзеячы, якія гуртаваліся ў адзінай легальнай арганізацыі — Беларускай народнай самапомачы (БНС). Яна стварылася пры канцы 1941 года і мела свае структуры ва ўсіх акругах і раёнах. Кіраванне БНС немцы даручылі Івану Ермачэнку, які ў Беларусі быў малавядомым чалавекам. Яго галоўным козырам з'яўляўся поўны давер нямецкага боку. У кіраўніцтве БНС апынуліся, аднак, такія вядомыя дзеячы, як Барыс Рагуля, Юры Сабалеўскі, Станіслаў Станкевіч, Іван Касяк, Антон Адамовіч, Юльян Саковіч. У ліпені 1942 года была створана Галоўная рада з дванаццаці чалавек, якая планавалася як ценевы кабінет, гатовы пераняць кіраванне краінай з нямецкіх рук. Рада стварыла аддзелы, якія адпавядалі структурам выканаўчай улады. Былі гэта, між іншага, ведамствы

вайсковых справаў, нутраной палітыкі, прапаганды, асветы, культуры і аховы здароўя. Рады БНС разам з адпаведнымі аддзеламі паўсталі таксама ў акругах.

Немцы дазволілі карыстацца ў публічных месцах беларускімі нацыянальнымі сімваламі — бел-чырвона-белым сцягам і гербам "Пагоня". Акупанты дазволілі яшчэ заснаваць Беларускае навуковае таварыства і беларускую Лігу жанчын. У жніўні 1942 года пачалася арганізацыя беларускіх сярэдніх школаў, планавалася адкрыццё універсітэта ў Менску. У жніўні было абвешчана пра ўзнікненне незалежнай ад Маскоўскай патрыярхіі Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы. На ўсходзе краіны пачалася дзяльба калгаснай зямлі паміж сялянаў.

На працягу некалькіх месяцаў ажыццяўлялася канцэпцыя акупацыйнай палітыкі генеральнага камісара Вільгельма Кубэ, якая прадугледжвала падтрымку беларускага нацыяналізму ў якасці метаду ліквідацыі ўплываў расейскага камунізму — ідэалагічнай асновы савецкага супраціву. Немцы перш за ўсё былі зацікаўленыя ў стварэнні беларускіх антыпартызанскіх ваенных фармаванняў, каб, эксплуатуючы патрыятычныя пачуцці беларусаў, выкарыстоўваць іх у сваіх інтарэсах.

У сярэдзіне 1942 года пачалася арганізацыя аддзелаў Беларускай самааховы. Меркавалася стварыць корпус у складзе трох дывізій. Фармальна гэтае войска складалі ўзброеныя сілы, падначаленыя шэфу Беларускай народнай самапомачы Івану Ермачэнку, аднак у аперацыйных справах яно падпарадкоўвалася камандзіру СС і паліцыі Генеральнай акругі Беларусь. У жніўні пачала працу беларуская афіцэрская школа ў Менску, а ў некалькіх іншых мясцінах адчыніліся падафіцэрскія курсы. Камендантам афіцэрскай школы стаў былы афіцэр Войска Польскага Францішак Кушаль. За кароткі час перападрыхтоўку прайшлі некалькі тысяч мужчынаў, якія мелі скласці кадры беларускага корпуса.

Увосень 1942 года немцы, маючы сумнеў у лаяльнасці беларускага войска, ператварылі яго падраздзяленні ў паліцэйскія фармаванні. Ермачэнку пазбавілі тытула генеральнага каменданта і прымусілі пакінуць Беларусь. Ліквідавалі штаб, а камандзірам забаранілі карыстацца афіцэрскімі званнямі. У рамках БНС захаваўся, аднак, вайсковы сектар і далей вялася вярбоўка ў падраздзяленні Беларускай самааховы, якія пасля дыслакацыі былі аддадзены пад кантроль мясцовых камендан-

таў СС і паліцыі. Яны выкарыстоўваліся пад час акцый супраць савецкай партызанкі, на ахове чыгункі ды выконвалі іншыя паліцэйскія абавязкі. Іх значэнне было зведзенае да ролі дапаможнай паліцыі.

На пачатку 1943 года сярод галоўнага камандавання СС і паліцыі перамагла канцэпцыя, што самым паспяховым метадам утрымання парадку ў Беларусі павінна быць жорсткае задушэнне ўсялякіх праяваў непаслухмянасці і падтрымкі руху супраціву. Палітычныя саступкі на карысць беларускага нацыянальнага руху ў такой сітуацыі сталіся непатрэбныя і нават шкодныя. У сакавіку дзейнасць Беларускай народнай самапомачы была абмежаваная да арганізацыі дабрачынных акцый і дапамогі мірнаму насельніцтву, пацярпеламу ад ваенных дзеянняў. Праз месяц немцы зліквідавалі Беларускую самаахову, а яе жаўнераў перавялі ў дапаможную паліцыю.

Пацыфікацыйныя акцыі ў Беларусі, якія ажыццяўляліся паводле загаду Гімлера, мелі на мэце ачышчэнне пэўнай тэрыторыі ад партызанаў, жыдоў і насельніцтва, якое падазравалася ў спрыянні руху супраціву. Аперацыі рыхтаваліся некалькі тыдняў. Акцыя, якая праводзілася на дадзеным абшары, атрымоўвала свой крыптанім, а паасобным падраздзяленням даводзілі заданні. У штабах СС, паліцыі ды Вэрмахта спакойна планавалася знішчэнне паасобных вёсак і іх жыхароў. У рамках калектыўнай адказнасці выносілі смяротныя прысуды для сотняў тысяч чалавек. Пад час пацыфікацыі ў Слонімскай акрузе ў снежні 1942 года пазбавілі жыцця больш за 6 тысяч вяскоўцаў, у Слуцкай акрузе ў сакавіку 1943 года расстралялі 13 тысяч чалавек, а пад Барысавам у чэрвені 1943 года загінулі 13 тысяч мірных грамадзян з навакольных вёсак. Да канца акупацыі было праведзена больш за 60 буйных пацыфікацыйных акцый, у часе якіх спалена 627 вёсак, а іх жыхары знішчаныя. У гэтых акцыях бралі ўдзел некалькі тысячаў украінскіх, летувіскіх, латышскіх паліцыянтаў, батальён польскай паліцыі і Расейская вызваленчая народная армія Браніслава Камінскага. Апрача буйнамаштабных акцый, якія ахоплівалі ўвесь раён і для выканання якіх прыцягваліся значныя сілы, было праведзена больш як 80 карных экспедыцый з выкарыстаннем мясцовых сілаў. Маштаб і характар тых карных аперацый залежалі ад волі раённага камандзіра СС і паліцыі. Часам яны абмя-

жоўваліся знішчэннем насельніцтва толькі адной вёскі або расстрэлам выпадкова выбраных яе жыхароў. У прынцыпе ўсім пацыфікацыйным акцыям спадарожнічалі рэквізіцыі маёмасці ахвяраў.

Аперацыі, скіраваныя галоўным чынам супраць партызанаў, абрыналіся перш за ўсё на мірнае насельніцтва. Забівалі найчасцей выпадковых людзей, каб такім чынам запалохаць насельніцтва і адахвоціць яго ад супрацоўніцтва з партызанамі. Але партызаны пад час канцэнтрацыі нямецкіх сілаў і правядзення аперацыі, як правіла, пакідалі раёны "ачысткі" — менавіта таму паліцэйска-вайсковыя акцыі не наносілі ім вялікіх стратаў. Пасля адыходу карнікаў партызаны зноў бралі кантроль над гэтымі абшарамі.

Партызанскі рух

Савецкі партызанскі рух у Беларусі у прынцыпе быў адным з франтоў змагання Чырвонай Арміі, да ўдзелу ў якім прыцягвалася, часта насуперак сваёй волі, мірнае насельніцтва. Дырэктыва СНК СССР і ЦК ВКП(б) ад 29 чэрвеня 1941 года ўскладвала на камуністаў абавязак арганізоўваць на занятых немцамі абшарах СССР дыверсійныя дзеянні і рух супраціву. У акупаванай зоне былі пакінуты 508 дыверсійных групаў і 4 560 камуністаў і камсамольцаў для неадкладнага ажыццяўлення задачаў, вызначаных урадам і кіраўніцтвам партыі. Усе савецкія грамадзяне былі абавязаныя выконваць указанні камуністычных уладаў у барацьбе з акупантамі, а спробы ўхіляцца ад падтрымкі партызанскаму руху расцэньваліся як здрада савецкай радзіме.

Натуральнай грамадскай базай для ўзнікнення савецкага падполля былі шматлікія групы салдатаў і афіцэраў, якія не паспелі адступіць на ўсход улетку 1941 года і якім пашанцавала выратавацца ад нямецкага палону. Добра ведалі, што іх чакае пад нямецкай акупацыяй і функцыянеры партыі, камсамолу ды прадстаўнікі жыдоўскай інтэлігенцыі. Для іх удзел у руху супраціву быў адным з шанцаў выжывання.

Да часу паразы гітлераўскай арміі пад Масквой партызанскія дзеянні на тэрыторыі акупаванай Беларусі асабліва не выяўляліся. Многія пакінутыя савецкім камандаваннем групы

былі ліквідаваныя ў часе карных акцый, якія праводзіліся аперацыйнымі аддзеламі айнзацгрупаў летам і восенню 1941 года. Перапалоханае тэрорам эсэсаўцаў і салдатаў Вэрмахта мірнае насельніцтва неахвотна далучалася да падтрымкі камуністаў. Ажыўленне і пашырэнне партызанскага руху насталі ўвесну 1942 года. Савецкае камандаванне чакала чарговага наступу немцаў на Маскву і таму зрабіла шэраг захадаў па дэзарганізацыі тылоў Вэрмахта. Ужо ў студзені 1942 года ў Беларусь, за лінію фронту, былі перакінутыя 33 групы, якія налічвалі 215 навучаных дыверсійным акцыям салдатаў. У лютым падрыхтавалі да высылкі яшчэ 12 групаў, у склад якіх уваходзілі 558 салдатаў і афіцэраў Чырвонай Арміі, а ў перыяд ад сакавіка да чэрвеня — чарговых 16 групаў па 49 салдатаў кожная[13]. Гэта былі кадры для будучых буйных партызанскіх злучэнняў. Шэраговыя салдаты набіраліся з ліку мясцовага насельніцтва. У тылах Маскоўскай, Прыволжскай і Уральскай ваенных акругаў сотні салдатаў сістэматычна навучалі арганізоўваць партызанскую дзейнасць на тэрыторыі Беларусі. Бальшыню перапраўленых цераз лінію фронту чырвонаармейцаў складалі беларусы, забраныя ў Чырвоную Армію ўлетку 1941 года.

Партызанскім рухам у Беларусі кіраваў ЦК КП(б)Б, які месціўся ў Маскве. Ад сакавіка 1942 года існаваў спецыяльны палітычна-ваенны орган — Паўночна-Заходняя аперацыйная група, якая каардынавала дзеянні Чырвонай Арміі і партызанаў у Беларусі. У выніку зімовага наступу савецкіх войскаў на пачатку 1942 года фронт клінам урэзаўся ў паўночна-ўсходнюю тэрыторыю Віцебшчыны, дзе ўжо сфармавалася структура партызанскага руху. Больш за паўгода паміж Усвятамі і Вяліжам існаваў калідор шырынёю больш за сорак кіламетраў, вядомы ў савецкай гістарыяграфіі як Віцебскія вароты, праз якія на тэрыторыю акупаванай Беларусі амаль бесперашкодна засылалі людзей, ваеннае абсталяванне, сродкі сувязі і прапагандысцкія матэрыялы. Партызаны ў сваю чаргу рэквізавалі ў насельніцтва і выслалі на ўсход праз Віцебскія вароты некалькі тысяч коней і кароў, блізу 1,5 тысячы тон збожжа і больш за 20 тысяч чалавек узялі на службу ў Чырвонай Арміі. З дапамогаю вайсковых

[13] Всенародное партизанское движение в Белоруссии. Т. 1. С. 184—185

спецыялістаў у Беларусі пабудавалі некалькі дзесяткаў палявых аэрадромаў, дзякуючы якім стала магчымым рэгулярна забяспечваць партызанскія аддзелы зброяй і амуніцыяй.

У траўні 1942 года пры галоўным камандаванні Чырвонай Арміі быў створаны Цэнтральны штаб партызанскага руху, які ўзначаліў першы сакратар ЦК КП(б)Б Панцеляймон Панамарэнка. Штаб Панамарэнкі вызначаў галоўныя кірункі дыверсійна-баявых дзеянняў, прапагандысцкай працы і фармаваў палітыку ў дачыненні да несавецкіх падпольных структураў у Беларусі. Рэалізацыяй указанняў Цэнтральнага штаба займаўся Беларускі штаб партызанскага руху, якім кіраваў Пётр Калінін.

У другой палове 1942 года ў сувязі з шырокамаштабнымі карнымі акцыямі немцаў партызанскія шэрагі папоўніліся вялікай колькасцю ахвотных змагацца з фашыстамі. Адбыўся таксама адваротны зрух. Тысячы маладых людзей трапілі ў Беларускую самаахову. Такім чынам у Беларусі ствараўся фронт нутранога канфлікту, на якім беларусы змагаліся паміж сабой за інтарэсы фашысцкага або камуністычнага таталітарызму.

Да канца 1942 года партызанскі рух канцэнтраваўся галоўным чынам ва Усходняй Беларусі. У 417 партызанскіх аддзелах змагаліся больш за 47 тысяч байцоў. Амаль 47 % падпольных сілаў знаходзілася ў Віцебскай і Менскай вобласцях[14]. У заходніх рэгіёнах дзейнічалі толькі некалькі дзесяткаў аддзелаў, якія сталі пашырацца толькі пры канцы 1943 года, калі з усходу было перапраўлена сюды 7 тысяч салдатаў.

Штаб Панамарэнкі, баючыся наступлення немцаў у цэнтральным кірунку, загадаў знішчаць чыгуначныя шляхі і эшалоны на тэрыторыі ўсёй Беларусі. Паводле савецкіх крыніцаў, партызаны за час акупацыі знішчылі больш за 10 тысяч адзінак ваеннага транспарту. Найболей акцыяў яны правялі ад траўня да верасня 1942 года. Канцэнтрацыя дыверсійных дзеянняў у Беларусі была памылкаю, бо нямецкі наступ насуперак чаканням адбыўся на паўднёвым фронце. І тым не менш параліч чыгуначнага транспарту ў жніўні і верасні 1943 года стаўся вялікім поспехам партызанаў. Ён значна скарациў нямецкія рэзервы на цэнтральным участку фронту.

---

[14] Всенародное партизанское движение в Белоруссии. Т. 2. С. 40.

Чарговай важнай задачай, якую даручыў партызанам штаб Панамарэнкі ўлетку 1942 года, была ліквідацыя ўстановаў мясцовай адміністрацыі і яе службоўцаў разам з сем'ямі. Каралі смерцю таксама настаўнікаў беларускіх школаў, старастаў і нават сялянаў, якім дасталася зямля ад распушчаных калгасаў. Гэтых людзей знішчалі як здраднікаў савецкай радзімы. Менавіта яны складалі бальшыню тых, каго савецкая гістарыяграфія залічвала ў "ліквідаваныя партызанамі сілы ворага". 70 % агульнага ліку забітых савецкім падполлем цывільных грамадзянаў складалі члены сем'яў старастаў, службоўцаў мясцовай адміністрацыі, настаўнікаў. Тэрор з боку партызанаў, хоць і вымушаў настаўнікаў уцякаць з школаў, а чыноўнікаў — з установаў, даваў супрацьлеглы эфект: гэтыя людзі часта шукалі ахову ў беларускіх пранямецкіх арганізацыях.

Псіхалагічнае становішча, якое склалася пасля пераможных баёў Чырвонай Арміі ў 1943 годзе, спрыяла развіццю савецкага партызанскага руху. Дзеяннямі штаба Панамарэнкі ўздым грамадскіх настрояў ператвараўся ў новыя партызанскія брыгады. На працягу 1943 года колькасць салдатаў, якія змагаліся ў партызанскіх падраздзяленнях, павялічылася ў 2,7 раза і пры канцы снежня перасягнула 150 тысяч, з іх 37 тысяч дзейнічалі ў заходніх вобласцях. У 1943 годзе ў Беларусь паветраным шляхам былі перапраўлены 43 тысячы адзінак стралковай зброі, вялікая колькасць мінаў, гранат, амуніцыі. У гэты перыяд на бок партызанаў перайшлі 12 тысяч паліцэйскіх і былых жаўнераў Беларускай самааховы ды 2,5-тысячная брыгада Расейскай нацыянальнай народнай арміі пад камандаваннем падпалкоўніка Гіль-Радыёнава. Гэтае фармаванне брала ўдзел у шматлікіх знішчэннях беларускіх вёсак, а пасля змены фронту было перайменаванае ў Першую антыфашысцкую партызанскую брыгаду.

У 1943 годзе амаль 20 % тэрыторыі даваеннай (да 1941 года) Беларусі апынулася пад кантролем партызанаў. На гэтым абшары ўся ўлада належала камандзірам партызанскіх аддзелаў. У большай частцы акупаванай рэспублікі нямецкая ўлада ўтрымоўвалася толькі ў гарадскіх цэнтрах. На Палессі, Віцебшчыне і Магілеўшчыне, багатых на вялікія лясы і балоты ўзніклі гэтак званыя партызанскія рэспублікі, у якіх была адноўленая большасць установаў савецкай дзяржавы.

У заходніх вобласцях Беларусі значны ваенны патэнцыял

уяўляла польскае падполле. Армія Краёва (АК) як узброеная сіла, падначаленая польскаму эміграцыйнаму ўраду ў Лондане, мелася ствараць умовы для адбудовы польскай дзяржавы ў межах да 17 верасня 1939 года. Пасля падпісання 30 ліпеня 1941 года пагаднення паміж польскім і савецкім урадамі падпольныя аддзелы Саюза ўзброенай барацьбы (СУБ), пазней — АК, сталі хаўруснікамі савецкай партызанкі. Хоць у падпісаным урадавым пагадненні не была дасягнута дамоўленасць наконт межаў, дамова, заключаная цэнтрам, абавязвала да працы ў нізах. У 1942 годзе камандзіры АК заключалі з камандзірамі савецкіх аддзелаў асобныя пагадненні, якія рэгулявалі іхныя ўзаеміны і вызначалі тэрыторыю харчовага забеспячэння для кожнага падпольнага падраздзялення[15]. Спарадычна даходзіла да супольных акцый супраць немцаў. Акцыя "Вахляж" (Веер), якая была серыяй дыверсійных дзеянняў, наладжаных СУБ-АК у 1942 годзе на тэрыторыі былых усходніх ваяводстваў, мела, аднак, палітычны антысавецкі падтэкст, бо была дэманстрацыяй польскай прысутнасці на гэтым абшары. Каб не ўскладняць дачыненні з палякамі, савецкія ўлады да 1943 года не разгортвалі свайго падполля ў Заходняй Беларусі. Сітуацыя рашуча змянілася толькі пасля разрыву дыпламатычных зносінаў паміж СССР і польскім урадам у красавіку 1943 года. Армія Краёва з саюзніцкага фармавання стала "фашысцкім", якое Цэнтральны штаб партызанскага руху загадаў знішчаць гэтаксама як нямецкія сілы або дапаможныя беларускія фармаванні.

22 чэрвеня 1943 года Цэнтральны Камітэт КП(б)Б выдаў інструкцыю для партыйных арганізацый на тэрыторыі Заходняй Беларусі, у якой было сказана, што заходнія вобласці — неадлучная частка БССР, часова акупаваная немцамі. У адпаведнасці з інструкцыяй на гэтай тэрыторыі мелі права дзейнічаць толькі тыя арганізацыі, якія кіраваліся інтарэсамі БССР. Прытым быў дадзены загад ліквідаваць дзейнасць польскіх нацыяналістычных арганізацый, да якіх прылічылі і АК, ды арганізаваць польскае савецкае падполле. Адначасова рашэннем ЦК КП(б)Б з Усходняй Беларусі ў Заходнюю было перапраўлена 40 невялікіх аддзелаў, якія папаўняліся мясцовым насельніцтвам.

---

[15] Prawdzic-Szlaski J. Nowogródczyzna w walce 1940—1945. Londyn, 1976. S. 114—117.

Савецкае падполле пашырылася таксама на Беласточчыну і налічвала блізу 6 тысяч салдатаў. На гэтай тэрыторыі не ствараліся структуры Польскай рабочай партыі, што азначала паслядоўное ажыццяўленне савецкім урадам плана аднаўлення межаў 1941 года. Узброеныя сутычкі паміж АК і савецкай партызанкай сталі непазбежнымі.

Пагаршэнню польска-савецкіх дачыненняў у Заходняй Беларусі ў 1943 годзе спадарожнічала абвастрэнне польска-беларускага канфлікту. У выніку палітыкі падтрымкі беларусаў пры падборы кадраў у мясцовую адміністрацыю і дапаможную паліцыю іх удзел у гэтых установах пры канцы 1943 года павялічыўся адпаведна да 80 і 60 %. Беларуская мова ў гэтай частцы Беларусі стала дзяржаўнай, на ёй выходзіла бальшыня легальных газетаў, па-беларуску выкладалася бальшыня прадметаў у пачатковых і сярэдніх школах. Камандаванне АК, асабліва Наваградскай і Віленскай акругаў, расцаніла выразнае развіццё беларускага нацыянальнага руху як пагрозу для польскіх інтарэсаў. Распаліць польска-беларускі канфлікт імкнуліся таксама немцы праз адпаведныя захады, напрыклад звальняючы з пасадаў палякаў, арганізуючы патаемныя забойствы прадстаўнікоў польскай і беларускай інтэлігенцыі. Так узмацнялася атмасфера недаверу і варожасці. Беларускія чыноўнікі ў выпадках сутыкнення інтарэсаў у прынцыпе прымалі рашэнні не на карысць палякаў. Яны больш ахвотна пасылалі на прымусовыя работы польскую моладзь, чым беларускую. На рост беларускай перавагі ў структурах акупацыйнай улады АК адказала антыбеларускім тэрорам. У Лідскай акрузе канфлікт ператварыўся ў вайну, мэтай якой было знішчэнне элітаў. Узаемадзеянне АК і польскай дапаможнай паліцыі, якая мела перавагу ў гэтай акрузе, давяло да фізічнага знішчэння большасці арганізатараў беларускага нацыянальнага жыцця — настаўнікаў, чыноўнікаў, дзеячоў Саюза беларускай моладзі[16]. Камендант Наваградскай акругі АК пісаў, што ягоныя жаўнеры ў другой палове 1943 года пакаралі смерцю больш за 300 беларусаў, а на 80 чалавек зрабілі даносы ў гестапа, абвінаваціўшы іх у камунізме[17].

[16] Ярмалковіч В. На жыццёвых хвалях // Лёс аднаго пакаленьня: Успаміны. Беласток, 1996. С. 186—190.

[17] Prawdzic-Szlaski J. Nowogródczyzna... S. 66.

Асаблівасцю Навагрудчыны было і тое, што амаль палову ўдзельнікаў беларускага нацыянальнага руху, з якім змагалася АК, складалі каталікі (у II Рэчы Паспалітай улады былі схільныя лічыць іх палякамі), а ў шэрагах АК амаль 40 % жаўнераў складалі праваслаўныя беларусы[18].

Цяжка вызначыць, якую палітычную гульню вёў Вацлаў Іваноўскі. Працуючы на пасадзе бургамістра Менска, ён прыняў на працу ў магістрат двух афіцэраў разведкі АК, падтрымоўваў дзейнасць польскага падполля на Меншчыне. Ён быў дарадцам генеральнага камісара Вільгельма Кубэ, старшынёю Беларускай рады даверу, якая прадстаўляла інтарэсы беларускага насельніцтва перад немцамі. Іваноўскі апынуўся ў цэнтры сілаў, якія бачылі будучыню Беларусі ў шчыльнай сувязі з Нямеччынай. Ягоны паралельны ўдзел у супрацоўніцтве з польскім падполлем быў ажыццяўленнем зусім адваротнай канцэпцыі, праявай веры ў магчымасць стварэння федэрацыі Польшчы і Беларусі як раўнапраўных суб'ектаў. Гэта была своеасаблівая пазіцыя сярод беларускіх палітыкаў з увагі на тое, што польскі бок катэгарычна выказваўся за вяртанне становішча, якое існавала да 1939 года.

Беларуская цэнтральная рада

Акрамя пацыфікацыі вёсак і тэрору ў дачыненні да падазроных у супрацоўніцтве з партызанамі асобаў, у сярэдзіне 1943 года нямецкія акупацыйныя ўлады вярнуліся да палітыкі падтрымкі беларускага нацыянальнага руху і стварэння антысавецкай грамадскай базы. Увесну 1943 года пачалася падрыхтоўка да заснавання беларускай моладзевай арганізацыі, узорам якой меліся стаць падобныя арганізацыі ў прыбалтыйскіх краінах. Навучанне кадраў будучай арганізацыі даверылі заўзятаму прыхільніку ідэі супрацоўніцтва з Нямеччынай Фабіяну Акінчыцу. Былі адкрыты два падрыхтоўчыя цэнтры — для дзяўчат у Драздах блізу Менска, а для хлопцаў — у Альбярціне блізу Слоніма. 22 чэрвеня 1943 года было абвешчана пра заснаванне Саюза беларускай моладзі (СБМ). Лідэр СБМ Міхась Ганько быў падначалены генеральнаму камісару Вільгельму Кубэ, яму падпарадкоўваліся акруговыя кіраўнікі, а тым у сваю чаргу —

[18] Сямашка Я. Армія Краёва на Беларусі. Мінск, 1994. С. 131.

раённыя кіраўнікі. Паводле статута, мэтай СБМ была падрыхтоўка маладога пакалення беларусаў да выканання нацыянальнай місіі. Арганізацыя выдавала свой часопіс "Жыве Беларусь". Лідэры ніжэйшых структураў вербаваліся з ліку гімназічнай моладзі. Яны праходзілі спецыяльныя курсы, набліжаныя да вайсковага навучання[19]. СБМ гуртаваў гарадскую і местачковую моладзь. У гэтым асяроддзі ў савецкіх партызанаў былі абмежаваныя магчымасці знішчаць варожыя сабе палітычныя структуры, таму СБМ неўзабаве стаў шматлікай арганізацыяй — пры канцы 1943 года ў ім налічвалася 40 тысяч сяброў і былі свае структуры на ўсёй тэрыторыі Беларусі, якая знаходзілася пад нямецкім кантролем.

Разам з заснаваннем моладзевай арганізацыі Кубэ стварыў таксама Беларускую раду даверу (БРД), якая мусіла быць заменнікам палітычнага прадстаўніцтва беларусаў перад нямецкімі ўладамі і, праўдападобна, зародкам нейкага калабаранцкага ўрада. Старшынёю БРД стаў Вацлаў Іваноўскі, а ў яе склад увайшлі таксама лідэры СБМ Міхась Ганько і Надзея Абрамава. Радзе цяжка было дасягнуць даверу беларусаў, бо якраз тым часам СС, паліцыя і Вэрмахт не пераставалі знішчаць беларускія вёскі. Чарговая спроба цывільнага кіраўніцтва стварыць антыбальшавіцкі беларускі фронт закончылася беспаспяхова. Аўтар гэтай палітычнай канцэпцыі Вільгельм Кубэ загінуў 22 верасня 1943 года ў выніку замаху, ажыццёўленага савецкім падполлем. Яго наступнікам стаў ініцыятар жорсткіх пацыфікацыйных акцыяў, камандзір СС і паліцыі ў Генеральнай акрузе Беларусь Курт фон Готбэрг. З ягонай санкцыі 7 снежня 1943 года ў Менску быў забіты старшыня Беларускай рады даверу Вацлаў Іваноўскі[20].

Новы генеральны камісар акругі Беларусь не выступаў як прыхільнік стварэння ўмоў для развіцця беларускага нацыяналізму ў якасці процівагі савецкаму падполлю. Затое ён быў зацікаўлены ў падтрымцы розных сілаў, якія з натуральных прычын схільныя былі весці вайну з СССР. На Наваградчыне немцы заключылі з мясцовымі камандзірамі АК — палкоўнікам Янушам Праўдзіцам-Шляскім, капітанам Адольфам Пільхам, па-

[19] Жамойцін Я. З перажытага // Лёс аднаго пакаленьня… С. 88—89.

[20] Туронак Ю. Беларусь пад нямецкай акупацыяй. С. 176.

ручнікам Юзафам Свідам некалькі пагадненняў аб узаемным ненападзе і забеспячэнні аддзелаў АК зброяй пры ўмове, што яна будзе скарыстаная ў барацьбе з савецкімі партызанамі[21]. Гэтыя пагадненні мелі вайсковы характар, бо афіцыйна навагрудскае злучэнне АК знаходзілася ў стане вайны з немцамі. Рашэнні мясцовых камандзіраў АК ніколі не былі ўхваленыя Галоўнай камендатурай, бо яны супярэчылі планам акцыі "Бура" і перакрэслівалі яе палітычны сэнс.

У выніку паляпшэння польска-нямецкіх дачыненняў на Навагрудчыне лік байцоў у мясцовых падраздзяленнях АК павялічыўся да 8 тысяч жаўнераў. Вярбоўка часта праводзілася па прынцыпе набору ўсіх маладых мужчын адпаведнага веку. У Лідскай акрузе савецкае падполле практычна было выцеснена, а абвінавачаныя ў камунізме мясцовыя беларускія дзеячы амаль усе забітыя[22].

Становішча на фронце змусіла немцаў пакарыстацца таксама беларускім людскім патэнцыялам. Восенню 1943 года быў абвешчаны набор мужчынаў 1922—1924 гадоў нараджэння ў беларускую дапаможную паліцыю. У казармах апынуліся 20 тысяч чалавек, а паасобныя аддзелы ўзначалілі нямецкія афіцэры і падафіцэры. Самастойныя батальёны беларускай дапаможнай паліцыі пачалі ствараццa таксама ў Беластоцкай акрузе, якая была ў складзе Усходняй Прусіі. Прымусовыя рэкруты служылі толькі мілітарным мэтам Райха. З прычыны масавага дэзерцірства навабранцаў боегатоўнасць беларускіх паліцэйскіх падраздзяленняў была невысокая. Менавіта таму пачалі ствараццa беларускія вайсковыя фармаванні ў якасці ўзброеных сілаў, падлеглых нейкаму беларускаму палітычнаму цэнтру. Такі марыянеткавы ўрад у сапраўднасці мог быць толькі шырмай для нямецкіх кіраўнічых цэнтраў. 21 снежня 1943 года з удзелам нямецкіх акупацыйных уладаў была створана Беларуская цэнтральная рада (БЦР), названая афіцыйнай прапагандай "прадстаўніцтвам беларускага народа". Яе старшынёй прызначылі Радаслава Астроўскага, які раней супрацоўнічаў з

---

[21] Świda J. Wyjaśnienia dotyczące okresu 1943/1944 // Zeszyty Historyczne. 1985. № 73. S. 77—78.

[22] Палажэнне ў Лідскай акрузе Генеральнага Камісарыята Беларусь // Летапіс. Нью-Йорк, 1985. № 28.

немцамі ў змаганні з савецкім падполлем на Смаленшчыне. БЦР, гэтаксама як і раней СБМ, была поўнасцю падпарадкаваная генеральнаму камісару, які прызначаў старшыню Рады і яе сяброў.

БЦР атрымала вялікія сродкі для грамадскай апекі, падтрымкі культуры і на прапаганду. Астроўскі часта звяртаўся да грамадзянаў з адозвамі, заклікаў партызанаў здавацца і абяцаў ім амністыю. Нямецкая прапаганда паказвала яго як правадыра беларускага народа, які змагаецца за вызваленне радзімы з-пад маскоўскага бальшавізму.

У студзені 1944 года была праведзена рэарганізацыя Рады. Пры Радзе стварылі пасаду вайсковага рэферэнта, на якую Готбэрг прызначыў Францішка Кушаля. 6 сакавіка Астроўскі выдаў шырока распаўсюджанае ў друку і распрапагандаванае з дапамогай плакатаў распараджэнне, якое заклікала ўсіх мужчын 1908—1924 гадоў нараджэння на службу ў падраздзяленні Беларускай краёвай абароны (БКА). Распараджэнне абавязвала беларусаў на працягу трох гадзін з моманту атрымання пазову з'явіцца на мабілізацыйны пункт. Непаслухмянасць лічылася дэзерцірствам і падпадала пад судовае пакаранне. Стварэнне БКА пачалося праз колькі дзён пасля ўхвалення праекта ўладамі Райха ў Берліне.

Вайсковыя камісіі БКА былі створаныя ў Менску, Баранавічах, Слуцку, Навагрудку, Вілейцы, Слоніме, Глыбокім. Пасля абвяшчэння набору ў "беларускае войска" частка абавязаных уцякла да партызанаў, але ў мабілізацыйныя камісіі з'явіліся 40 тысяч мужчын. Немцы не чакалі такога вялікага прытоку навабранцаў, яны загадалі вайсковым камісіям частку юнакоў і мужчын адаслаць дадому. Тады было завербавана 28 тысяч жаўнераў, якіх злучылі ў 45 батальёнаў, галоўным чынам пяхотных. Баючыся дэзерцірства, немцы забяспечылі атрады БКА ўсяго той колькасцю зброі, якая патрабавалася для навучання. З гэтае прычыны жаўнеры-беларусы выкарыстоўваліся галоўным чынам на будаўніцтве ваенных аб'ектаў. Немцы не мелі дастатковай колькасці афіцэраў і падафіцэраў, каб згуртаваны ў БКА людскі патэнцыял скарыстаць для барацьбы з партызанамі. У сярэдзіне чэрвеня ў Менску адкрылася афіцэрская школа для 280 слухачоў, але праз два тыдні горад заняла Чырвоная Армія.

27 чэрвеня, за некалькі дзён да ўступлення савецкіх войскаў у Менск, Астроўскаму ўдалося склікаць Другі Усебеларускі кангрэс (першы адбыўся ў снежні 1917 г.) з удзелам прадстаўнікоў беларускіх асяродкаў з усёй тэрыторыі акупаванай немцамі Еўропы. У ім удзельнічалі 1039 дэлегатаў. Кангрэс абвясціў сябе органам, які працягвае палітычныя традыцыі Беларускай Народнай Рэспублікі, палічыў БЦР адзінай легальнай уладай у Беларусі, а БССР назваў творам маскоўскага імперыялізму. Усе дэкларацыі, гэтаксама як і парадак паседжання Кангрэса, былі наперад узгодненыя з службай бяспекі Райха. Прапагандысцкая акцыя вакол Кангрэса мела паказаць беларускаму грамадству, што ў Беларусі ёсць свой уласны ўрад, ухвалены нацыянальным прадстаўніцтвам, што нямецкае войска — гэта часова размешчаная армія альянтаў, а Чырвоная Армія, якая набліжалася, ёсць агрэсарам. Праз два дні пасля заканчэння Кангрэса з Менска эвакуяваліся БЦР ды частка афіцэраў і падафіцэраў БКА. На месцы засталіся шэраговыя жаўнеры, якія разышліся па дамах, калі распалася ўлада, што заклікала іх на вайсковую службу. Частка з іх неўзабаве трапіла ў Чырвоную Армію, частку неадкладна асудзілі савецкія ваенныя трыбуналы.

Рада БЦР ад сярэдзіны ліпеня 1944 года працягвала дзейнасць у Берліне, дзе немцы хацелі выкарыстаць яе для ўздзеяння на некалькі тысяч беларусаў, вывезеных на прымусовыя работы ў Нямеччыну, на актывістаў СБМ, якія ахвотнікамі прыбылі на тэрыторыю Райха, ды на некалькі дзесяткаў тысяч уцекачоў, якія баяліся рэпрэсій з боку савецкіх уладаў.

Ваенныя страты

Паводле савецкіх крыніцаў, з чэрвеня 1941 да канца 1944 года ў выніку вайны і нямецкай акупацыі загінулі 2 219 317 жыхароў Беларусі. Гэты лік датычыў толькі тых земляў, якія ў 1944 годзе ўвайшлі ў склад БССР. У савецкай літаратуры, аднак, адсутнічаюць верагодныя падлікі, на падставе якіх была вызначана велічыня людскіх стратаў. Перш за ўсё бракуе звестак пра колькасць жыхароў Беларусі ў чэрвені 1941 года. У момант выбуху вайны ў Сібір імчалі, між іншым, эшалоны з жыхарамі Беларусі, а ў турмах НКВД знішчаліся сапраўдныя і ўяўныя ворагі савецкай улады.

У ліку 2,2 мільёна змяшчаецца 810 тысяч ваеннапалонных,

палеглых на тэрыторыі Беларусі, з якіх не ўсе былі жыхарамі рэспублікі да 1941 года. Большасць распрацовак карыстаецца дакладным лікам забітых — 1 409 225 чалавек[23]. Гэтыя ж крыніцы паведамляюць, што ў чэрвені 1941 года блізу 0,5 мільёна жыхароў Усходняй Беларусі забралі ў Чырвоную Армію, а 1,5 мільёна эвакуявалася ў Расею. Паколькі яшчэ працягваліся ваенныя дзеянні, не маглі вярнуцца на радзіму ні салдаты з фронту, ні цывільныя асобы, вывезеныя ўлетку 1941 года. Падводзячы гэтыя вынікі, можна было б сказаць, што страты насельніцтва ў 1945 годзе складаюць блізу 4 мільёнаў чалавек. Быў бы гэта, аднак, абсурдны тэзіс. Савецкая гістарыяграфія не дае адказу на пытанне, колькі людзей загінула ў барацьбе з немцамі, колькі — у выніку масавых расстрэлаў летам 1941 года, а колькі пад час масавых пацыфікацый у 1942—1944 гадах, колькі асобаў загінула ў канцэнтрацыйных лагерах на тэрыторыі Беларусі, а колькі — у выніку рэпрэсій савецкага падполля. Невядомы таксама лік ахвяраў польска-беларускага і польска-савецкага канфліктаў, як і нацыянальны склад жыхароў Беларусі, якія страцілі жыцці пад час нямецкай акупацыі.

Да вайны у Беларусі жыло каля 700 тысяч жыдоў. Многія з іх эвакуяваліся ў 1941 годзе на ўсход. Бальшыня з тых, што засталіся, былі знішчаныя. У канцэнтрацыйныя лагеры на тэрыторыі Беларусі, асабліва ў Трасцянец блізу Менска, прывозілі жыдоў з усёй Еўропы. Дзвесце тысяч чалавек, якія загінулі ў Трасцянцы, былі жыхарамі розных краінаў.

Пад час нямецкай акупацыі з Беларусі было вывезена на прымусовыя работы ў Нямеччыну амаль 385 тысяч маладых людзей. Толькі 120 тысяч вярнуліся дамоў, частка загінула ў выніку бамбавання прамысловых цэнтраў на тэрыторыі Райха авіяцыяй альянтаў, а частка пастанавілі не вяртацца ў Савецкі Саюз.

У 1944—1945 гадах працягваўся набор у Чырвоную Армію, якім ахапілі 600 тысяч чалавек. Пачаліся таксама дэпартацыі асобаў, абвінавачаных у калабарацыянізме з акупантамі. Менавіта таму памер людскіх стратаў — 2,2 мільёна ахвяраў, здаецца недакладным з прычыны таго, што ў тагачасных умовах не было ніякіх шанцаў вызначыць іх сумленна. Аднак савецкая гістарыяграфія прыняла гэты лік як неаспрэчны факт. Бяс-

[23] Нарысы гісторыі Беларусі. Ч. 2. С. 323.

спрэчным у сваю чаргу ёсць тое, што лютасць нямецкай акупацыйнай сістэмы ў Беларусі і татальны характар вайны, якую вялі партызаны ў тыле ворага, спрычыніліся да незвычайна высокага параўнальна з іншымі краінамі акупаванай Еўропы ліку ахвяраў сярод мірнага насельніцтва. Беларусь знаходзілася ў зоне шырокага фронту змагання паміж двума таталітарызмамі, якія не зважалі на кошт людскіх жыццяў, таму такімі вялікімі сталіся памеры трагедыі нашага народа.

Апрача людскіх стратаў вайна і акупацыя давялі да зруйнавання гаспадарку Беларусі. Згарэлі больш за дзвесце гарадоў і мястэчак. Найбольш пацярпелі Менск і Віцебск, у якіх знішчэнне будынкаў і гарадской інфраструктуры дасягнула 80—90 %. Частку стратаў ва ўсходніх вобласцях нанесла Чырвоная Армія, адступаючы ўлетку 1941 года. Наагул пад час Другой сусветнай вайны ў Беларусі спалена было 9 200 вёсак, амаль 1,2 мільёна будынкаў. Вайсковыя сілы з розных бакоў рэквізавалі ў беларускіх сялянаў 61 % усіх коней, 69 % кароў і валоў і ажно 89 % свіней.

Партызанскія дзеянні адпаведна загадам савецкага камандавання таксама палягалі ў разбурэнні ўсяго, што магло служыць узмацненню ваеннага патэнцыялу Нямеччыны. Найбольшыя страты гаспадарка Беларусі пацярпела ў часе эвакуацыі прамысловых аб'ектаў на ўсход летам 1941 года. Астатнія вартасныя аб'екты забралі немцы, адступаючы з Беларусі ў 1944 годзе. Менавіта таму ў 1945 годзе велічыня прамысловай вытворчасці Беларусі склала толькі 20 % даваеннай магутнасці.

У выпадку Беларусі Другая сусветная вайна мела асабліва цяжкія наступствы. Краіна засталася без нацыянальнай эліты, частка якой загінула ў часе акупацыі, частка эвакуявалася з нямецкай арміяй, а астатнія неўзабаве апынуліся ў савецкіх канцэнтрацыйных лагерах. У Беларусі не стала сілаў, якія маглі б хоць прыпамінаць пра ідэю незалежнасці, пра свае нацыянальныя сімвалы. Усё гэта было скампраметаванае ў часе нямецкай акупацыі, што старанна выкарыстала савецкая прапаганда, падаючы кожную думку аб самастойнай Беларусі як нацыянальную здраду і праяву нацыяналістычна-фашысцкай тэндэнцыі. Змаганне паміж савецкімі і нацыянальнымі інтарэсамі не закончылася ў 1944 годзе. Пераможны савецкі бок пачаў знішчаць усё, што ў будучыні магло б паспрыяць адраджэнню беларускіх нацыянальных імкненняў.



Ляхавіцкія музыкі. Слуцкі павет Менскай губерні. 1913 год



Адзін з заснавальнікаў Беларускай сацыялістычнай грамады Вацлаў Іваноўскі — студэнт Пецярбургскага тэхналагічнага інстытута. Пачатак XX стагоддзя




Язэп Лёсік (злева) і Алесь Гарун, высланыя на пасяленне ў пасёлак Бадайба Якуцкай вобласці. 1914 год




Супрацоўнікі Менскай грамадзянскай міліцыі. У першым радзе пяты справа — М.Фрунзе. 1917 год




Першамайская дэманстрацыя ў Менску. 1917 год



Палітычная карта Беларускай дзяржавы, выдадзеная ў 1919 годзе Народным Сакратарыятам
да Парыжскай мірнай канферэнцыі, дзе вырашаліся пытанні ўладкавання свету пасля Першай сусветнай вайны



Сябры першага складу Нацыянальнага Сакратарыята БНР
(20 лютага — 23 ліпеня 1918 года). Сядзяць (злева направа): Алесь Бурбіс, Іван Серада, Язэп Варонка, Васіль Захарка; стаяць: Аркадзь Смоліч, Пётра Крэчэўскі, Кастусь Езавітаў, Антон Аўсянік, Лявон Заяц





Пячатка Місіі (дэлегацыі)
Найвышэйшае Рады БНР
па надзвычайных даручэннях.
1920 год


Старшыня ўрада БНР Вацлаў Ластоўскі.
Юбілейная фотапаштоўка, выдадзеная
нелегальна да 100-годдзя выдатнага
палітычнага дзеяча, гісторыка, пісьменніка



Сцяг 1-га Слуцкага палка войскаў БНР, вышыты актывісткамі Гарадзенскага беларускага жаноцкага гуртка. Побач сядзяць (злева направа): старшыня Беларускага нацыянальнага камітэта ў Варшаве Лявон Дубейкаўскі, невядомая; стаіць — капітан Антон Борык. Вільня, 1921 год



Эскадрон 1-га Гарадзенскага беларускага палка каля ўвахода ў гарадскую камендатуру. Сакавік 1919 года



Наша Слова


Раздзел першы.
(Сучаснае становішча).

Шостая праўда.
Уступ.

Наша Слова.

Хто такія? (сатыра).

Старонкі рукапіснага часопіса «Наша Слова», які выдавалі навучэнцы агульнаадукацыйных настаўніцкіх курсаў у Слуцку — удзельнікі нелегальнай антысавецкай арганізацыі, кіраванай выкладчыкам Юркам Лістападам. 1925 год



Аляксандар Чарвякоў — адзін з найбольш выдатных дзяржаўных дзеячоў Савецкай Беларусі, у 1920—1924 гадах старшыня ЦВК і СНК БССР, у 1924—1937 гадах старшыня ЦВК БССР, быў у ліку ініцыятараў палітыкі беларусізацыі ў 1920-я гады



„Труд в СССР есть дело чести, дело славы, дело доблести и геройства". (СТАЛИН)

Делегатский билет

Предъявитель билета Горецкий Г. Ш.

является делегатом 1-го Всесоюзного слета ударников Беломорбалткомбината.

10 ноября 1933 года Ряд № 13 Место № 16

Зам. пред. Центр. Штаба С и У
ББК и Нач. КВО СИБЫТЬЕВ

Па-рознаму «заахвочвалі» катаржную працу вязняў у ГУЛАГу. Дэлегацкі білет Г.Гарэцкага — удзельніка ўсесаюзнага злёту ўдарнікаў



Гулагаўскі сімвал пабудовы сацыялізму




Чалавечыя парэшткі ў Курапатах — жахлівае сведчанне сталінскага генацыду. Толькі ў канцы 1980-х гадоў прыўзнялася заслона маўчання над гэтым месцам злачынстваў НКВД



Так і не даляцеў «наш паравоз» да камуны, хаця і пайшлі «ў топку» мільёны чалавечых жыццяў... Рэшткі чыгункі, якую на вечнай мерзлаце будавалі і вязні-беларусы



Палітычная карыкатура, якая паказвае жорсткую дыскрымінацыю беларусаў у Польскай дзяржаве. Мастак Мсціслаў Дабужынскі



Браніслаў Тарашкевіч — аўтар першай «Беларускай граматыкі для школ», сябар Беларускага пасольскага клуба, старшыня Беларускай сялянска-работніцкай грамады



Паэтка Наталля Арсеннева разам з гісторыкам Міколам Шчорсам (злева) і літаратуразнаўцам Станіславам Станкевічам пад час шпацыру па віленскіх вуліцах. Другая палова 1930-х гадоў



Прапагандысцкі плакат
часоў нямецкай акупацыі



Агітацыйны плакат
Саюза беларускай моладзі



Разбураны Барысаў. Здымак 1944 года




Пасля вайны даводзілася і так працаваць...




Цэнтральная плошча Менска ў дзень смерці І.Сталіна 5 сакавіка 1953 года



З'явіліся і ў Беларусі «гіганты індустрыі».
Першае рудаўпраўленне Салігорскага калійнага камбіната. 1965 год



«Гігантаманія» ў сельскай гаспадарцы.
Комплекс па адкорме буйной рагатай жывёлы саўгаса-камбіната «Мір»
Баранавіцкага раёна




Газафракцыйная ўстаноўка вытворчага аб'яднання «Нафтан». Наваполацк



Вынік савецкага «наватарства» ў аграпрамысловым комплексе — тут нарыхтоўвалі «галінкавы корм». У адным з калгасаў Пухавіцкага раёна. Здымак канца 1980 года

Паштоўка
«1000 гадоў Беларусі»
мастака Яўгена Куліка,
выдадзеная нелегальна





Юбілейны медаль,
прысвечаны 1000-годдзю Беларусі.
Мастак Тамара Васюк



Беларускі пісьменнік
і грамадскі дзяяч
Алесь Адамовіч (у цэнтры)
пад час аднаго з першых мітынгаў
Беларускага народнага фронта
каля Акадэміі навук Беларусі
1 траўня 1989 года




Антыкамуністычная дэманстрацыя і мітынг у Менску 7 лістапада 1990 года



Свята беларускай вайсковай славы. Прыняцце прысягі на Плошчы Незалежнасці ў Менску 8 верасня 1992 года



Пад час адборачнага матчу на першынство свету па футболе паміж нацыянальнымі зборнымі Беларусі і Нідэрландаў (Менск, 15 чэрвеня 1995 года), у якім беларуская дружына перамагла з лікам 1 : 0



Менск 1996 года. Палітычная карыкатура

Раздзел 7

Уніфікацыя палітычнай і гаспадарчай сістэмы БССР (1944—1956)

Карэктаванне межаў і перасяленні

Ад пачатку вайны з Нямеччынай савецкі ўрад трымаўся погляду пра неабходнасць вяртання да межаў СССР з чэрвеня 1941 года. Аднак нічога не ўзгадвалася пра межы савецкіх рэспублік. Неўзабаве пасля вызвалення Беларусі ў 1944 годзе Сталін прапанаваў змяніць межы рэспублікі з Расеяй. У жніўні быў гатовы праект перадачы Расейскай Федэрацыі Полацкай вобласці. Дзякуючы настойлівым старанням першага сакратара ЦК КП(б)Б Панцеляймона Панамарэнкі, падмацаваным аргументамі пра ахвярнасць насельніцтва Беларусі ў барацьбе з нямецкімі акупантамі, беларускім камуністам удалося абараніць усходнія межы рэспублікі[1].

Хоць Беларусь апынулася ў ліку дзяржаў-заснавальніц Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, аднак яна не мела амаль ніякіх прыкметаў дзяржаўнага суверэнітэту. Панамарэнка няшмат мог паўплываць на справу ўсталявання мяжы з Польшчай. Яна праводзілася без удзелу беларускага боку. Няма доказаў таго, што Сталін, ствараючы польскую Краёву Раду Нарадову пры канцы 1943 года даручыў ёй пад апеку Беласточчыну. Толькі ў сакавіку 1944 года на паседжанні Вярхоўнага Савета БССР старшыня яго Прэзідыума Нічыпар Наталевіч згадаў пра магчымасць перадачы Беластоцкай вобласці Польшчы. Аднак ніякія канкрэтныя пастановы ў гэтай справе не прымаліся. Панамарэнка настойваў пакінуць у межах Беларусі Бельскі павет. Прыналежнасць гэтых земляў не была яшчэ вызначаная ў ліпені 1944 года, бо на працягу больш чым двух тыдняў пасля вызвалення Беласточчыны на тэрыторыі Бельскага павета ствараліся савецкая адміністрацыя. Толькі 10 жніўня 1944 года Берасцейскі абласны камітэт КП(б)Б выдаў інструкцыю аб вывадзе работнікаў савецкай адміністрацыі і партыйнага апарату з Кляшчэльскага і Сямяціцкага раёнаў. Іх месца занялі людзі, дэлегаваныя ўпаўнаважаным Польскага камітэта нацыянальна-

---

[1] Бодак А. Об изменениях западной границы Беларуси в 1944—1955 гг. // Берасцейскі храніограф: Зборнік навуковых прац. Брэст, 1997. С. 66.

га вызвалення (ПКНВ) па Беластоцкім ваяводстве Леанардам Барковічам. Аднак Вярхоўны Савет БССР фармальна прыняў пастанову пра перадачу Польшчы большасці земляў Беластоцкай вобласці толькі 20 жніўня. З рэштак Беластоцкай вобласці, да якіх былі далучаны тры раёны Баранавіцкай і адзін Берасцейскай, была створана Гарадзенская вобласць.

У 1946—1955 гадах мяжа паміж БССР і Польшчай карэктавалася некалькі разоў. На загад цэнтральных савецкіх уладаў дзяржаўная мяжа перасоўвалася на ўсход чатыры разы: Польшчы перадалі некалькі дзесяткаў вёсак Сапоцкінскага, Беластавіцкага і Свіслацкага раёнаў, жыхары якіх былі пераважна каталікамі. Савецкія ўлады трымаліся погляду, што самым карысным развязаннем, якое забяспечыць стабільнасць заходніх межаў СССР будзе перасяленне ў Польшчу палякаў з Летувы, Беларусі і Украіны.

14 верасня 1944 года паміж урадам БССР і ПКНВ было падпісанае пагадненне аб рэпатрыяцыі беларускага насельніцтва з Польшчы і польскага — з Беларусі. У выніку ў 1945—1947 гадах з Беларусі выехалі 274 163 чалавекі[2]. Гэта былі пераважна тыя, што лічылі сябе або запісваліся палякамі, хоць выязджалі таксама беларусы і жыды. Рух у другі бок быў намнога меншы. З Польшчы ў гэты час выехалі 36 388 чалавек беларускай нацыянальнасці, аднак не ўсе пасяліліся ў Беларусі. Некалькі тысяч рэпатрыянтаў насуперак іхнай волі былі вывезеныя ў глыб Расеі. У Польшчы засталося блізу 135 тысяч беларусаў праваслаўнага веравызнання і блізу 200 тысяч каталікоў, якія карысталіся беларускімі гаворкамі і нацыянальная свядомасць якіх паступова развівалася ў накірунку да польскасці[3].

Нельга, аднак, вызначыць колькасць беларусаў, якія ў адпаведнасці з пагадненнем аб рэпатрыяцыі ад 14 верасня 1944 года перасяліліся ў Польшчу, запісваючыся палякамі. Як і большасць рэпатрыянтаў, іх пасялілі ў паўночных і заходніх ваяводствах на былой нямецкай тэрыторыі. Некаторыя з іх праз сваю прыналежнасць да беларускага народа змаглі заявіць толькі ў 1956 годзе.

---

[2] Волаціч М. Насельніцтва Заходняй Беларусі і яго перасяленне між сучаснай Польшчай і БССР // Беларускі зборнік. 1956. № 4. С. 25.

[3] Mironowicz E. Białorusini w Polsce 1944—1949. Warszawa, 1993. S. 104—116.

Аднаўленне гаспадаркі

Беларусь, зруйнаваная ў выніку ваенных дзеянняў, была пазбаўленая аб'ектаў стратэгічнага значэння, якія можна было б скарыстаць для падмацавання тылоў савецкага фронту. Няшмат сектараў эканомікі, апрача хіба сельскай гаспадаркі, маглі б наладзіць вытворчасць без дапамогі звонку. У 1945 годзе было выпрацавана 82 мільёны кілаватаў электрычнай энергіі, што складала ўсяго 16,1 % вытворчасці 1940 года. Найбольшы спад прадукцыі назіраўся ў металаапрацоўчай прамысловасці, якой ў 1945 годзе практычна не існавала, а таксама ў металургічнай, якая давала ўсяго толькі 3,4 % гадавой даваеннай вытворчасці. Параўнальна хутка ўдалося запусціць цэментавыя заводы, што мела важнае значэнне для адбудовы краіны. У 1945 годзе вытворчасць цэменту дасягнула 50 тысяч тон. І хоць гэта складала ўсяго чвэрць прадукцыі 1940 года, аднак стварала нейкія новыя магчымасці для рэканструкцыі гаспадаркі[4]. З прычыны складанасцяў у забеспячэнні няспыннага прытоку энергетычных рэсурсаў з Расеі ўлады БССР пастанавілі шырэй скарыстаць паклады торфу ў цэнтральных і паўднёвых раёнах рэспублікі.

Аднак памеры стратаў не дазвалялі Беларусі самастойна адбудаваць гаспадарку. Яшчэ пад час вайны паасобныя вобласці Расейскай Федэрацыі заяўлялі аб гатоўнасці дапамагчы вызваленым Чырвонай Арміяй вобласцям Беларусі. Фармальна велічыню дапамогі і яе адрасатаў вызначалі абласныя камітэты ВКП(б), аднак уся акцыя каардынавалася Цэнтральным Камітэтам партыі і Саветам Народных Камісараў. Дапамога гэтая рэалізавалася ў адпаведнасці з пастановай ЦК ВКП(б) ад 21 жніўня 1943 года "Аб метадах аднаўлення гаспадаркі ў раёнах, вызваленых з-пад нямецкай акупацыі". 27 сакавіка 1944 года першым пра адпраўку ў Беларусь 41 вагона тавараў заявіў абласны камітэт ВКП(б) у Яраслаўлі. У гэтым транспарце было 25 металаапрацоўчых станкоў, 24 электрарухавікі і трансфарматары, 7 740 прыладаў, 41 тона фарбаў і лакаў, 1 цыстэрна паліва, 13 тысяч пар ботаў, бялізна і вопратка, 2 748 кг мыла, 53 тысячы экзэмпляраў літаратуры, 37 тон ільнянога і канаплянага

[4] Народное хозяйство БССР: Статистический сборник. Минск, 1957. С. 22.

насення, 3,2 тысячы баронаў і конных плугоў[5]. Пра такую ж дапамогу з дэталёвым пералікам відаў і колькасці планаваных да высылкі тавараў заяўлялі іншыя абласныя і гарадскія камітэты рэгіёнаў Расеі, якія не пацярпелі ад ваенных дзеянняў. Запланаваны прыток тавараў у Беларусь быў, аднак, значна меншы, чым іх вываз улетку 1941 года. Гэта датычыла найперш пагалоўя жывёлы, дэфіцыт якой адчуваўся і ў самой Расеі. У Беларусь вярнулася толькі частка чыгуначнага і аўтамабільнага транспарту, металаапрацоўчых станкоў, рухавікоў і трансфарматараў, якія былі вывезеныя пад час вялікай эвакуацыі ўлетку 1941 года.

Былі выпадкі вяртання ў Беларусь з глыбі Расеі паасобных заводаў разам з працоўнымі калектывамі, інжынернымі кадрамі і дакументацыяй. У сакавіку 1945 года з Башкіріі ў Віцебск перавезлі абсталяванне станкабудаўнічага завода разам з работнікамі гэтага прадпрыемства. За месяц у адзіным ацалелым будынку была наладжана вытворчасць. Былі гэта, аднак, спарадычныя выпадкі. Большасць заводаў і працоўных калектываў, вывезеных улетку 1941 года, засталіся на тэрыторыі Расеі. У Беларусь пераехалі пераважна тыя прадпрыемствы, якія выпускалі прадукцыю, неабходную для забеспячэння патрэбаў арміі. Дзеля нястачы чыгуначнага рухомага саставу транспартаванне ўзбраення з Заўралля было надта складанай справай. З гэтае прычыны рамонт пашкоджаных самалётаў, танкаў, машын і гармат трэба было арганізаваць бліжэй да лініі фронту, таму ў Беларусі адчынялі прадпрыемствы па рамонце ваеннай тэхнікі.

Тэмпы аднаўлення гаспадаркі замаруджваліся ад дэфіцыту электраэнергіі, нястачы рабочых і накіравання большай часткі вытворчасці на патрэбы арміі. Прадукцыя для войска, хоць і не спрыяла актуальным патрэбам гаспадаркі, аднак стварала прамысловую інфраструктуру, якая з цягам часу стала базай для цывільнага сектара. На пачатку 1946 года на базе мясцовых пакладаў торфу была прыведзена ў рух большасць электрастанцый Менскай, Гомельскай, Віцебскай і Магілеўскай вобласцяў.

У верасні 1946 года Вярхоўны Савет БССР прыняў пяцігадовы план развіцця гаспадаркі, які быў складовай часткай пяцігодкі СССР (1946—1950 гг.). План прадугледжваў рост вытвор-

[5] Хрестоматия по истории БССР. С. 308.

часці беларускай гаспадаркі, якая ў 1950 годзе мела на 16 % перасягнуць даваенныя паказнікі. У 1946 годзе больш за 6 тысяч прадпрыемстваў было гатова выпускаць сродкі вытворчасці і спажывецкую прадукцыю, а іх вытворчыя магутнасці дазвалялі выканаць і перавыканаць усе планы першай пасляваеннай пяцігодкі. Аднак перашкодай стаўся дэфіцыт сыравіны і электраэнергіі. Апошняй асабліва бракавала ў заходніх вобласцях, дзе інфраструктура была горшай і да 1941 года. Да таго ж тэхналогія, якая выкарыстоўвалася ў вытворчасці вайсковай прадукцыі, далёка не заўсёды падыходзіла да цывільнай. Сур'ёзнай перашкодай быў таксама дэфіцыт кваліфікаваных кадраў і рабочай сілы. Страты насельніцтва ў вайну яшчэ доўгі час адмоўна адбіваліся на гаспадарчым жыцці краіны.

Развіццю гаспадаркі перашкаджаў таксама буйны рост партыйнай і дзяржаўнай адміністрацыі. У 1936 годзе ўрад БССР складаўся з 18 камісараў (міністраў), а ў 1946 годзе іх было ужо 44. Раздзіманне адміністрацыйных пасадаў у многіх выпадках з'яўлялася формай нагароды для заслужаных арганізатараў партызанскага руху ў Беларусі, камандзірскія здольнасці якіх не заўсёды спалучаліся з гаспадарчымі і адміністрацыйнымі ведамі. Кампетэнцыі паасобных камісараў і падначаленых ім структураў часта перакрыжоўваліся, што ў сваю чаргу выклікала хаос у кіраванні гаспадаркай. Выцясненне ўсіх элементаў рынкавай гаспадаркі і бюракратычны спосаб кіравання эканамічнымі працэсамі, паспяховы ў ваенны перыяд, у мірны час стаўся прычынай гіганцкага марнатраўства людской працы, сыравіны і электраэнергіі.

На хвалі новага энтузіязму сацыялістычнага будаўніцтва кожны чыноўнік, які кіраваў гаспадаркай, прадпрыемствам у раёне або вобласці, хацеў паказаць вынікі сваёй дзейнасці. Яны былі меркай ягонага сацыялістычнага патрыятызму. Усталёваліся розныя формы "сацыялістычнага спаборніцтва". Рабочыя, працоўныя брыгады, заводы "змагаліся" за выкананне і перавыкананне нормаў. Найлепшыя выконвалі — так прынамсі заяўляла савецкая прапаганда — нават 400 % прадугледжанай планам нормы[6]. Работнікі завода "Чырвоны барацьбіт" з Оршы быццам бы яшчэ ў 1954 годзе выканалі план вытворчасці, пра-

[6] Сообщение о трудовых успехах стахановцев города Минска // Советская Белоруссия. 1951. 29 сент.

дугледжаны на 1958 год. Савецкая гістарыяграфія паведамляе, што пяцігадовы план 1946—1950 гадоў быў выкананы датэрмінова[7].

Несумнеўна, Беларусь, як і іншыя савецкія рэспублікі, дасягнула вялікіх поспехаў у аднаўленні зруйнаванай пад час вайны тэрыторыі. Здзейснілася гэта дзякуючы вялікім намаганням грамадзян і пры іх шчырым удзеле ў гэтым працэсе. Аднак паказнікі колькасці выпушчанай у гэты час прадукцыі няшмат даюць інфармацыі пра яе якасць — гэта значыць пра сапраўдныя вынікі працы рабочых і інжынераў, якія быццам бы выконвалі нормы на 400 %.

Пад час першай пасляваеннай пяцігодкі выпускаліся перад усім сродкі вытворчасці, абмяжоўваючы такім чынам спажыванне і ровень матэрыяльнага жыцця грамадства. У чарговай пяцігодцы 1951—1955 гадоў у Беларусі сталі працаваць прадпрыемствы ўсесаюзнага значэння. Менскі трактарны завод, Менскі аўтамабільны завод або Гомельскі станкабудаўнічы завод выпускалі прадукцыю на патрэбы ўсяго Савецкага Саюза ды іншых краінаў народнай дэмакратыі.

Савецкая гістарыяграфія паведамляе, што ў 1951—1955 гадах прамысловая вытворчасць Беларусі павялічылася на 210 %. Найбуйнейшым прамысловым цэнтрам стала сталіца рэспублікі — Менск. У другой пасляваеннай пяцігодцы больш інвестыцый было накіравана ў заходнія вобласці. Да вялікіх будоўляў гэтага перыяду належаць электрастанцыя ў Горадні і галоўная аўтамабільная магістраль Менск—Берасце. Аднак савецкія ўлады ўстрымліваліся ад значнага інвеставання ў заходняй частцы рэспублікі, што было выклікана, здаецца, засцярогамі на выпадак новага канфлікту, бо гэтыя землі, як у 1941 годзе, на нейкі час маглі быць заваяваныя патэнцыйным праціўнікам. Большасць інвестыцый 1951—1955 гадоў, напрыклад магістраль Менск—Берасце, праводзілася з улікам ваенных інтарэсаў СССР.

Калектывізацыя Заходняй Беларусі

Самай вялікай праблемай беларускай сельскай гаспадаркі пасляваеннага перыяду стаў дэфіцыт цяглавай сілы. І хоць у 1945 годзе з Расеі ў Беларусь былі дастаўлены 1 542 трактары

[7] История Белорусской ССР. Минск, 1961. Т. 2. С. 577.

і 70 тысяч коней, гэтая дапамога толькі ў невялікай ступені забяспечыла патрэбы. Кожны з 4 тысяч калгасаў распараджаўся 2—10 коньмі. У некаторых калгасах коней наогул не было. У Віцебскай вобласці ў якасці цягла выкарыстоўвалі кароў. Здаралася, што плуг прыводзілі ў рух з дапамогаю людской сілы. Сітуацыю ўскладняла яшчэ і тое, што большасць вясковых мужчынаў папоўніла шэрагі Чырвонай Арміі або была накіравана на работы пры аднаўленні дарог, мастоў, чыгункі. Менавіта таму, нягледзячы на незвычайныя намаганні вясковых жанчынаў, значная частка зямлі вясною 1945 года засталася незасеянай. Сітуацыя выправілася толькі ў 1947 годзе, калі частку сялянаў дэмабілізавалі ды павялічылася колькасць прывезеных з Расеі трактароў. Паводле савецкіх крыніцаў, даваенны ровень сельскагаспадарчай вытворчасці быў дасягнуты ўжо ў 1950 годзе[8].

У заходняй частцы Беларусі пераважалі аднаасобніцкія гаспадаркі. У 1946 годзе там існавалі толькі 133 калгасы, якія ўзніклі на базе зліквідаваных фальваркаў. Першапачаткова ў заходніх абласцях метады калектывізацыі ў параўнанні з тымі, што ўжываліся ва Усходняй Беларусі ў 20—30-х гадах, былі надзвычай лагоднымі. Заснаванню калгасаў звычайна спадарожнічала прапагандысцкая акцыя. Новастварэныя калектыўныя гаспадаркі атрымоўвалі трактары і сельскагаспадарчыя машыны, калгаснікам ў першую чаргу электрыфікавалі дамы. Ствараліся таксама калгасныя партыйныя і камсамольскія камітэты, якія дбалі пра адпаведную атмасферу сярод сялянаў, прымушаных аддаць бацькоўшчыну.

Да 1949 года калектывізацыя Заходняй Беларусі вялася галоўным чынам пры выкарыстанні прапаганды, угаворвання і палітычных метадаў, таму на пачатку года там было ўсяго 909 калгасаў. Увесну 1949 года савецкія ўлады намерыліся пакарыстацца багатым арсеналам сродкаў, якія ўжываліся пад час калектывізацыі ўсходняй часткі рэспублікі. Рэпрэсіі і дэпартацыі гэтак званых кулакоў у глыб СССР зноў аказаліся неабходнымі для паспяховага правядзення "сацыялістычных пераўтварэнняў на вёсцы". У канцы 1950 года ў заходніх абласцях працавалі ўжо 6 054 калгасы, якія аб'ядналі амаль 84 % усіх сялянскіх гаспадарак. Калектывізацыя ў Беларусі была завершана толькі ў 1952 годзе.

---

[8] Нарысы гісторыі Беларусі. Ч. 2. С. 333.

У верасні 1951 года Савет Міністраў БССР прыняў пастанову "Аб высяленні кулакоў з Беларускай ССР". У прынцыпе ўжо пасля заканчэння калектывізацыі былых багатых сялянаў пачалі высылаць у Сібір, Казахстан і Якуцію. У 1952 годзе выслалі амаль 30 тысяч чалавек, у тым ліку дзяцей, жанчынаў, старых, віна якіх была ў тым, што ў мінулым іх сем'і мелі большую, чым у іншых, гаспадарку.

Савецкія ўлады ўспрымалі калгасы гэтаксама як і дзяржаўныя прадпрыемствы. Зверху ім слалі ўказанні пра віды вытворчасці без уліку якасці зямлі і кліматычных умоваў на дадзенай тэрыторыі. Строгія пакаранні за невыкананне ўказанняў прымушалі калгаснікаў выконваць работу, якая не давала ніякіх гаспадарчых вынікаў. Дзяржаўная адміністрацыя вызначала таксама цэны збыту і велічыню заробкаў калгаснікаў, якія былі значна меншыя за заробную плату рабочых на заводах. Незайздроснае становішча калгаснікаў выратоўвалі прысядзібныя ўчасткі, якія на фоне ўраджайнасці ў калектыўных гаспадарках былі цудам агратэхнічных дасягненняў.

У аснове сельскагаспадарчай палітыкі пасляваеннага сталінізму ляжала логіка 30-х гадоў. Яна характарызавалася цэнтралізаваным кіраваннем і нявольніцкай працай сялянаў, пазбаўленых сваёй зямлі. Калгаснік мусіў плаціць спецыяльны падатак за ўсё, што знаходзілася ў ягоным двары і мела рысы прыватнай уласнасці — ад пладовых дрэваў, вуллёў, свойскай птушкі, вырашчанай морквы або цыбулі. Такая палітыка, мэтай якой было засяроджанне высілкаў людзей на калгасным полі, знішчала ўсялякую актыўнасць і ставіла калгаснікаў у поўную залежнасць ад улады.

Адзінай прыкметай зменаў у пасляваенны перыяд было змякчэнне пакаранняў за крадзеж "дзяржаўнай і грамадскай уласнасці". Адпаведна з рашэннем Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР усім, хто скраў калгасную ўласнасць, хоць іх і надалей называлі "ворагамі народа", пагражала пакаранне ад 5 да 20 гадоў турэмнага зняволення. Гэта было істотнае параўнальна з 30-мі гадамі змякчэнне рэпрэсіўнасці савецкага правасуддзя, бо раней за такія злачынствы каралі нават смерцю.

Пры цэнтралізаваным адміністрацыйным кіраванні ўраджайнасць калгаснай гаспадаркі аказалася трывожна нізкая, і таму ў 1952 годзе былі зробленыя спробы стварыць такую сістэму працы, якая змяшчала б элементы эканамічнага заахвочвання і спрыяла б зацікаўленасці работнікаў гаспадарчымі вынікамі калга-

саў. Велічыня заробнай платы была пастаўлена ў залежнасць ад колькасці выпрацаваных за месяц чалавека-дзён. Некаторыя калгаснікі выконвалі па два чалавека-дні (16 гадзін) за суткі, аднак тое мела невялікі ўплыў на агульную прадукцыйнасць калгасаў.

У 1955 годзе Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Савецкага Саюза (КПСС) наважыўся на частковае адмаўленне ад цэнтральнага вызначэння заданняў паасобным калгасам. З вясны 1955 года кіраўніцтва калгасаў магло самастойна вызначаць плошчы пасеваў збожжавых культур і віды жывёлагадоўлі. Гэтая невялікая доля свабоды вельмі хутка давяла да росту ўраджайнасці збожжавых і пагалоўя жывёлы. У сярэдзіне 50-х гадоў Беларусь стала адной з важнейшых крыніцаў забеспячэння Расеі харчовымі прадуктамі.

Рэпрэсіі не спыняюцца

У лютым 1945 года ЦК КП(б)Б прыняў пастанову "Аб перавыхаванні грамадства ў духу савецкага патрыятызму і нянавісці да нямецкіх акупантаў"[9]. Зважаючы на тое, што нямецкія акупанты адступілі з Беларусі некалькі месяцаў раней, пастанова ЦК была прынята з мэтаю расправы з людзьмі, якія пад час вайны не выявілі дастатковай адданасці савецкай радзіме. Савецкая прапаганда намагалася спалучаць нямецкія злачынствы з праявамі беларускага нацыяналізму і паказваць іх як адно цэлае. Калабарантамі называліся не толькі былыя паліцыянты, чыноўнікі, настаўнікі, сябры Саюза беларускай моладзі ці жаўнеры беларускай самааховы, але таксама прыбіральшчыцы і вартаўнікі, якія пад час акупацыі працавалі ў мясцовых беларускіх установах. У ліку падазроных апынуліся вучні, якія наведвалі школы ў 1941—1944 гадах, вывезеныя ў Нямеччыну прымусовыя работнікі і салдаты Чырвонай Арміі, якія вярнуліся з нямецкага палону.

Клеймаванне нямецкіх злачынстваў вялося паралельна са змаганнем з беларускай нацыянальнай элітай, некамуністычнай культурнай спадчынай, знішчэннем беларускай нацыянальнай свядомасці. Пасляваенная адбудова СССР патрабавала выклю-

[9] Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Минск, 1985. Т. 3. С. 501.

чэння з грамадскага жыцця праслойкі нацыянальна свядомага беларускага насельніцтва і замену яе на расейскамоўную эліту. Пад шырмай барацьбы з калабарантамі і нацыяналістамі і ў рамках "перавыхавання" у 1945—1955 гадах з Беларусі вывезлі блізу мільёна чалавек. Было гэта галоўным чынам гарадское і местачковае насельніцтва, якое складала беларускую грамадска-прафесійную эліту. Іх месца занялі прыхадні з Расеі ды іншых рэспублік СССР, якія апанавалі партыйныя камітэты, дзяржаўную адміністрацыю і культурна-асветныя ўстановы. Русіфікацыя ахапіла большасць вышэйшых навучальных установаў ды гарадскія сярэднія і пачатковыя школы. Вясковая моладзь, што мігравала ў гарады, сустракалася з расейскай культурай і расейскай мовай, засваенне якіх станавілася неабходнай умовай падвышэння грамадскага статуса кожнага чалавека

Пасляваенныя кадравыя замены датычылі таксама тых, хто пад час нямецкай акупацыі перайшоў на савецкі бок. У 1946 годзе было заменена больш за 90 % кіраўнікоў раённай і гарадской адміністрацыі ды 83 % старшынь калгасаў. Частка з іх атрымала падвышэнне па службе разам з пераводам у Расею або іншыя рэспублікі, частка была накіраваная на іншую працу. Іх месца занялі чужынцы, якія прыехалі з-за межаў Беларусі. Пераважная бальшыня партыйна-адміністрацыйнага кіраўніцтва рэспублікі таксама была заменена расейцамі. У 1951 годзе ва ўрадзе БССР было 22 расейцы, 9 беларусаў, 1 грузін і 1 жыд. У 1953 годзе з ліку 1 408 работнікаў адміністрацыі абласнога роўню ў заходняй частцы краіны толькі 114 чалавек былі беларусамі мясцовага паходжання. Такое становішча назіралася і ў гарадской адміністрацыі, дзе сярод 321 чыноўніка было толькі 7,7 працэнта беларусаў[10].

Няшмат вядома пра пасляваенную беларускую ўзброеную апазіцыю. Савецкія гісторыкі пісалі, што "ўзброеныя банды ў 1945—1947 гадах здзейснілі шэраг распраў над партыйнымі, савецкімі і камсамольскімі актывістамі. Пры актыўнай дапамозе мясцовага насельніцтва органы бяспекі ліквідавалі 814 антысавецкіх групаў і ўзброеных бандаў"[11]. Безумоўна, большасць беларускіх нацыянальных дзеячоў, паліцэйскіх, чыноўнікаў не

[10] Лукашук А. Жаркое лето 53-го // Коммунист Белоруссии. 1990. № 7. С. 69—71.
[11] Гісторыя Беларускай ССР. Мінск, 1975. Т. 5. С. 78.

сумняваліся ў тым, што іх чакала ў выпадку арышту энкавэдыстамі. І яны адчайна змагаліся больш, відаць, за выжыванне, чым за ідэю.

З вайны ў арэоле пераможцаў вярнуліся ў Беларусь сотні тысяч салдатаў і афіцэраў Чырвонай Арміі. Шмат хто з іх быў таксама ветэранам партызанскага руху. Сярод гэтай шматтысячнай грамады многія чакалі зменаў, у першую чаргу — спынення рэпрэсій і роспуску калгасаў. Яны выйгралі вайну і былі перакананыя, што сваёй ахвярнасцю даказалі адданасць сацыялістычнай айчыне. Савецкія ўлады палічылі гэтыя настроі надта небяспечнымі і зрабілі шэраг захадаў па іх ліквідацыі. Частка салдатаў засталася ў гарнізонах на тэрыторыі Расеі, частку ў жніўні 1945 года выслалі на вайну супраць Японіі. Тэрмін дэмабілізацыі быў расцягнуты на некалькі гадоў, а звольненыя з вайсковай службы асобы падпадалі пад пільны нагляд.

У 1946—1949 гадах органы дзяржбяспекі выявілі больш за дзесяць нелегальных групаў у асяроддзі школьнай і студэнцкай моладзі. Магчыма, што ініцыятарам узнікнення некаторых моладзевых антысавецкіх арганізацыяў, якія мелі прыцягнуць усіх патэнцыйных праціўнікаў сталінізму і палегчыць іх ліквідацыю, былі спецслужбы.

Вясной 1946 года ў Слоніме заснавалася падпольная арганізацыя "Чайка". Падпольшчыкі наладзілі супрацоўніцтва з групай слухачоў Баранавіцкага педагагічнага інстытута. Да нелегальнай дзейнасці далучылася шмат асобаў з розных асяроддзяў і мястэчак Заходняй Беларусі. Мэтай арганізацыі было змаганне за захаванне нацыянальных свабодаў, абарона беларускай культуры і мовы, а таксама папулярызацыя гісторыі Беларусі ў якасці канкурэнцыі для савецкай міфалогіі. Нефармальныя групы ўзніклі таксама ў Жыровіцкім сельскагаспадарчым тэхнікуме, Ганцавіцкай педагагічнай навучальні. У жніўні 1947 года некалькі дзесяткаў асобаў з гэтых цэнтраў былі арыштаваныя і абвінавачаныя ў прыналежнасці да арганізацыі "Цэнтр беларускага вызвольнага руху", які меўся весці беларускую нацыяналістычную прапаганду і рыхтаваць кадры для тэрарыстычных фармаванняў. За прыналежнасць да яе Менскі ваенны суд асудзіў на шматгадовае зняволенне ў канцэнтрацыйных лагерах 29 чалавек. На пачатку лютага савецкай дзяржбяспекай былі арыштаваныя 33 навучэнцы Глыбоцкай педагагічнай навучальні. Іх абвінавацілі ў прыналежнасці да Саюза беларускіх

патрыётаў. Арганізацыя гэтая існавала ад студзеня 1946 года і займалася прапагандаваннем патрыятычных ідэяў сярод моладзі. 20 чэрвеня Менскі ваенны суд засудзіў арыштаваных да шматгадовага турэмнага зняволення. Бальшыня іх атрымала па 25 гадоў турмы.

Функцыянеры дзяржбяспекі выявілі ўвосень 1947 года падобныя арганізацыі ў моладзевым асяроддзі у Полацку, Маладзечне, Пінску і Менску. Ваенныя суды ў прынцыпе не выносілі прысудаў меншых, чым 5 гадоў знаходжання ў гэтак званых працоўных калоніях.

У 1949 годзе Сталін даў пачатак новай хвалі чыстак у партыйным апараце і сярод кіраўнічых адміністрацыйных кадраў. У Беларусі змаганне з "здраднікамі і рэвізіяністамі" ўзначаліў шэф рэспубліканскага Міністэрства дзяржбяспекі Лаўрэнцій Цанава. У 1951 годзе Цанава абвінаваціў у нацыяналізме нават героя беларускага камуністычнага руху Сяргея Прытыцкага, тагачаснага першага сакратара абласнога камітэта КП(б)Б у Горадні. Іншы заслужаны бальшавік, міністр асветы БССР Платон Саевіч за нацыяналістычны "ўхіл" быў засуджаны да 25 гадоў у канцэнтрацыйным лагеры.

Ад пасляваенных рэпрэсій у першую чаргу цярпела інтэлігенцыя. Сталінізм апускаўся ў акасцяненасць і дагматызм, што сталася прычынай ганенняў на тых, хто праяўляў хоць драбінку сумневу ў стаўленні да ісцінаў, прапаведаваных тагачаснай бальшавіцкай прапагандай. Ацэнкай літаратурнай і мастацкай творчасці займаўся Цэнтральны Камітэт КП(б)Б. У канцэнтрацыйныя лагеры зноў вывозілі пісьменнікаў і паэтаў, якія не трымаліся сталінскай этыкі пры апісванні вайны і з'яваў грамадскага і палітычнага жыцця ў Беларусі (Андрэй Александровіч, Рыгор Бярозкін, Сяргей Грахоўскі, Барыс Мікуліч, Станіслаў Шушкевіч).

У коле найбольш падазроных апынуліся інтэлектуалы, хто меў хоць нейкія кантакты з Захадам. Гучнай стала справа прэзідэнта Акадэміі навук Беларусі Антона Жэбрака, артыкул якога "Савецкая біялогія" ў 1945 годзе апублікаваў амерыканскі часопіс "Science" ("Навука"). У ім Жэбрак пераконваў амерыканскіх вучоных у няслушнасці ацэнкі дасягненняў савецкіх біёлагаў праз прызму тэорый Трафіма Лысенкі. Публікацыя Жэбрака была прызнаная праявай здрады савецкай навуцы і кампраметацыі яе выдатных аўтарытэтаў. 14 верасня 1948 года

яго навуковыя погляды аціаніла Палітбюро ЦК КП(б)Б. Рашэннем гэтага партыйнага органа быў зліквідаваны Інстытут біялогіі АН Беларусі, а ўсе кіраўнікі паасобных яго аддзелаў, дзе вяліся доследы ў галіне медыцыны, біялогіі і генетыкі, былі звольненыя з працы. Страцілі службу таксама навукоўцы Беларускага дзяржаўнага універсітэта, у навуковых працах якіх прысутнічалі тэзісы, падобныя да палажэнняў біёлагаў з Акадэміі навук.

У пасляваенны перыяд культ Сталіна стаў набываць рысы рэлігійнага рытуалу. Савецкая прапаганда паказвала Сталіна як пераможнага правадыра, які ўратаваў чалавецтва ад фашысцкіх крэматорыяў і вяртання ў эпоху нявольніцтва. Вярхоўнай уладай у вобласцях, раёнах, калгасах, на заводах сталі партыйныя камітэты, функцыянеры якіх выконвалі ролю жрацоў культу правадыра. І хоць праводзіліся выбары ў Вярхоўны Савет і мясцовыя Саветы народных дэпутатаў, іх улада ў большай ступені была сімвалічнай, чым праўдзівай. Пры стопрацэнтавай прысутнасці выбаршчыкаў на ўчастках для галасавання прапанаваныя партыйнымі камітэтамі кандыдаты (звычайна ў адной акрузе быў і адзін кандыдат) атрымоўвалі стопрацэнтавую падтрымку. Выбарчыя кампаніі ў Вярхоўны Савет у 1948 годзе і ў мясцовыя Саветы ў 1950 годзе сталі своеасаблівымі спектаклямі, на якіх некалькі месяцаў запар услаўляліся Сталін і камунізм. Партыйныя камітэты прызначалі і адклікалі старшыняў Саветаў народных дэпутатаў, вядома, пры захаванні працэдураў, якія існавалі ў савецкім заканадаўстве.

Прапагандаванне культу Сталіна асабліва інтэнсіўна праводзілася ў моладзевым асяроддзі. 500-тысячны камсамол у Беларусі быў цесна звязаны з партыяй і верна ўкараняў яе ідэі сярод наймалодшых пакаленняў. Дзеці і ўнукі сталінскіх ахвяраў шчыра верылі ў тое, што іхныя бацькі заслужылі долю, якую ім падрыхтавала савецкая ўлада.

Беларуская культура перыяду пасляваеннага сталінізму

Нягледзячы на жудасныя рэпрэсіі, у выніку якіх мільёны людзей апынуліся ў канцэнтрацыйных лагерах, Сталін мусіў быць натхненнем для творцаў усіх галінаў культуры. Кожны твор інтэлектуальнай дзейнасці лічыўся нявартым увагі, калі

не ўслаўляў "правадыра сусветнага пралетарыяту". У 1947—1951 гадах на беларускай мове выйшлі ўсе творы Сталіна. Мільённым накладам была выпушчана "Кароткая біяграфія І. В. Сталіна". У Беларусі стварылі больш за 7 тысяч гурткоў вывучэння жыцця і думак "вялікага правадыра". У снежні 1949 года па інспірацыі ЦК КП(б)Б быў напісаны "Ліст Вялікаму Сталіну ў 70-ю гадавіну з дня нараджэння ад беларускага народа", пад якім падпісаліся тысячы інтэлектуалаў і звычайных жыхароў рэспублікі. Ягоны змест у большай ступені нагадваў малітву, чым юбілейныя віншаванні чалавеку. З нагоды дня нараджэння Сталіна ў Беларусі адбыліся 32 тысячы мітынгаў і сходаў, у якіх узялі ўдзел больш за 3 мільёны чалавек. Паэты чыталі вершы, спевакі, акторы, танцоры дасягалі найвышэйшага роўню прафесійнасці, рыхтуючыся да выступленняў у гонар генеральнага сакратара партыі — "прадстаўніка інтарэсаў працоўнага народа".

Культура і ўстановы для яе распаўсюджвання служылі перш за ўсё пашырэнню культу Сталіна. Выдаткі на культуру былі даволі высокія. Клубы, дамы культуры, бібліятэкі, чытальні працавалі амаль у кожным калгасе. З раённых і калгасных бюджэтаў вылучалі сродкі для вядзення розных формаў мастацкай самадзейнасці, прычым яны мусілі быць цесна звязанымі з афіцыйнай ідэалогіяй. Кніжкі, прызнаныя правільнымі, друкаваліся шматмільённымі тыражамі. Дзякуючы разгорнутай сетцы бібліятэк і чытальняў яны былі агульнадаступныя. Арганізоўвалі шматлікія чытацкія конкурсы. З чытальняў і бібліятэк сістэматычна выкідвалі творы тых пісьменнікаў, якіх расстралялі або выслалі ў канцэнтрацыйныя лагеры. У бібліятэкі рэгулярна паступалі спісы забароненых кніг, а бібліятэкараў кантралявалі — ці сапраўды выводзяць з ужытку крамольную літаратуру. У 1952 годзе такі кантроль быў праведзены у 18 000 бібліятэчных пунктаў і чытальняў, з якіх забралі 24 тысячы кніг. Праз год праверылі ўжо 21 тысячу пунктаў, з кнігазбораў якіх вынялі 41 тысячу кніг.

Да 1949 года 96 % газет і кніжак у Беларусі друкавалі на беларускай мове. Не маглі ж савецкія ўлады ставіцца да беларускай мовы горш, чым нямецкія акупанты. У 1950 годзе пачаўся паступовы спад колькасці найменняў друкаваных выданняў па-беларуску. Праз пяць гадоў ужо больш за 30 % кніжак і

20 % газет выдаваліся на расейскай мове. Гэты працэс неўзабаве яшчэ болей паскорыўся.

У жніўні 1946 года Цэнтральны Камітэт ВКП(б) акрэсліў дырэктыву для савецкай літаратурнай творчасці. У ліпені 1947 года крытэры, якімі павінны кіравацца беларускія літаратары, вызначыў Цэнтральны Камітэт КП(б)Б. У адпаведнасці з указаннямі ЦК вядучымі тэмамі беларускай літаратуры павінны былі стаць барацьба беларускага народа з фашысцкімі акупантамі і прапаганда дасягненняў партыі і яе правадыроў у падвышэнні дабрабыту працоўнага люду і пабудове справядлівага грамадскага ладу. За адпаведнае ўладным дырэктывам апісанне барацьбы савецкага народа ў вайне і сацыялістычных пераўтварэнняў аўтарам прысвойвалі самую высокую літаратурную нагароду — Сталінскую прэмію. Яе атрымалі ў 1947 годзе Пятрусь Броўка за паэму "Хлеб" і вершы, у 1949 годзе Якуб Колас за паэму "Рыбакова хата" і Аркадзь Куляшоў за паэму "Новае рэчышча".

Адміністрацыйнымі метадамі ствараласа і літаратурная крытыка. Савецкія літаратуразнаўцы ў прынцыпе прадстаўлялі пазіцыю нейкага партыйнага калектыву. Іх ацэнка на старонках газеты або часопіса прадвяшчала ўхваленне або адхіленне твора партыйнымі ідэолагамі. Яна была таксама ўказальнікам для журналістаў і работнікаў культуры, як трэба ацэньваць творчасць паасобных аўтараў. Адмоўная ацэнка твора партыйным актывам адкрывала шлях да паклёпаў на аўтара, таварыскага астракізму і пазбаўляла выдавецкіх перспектываў на доўгія гады. Такім чынам была зацкавана Канстанцыя Буйла, абвінавачаная ў прапагандаванні беларускага нацыяналізму, бо ў адным з вершаў напісала пра Беларусь як пра самае прыгожае месца на Зямлі.

Ад 1951 года друкаванне літаратурных твораў санкцыянавала Галоўнае ўпраўленне ў справах літаратуры і выдавецкай дзейнасці пры Савеце Міністраў БССР. Вобраз свету, які паказвала савецкая літаратура сталінскага перыяду, толькі ў невялікай ступені адлюстроўваў праўдзівыя рэаліі, людскія пачуцці і думкі і ствараўся пад густы партыйных ідэолагаў паводле вызначаных імі крытэраў. Чым больш гэты вобраз быў скажоны, тым большы гонар і нагароды чакалі аўтараў. Хлусня, якая стварался пры ўдзеле таленавітых творцаў і шматкроць паўтаралася прапагандысцкім апаратам, для новых пакаленняў

станавілася неаспрэчнай праўдай. Творчасць Іллі Гурскага, Усевалада Краўчанкі, Кастуся Губарэвіча ці Тараса Хадкевіча стала сімвалам канфармізму пасляваеннага пакалення беларускіх літаратараў. Тыя, што спрабавалі захаваць нейкую долю незалежнага мыслення, апынуліся ў Сібіры.

Падобныя патрабаванні бальшавікі ставілі рэжысёрам і акцёрам. Рэпертуар паасобных тэатраў зацвярджаўся спецыяльнай ўстановай, якая дзейнічала пры ЦК КП(б)Б. У 1949 годзе з рэпертуару беларускіх тэатраў зніклі амаль усе творы заходнееўрапейскіх драматургаў. Развязаная ў тым часе Сталіным антысеміцкая кампанія давяла да змены кіраўнічых кадраў у большасці тэатраў. Змаганне з касмапалітызмам ішло паралельна з пашырэннем рэпертуару, які навязваўся да славянафільскай міфалогіі. Бюро ЦК КП(б)Б дазваляла тэатрам ставіць у асноўным тыя творы беларускіх драматургаў, якія звярталіся да народнага жыцця, класавай барацьбы на вёсцы або змагання беларускага народа з нямецкімі захопнікамі, і ўнікала п'есаў, якія спасылаліся на традыцыю Вялікага Княства Літоўскага.

Школьніцтва

Вялікую ролю ў выхаванні маладога пакалення беларусаў савецкія ўлады прызначылі школе. Пасля вайны спраўна і параўнальна хутка была адноўленая сістэма ўсіх роўняў навучання. У 1945/46 навучальным годзе ў Беларусі працавалі 10,9 тысячы навучальных установаў, у якіх вучыліся 1 337 тысяч школьнікаў. Найбольш складанай праблемай беларускай асветы была нястача кадраў. Настаўнікі, якія працавалі ў школах пад час акупацыі, у большасці былі вывезеныя з Беларусі, а перададзеныя імі веды, асабліва ў аб'ёме гуманітарных навук, выклікалі неабходнасць перавыхавання маладога пакалення. Менавіта таму значную частку кадраў складалі актывісты камсамола, якія прыехалі сюды з Расеі. У сувязі з гэтым з'явілася праблема мовы выкладання ў школах, бо вучні, асабліва ў Заходняй Беларусі, не заўсёды разумелі мову настаўнікаў. У Менску ў 1946 годзе з 28 сярэдніх школаў у палове ўрокі вяліся на расейскай мове. У 1953 годзе лік школаў у сталіцы БССР павялічыўся да 46, але беларуская мова захавалася толькі ў дзевяці. У Берасці з 14 школаў толькі ў адной прадметы выкладаліся

па-беларуску[12]. Гэтакае становішча было і ў іншых гарадах, дзе настаўнікамі працавалі прыхадні з Расеі. Беларускае школьніцтва сістэматычна скарачалася і ў асноўным абмежавалася да вясковага асяроддзя.

Цэнтрам, які падтрымоўваў русіфікатарскія тэндэнцыі ў Беларусі, быў Цэнтральны Камітэт КП(б)Б. У чэрвені 1952 годзе ён прыняў спецыяльную пастанову "Аб ходзе выкладання расейскай і беларускай моваў у школах БССР у святле вучэння таварыша Сталіна аб мовазнаўстве". Хоць пастанова ЦК не аспрэчвала мэтазгоднасці навучання беларускай мове, аднак указвала, што веданне грамадзянамі расейскай мовы з'яўляецца неабходнасцю ў інтарэсах савецкай дзяржавы. На пачатку 50-х гадоў амаль 70 % сярэдніх школаў працавала на базе расейскай мовы.

Больш дынамічным стаўся працэс русіфікацыі вышэйшага школьніцтва. У 1944/45 навучальным годзе пачалі працу 22 вышэйшыя навучальныя ўстановы. Амаль палова ўсіх беларускіх студэнтаў — 5 тысяч — у тым часе вучылася ў Беларускім дзяржаўным універсітэце ў Менску. З прычыны нястачы настаўніцкіх кадраў найбольш увагі аддавалі стварэнню педагагічных інстытутаў. У чэрвені 1951 года ў рэспубліцы было 10 такіх ВНУ.

У вышэйшым школьніцтве асноўнай праблемай таксама былі выкладніцкія кадры. У 1951 годзе з 1,4 тысячы выкладнікаў педагагічных, медычных, мастацкіх, політэхнічных і універсітэцкіх установаў толькі 5,3 % мелі вучоную ступень доктара навук. Бальшыня навуковай эліты, якая знаходзілася ў Беларусі пад час акупацыі, была пераселеная ў Расею і іншыя савецкія рэспублікі. Неўзабаве, аднак, навучальныя ўстановы выхавалі свае кадры, а беларускія навуковыя цэнтры сталі важнымі элементамі тылоў савецкай гаспадаркі. Датычыла гэта такіх галінаў навукі, як матэматыка, фізіка, хімія. Гуманітарныя навукі і надалей заставаліся часткай механізму распаўсюджвання камуністычнай ідэалогіі. З прапановы ЦК КП(б)Б у 1952 годзе ў менскім БДУ было абмежавана выкладанне гісторыі і беларускай культуры. У сярэдзіне 50-х гадоў беларускую мову амаль поўнасцю выпіхнулі з муроў гэтай найбуйнейшай ВНУ ў Беларусі. Яна засталася мовай выкладання толькі ў некаторых педагагічных інстытутах.

---

[12] Нарысы гісторыі Беларусі. Ч. 2. С. 362.

Раздзел 8

Ударніцтва ў пабудове камунізму (1956–1990)

Рэфармаванне сталінізму

Смерць Сталіна (5 сакавіка 1953 года) выклікала ў жыхароў Беларусі розныя пачуцці. Афіцыёзны смутак суседнічаў з прытоенай радасцю, трывога за будучыню — з спадзяваннямі на перамены да лепшага. Багата было й тых, хто шчыра бедаваў. Некаторыя з іх накіроўваліся ў Маскву, каб развітацца з чалавекам, які пры жыцці стварыў легенду пра самога сябе.

Па смерці правадыра савецкай імперыі створаная ім сістэма патрабавала вялікіх зменаў. Раней яна давала абсалютную ўладу аднаму чалавеку. Але цяпер сярод бальшавіцкіх правадыроў не было такіх аўтарытэтных асобаў, як Сталін. Сама логіка сістэмы не дапускала існавання іншай індывідуальнасці. Гіганцкая прапаганда доўгія гады стварала вобраз звышчалавечага генію толькі аднаго члена партыі, калі астатнія былі яму толькі фонам і выканаўцамі ўказанняў. Менавіта таму спробы кіраўніка Міністэрства нутраных справаў СССР (колішняга шэфа НКВД) Лаўрэнція Берыі пераняць усе вагары ўлады закончыліся ягоным арыштам у чэрвені 1953 года. У верасні 1953 года пасаду першага сакратара ЦК Камуністычнай партыі Савецкага Саюза — так з 1952 года стала называцца ВКП(б) — і кіраўніка савецкай дзяржавы заняў Мікіта Хрушчоў, адзін з самых блізкіх паплечнікаў Сталіна, які пасля смерці дыктатара стаў разбуральнікам ягонага культу і прыхільнікам абмежавання выродлівых метадаў ажыццяўлення ўлады.

Неўзабаве па смерці Сталіна была праведзена рэарганізацыя цэнтральнага апарату ўлады. Значна скарацілася колькасць міністэрстваў і чыноўнікаў. 27 сакавіка 1953 года Вярхоўны Савет аб'явіў амністыю для зняволеных, асуджаных на 5 гадоў турмы па палітычных матывах. У верасні была ліквідавана спецыяльная група пры Міністэрстве нутраных справаў, якая без судоў і пракуратуры магла высылаць людзей у канцэнтрацыйныя лагеры або прыцягваць да вышэйшай меры пакарання. Ад траўня 1955 года ўведзены былі судовыя працэдуры, якія рэгулявалі парадак абыходжання з абвінавачанымі. Была вызначаная кампетэнцыя паасобных праваахоўных органаў у стаўленні да абвінавачаных з моманту арышту да вынясення

прысуду. Выразна раздзяляліся таксама правамоцтвы пракуроўраў, суддзяў, міліцыі.

У жніўні 1955 года была праведзена дэцэнтралізацыя сістэмы кіравання. Большую аўтаномію атрымалі абласныя і раённыя Саветы. Яны маглі распараджацца сродкамі на жыллёвае будаўніцтва, камунальную гаспадарку і культурна-асветную дзейнасць. Саветы, аднак, надалей былі выканаўцамі волі мясцовых партыйных камітэтаў, а дэпутаты ў сапраўднасці прызначаліся партыйным кіраўніцтвам. Выбары ў такіх умовах былі звычайнай фармальнасцю.

XX з'езд КПСС, які адбыўся ў лютым 1956 года, ва ўсіх злачынствах камунізму абвінаваціў Сталіна, адначасова здымаючы адказнасць з астатніх функцыянераў партыі і НКВД, якія бралі ўдзел у пазбаўленні жыцця мільёнаў савецкіх грамадзян. У структурах улады засталася большасць выканаўцаў сталінскага генацыду 30-х гадоў. У новых палітычных умовах яны на словах асудзілі сістэму, якой верна служылі доўгія гады. Хрушчоў абвінаваціў Сталіна перш за ўсё ў злачынствах супраць камуністаў, аднак не згадаў пра мільёны ахвяраў, якія не былі членамі партыі.

Неўзабаве пасля XX з'езда КПСС пачалася рэабілітацыя ахвяраў сталінізму. Сотні тысяч людзей былі вызваленыя з канцэнтрацыйных лагераў. Да 1962 года ў Беларусі рэабілітавалі 29 тысяч чалавек, галоўным чынам расстраляных работнікаў партыі і НКВД. Нешматлікімі былі выпадкі апраўдання рэпрэсаваных творцаў беларускай культуры, абвінавачаных у "нацыянал-дэмакратызме", або замучаных сялянаў, якія супраціўляліся калектывізацыі. Разлічыцца з сталінізмам па-сапраўднаму было немагчыма з тае прычыны, што пры ўладзе засталіся людзі, якія былі суаўтарамі гэтай сістэмы. Папраўдзе, ім трэба было б абвінаваціць саміх сябе. Разбурэнне помнікаў Сталіну пры канцы 50-х гадоў не азначала развалу таталітарнай палітычнай сістэмы, якую ён стварыў. Сталінская сістэма толькі рэфармавалася і прыстасоўвалася да патрэбаў новай партыйнай каманды, якая поўнасцю кантралявала дзяржаўнае і грамадскае жыццё. Уся ўлада засталася ў руках партыйнага апарату. Ягоныя прывілеі захаваліся і нават пашыраліся, ствараючы такім чынам структуры на ўзор каставага грамадства. Партыйныя работнікі карысталіся сваёй сістэмай заробных платаў, спецыяльным медычным абслугоўваннем, асобнымі крамамі і

сталоўкамі, спецыяльнымі санаторыямі, службовым транспартам, які заўсёды і паўсюль выкарыстоўваўся ў прыватных мэтах.

У ліпені 1956 года першым сакратаром ЦК Камуністычнай партыі Беларусі (КПБ) стаў Кірыла Мазураў. Ён быў першым беларусам, прызначаным на самую высокую пасаду ў партыйным апараце Беларусі[1]. За Мазуравым (1956—1965) шэрагі КПБ павялічыліся з 145 тысяч да 345 тысяч членаў, а палітычнае і гаспадарчае жыццё стабілізавалася. У 1956 годзе былі зменшаныя падаткі для калгаснікаў і паніжаны цэны на прамысловыя тавары. Прадукты для шырокага спажывання айчыннай вытворчасці мелі нізкую якасць (і невысокі кошт), а іх колькасць значна перавышала патрэбы грамадства. Агульнадаступнымі сталі такія тавары, як тканіны, гадзіннікі, радыёпрымальнікі, фотаапараты, веласіпеды. Па-за магчымасцямі звычайных грамадзянаў былі прыватныя кватэры ў горадзе, легкавыя аўтамашыны, дываны, вырабы з каштоўных металаў.

У 1957 годзе быў адменены падатак, уведзены пад час вайны для адзінокіх асобаў і бяздзетных шлюбных параў.

Найважнейшай зменай па смерці Сталіна было спыненне тэрору ў дачыненні да сапраўдных і ўяўных праціўнікаў камунізму. Партыйныя функцыянеры ўжо не баяліся, што страцяць жыццё за адступніцтва ад догмаў, устаноўленых вышэйшым кіраўніцтвам. Уладны апарат пачаў карыстацца магчымасцямі, якія даваў яму кантроль за ўсім гаспадарчым патэнцыялам краіны. З гэтае прычыны грамадскі статус савецкага грамадзяніна вызначала ягонае месца ў партыйнай герархіі.

У 1956—1957 гадах адбылася частковая дэцэнтралізацыя кіравання прадпрыемствамі, якія раней падпарадкоўваліся гаспадарчым міністэрствам СССР. Тады ж у распараджэнне адміністрацыі БССР было перададзена 856 вялікіх прамысловых прадпрыемстваў на тэрыторыі рэспублікі. Такім чынам пад кантролем уладаў БССР апынулася 85 % айчыннай маёмасці.

У сакавіку 1957 года Вярхоўны Савет СССР прыняў пастанову, якая дазваляла саюзным рэспублікам самастойна вызначаць межы вобласцяў і раёнаў, а таксама ўводзіць у судовую сістэму

[1] Праўда, раней (1937 г.) першым сакратаром ЦК абралі Васіля Шаранговіча, але праз некалькі месяцаў яго расстралялі за "здраду" камуністычным ідэалам.

элементы свайго крымінальнага, працэсуальнага і цывільнага права. Аднак на практыцы Вярхоўны Савет БССР рэдка карыстаўся гэтымі паўнамоцтвамі.

Хрушчоў яшчэ раз спрабаваў звесці рахункі са сталінізмам на XXII з'ездзе КПСС у кастрычніку 1961 года. Ён тады ўспомніў, што сталінскія рэпрэсіі былі накіраваныя не толькі супраць камуністаў, але і супраць звычайных савецкіх грамадзян. Пры гэтым запрапанаваў, аднак, паставіць помнік дзеля ўшанавання памяці камуністаў — ахвяраў сталінізму.

Пабудова цяжкай прамысловасці

XXII з'езд КПСС прыняў пастанову аб пабудове камунізму пры жыцці аднаго пакалення. Хрушчоў выставіў лозунг: "За 3—4 гады дагонім і абгонім Злучаныя Штаты Амерыкі", маючы на ўвазе перш за ўсё гаспадарку[2]. Беларускія камуністы пад кіраўніцтвам Кірылы Мазурава, а пазней — Пятра Машэрава, мелі амбіцыю першымі давесці сваю рэспубліку да стану "развітога сацыялізму".

Паводле афіцыйных дадзеных, у другой палове 50-х гадоў вартасць вытворчасці беларускай гаспадаркі павялічылася на 79 %. За гэты час было пабудавана 157 новых прадпрыемстваў, прадукцыя якіх галоўным чынам прызначалася на патрэбы агульнасавецкага рынку. У Жодзіне быў пабудаваны новы аўтамабільны завод. Электрастанцыі, станкабудаўнічыя заводы, фабрыкі будаўнічых матэрыялаў, тэкстыльныя камбінаты выпускалі ў некалькі разоў больш прадукцыі, чым мог увабраць у сябе беларускі рынак.

У 1961—1970 гадах прамысловы патэнцыял Беларусі павялічыўся на чарговыя 167 вялікіх прадпрыемстваў. У Гомелі пабудавалі магутны завод пускавых рухавікоў, у Салігорску — некалькі шахтаў дзеля здабычы калійнай солі і тры камбінаты па яе апрацоўцы, у Полацку — нафтаперапрацоўчы камбінат, у Горадні — хімічныя фабрыкі, у Светлагорску і пад Магілевам — заводы штучнага валакна. За некалькі гадоў Беларусь стала магутным цэнтрам хімічнай прамысловасці.

Савецкія гісторыкі з гонарам адзначалі, што ў 1966—1970 гадах прамысловая вытворчасць БССР дасягнула такой жа вялі-

[2] Мядзведзеў Р. М.С. Хрушчоў: Палітычны партрэт. Мінск, 1989. С. 141.

чыні, як за ўсё пасляваеннае дваццацігоддзе. У 1965 годзе Беларусь выпусціла больш трактароў, чым увесь Савецкі Саюз у даваенны перыяд. У 1970-м рэспубліка паставіла на савецкі рынак 49 % мінеральных соляў, 19 % поліэтылену, 10 % штучнага валакна, 18 % трактароў, 13 % металаапрацоўчых станкоў, 22 % матацыклаў[3].

Беларуская прамысловасць была часткай агульнасавецкай планавай гаспадаркі. Прамысловыя інвестыцыі на тэрыторыі рэспублікі і від прадукцыі не вынікалі з патрэбаў краіны і яе жыхароў. Большасць інвестыцый фінансавалася цэнтральным бюджэтам з разлікам на патрэбы савецкай імперыі. Пры іх рэалізацыі былі заняты тысячы людзей з іншых рэспублік. У той жа час шмат беларусаў працавала на будаўніцтве розных прамысловых аб'ектаў на тэрыторыі ўсяго СССР (асабліва ў Карэліі, Сібіры і Казахстане). Чарговыя пяцігодкі ў БССР былі толькі выкананнем часткі ўсесаюзных планаў. Тое, што адбывалася ў беларускай гаспадарцы, толькі ў невялікай ступені інспіравалася кіраўніцтвам БССР. Правадыры КПБ і тысячы партыйных актывістаў з вялікім перакананнем ажыццяўлялі ў Беларусі планы маскоўскага цэнтра. Сакратары ЦК КПБ — Мазураў і Машэраў — імкнуліся стаць найлепшымі будаўнікамі камунізму на ўсёй савецкай тэрыторыі і з вялікай адданасцю рэалізоўвалі найбольш недарэчныя — з гледзішча інтарэсаў Беларусі — праекты гаспадарчага развіцця. Савецкія крыніцы паведамляюць, што валавы нацыянальны даход у БССР у 1970 годзе параўнальна з 1965 годам павялічыўся на 58 %, у 1975 годзе — на 135 %, у 1980 годзе — на 207 %[4]. У значна меншых тэмпах узрастаў даход у сельскай гаспадарцы.

Аднак няшмат вядома пра рэальную эфектыўнасць беларускай гаспадаркі пасля 1956 года. Спажыўцом значнай часткі прамысловай прадукцыі была Савецкая Армія. Многія прамысловыя аб'екты размяшчаліся ў гарадах, якія не мелі за сабою ніякіх аргументаў дзеля абгрунтавання такога выбару (напрыклад, нафтаперапрацоўчы камбінат у Полацку). Ва ўмовах "сацыялістычнага спаборніцтва" і "змагання за выкананне планаў"

---

[3] Абэцэдарскі Л., Баранава М., Паўлава Н. Гісторыя БССР. Мінск, 1984. С. 254.

[4] Народное хозяйство Белорусской ССР в 1981 г. // Статистический ежегодник. Минск, 1981. С. 11—12.

кіраўнічыя кадры перш за ўсё клапаціліся пра колькасць выпушчаных тавараў, якая была паказчыкам прагрэсу ў савецкай гаспадарцы. Пра якасць прамысловых вырабаў не кажа ніводная статыстыка, таму невядома, якая была сапраўдная вартасць зробленых у Беларусі машынаў, вузлоў, матэрыялаў, хімічных тавараў.

Пад час XXVII з'езда КПБ у лютым 1971 года старшыня Савета Міністраў БССР Ціхан Кісялёў, характарызуючы развіццё беларускай гаспадаркі ў 1965—1971 гадах, гаварыў пра сярэдні 10-працэнтны гадавы рост валавога нацыянальнага прадукту ў згаданым перыядзе. Кіраўнік беларускага ўрада шмат казаў пра укараненне рэформаў у паасобных галінах гаспадаркі, аднак не паказаў на істотныя элементы гэтых зменаў[5]. У сапраўднасці рэформа праводзілася толькі на словах. Мэтай гаспадарчых дзеянняў стала змаганне за паказчыкі колькаснага росту вытворчасці згодна з указаннямі цэнтральнага плана. Выкананне плана было крытэрам паспяховай дзейнасці партыйнага і адміністрацыйнага кіраўніцтва рэспублікі. Над гаспадарчымі механізмамі выразна дамінавалі фармалізм і дагматызм.

Ва ўмовах зніжэння прадукцыйнасці працы на пачатку 60-х гадоў у працоўных калектывах многіх прадпрыемстваў пачалася новая акцыя "змагання за званне брыгады камуністычнай працы". Штогод да гэтага спаборніцтва прыступала блізу 90 % працоўных калектываў. Прысваенне калектыву такога звання гарантавала рабочым лепшую зарплату, а кіраўнікам адкрывала шлях да падвышэння па службе.

Дабрабыт эпохі Машэрава

Адстаўка Хрушчова ў 1964 годзе выклікала таксама кадравыя змены ў рэспубліках. У сакавіку 1965 года першага сакратара ЦК КПБ Кірылу Мазурава замяніў Пётр Машэраў, які знаходзіўся на гэтай пасадзе да 1980 года. У юрыдычных умовах савецкага ладу ён выявіўся як актыўны адміністратар. Пад ягоным кіраўніцтвам Беларусь заняла перадавое месца ў СССР як па развіцці гаспадаркі, так і роўню жыцця грамадзян рэспублікі. Машэраў намагаўся нават рэфармаваць савецкую сістэму

[5] Из доклада Председателя Совета Министров БССР Т. Киселева на XXVII съезде КПБ // Советская Белоруссия. 1971. 25 февр.

на сваёй тэрыторыі, не парушаючы, вядома, яе ідэалагічных і юрыдычных асноваў. Клапаціўся, каб дэпутатамі мясцовых Саветаў былі адукаваныя і актыўныя людзі. У мясцовых Саветах ствараў камісіі, якія мусілі распрацоўваць планы грамадскага і гаспадарчага развіцця на сваёй тэрыторыі. Новаўвядзеннем было тое, што ў склад камісіяў можна было ўводзіць у якасці спецыялістаў асобаў, якія не былі дэпутатамі. Тэарэтычна стварыліся ўмовы для прадстаўлення поглядаў асобаў, якія фармальна не залежалі ад партыйнага апарату. Аднак у сапраўднасці ўлада заставалася ў руках сакратароў партыі, якія мелі права даваць дэпутатам загады і патрабаваць справаздачу аб іхнай дзейнасці. З гэтае прычыны камісіі сталі ўсяго дарадчым органам, да рэкамендацый якіх можна было ставіцца абыякава.

Згодна з Канстытуцыяй СССР ад 1977 года, сацыялістычнае грамадства вылучаецца самай высокай ступенню арганізаванасці, ідэйнасці і свядомасці працоўных масаў. "Развітое сацыялістычнае грамадства — пісалася ў Канстытуцыі — заканамерны этап на шляху да камунізму"[6].

Машэраў з вялікім энтузіязмам ажыццяўляў гэтыя прынцыпы і несумнеўна правёў Беларусь праз "заканамерны этап на шляху да камунізму". У 1965—1980 гадах усе працаўнікі — 5 мільёнаў чалавек — сталі сябрамі дзяржаўна-партыйных прафсаюзаў. Амаль 100 % моладзі належала да камсамола, а лік членаў партыі перасягнуў 600 тысяч. Амаль кожны шаснаццаты жыхар рэспублікі насіў пры сабе камуністычны білет.

У 1970—1985 гадах у Беларусі сталі працаваць 186 новых прадпрыемстваў, мадэрнізаваліся многія дзейныя заводы. Развіваліся перш за ўсё хімічная, машынабудаўнічая, металургічная, а таксама (у меншых тэмпах) тэкстыльная і апрацоўчая прамысловасць. Адсутнасць усялякай самастойнасці прадпрыемстваў стала прычынай нізкай прадукцыйнасці працы. Прамысловасць усмоктвала вялікую колькасць вяскоўцаў, якія пакідалі калгасы з прычыны нізкіх заробкаў і кепскіх умоваў працы. Празмерная колькасць работнікаў на прадпрыемствах як вынік ідэалогіі, якая адпрэчвала з'яву беспрацоўя ў сацыя-

---

[6] Конституция (Основной Закон) Союза Советских Социалистических Республик. Минск, 1977. С. 4.

лізме, рабіла немагчымай рацыянальную арганізацыю працы. Разбухлая колькасна заводская адміністрацыя таксама перашкаджала дасягнуць высокай эфектыўнасці прадпрыемстваў.

БССР была амаль поўнасцю залежная ад забеспячэння энерганосьбітамі з Расеі. Таму перабоі ў пастаўках нафты, вугалю і газу, якія сталі з'яўляцца ад канца 70-х гадоў, выклікалі застой у многіх галінах прамысловасці.

Інвестыцыі ў хімічную, машынабудаўнічую і нафтаперапрацоўчую прамысловасць праводзіліся без уліку экалагічных патрабаванняў. Вакол прамысловых аб'ектаў паўставалі вялікія зоны забруджаных атмасферы і грунтавых водаў, прасторы без лясоў і ўсялякай расліннасці. Хімічная прамысловасць Беларусі нагадвала бомбу з запавольнікам. З часам штораз больш відавочным рабілася яе адмоўнае ўздзеянне на навакольнае асяроддзе.

Савецкія статыстыкі паведамляюць пра высокія тэмпы развіцця беларускай прамысловасці да 1985 года. Ад 1970 года вытворчасць машынабудаўнічай і хімічнай прамысловасці штогод павялічвалася на 30 %[7]. Аднак у пачатку 80-х гадоў савецкая гаспадарка вычарпала ўсе магчымасці развіцця. Пры той цэнтралізаванай сістэме кіравання і адсутнасці ўздзеяння якіх-небудзь рынкавых механізмаў гаспадарчае жыццё каціласа па інерцыі. Ідэалогія ў перспектыве не магла замяніць эканамічных фактараў. Тым часам сярод работнікаў паўсюдным было перакананне, што заробак даюць за прысутнасць на працы, а не за яе выкананне. Адсутнасць тэхналагічнай дысцыпліны праз дэфіцыт адпаведных кампанентаў прыводзіла да выпуску вялікай колькасці няякасных тавараў, каштоўных толькі для статыстыкі. У сапраўднасці гэта было марнатраўства сыравіны, электраэнергіі і людской працы.

Таксама паспешліва збудаваныя прамысловыя аб'екты пад час іх эксплуатацыі прыводзілі да вялікіх стратаў энергіі і сыравіны. Афіцыйная статыстыка ў 1972 годзе адзначыла, што 6,3 % прадпрыемстваў мелі беспадстаўныя страты паліва, 7,1 % — электраэнергіі і 6,5 % — цяпла. Маштабы марнатраўства на гэтых прадпрыемствах ніхто не вызначаў. Спробы палепшыць

[7] Народное хозяйство Белорусской ССР в 1985 г. // Статистический ежегодник. Минск, 1986. С. 33.

якасць вытворчасці і абмежаваць страты, якія назіраліся ў 1981—1985 гадах, выклікалі значнае зніжэнне тэмпаў росту колькасці прадукцыі, амаль 7 % прадпрыемстваў не выканалі гадавых планаў.

Намаганні правесці мадэрнізацыю прадпрыемстваў, якую рабілі занятыя там тэхнікі і інжынеры, звычайна насцярожвалі заводскую адміністрацыю і яе партыйныя камітэты. Бюракратычны апарат здаўна прывык выконваць загады, якія паступалі згары. Ініцыятывы нізоў па ўдасканаленні вытворчых працэсаў заўсёды праходзілі доўгі шлях атрымання ўхвалы з боку людзей і ўстановаў, якія часта не мелі дачынення да прамысловасці. Так, у 1978 годзе была адхілена рэкордная колькасць — звыш 20 тысяч рацыяналізатарскіх прапановаў, мэтай якіх было абмежаванне стратаў на вытворчасці.

Нягледзячы на адмоўныя з'явы, якія спадарожнічалі развіццю прамысловасці ў Беларусі, па савецкіх мерках была яна вельмі сучаснай і прадукцыйнай. Новыя прадпрыемствы, напрыклад фабрыка апрацоўкі дыяментаў ці Менскі гадзіннікавы завод выпускалі прадукцыю высокай якасці.

Ахілесавай пятой савецкай эканомікі была калектыўная сельская гаспадарка. Хоць на фоне ўсёй савецкай прасторы Беларусь мела найлепшыя паказнікі сельскагаспадарчай вытворчасці, але параўнальна з заходнееўрапейскімі краінамі яны былі карыкатурна нізкія. У 1960 годзе ўраджайнасць збожжавых склала ўсяго 8,7 цэнтнера з аднаго гектара. Падобнага плёну дасягалі нашыя продкі ў Сярэднявеччы. Праз дзесяць гадоў у выніку забеспячэння калгасаў і саўгасаў тэхнікай і ўгнаеннямі ўраджайнасць з аднаго гектара ў Беларусі ўзрасла да 16 цэнтнераў, а на пачатку 80-х — да 22 цэнтнераў. Гэтыя вынікі сталіся значна вышэйшымі за дасягненні сельскай гаспадаркі Расеі ці Украіны, але ў краінах Заходняй Еўропы, пры гэтакай насычанасці сельскагаспадарчай тэхнікай ураджайнасць была ў тры разы большая.

Прычынай нізкай прадукцыйнасці працы калгаснікаў стала перш за ўсё адсутнасць якіх-колечы стымулаў зацікаўлення яе вынікамі. Вялікія страты ў сельскай гаспадарцы наносілі крадзяжы калгаснай маёмасці, якія ўчынялі як кіраўнікі, так і калгаснікі. Апошнія кралі з прычыны нізкіх заробкаў. Значная частка стратаў была вынікам дрэннай арганізацыі жніва. Шмат збожжа траціласа пад час транспартавання і захоўвання.

Між іншага, з гэтых прычынаў беларускія калгасы не маглі нават наблізіцца да мяжы самаакупнасці і былі асуджаныя на выкарыстанне датацый, якія ствараліся за кошт іншых галінаў гаспадаркі.

Прагрэс у галіне жывёлагадоўлі тармазіўся заўсёднай нястачай кармавых рэзерваў. З гэтае прычыне калгасы ў вясновы перыяд мусілі скарачаць пагалоўе буйной рагатай жывёлы і свіней. Рэпрадукцыя статка, як правіла, вымагала часу і вялікіх фінансавых затратаў.

Нізкія заробкі і дрэнныя сацыяльныя ўмовы ў калгасах былі прычынай адцёку людзей з вёсак у гарады. Улады, каб зрабіць вёску падобнай да горада, у сярэдзіне 70-х гадоў пачалі ліквідоўваць традыцыйную вясковую забудову і перасяляць жыхароў у вялікія дамы-блокі, часта ўзведзеныя у чыстым полі. Такім чынам знішчаліся рэшткі вясковага традыцыяналізму. Статыстыка паказвала аптымістычны вобраз жыцця калгаснікаў, паведамляла пра колькасць ваннаў, тэлевізараў, радыятараў у іх кватэрах. За імі не было відаць адмоўных наступстваў знішчэння традыцыйнай вёскі: падзення народнай культуры, пашырэння п'янства, дэпрэсій жыхароў новых каменных дамоў.

У 1964 годзе Вярхоўны Савет СССР ухваліў закон "Аб пенсіях і дапамозе членам калгасаў". Тады ўпершыню калгаснікі атрымалі пенсійнае забеспячэнне. У Беларусі ў 1966 годзе іхная пенсія складала ўсяго 12 рублёў у месяц. Сярэдняя заробная плата калгасніка ў той час была 38 рублёў (самая нізкая ў пазасельскагаспадарчым сектары — 60 рублёў і была поўнасцю вызваленая ад падаткаў). За Машэравым заробкі калгаснікаў значна павялічыліся. У 1968 годзе іх мінімальная заробная плата стала роўнай мінімальнаму заробку ў горадзе, а пры канцы 70-х гадоў сярэдні заробак у сельскай гаспадарцы Беларусі склаў 157 рублёў і быў адным з найвышэйшых у СССР.

Дынамічны рост нацыянальнага даходу Беларусі, які няўхільна працягваўся ад 50-х гадоў, пры канцы 70-х значна запаволіўся. У ходзе выканання дзевятай пяцігодкі (1971—1975) сярэднія гадавыя тэмпы росту дасягнулі 8,3 %, а ў наступнай пяцігодцы (1976—1980) — 5,1 %[8]. Хоць намінальныя заробкі

[8] Народное хозяйство Белорусской ССР в 1988 г. // Статистический ежегодник. Минск, 1989. С. 7.

ў гэты перыяд значна павялічыліся, рэальна яны падалі. Сярэднія тэмпы росту даходаў у 70-х гадах былі ў два разы меншыя, чым у папярэднім дзесяцігоддзі. Апрача таго, адмоўныя з'явы ў гаспадарцы паказвалі на далейшае падзенне. Да паловы 80-х гадоў гэта не так моцна адбівалася на стандарце жыцця жыхароў рэспублікі, бо, згодна з прынятай стратэгіяй пабудовы камунізму дзяржава брала на сябе шораз шырэйшы дыяпазон сацыяльнага забеспячэння грамадзян. У 1960—1985 гадах штогод у сярэднім на 20 % павялічваліся бюджэтныя выдаткі на адукацыю, культуру, спорт і ахову здароўя. За Машэравым сімвалічнымі сталі кватэрная плата, камунальныя і тэлефонныя паслугі, аплата за праезд у транспарце. Аднак у сапраўднасці выявіліся вельмі небяспечныя для гаспадаркі і савецкай дзяржавы тэндэнцыі. Тэмпы росту нацыянальнага даходу былі значна меншыя за тэмпы росту бюджэтных выдаткаў на сацыяльную сферу. Абавязкі дзяржавы ў дачыненні да грамадства ўжо ў 70-х гадах перасягалі ейныя магчымасці. Апрача таго, амаль трохразоваму росту сярэдняй заробнай платы ў 1971—1985 гадах спадарожнічаў толькі двухразовы рост вытворчасці пры 3-працэнтавай інфляцыі для ўсяго перыяду. На пачатку 80-х гадоў з'явілася забытая ўжо нястача тавараў шырокага спажывання. У ашчадных касах назбіраліся вялікія рэзервы грошай насельніцтва, на якія не было таварнага пакрыцця.

У грамадскай свядомасці эпоха Машэрава ўспрымалася як перыяд спакою і трывалага дабрабыту. Пасля гадоў неверагодных намаганняў усяго грамадства па аднаўленні разбуранай пад час вайны краіны і ўзвядзенні вялікіх будоўляў сацыялізму настаў перыяд спажывання. Тэлевізар, радыёпрымальнік, пральная машына, халадзільнік і нават адпачынак на Чорным моры сталі жыццёвым стандартам звычайнага жыхара Беларусі. Пасля 10—15-гадовага чакання кожны мог спадзявацца на кватэру ў адным з велічэзных дамоў-гмахаў, якія выраслі на ўскраінах Менска і абласных гарадоў.

На пачатку 80-х гадоў амаль 70 % насельнікаў Беларусі жылі ў гарадах. Перасяленне з калгасаў у гарады ўспрымалася як грамадскае і цывілізацыйнае падвышэнне. Таму большасць жыхароў БССР жылі ў адчуванні поспеху, зменаў на лепшае. Прапаганда ўдала замацоўвала гэты стэрэатып станоўчых пераўтварэнняў. Камуністычны лад, стварыць які імкнулася

савецкае кіраўніцтва, быў яшчэ больш прываблівы. Таму ў Беларусі мала хто сумняваўся ў асноўных кірунках грамадска-гаспадарчага развіцця краіны.

Нарастанне гаспадарчага крызісу

Створаная ў часе выканання чарговых пяцігодак беларуская прамысловасць рабіла катастрафічны ўплыў на навакольнае асяроддзе. Магутныя аб'екты ўзводзіліся рэкорднымі тэмпамі. Яны меліся выпускаць прадукцыю і тым самым фармаваць паказнікі гаспадарчага прагрэсу. Абсталяванне, якое абмяжоўвала колькасць атрутных выкідаў, патрабавала значных інвестыцыйных коштаў і таму ўстанаўлівалася спарадычна.

У 1960—1985 гадах вытворчасць хімічнай прамысловасці павялічылася ў 49 разоў. У Беларусі выпускалася 25 % хімічнай прадукцыі ўсяго Савецкага Саюза. Больш за 90 % гэтай прадукцыі адпраўлялі за межы рэспублікі. У гарадах, дзе знаходзіліся самыя вялікія хімічныя камбінаты — Наваполацку, Магілеве, Гомелі, Салігорску, Горадні, Бабруйску — забруджанасць паветра ў некалькі разоў перавышала дапушчальныя нормы. Беларуская прамысловасць патрабавала вялікіх капіталаўкладанняў для пабудовы ачышчальных установак. Тым часам рэзка скарачаліся фінансавыя магчымасці савецкай дзяржавы. І хоць беларуская прамысловасць служыла ўсяму Савецкаму Саюзу, развязваць экалагічныя праблемы давялося самім беларусам.

У кастрычніку 1985 года XXVII з'езд КПСС нанова вызначыў планы "паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны", аднак гаспадарчая сістэма, пабудаваная на акасцянелых догмах камуністычнай ідэалогіі, зрабілася зусім непадаткой да рэфармавання. Карумпаваная партыйная эліта не мела, апрача старых лозунгаў, ніякай ідэі ратавання непрадукцыйнай гаспадаркі. Ізаляванае ад астатняга свету савецкае грамадства не ўсведамляла становішча, у якім яно апынулася. Прапаганда паспяхова пераконвала грамадзян, што яны жывуць ў дзяржаве перадавой цывілізацыі. Тым часам ровень матэрыяльнага жыцця насельніцтва СССР быў незвычайна нізкі параўнальна з краінамі Заходняй Еўропы. Працяглая вайна ў Афганістане паскорыла працэс распаду савецкай эканомікі. Пачатак кіравання

Міхаіла Гарбачова і абмежаванне цэнзуры адкрылі грамадству шматгадовы параліч савецкай гаспадаркі.

У Беларусі крызіс пачаўся крыху пазней. У 1988 годзе быў адзначаны нават 8-працэнтавы рост прамысловай вытворчасці. Аднак крызіс у Расеі ды іншых рэспубліках неўзабаве распаўсюдзіўся і на Беларусь. З'явіліся складанасці з забеспячэннем сыравінай, 90 % якой завозілася звонку. Скараціўся таксама рынак збыту вырабаў беларускай прамысловасці. Больш за 80 % гатовых тавараў раней адпраўлялі ў Расею, Украіну, Сярэднюю Азію і Закаўказзе. У выніку распаду структураў савецкай дзяржавы ў 1990 годзе ўсе планы стратэгічнага развіцця гаспадаркі страцілі актуальнасць. Ранейшыя кааператыўныя міжрэспубліканскія пагадненні сталі нядзейнымі. Дзеля нястачы вузлоў дэталяў, якія выпускаліся па-за межамі Беларусі, значную частку вырабаў нельга было паставіць на рынак. З гэтае прычыны ўлады рэспублікі рабілі ўсё магчымае, каб захаваць гаспадарчыя сувязі з новымі палітычнымі суб'ектамі пасля развалу Савецкага Саюза, асабліва з Расеяй — галоўным пастаўшчыком сыравіны і спажыўцом тавараў беларускай прамысловасці.

Вынікі развалу СССР неўзабаве знайшлі адбітак у беларускай гаспадарцы. У 1992 годзе быў зафіксаваны 10-працэнтавы спад прамысловай вытворчасці, што сталася толькі пачаткам працэсу, які яшчэ з большаю напругаю развіваўся ў наступных гадах. Імкліва павялічваўся лік нерэнтабельных прадпрыемстваў. Увядзенне Расеяй сусветных цэнаў на нафту і газ выклікала параліч беларускай хімічнай і нафтаперапрацоўчай прамысловасці і падзенне валавога нацыянальнага прадукту ў 1993 годзе на 31 % і нацыянальнага даходу — на 20 %. Інфляцыя перасягала 400 % у год.

Наступствы катастрофы на Чарнобыльскай АЭС

Вялікі ўплыў на палітычную, грамадскую і гаспадарчую сітуацыю рэспублікі зрабілі наступствы катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, якая адбылася 26 красавіка 1986 года. На Беларусь выпала тады больш за 70 % радыеактыўных выкідаў з палаючай атамнай электрастанцыі. Забрудзілася чацвертая ча-

стка рэспублікі, а найбольш ад катастрофы пацярпелі Гомельская і Магілеўская вобласці[9].

У зоне з высокім роўнем забруджання цэзіем-137 апынулася больш за 2,2 мільёна чалавек — амаль пятая частка насельніцтва Беларусі.

Дапамогу пацярпелым ад аварыі ўскладняла пазіцыя цэнтральных і рэспубліканскіх савецкіх уладаў. Тым часам, калі ў паветры ўтрымлівалася высокая канцэнтрацыя радыеактыўнага пылу, гэты факт ўтойваўся ад грамадства. Улады не наважыліся адмовіцца ад традыцыйных першамайскіх шэсцяў (у тым ліку ў Гомелі), у якіх ўдзельнічала бальшыня жыхароў забруджанай зоны. Пад забруджаным радыеактыўнымі выкідамі небам маршыравалі дзеці і моладзь. Калі весткі пра чарнобыльскую катастрофу дайшлі да шырокіх колаў грамадства, камуністычная прапаганда намагалася мінімалізаваць памеры трагедыі, даказваючы людзям, што знаходжанне на забруджанай тэрыторыі нічым не пагражае. Службы, якія павінны былі ратаваць насельніцтва ў выпадку радыеактыўнага забруджання, былі непадрыхтаваныя да такой акцыі. Партыйныя камітэты, адміністрацыя, службы бяспекі пасіўна і бяздарна паставіліся да пагрозы, якая навісла над насельніцтвам. Мясцовыя наменклатурныя работнікі ў першую чаргу заняліся эвакуацыяй сваіх сем'яў у бяспечныя раёны краіны. Першы сакратар ЦК КПБ Мікалай Слюнькоў і прэм'ер-міністр Міхаіл Кавалёў у шматлікіх публічных выступленнях заяўлялі, што аварыя на Чарнобыльскай АЭС мае лакальны характар і ў ніякай ступені не пагражае бяспецы насельніцтва Беларусі.

Да дэзінфармацыі грамадства прычыніліся таксама медычныя службы, прадстаўнікі якіх сваім аўтарытэтам пераконвалі насельніцтва ў адсутнасці небяспекі пасля чарнобыльскай катастрофы. Рэкорд безадказнасці і некампетэнтнасці паставіў начальнік Галоўнага санітарна-эпідэміялагічнага ўпраўлення, а заадно намеснік міністра аховы здароўя Віктар Бур'як, які, спасылаючыся на маскоўскіх вучоных, даказваў, што можна бяспечна жыць у зоне, дзе забруджанасць у некалькі дзесяткаў разоў перавышае нормы, прызнаныя за бяспечныя для здароўя.

Дапамогу насельніцтву ўскладняў таксама выезд з забру-

[9] Чарнобыль: Погляд праз дзесяцігоддзе. Мінск, 1996. С. 54—57.

джаных раёнаў часткі лекараў, чыноўнікаў і спецыялістаў па ліквідацыі наступстваў радыеактыўнага забруджання. Цягам некалькіх дзён не праводзілася эвакуацыя насельніцтва з забруджаных зонаў, знаходжанне ў якіх пагражала смерцю. Савецкія эліты праяўлялі бяспрыкладную абыякавасць у стаўленні да суграмадзян.

Толькі 4 траўня пры мяжы з Украінай была вызначана 30-кіламетровая зона, з якой ўсё насельніцтва падлягала абавязковай эвакуацыі. У паўднёва-ўсходняй Беларусі вызначылі 485 населеных пунктаў, знаходжанне ў якіх прызнавалася небяспечным для людскога здароўя і жыцця. Больш за 20 % сельскагаспадарчай плошчы краіны было прызнана непрыдатнымі для раслінаводства. З гаспадарчага карыстання выключылі 15 % лясной тэрыторыі рэспублікі.

Найбольш балючымі для Беларусі сталіся дэмаграфічныя наступствы чарнобыльскай аварыі. Шматлікія выпадкі захворвання немаўлят на рак крыві, касцявога мозгу, хваробы стрававальнага апарату, дыхальных шляхоў і агульнае аслабленне арганізма істотна паўплывалі на нараджальнасць. Адначасова павялічылася смяротнасць людзей рознага веку. У 1992 годзе ў Магілеўскай вобласці памерла на 8 % людзей больш, чым нарадзілася. Праз год паказчык гэты дасягнуў 19,4 %, а ў 1994 годзе — 29,6 %[10]. Боязь перад кволасцю нашчадкаў схіляла жанчын устрымоўвацца ад мацярынства, асабліва калі стан медычнай і сацыяльнай апекі з боку дзяржавы пакідаў бацькоў сам-насам з бядою ў выпадку хваробы ці інваліднасці дзіцяці ад пашкоджання генетычнага коду аднаго з бацькоў. З 1990 года ў Беларусі наглядаецца адмоўны прырост насельніцтва. У 1994 годзе ён склаў 1,9 %.

Сталае знаходжанне ў забруджанай зоне спараджала шмат паталогій псіхалагічнага характару. У бальшыні людзей з'явіўся своеасаблівы хранічны стрэс, у аснове якога ляжала боязь за будучыню сваю і дзяцей. У раёнах наяўнасці гэтага стрэсу паўсюднай з'явай было разладжванне нервовай сістэмы, якое ахапіла вялікія групы насельніцтва.

Паводле ацэнак ад 1992 года, на ліквідацыю наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС у Беларусі патрабавалася 235

[10] Чарнобыль: Погляд праз дзесяцігоддзе. С. 67.

мільярдаў долараў. У гэтую суму ўлучаныя страты, выкліканыя пагаршэннем стану здароўя грамадзян рэспублікі, абмежаваннем іх працаздольнасці і прадукцыйнасці, адмоўнымі дэмаграфічнымі працэсамі, неабходнасцю фінансаваць лячэнне хворых і сацыяльныя паслугі тым, хто ў выніку ўздзеяння радыяцыі страціў здольнасць зарабляць на сваё ўтрыманне. Другую групу стратаў складалі матэрыяльныя каштоўнасці Беларусі — вынятыя з гаспадарчага ўжытку палі, лясы, воды, прамысловыя аб'екты і жыллёвыя рэсурсы ў адселенай зоне.

На ліквідацыю наступстваў катастрофы з бюджэту БССР у 1986—1990 гадах было выдзелена 29 мільярдаў долараў, што склала 17 % пяцігадовага нацыянальнага даходу рэспублікі. Ахінуты гаспадарчым і фінансавым крызісам Савецкі Саюз не вылучыў з цэнтральнага бюджэту ніякіх сродкаў на дапамогу Беларусі. Расея і Украіна, хоць былі забруджаныя ў меншай ступені, самі мелі вялікія клопаты з ліквідацыяй наступстваў катастрофы. Развал СССР у 1991 годзе пакінуў Беларусь сам-насам у змаганні з гіганцкімі праблемамі, несувымернымі з магчымасцямі дзяржаўнага бюджэту і інтэлектуальнага роўню кіраўніцтва, звыклага выконваць загады з Масквы. Адсутнасць досведу і ўмення гэтага кіраўніцтва трымаць сябе ў свеце сталася прычынай таго, што замежная дапамога ў ліквідацыі наступстваў чарнобыльскай катастрофы абмежавалася да сімвалічных памераў. Значна большыя сродкі былі накіраваныя ў Расею і Украіну, бо палітыкі гэтых краін здолелі адпаведна зацікавіць сваёй праблемай заходнюю грамадскую думку.

Наступствы чарнобыльскай катастрофы яшчэ больш ускладнілі экалагічнае становішча Беларусі. У 1990 годзе прамысловаць выкінула ў атмасферу 4 млн тон атрутных рэчываў[11]. Забруджанасць паветра вакол вялікіх цэнтраў хімічнай прамысловасці — Магілева, Гомеля, Светлагорска, Салігорска, Наваполацка — была не нашмат меншая, чым у чарнобыльскай зоне. Сельская гаспадарка ўжо многія гады выкарыстоўвала ў раслінаводстве празмерныя колькасці штучных угнаенняў і пестыцыдаў. Якасць харчоў і забруджанне навакольнага ася-

[11] Народное хозяйство Республики Беларусь в 1990 г. // Статистический сборник. Минск, 1993. С. 161.

роддзя, між іншага, паўплывала на тое, што сярэдняя працягласць жыцця ў Беларусі на пачатку 90-х гадоў была адной з самых нізкіх у Еўропе.

Русіфікацыя

Палітычная адліга па смерці Сталіна не зрабіла, аднак, ніякага ўплыву на нацыянальную палітыку савецкіх уладаў. Пад час міжрэспубліканскай партыйнай канферэнцыі ў Ташкенце ў жніўні 1956 года была ўхваленая дэкларацыя, у якой сцвярджалася, што расейская мова павінна стаць другой роднай мовай для ўсіх савецкіх народаў і элементам узбагачэння лексікі мясцовых моваў. Такая тэндэнцыя ішла ўразрэз са спадзяваннямі беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі і часткі партыйнай эліты. Гэтае асяроддзе паўсюль чакала пашырэння роднай мовы ў грамадскім жыцці, спадзявалася, што сужыццё народаў Савецкага Саюза будзе наладжана паводле інтэрнацыяналістычных асноваў. Сваю палітыку беларусізацыі спрабаваў весці першы сакратар ЦК КПБ Кірыла Мазураў. Ён лічыў, як і многія іншыя камуністы, што неабходным элементам дэмакратызацыі з'яўляецца развіццё нацыянальнай культуры[12]. Неўзабаве, аднак, калі больш выразнымі сталі прынцыпы нацыянальнай палітыкі Мікіты Хрушчова, Мазураў як прыкладны камуніст ахвяраваўся сваімі ідэямі на карысць праграмы партыі. Паводле кіраўніцтва КПСС, русіфікацыя мела быць адным з асноўных элементаў цэментавання савецкай дзяржавы.

Пад час візіту Хрушчова ў Менск у студзені 1959 года, прымеркаванага да 40-годдзя ўтварэння БССР, генеральны сакратар ЦК КПСС шмат разоў публічна паўтарыў: "Чым хутчэй будзем гаварыць па-расейску, тым хутчэй пабудуем камунізм". У прысутнасці членаў ЦК КПБ ён папракнуў Кірылу Мазурава за тое, што пад час урачыстай канферэнцыі той прачытаў уступны даклад на беларускай мове.

У сакавіку 1965 года партыйную арганізацыю ў Беларусі ўзначаліў Пётр Машэраў, які даў пачатак паскоранаму пераводу школаў з беларускай мовай навучання на расейскую. Бела-

[12] Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Минск, 1986. Т. 5. С. 42—43.

русь у канцэпцыях Машэрава, які некрытычна выконваў палітычную лінію кіраўніцтва КПСС, мусіла стаць мадэльным прыкладам савецкай нацыянальнай палітыкі, канчатковай мэтай якой было стварэнне на тэрыторыі СССР адзінай гістарычнай і культурнай супольнасці — савецкага народа. Значыць, вышэйшыя інтарэсы камунізму патрабавалі адрачэння ад уласнай тоеснасці, нацыянальнай свядомасці, мовы і культуры. Трагедыяй Беларусі стала тое, што яе правадыры ў адрозненне ад партыйных элітаў прыбалтыйскіх рэспублік былі перакананыя ў патрэбе рэалізацыі гэтай стратэгіі нацыянальнай палітыкі і рупліва ажыццяўлялі ўсе русіфікатарскія канцэпцыі.

Ад 1960 года большасць культурных установаў Беларусі стала пераходзіць на расейскую мову. У 1960 годзе толькі 26,5 % найменняў кніг было надрукавана на беларускай мове, а праз дзесяць гадоў — 12,3 %[13]. Змест гэтай літаратуры часта знеахвочваў чытачоў карыстацца кніжкамі на роднай мове. Моладзь знаёмілася з творчасцю класікаў беларускай літаратуры на аснове расейскамоўных перакладаў. У гарадскіх школах шмат вучняў па просьбе бацькоў наогул былі вызваленыя ад вывучэння беларускай мовы.

Гэтаму спрыяла рашэнне ЦК КПБ ад красавіка 1959 года "Аб умацаванні сувязі школы з жыццём і аб далейшым развіцці сістэмы народнай адукацыі ў Беларускай ССР". Навучанне на беларускай мове вялося пераважна ў вясковых і местачковых школах. У 1985 годзе на беларускай мове працавала толькі 23 % сярэдніх школаў у рэспубліцы. Для вясковай моладзі, якая паступала на вучобу або працу ў гарады, веданне расейскай мовы станавілася неабходнасцю.

У свядомасці большай часткі насельніцтва Беларусь захоўвала ранг адміністрацыйнай адзінкі Савецкага Саюза. Выхаваўчая сістэма, літаратура, тэлебачанне, радыёвяшчанне, савецкая кінематаграфія вучылі думаць агульнасавецкімі катэгорыямі.

Спроба "пабудаваць" у Беларусі савецкі народ была даволі паспяховая. Пэўнай перашкодай для гэтага эксперыменту стала катастрофа на Чарнобыльскай АЭС, якая падарвала давер да са-

---

[13] Народное хозяйство Белорусской ССР в 1985 г. // Статистический ежегодник. Минск, 1986. С. 162.

вецкай улады. У 1988 годзе археолаг Зянон Пазьняк апублікаваў праўду пра Курапаты. Магілы пад Менскам, месца пакутнай смерці сотняў тысяч людзей, адкрылі не толькі жудасныя злачынствы сталінскага рэжыму, але таксама крывадушнасць і хлуслівасць савецкай прапагандысцкай сістэмы. Ва ўмовах гарбачоўскай перабудовы і свабоды слова структуры апазіцыйных рухаў узніклі і ў Беларусі.

Раздзел 9

Суверэнная Беларусь

Дэмакратычная апазіцыя і нацыянальнае адраджэнне

Татальная русіфікацыя выклікала супраціў, які ўлады душылі самымі рознымі спосабамі — ад звальнення з працы да турэмнага зняволення. Так, Міхаіл Кукабака за крытыку камуністычнага рэжыму правёў у канцлагерах і псіхіятрычных клініках сямнаццаць гадоў.

У 1976 годзе з'явілася ананімнае "Письмо русскому другу", якое нелегальна распаўсюджвалася ў інтэлектуальных колах[1]. У той час партыйная адміністрацыя ажыццяўляла хрушчоўскі тэзіс "чым хутчэй перастанем размаўляць па-беларуску, тым хутчэй пабудуем камунізм", дэкларуючы адначасна лозунг аб раўнапраўнасці беларускай і расейскай моваў. Аўтар ліста паказваў катастрафічны стан беларускай культуры і школьніцтва, сістэму дэнацыяналізацыі беларусаў і прыраўноўваў гэтае становішча да роўнасці шанцаў Чырвонага Каптурыка і Шэрага Ваўка.

Адліга ў СССР, якая пачалася з прыходам да ўлады Міхаіла Гарбачова, найхутчэй паўплывала на змены ў Прыбалтыцы і ў самой Расеі. У Беларусі партыйны і адміністрацыйны апарат з вялікім імпэтам бараніў старыя ідэалы камуністычнай дзяржавы. Дадатковай псіхалагічнай перашкодай, якая замінала правядзенню палітычных зменаў у Беларусі, была глыбокая русіфікацыя партыйных і інтэлектуальных элітаў. Рэформы на ўзор тых, якія адбываліся ў прыбалтыйскіх рэспубліках, патрабавалі прынамсі ўвядзення беларускай мовы ў грамадскі ўжытак. Лозунгі аб частковай беларусізацыі, якія вылучаліся ў сярэдзіне 80-х гадоў беларускай інтэлігенцыяй, работнікі партыйнага апарату ўспрымалі як абвінавачанні іх у здрадзе. Тое, што яны як функцыянеры савецкай дзяржавы ўчынілі ў справе русіфікацыі асветы, культуры і грамадскага жыцця, было жахлівым сведчаннем іхнага стаўлення да беларускага нацыянальнага пытання. Беларусь стала адной з нешматлікіх савецкіх

---

[1] Каўка А. Письмо русскому другу // Скарыніч. 1991. С. 167.

рэспублік, да якой ідэі гарбачоўскай перабудовы даходзілі з вялікім спазненнем.

Першай падзеяй, якая парушыла рэпутацыю "ўзорнай рэспублікі", стаў інцыдэнт у Траецкім прадмесці 20 красавіка 1986 года. Тады ў гэтым старажытным кварталe Менска быў наладжаны абрад Гукання вясны. Завадатарамі імпрэзы былі выкладчыкі Менскай мастацкай навучальні Аляксей Марачкін і Мікола Купава разам з студэнтамі. Інсцэнізацыя абраду грунтавалася на старажытных беларускіх традыцыях і не змяшчала ніякіх элементаў палітызацыі. Але пад час гэтага свята студэнтаў і гледачоў збілі і разагналі ветэраны афганскай вайны ды камсамольскія функцыянеры, нацкаваныя менскім гаркамам партыі. Падзея атрымала шырокі рэзананс і прадэманстравала сапраўднае стаўленне ўладаў да беларускай культуры.

Пры канцы 1986 года з'явіўся гэтак званы "Ліст 28-мі", які можна разглядаць як праграму адраджэння беларускай нацыі. Дакумент меў форму звароту да генеральнага сакратара ЦК КПСС Міхаіла Гарбачова і быў падпісаны 28 вядомымі творцамі — мастакамі, пісьменнікамі, акторамі, навукоўцамі. Яны патрабавалі надаць беларускай мове статус асноўнай у рабоце партыйнай і дзяржаўнай адміністрацыі, беларусізаваць школьніцтва, кінематаграфію і сродкі масавай інфармацыі ў Беларусі. Ліст суправаджаўся дадаткам на 7 старонках, які змяшчаў дэталёвы комплекс прапановаў па карэнным паляпшэнні становішча роднае мовы, культуры і патрыятычнага выхавання ў Беларускай ССР.

Зварот беларускіх інтэлектуалаў у ЦК КПСС сустрэлі станоўчым водгукам. У Менск прыехала адмысловая камісія для вывучэння справы. Аднак вынікі яе працы, агалошаныя пазней першым сакратаром ЦК КПБ Яфрэмам Сакаловым, сведчылі пра адваротнае — нібыта ў БССР панавала поўная свабода развіцця беларускай мовы і культуры. У якасці прыкладу Сакалоў прывёў выданне шматтамовай "Беларускай савецкай энцыклапедыі", серыі "Беларуская народная творчасць" і 10 тамоў твораў Леніна на беларускай мове[2].

"Ліст 28-мі" быў, аднак, важным крокам, які адкрыў магчымасць дыскусіі аб становішчы беларускай культуры і мовы ў БССР. І хоць з партыйных трыбунаў на адрас аўтараў ліста гу-

[2] Звязда. 1987. 27 сак. № 52.

чалі розныя абвінавачанні, якія пасля распаўсюджваліся некаторымі сродкамі масавай інфармацыі, аднак справу ўжо нельга было пакінуць на роўні Камітэта дзяржаўнай бяспекі. Аўтары ліста ўжо не баяліся ні КГБ, ні грамадскага астракізму.

4 чэрвеня 1987 года з Беларусі быў пасланы чарговы ліст Гарбачову, пад якім падпісаліся 134 грамадзяне рэспублікі — прадстаўнікі розных грамадскіх і прафесійных колаў. Копіі ліста атрымалі ўлады і партыйныя газеты ў Беларусі, аднак гэта не выклікала ніякай рэакцыі з боку адрасатаў. Тым не менш гэты, як і папярэдні, лісты мелі вялікае значэнне ў развіцці сітуацыі ў Беларусі: яны паклалі пачатак ідэалагічнаму разняволенню людзей і паспрыялі згуртаванню патрыятычных сілаў.

Праз колькі месяцаў у цэнтры Менска прайшла першая дэманстрацыя пад лозунгамі асуджэння віноўнікаў сталінскага генацыду і спынення русіфікацыі рэспублікі. Нагодай для выступленняў стала святкаванне Дзядоў. Дэманстрацыя 1 лістапада 1987 года, у якой удзельнічала некалькі сотняў студэнцкай моладзі і ў часе якой злачынствы Сталіна ўпершыню былі параўнаныя з генацыдам Гітлера, пераламала пэўны псіхалагічны бар'ер, што стрымліваў людзей ад шчырых выказванняў на тэму цёмных бакоў эпохі камунізму.

У другой палове 1987 года ў Беларусі стварылася некалькі сотняў нефармальных моладзевых суполак. Большая іх частка не мела палітычнага характару, аднак у нейкай ступені яны змяншалі манаполію партыі на наладжванне грамадскага жыцця. Шмат студэнтаў менскіх вышэйшых навучальных установаў былі сябрамі нефармальных суполак, якія дзейнічалі ў сталіцы. Дынамічна актывізаваліся таксама інтэлігенцкія асяродкі ў абласных гарадах. Неўзабаве малалікія групы пачалі аб'ядноўвацца ў большыя арганізацыі, якія ў 1988 годзе налічвалі па некалькі сотняў сяброў. Гэта былі найперш інтэлігенцкія дыскусійныя згуртаванні. У часе арганізацыйных сустрэчаў панавала сапраўдная эйфарыя з прычыны раптоўна атрыманай свабоды слова. Тысячы людзей хацелі падправіць камуністычны свет, не аспрэчваючы, аднак, яго фундаментальныя асновы. Толькі некаторыя моладзевыя суполкі — менская "Талака", гарадзенская "Пагоня" — выступалі за вяртанне беларускай нацыянальнай сімволікі, стварэнне беларускай нацыянальнай

арміі і ўвядзенне беларускага грамадзянства. Гэтыя пастулаты заклікалі ігнараваць Канстытуцыю СССР, яны не атрымалі, аднак, шырэйшай грамадскай падтрымкі.

Прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі наладзілі шэраг кантактаў з асяродкамі Вільні, Рыгі, Таліна, Львова, Масквы, Кіева, Пецярбурга, якія аспрэчвалі савецкі лад. Гэта быў нізавы рух, які імкнуўся да рэфармавання савецкай рэчаіснасці. Ён меў толькі элітны характар, таму па-за ягоным уздзеяннем апынулася бальшыня жыхароў рэспублікі.

Несумнеўна, пачаткам палітычнага пералому ў Беларусі стала апублікаванне ў чэрвені 1988 года рэдакцыяй элітнага штотыднёвіка "Літаратура і мастацтва" артыкула археолага Зянона Пазьняка і інжынера Яўгена Шмыгалёва "Курапаты. Дарога смерці". Рэдакцыйны калектыў на чале з Анатолем Вярцінскім наважыўся насуперак пазіцыі ЦК КПБ надрукаваць матэрыял пра злачынствы НКВД у Беларусі пры канцы 30-х гадоў. Змест артыкула ў штотыднёвіку, які выйшаў 8-тысячным накладам, на працягу некалькіх дзён стаў у Беларусі агульнавядомым. З'явіліся перадрукі ў замежных перыядычных выданнях. Беларускія ўлады мусілі стварыць спецыяльную камісію дзеля праверкі праўдзівасці фактаў, выкладзеных З.Пазьняком і Я.Шмыгалёвым. У камісію ўвайшлі прадстаўнікі Міністэрства нутраных спраў, Міністэрства абароны, пракуратуры, Акадэміі навук і грамадскіх арганізацый. Больш за год спатрэбілася камісіі для сцвярджэння, што дзесяткі тысяч шкілетаў, зарытых у Курапацкім лесе, — гэта парэшткі ахвяраў НКВД і што з курапацкіх магілаў пасля вайны неакрэсленая іх колькасць вывезеная ў невядомым кірунку. На думку З.Пазьняка, у 1937—1940 гадах у Курапатах загінула амаль чвэрць мільёна жыхароў Беларусі[3].

Праз два месяцы пасля апублікавання вышэйзгаданага артыкула ў Менску пры Беларускім аддзяленні Савецкага фонду культуры заснавалася група з назвай "Камітэт-58", якая збіралася заняцца падрыхтоўкай да стварэння рэспубліканскай арганізацыі па зборы інфармацыі і дакументацыі ўсіх злачынстваў, учыненых камуністычным рэжымам супраць беларускага наро-

[3] Курапаты. С. 77.

да[4]. Камітэт узначалілі Зянон Пазьняк і вядомы беларускі пісьменнік Васіль Быкаў. 19 кастрычніка 1988 года адбыўся сход, на якім 350 удзельнікаў ператварылі арганізацыю ў Беларускае гістарычна-асветнае таварыства памяці ахвяраў сталінізму "Мартыралог Беларусі" і выбралі яго кіраўніцтва з Зянонам Пазьняком на чале. Удзельнікі сходу сфармулявалі палітычныя пастулаты, патрабуючы "асуджэння палітычнай сістэмы сталінізму і сталіншчыны, гвалтоўных і недэмакратычных метадаў вырашэння сацыяльных, палітычных і эканамічных праблемаў"[5]. Адначасова на гэтым жа сходзе быў створаны арганізацыйны камітэт Беларускага народнага фронту за перабудову "Адраджэньне" (далей — БНФ) на чале з пісьменнікам Васілём Якавенкам. У сувязі з тым што народныя франты Летувы, Латвіі і Эстоніі вылучалі пастулаты дэмакратычна-незалежніцкага кшталту, хада падзеяў у Менску насцярожвала Маскву і камуністычнае кіраўніцтва Беларусі. За колькі месяцаў да таго першы сакратар ЦК КПБ Яфрэм Сакалоў запэўніваў у Маскве цэнтральныя савецкія ўлады, што ў Беларусі народны фронт не ўзнікне. У жніўні 1988 года ў часе падрыхтоўкі Камітэта-58 да сходу камуністычныя ўлады надумалі стварыць сваю арганізацыю з назовам Беларускі народны фронт. Аднак гэтыя спробы не знайшлі прыхільнікаў і не апраўдалі сябе. Затое расла вага БНФ, які ўвесну 1989 года ўзначаліў Зянон Пазьняк. У шэрагі БНФ уступала перш за ўсё інтэлігенцыя, яму сімпатызавала частка членаў камуністычнай партыі, якія бачылі ў гэтай арганізацыі сілу, здольную адрадзіць нацыянальную ідэю.

30 кастрычніка 1988 года напярэдадні Дзядоў у Менску адбылася вялікая дэманстрацыя. Некалькі дзесяткаў тысяч чалавек з нацыянальнымі бел-чырвона-белымі сцягамі рушылі ў кірунку да Курапатаў ушанаваць памяць ахвяраў сталінізму. Жорсткая атака міліцыі на дэманстрантаў з ужываннем слезацечнага газу толькі замацавала ў грамадстве адмоўны вобраз уладаў. Пры канцы 1988 года групы падтрымкі БНФ узніклі ва ўсіх абласных гарадах Беларусі. БНФ пачаў выдаваць газету "Навіны", аднак друкаваць яе мусілі ў Летуве. Фронтаўская

[4] Лічба "58" у назве Камітэта асацыявалася з нумарам артыкула Крымінальнага кодэкса, на падставе якога асуджалі за "контррэвалюцыйныя злачынствы".

[5] Мартыралог. 1989. № 1. С. 14.

прапаганда апелявала да беларускіх дзяржаўных традыцыяў Вялікага Княства Літоўскага, барацьбы за незалежнасць, увасабленнем якой былі Тадэвуш Касцюшка і Кастусь Каліноўскі. Дзеячы БНФ абапіраліся на ідэі Беларускай Народнай Рэспублікі, утворанай 25 сакавіка 1918 года, лічылі яе легітымнай, а ўсе дзяржаўныя арганізацыі ў Беларусі, якія існавалі пасля падзення БНР, прызнавалі часовымі формамі дзейнай савецкай улады.

Лозунгі БНФ адначасова абвінавачвалі кіраўніцтва рэспублікі ў нацыянальнай здрадзе, адстойванні інтарэсаў чужой дзяржавы, пакланенні ідэалогіі, якая загубіла мільёны людзей. З другога боку, у кантраляваных камуністычнай партыяй сродках масавай інфармацыі БНФ паказваўся як экстрэмісцкая нацыяналістычная арганізацыя, што намагаецца парваць сувязі паміж Беларуссю і Расеяй, рэлікт калабаранцкіх рухаў перыяду Другой сусветнай вайны.

У 1989 годзе кампартыя страціла магчымасць кантраляваць увесь друк. Некаторыя газеты і часопісы, асабліва беларускамоўныя "Чырвоная змена", "Звязда", "ЛіМ", "Настаўніцкая газета", "Полымя", "Крыніца", "Маладосць" — часта прапаноўвалі свае старонкі аўтарам, звязаным з БНФ. Ідэя нацыянальнага адраджэння шораз рабілася ўсё больш папулярнай, асабліва сярод інтэлігенцыі. Але большасць грамадства заставалася яшчэ пад уплывам камуністычнай прапаганды, распаўсюджанай праз пасярэдніцтва тэлебачання, радыёвяшчання і большасці расейскамоўнага друку.

Атмасфера, якая спадарожнічала свабодзе слова, неўзабаве дала вынікі ў выглядзе новых распрацовак гісторыі Беларусі. Перыядычныя выданні змяшчалі публікацыі, якія аспрэчвалі савецкія навуковыя дасягненні ў галіне гісторыі Беларусі. Гісторыкі па-новаму пачалі паказваць дачыненні Беларусі з усімі суседзямі. З савецкага забыцця пачаў вяртацца вобраз народа, у якога ёсць свая гісторыя, культура, юрыдычныя і дзяржаўныя традыцыі. Аднак беларускім элітам не ўдалося за кароткі час прышчапіць масам гэтыя новыя разумовыя плыні.

Пераважная большасць беларускага савецкага грамадства была гатовая падтрымаць хоць якія палітычныя змены з умовай, што яны палепшаць эканамічнае становішча. Слова "дэмакратыя" муляла грамадзянам Беларусі, бо пачынала асацыявацца з анархіяй у інфармацыйнай сферы, разбурэннем ка-

муністычнай сістэмы каштоўнасцяў, да якой яны прызвычаіліся і якая цяпер аспрэчвалася на кожным кроку. Большасць ветэранаў Другой сусветнай вайны, якія з гонарам і пры кожнай нагодзе дэманстравалі ордэны, дадзеныя ім за мужнасць і адвагу ў абароне Савецкага Саюза, не ўспрымалі тлумачэнняў, што яны проста змагаліся за іншую форму акупацыі. Настойлівыя патрабаванні неадкладна правесці беларусізацыю насцярожвалі сотні тысяч чыноўнікаў, інжынераў, настаўнікаў, якія баяліся стаць прафесійна непрыдатнымі з прычыны няведання беларускай мовы. Усе іхныя веды абапіраліся на грунт расейскамоўнай тэрміналогіі. Выразна адмоўную пазіцыю ў справе нацыянальнага адраджэння заняла большасць амаль паўтарамільённай расейскай меншасці. Расейцы баяліся страціць ранейшае прывілеяванае становішча ў жыцці рэспублікі.

У пачатку 1989 года ў Беларусі акрэсліліся дзве выразныя палітычныя плыні — савецкая і нацыянальная. Паміж інтэлігенцкімі групоўкамі, якія выказваліся за тую або іншую плынь, знаходзілася дэзарыентаваная маса грамадзян. Нарастанне гаспадарчага крызісу выклікала ў грамадстве рост апатыі і абыякавасці да ўсялякіх лозунгаў пра дэмакратыю і нацыянальнае адраджэнне.

14 студзеня 1989 года ў Вільні адбыўся з'езд дэлегатаў 66 беларускіх моладзевых арганізацый. Улады Беларусі не дазволілі правесці гэтае мерапрыемства ў Менску. З'езд заснаваў Канфедэрацыю беларускіх моладзевых суполак і падтрымаў ініцыятыву стварэння палітычнай некамуністычнай і ўсенароднай арганізацыі ў выглядзе Беларускага народнага фронту. Вялікі мітынг на стадыёне "Дынама" ў Менску, арганізаваны Канфедэрацыяй і Аргкамітэтам БНФ, сабраў 40 тысяч чалавек. Упершыню ў такой форме ставіліся патрабаванні ліквідаваць запіс у канстытуцыі пра кіраўнічую ролю кампартыі, стварыць беларускія вайсковыя фармаванні, надаць беларускай мове статус адзінай дзяржаўнай мовы на тэрыторыі БССР[6].

Устаноўчы з'езд БНФ, у якім удзельнічалі 400 дэлегатаў, адбыўся 24—25 чэрвеня 1989 года ў Вільні. Правесці яго на тэрыторыі Беларусі ўлады не дазволілі. Першачарговай мэтай БНФ з'езд вызначыў адраджэнне мовы, культуры і беларускай

[6] Запруднік Я. Беларусь на гістарычных скрыжаваннях. С. 146.

нацыянальнай свядомасці. У прынятым статуце арганізацыі гаварылася пра пабудову адкрытага грамадства ў духу дэмакратычных і гуманістычных каштоўнасцяў, з шанаваннем правоў нацыянальных меншасцяў. У праграму БНФ быў занесены нават пастулат пра "адраджэнне ленінскіх прынцыпаў нацыянальнай палітыкі". З'езд прыняў таксама пастанову, што БНФ будзе трымацца канстытуцыі і заканадаўства БССР, аднак звярнуў увагу, што, згодна з канстытуцыяй, Беларусь — суверэнная дзяржава. Гэтую суверэннасць, на думку дэлегатаў, мог гарантаваць запіс пра зверхнасць рэспубліканскага заканадаўства над саюзным. Аднак гэта не быў пастулат адлучэння Беларусі ад СССР, а толькі патрабаванне, каб савецкія ўлады прызналі гарантаваную дзейным правам палітычную аўтаномію Беларусі ў складзе савецкай дзяржавы. Неадкладнай справай у рэспубліцы дэлегаты прызналі ліквідацыю наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС[7]. Узначалілі БНФ апрача Зянона Пазьняка прафесары Міхась Ткачоў і Юрась Хадыка.

Улетку 1989 года дзеячы БНФ паспрабавалі стварыць незалежныя ад кампартыі беларускія прафсаюзы. У верасні таго ж года прадстаўнікі 72 прадпрыемстваў заснавалі Арганізацыйны камітэт Рабочага саюзу Беларусі, у склад якога ўвайшлі дзеячы БНФ Віктар Івашкевіч, Міхась Собаль і Сяргей Мухін. Пераважна абыякавае стаўленне рабочых да дэмакратычных і нацыянальных лозунгаў не дазволіла паўтарыць польскі сцэнар. Незалежныя прафсаюзы згуртавалі ўсяго некалькі працэнтаў працоўнага насельніцтва і абмежавалі сваю дзейнасць пытаннямі сацыяльнай сферы.

У 1989 годзе Камуністычная партыя Беларусі налічвала больш за 700 тысяч членаў, з якіх 71 % складалі беларусы[8]. Шмат хто з іх у новай сітуацыі стаў шчырым прыхільнікам ідэі нацыянальнага адраджэння. Большасць сяброў БНФ у момант заснавання арганізацыі былі камуністамі. Многія не ведалі беларускай мовы. З другога боку, сярод прадстаўнікоў кіраўнічых колаў КПБ знайшлося нямала людзей сапраўды зацікаўленых беларусізацыяй партыйных і дзяржаўных структураў. Адным з іх быў сакратар Менскага гарадскога камітэта КПБ Пётра

[7] Праграмныя дакументы БНФ "Адраджэньне". Менск, 1989. С. 25—26.

[8] КПБ в зеркале статистики // Коммунист Белоруссии. 1990. № 5. С. 27.

Краўчанка. Ад сведамай беларускай партыйнай інтэлігенцыі выйшла прапанова заснаваць у 1989 годзе Таварыства беларускай мовы (ТБМ), старшынёй якога стаў вядомы абаронца роднай мовы паэт Ніл Гілевіч. Таварыства адыграла вялікую ролю ў падрыхтоўцы законапраектаў аб статусе беларускай мовы ў БССР, якая ў студзені 1990 года пастановай Вярхоўнага Савета стала адзінай дзяржаўнай мовай у Беларусі. Аднак вельмі часта з боку зрусіфікаванай партыйнай наменклатуры можна было пачуць непрыхаваную пагарду да дзяржаўнай мовы.

Змены ў БССР адбываліся галоўным чынам пад уплывам падзеяў, што ішлі ў суседніх савецкіх рэспубліках, асабліва ў Летуве, Латвіі і Украіне. На вуліцах беларускіх гарадоў, у адміністрацыі, школах, культурных установах і дамах большасці беларусаў паўсюднай была расейская мова або гэтак званая "трасянка". Палітычная сітуацыя вакол Беларусі прымушала ствараць самастойнае рэспубліканскае заканадаўства, ўжо само існаванне якога ўмацоўвала палітычную адасобленасць рэспублікі. У першай палове 1990 года абвясцілі незалежнасць Летува, Латвія, Эстонія, Украіна і нават Расея. Беларускі Вярхоўны Савет пад ціскам парламенцкай фракцыі БНФ таксама прыняў 27 ліпеня "Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце БССР". "Закон аб мовах у Беларускай ССР", які надаваў беларускай мове статус адзінай дзяржаўнай мовы, быў прыняты яшчэ папярэднім Вярхоўным Саветам адзінаццатага склікання, у якім 80 % дэпутатаў складалі камуністы. Пераважная іх большасць нават не карысталася роднай мовай. Аднак яны не маглі ігнараваць грамадскую думку і змушаны былі галасаваць "за", тым больш што раней такія законы прынялі парламенты суседніх савецкіх рэспублік.

"Закон аб мовах" уступаў у сілу ў верасні 1990 года. З прычыны няведання дзяржаўнымі чыноўнікамі беларускай мовы ажыццяўленне шмат якіх артыкулаў гэтага закону было адтэрмінавана. Паасобным ведамствам вызначаліся пэўныя тэрміны падрыхтоўкі да працы на аснове беларускай мовы. Да канца 2000 года планавалася перавесці на "дзяржаўную мову" ўсе ўстановы, апрача школьніцтва нацыянальных меншасцяў. Дзяржаўныя чыноўнікі часта ігнаравалі гэты закон або зацягвалі тэрміны яго выканання. З боку расейскамоўных у сваёй большасці беларусаў таксама не было належнага ціску на наменклатуру. Нават некаторыя дзеячы новастварэных арганіза-

цыяў, якія далучыліся да дэмакратызацыі палітычнага жыцця рэспублікі, не паказвалі вялікага энтузіязму да нацыянальнай мовы. І тым не менш у гэтай справе былі дасягнуты немалыя поспехі, асабліва ў сферы сярэдняй адукацыі.

У атмасферы станаўлення незалежных дзяржаў на руінах Савецкага Саюза ў свядомасці грамадзян Беларусі расло значэнне беларускай мовы ў якасці асноўнага сродку зносінаў у сваёй дзяржаве. У выніку настойлівасці інтэлігенцкіх колаў, дзеячоў БНФ, ТБМ і новастворанай Грамады (БСДГ) Вярхоўны Савет ухваліў чарговыя законы, якія спрыялі ўмацаванню пазіцый роднай мовы. У чэрвені 1991 года быў прыняты "Закон аб культуры", а ў кастрычніку — "Закон аб адукацыі". Абодва законы спрыялі беларусізацыі жыцця ў краіне. У 1991/92 навучальным годзе на некаторых факультэтах педагагічных інстытутаў пачалі весці заняткі са студэнтамі на беларускай мове. Таксама першакласнікі, якія ў тым жа годзе пачалі навуку, сталі атрымоўваць веды на роднай мове. Старшакласнікам была павялічана колькасць урокаў дзяржаўнай мовы.

У 1989—1991 гадах стварыліся ўсе інстытуцыйна-праўныя формы, якія рабілі магчымым адраджэнне беларускіх нацыянальных каштоўнасцяў: мовы, культуры, гістарычнай і нацыянальнай свядомасці. Гэты працэс нягледзячы на перашкоды з боку прыхільнікаў старога ладу абымаў шторaз шырэйшыя грамадскія колы. Бальшыня грамадзянаў даходзіла да высновы, што будучыня ў сваёй дзяржаве патрабуе засваення дзецьмі роднай мовы.

Структурныя перамены 1989—1995 гадоў

Адсутнасць пераемнасці дэмакратычных традыцыяў мінулага (перапыненых за гады расейскага панавання) і нізкі ровень палітычнай культуры грамадства сталі прычынай таго, што пасля 1989 года змены ў ім адбываліся дзякуючы інтэлектуальным і палітычным элітам. Камунізм укараніў у людзях, якія мелі дачыненне да ўлады, заганныя звычкі. Для іх характэрным было перш за ўсё адмаўленне прынцыпу партнёрства ўлады і грамадзяніна, прысваенне першаму з гэтых фактараў дамінавальнай пазіцыі, бюракратычная сістэма выдачы рашэнняў, якая выяўлялася ў шматлікіх дазволах, даведках, пропусках. Сістэму, якая асуджала людзей на заўсёднае чаканне, пакору

і саступкі ў дачыненні да ўладных структураў, грамадства наогул лічыла нормай грамадскага жыцця. У такім становішчы не магло існаваць якое-колечы самакіраванне, што ёсць асновай дэмакратыі. Змяніць гэты менталітэт магла толькі сіла, якая распараджалася поўнай уладай, шляхам яе паступовага самаабмежавання і перадачы кампетэнцыяў розным грамадскім арганізацыям і прадстаўнічым структурам. Але гэтага не адбылося. І надалей грамадства ў пераважнай сваёй большасці заставалася аб'ектам уздзеяння з боку розных палітычных груповак, заставалася падаткім на маніпуляцыю і некрытычнае стаўленне да дэмагогіі. Механізмы дэмакратыі падаліся надта складанымі і чужымі, таму яны лічыліся не надта спраўным інструментам усталявання ўлады.

У Беларусі адсутнічала грамадская перакананасць у тым, што воля народа можа ўплываць на хаду палітычных працэсаў. Чакалася такая ўлада, якая забяспечыць справядлівасць і пэўны дабрабыт. Формы ўсталявання гэтай улады і метады яе выканання ў грамадскім адчуванні мелі другараднае значэнне.

Нават калі злачынствы камунізму набылі шырокую вядомасць, з цэнтральных плошчаў беларускіх гарадоў не зніклі помнікі Леніну, Дзяржынскаму ды іншым бальшавіцкім героям. Імёны вінаватых у генацыдзе бальшавікоў засталіся таксама ў назовах вуліц, калгасаў, прадпрыемстваў.

Увесну 1990 года ўпершыню адбыліся выбары ў Вярхоўны Савет, пад час якіх кандыдатаў у дэпутаты маглі вылучаць гэтак званыя сходы жыхароў, а таксама грамадскія арганізацыі. У сітуацыі, калі адзінай арганізаванай сілай была КПБ, яе функцыянеры перанялі ініцыятыву ладзіць сходы для вылучэння кандыдатаў. Пяцьдзесят месцаў у Вярхоўным Савеце, у якім засядала 360 дэпутатаў, атрымалі падкантрольныя КПБ грамадскія арганізацыі — Беларускі саюз ветэранаў вайны і працы, Беларускае таварыства інвалідаў, Беларускае таварыства інвалідаў па зроку, Беларускае таварыства глухіх. Тым не менеў 13 кандыдатаў, у іх ліку і Зянона Пазьняка, вылучылі структуры Таварыства беларускай мовы.

Апазіцыя пайшла на выбары, арганізаваўшы Дэмакратычны блок, аснову якога складалі дзеячы БНФ. Апанаваны камуністамі Цэнтральны выбарчы камітэт за месяц да выбараў адкінуў усіх кандыдатаў Дэмакратычнага блока. Толькі дэманстрацыя БНФ 25 лютага 1990 года, пад час якой актыўна гучалі

патрабаванні распусціць Цэнтрвыбаркам і КПБ, паспрыяла рэгістрацыі кандыдатаў ад апазіцыі.

У першым туры галасавання 4 сакавіка 1990 года абралі толькі 98 дэпутатаў, з ліку якіх 50 было дэлегавана гэтак званымі грамадскімі арганізацыямі. Згодна з палажэннем аб выбарах, дэпутацкі мандат атрымоўваў той кандыдат, які ў сваёй акрузе набраў 50 % галасоў пры 50-працэнтавым удзеле грамадзян у выбарах. У двух чарговых турах галасавання да 10 траўня 1990 года агулам было выбрана 327 дэпутатаў. Амаль 86 % народных дэпутатаў складалі члены КПБ. Дэмакратычны блок займеў 67 мандатаў, з таго ліку 26 месцаў атрымалі дэпутаты ад БНФ. Праз некалькі месяцаў фракцыя БНФ павялічылася да 36 дэпутатаў. Найбольшую падтрымку апазіцыя атрымала ў Менску, дзе жыве пятая частка ўсяго электарату Беларусі.

Першым старшынёю Вярхоўнага Савета стаў член Бюро ЦК КПБ Мікалай Дземянцей, а яго першым намеснікам — старшыня Дэмакратычнага блока Станіслаў Шушкевіч. Зянон Пазьняк узначаліў нешматлікую, але згуртаваную фракцыю БНФ у складзе Дэмакратычнага блока. Старшынёю Савета Міністраў БССР быў прызначаны Вячаслаў Кебіч.

Паўсюдныя выпадкі парушэння палажэння аб выбарах, нават фальшаванне вынікаў, асабліва ў правінцыі, давялі да далейшага абвастрэння дачыненняў паміж дзеячамі БНФ і камуністычнымі ўладамі. 11 траўня Сойм БНФ — вярхоўны орган гэтай арганізацыі паміж з'ездамі, зрабіў змены ў сваёй праграме. З гэтай пары мэтай БНФ стала дасягненне поўнай незалежнасці рэспублікі і выхад яе са складу СССР. Частка дзеячоў БНФ падтрымоўвала праект стварэння Балтыйска-Чарнаморскай федэрацыі, у якой апрача Беларусі апынуліся б Украіна, Летува і Латвія. Канферэнцыя БНФ (форма нечарговага з'езда), якая адбылася ў Менску 30 чэрвеня, адназначна выказалася за незалежнасць, перагледзела сваё стаўленне да "ленінскай нацыянальнай палітыкі", прызнаўшы яе антынацыянальнай і антыгуманнай. Дэлегаты вылучылі пастулат нацыяналізацыі маёмасці КПСС і камсамолу ў Беларусі, адмены партыйнага кантролю над сродкамі масавай інфармацыі, арміяй, асветай і прадпрыемствамі[9].

---

[9] Darski J. Białoruś. Historia, współczesność, konflikty narodowe. Warszawa, 1993. S. 41.

27 ліпеня 1990 года дзякуючы намаганням апазіцыі Вярхоўны Савет прыняў "Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце БССР" у складзе савецкай федэрацыі. Зрабіць такі крок вымусіла яго і вонкавая сітуацыя, асабліва абвяшчэнне незалежнасці Расеяй. Згаданае рашэнне хоць і не вынікала з пераканання і волі большыні дэпутатаў, але адкрыла Беларусі шлях да сапраўднай незалежнасці. Праўда, большасць беларускага грамадства тады яшчэ не была зацікаўленая суверэнітэтам[10].

У 12-м артыкуле дэкларацыі сцвярджалася, што "любыя гвалтоўныя дзеянні супраць нацыянальнай дзяржаўнасці Беларускай ССР з боку палітычных партый, грамадскіх аб'яднанняў ці асобаў пераследуюцца па законе". Выступаць ад імя народа дэкларацыя дазваляла толькі Вярхоўнаму Савету БССР (арт. 2). На тэрыторыі Беларусі яна ўстанаўлівала зверхнасць Канстытуцыі і законаў БССР (арт. 7). Пацвярджаўся прыярытэт беларускай мовы ў якасці дзяржаўнай на тэрыторыі рэспублікі. Дэкларацыя давала ўраду права стварыць нацыянальную армію, рэспубліканскую міліцыю і службы бяспекі (арт. 10). Камуністы прагаласавалі таксама за 11-ы артыкул пра неабходнасць падпісання новай саюзнай дамовы паміж рэспублікамі, якія ўваходзілі ў склад Савецкага Саюза. Дэпутаты ад БНФ, якія выступалі супраць якіх-колечы новых саюзаў з Расеяй, не ўдзельнічалі ў гэтай частцы пасяджэння.

27 ліпеня было аб'яўлена святочным нерабочым днём.

Галоўным штуршком, які паўплываў на хаду падзеяў у Беларусі, сталі змены ў Расеі. Дэманстратыўны выхад Барыса Ельцына з КПСС выклікаў у Беларусі масавую здачу партыйных білетаў. У многіх заводскіх і мясцовых структурах КПБ засталіся толькі штатныя работнікі. Пад час апошняга, XXXI з'езда КПБ яе лідэр Яфрэм Сакалоў падняў трывогу, што калектывізм і інтэрнацыяналізм у Беларусі выцясняюцца сепаратызмам і нацыяналізмам. Сапраўды, партыя, як толькі перастала быць галоўным элементам дзяржаўнага апарату, а сяброўства ў ёй — неабходнай умовай навуковай, прафесійнай або палітычнай кар'еры, апынулася ў становішчы развалу.

Апрача КПБ і БНФ у 1990—1992 гадах у Беларусі з'явілася

---

[10] У рэферэндуме 17 сакавіка 1991 г. 83 % жыхароў Беларусі выказаліся за прыналежнасць да СССР.

шмат арганізацыяў, якія імкнуліся стаць палітычнымі партыямі. БНФ, на думку яго кіраўніцтва, не быў партыяй, а толькі грамадскім рухам, у якім маглі дзейнічаць прадстаўнікі розных палітычных плыняў — прыхільнікі незалежнасці Беларусі.

У чэрвені 1990 года ўзнікла Нацыянальна-дэмакратычная партыя Беларусі (НДПБ). Гэта была нацыяналістычная арганізацыя, якая супрацоўлялася ўсялякаму супрацоўніцтву з камуністамі. Сяброўства ў НДПБ абумоўлівалася доказам прыналежнасці да беларускага народа і веданнем роднай мовы. Галоўнай мэтай партыя абвяшчала змаганне за поўную незалежнасць і нацыянальнае адраджэнне. Яе кіраўнікі Алесь Емяльянаў і Віктар Навуменка засяроджваліся галоўным чынам на прыцягненні ў свае шэрагі моладзі. Пасля некалькіх гадоў малапрыкметнай дзейнасці партыя знікла з палітычнай карты Беларусі.

Нашмат большую ролю мелася адыграць Аб'яднаная дэмакратычная партыя Беларусі (АДПБ), якая паўстала ў лістападзе 1990 года ў выніку аб'яднання некалькіх арганізацыяў ліберальнага ўхілу з Горадні, Менска і Віцебска. АДПБ у сваёй дзейнасці кіравалася прынцыпам першаснасці інтарэсаў адзінкі над інтарэсамі грамадскіх і нацыянальных групаў. Партыя падтрымоўвала працэс беларусізацыі, аднак супраціўлялася парушэнню інтарэсаў расейскамоўнага насельніцтва. У гаспадарчай галіне ліберады ад АДПБ прапанавалі магчыма хуткую і ўсеагульную прыватызацыю ўсёй нацыянальнай маёмасці. Пераважную групу ў партыі складала тэхнічная інтэлігенцыя, юрысты і чыноўнікі. На II з'ездзе АДПБ у лістападзе 1991 года былі падтрыманы тыя дзеянні, якія вялі да ўмацавання незалежнасці дзяржавы. Новым старшынёй партыі стаў народны дэпутат СССР Аляксандар Дабравольскі.

Дзеячы БНФ Міхась Ткачоў, Алег Трусаў, Мікалай Крыжаноўскі выступілі ініцыятарамі стварэння вясной 1991 года левацэнтрысцкай Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады (БСДГ). БСДГ выказвалася за незалежнасць Беларусі, аднак не адпрэчвала на той час магчымасці стварэння нейкай формы федэрацыі з іншымі краінамі, якія належалі да СССР. Грамадская і гаспадарчая праграма прадугледжвала магчымасць паступовай прыватызацыі нацыянальнай маёмасці, аднак пры ўмове забеспячэння бясплатнай аховы здароўя і адукацыі, а таксама стварэння прыстойных умоваў для пенсіянераў і маламаёмасна-

га насельніцтва. Старшынёю БСДГ стаў Міхась Ткачоў, а пасля ягонай смерці ў кастрычніку 1992 года — Алег Трусаў. БСДГ мела сваю фракцыю (15 дэпутатаў) у Вярхоўным Савеце.

Заснавальнікам Беларускай сялянскай партыі (БСП) быў адстаўны палкоўнік Савецкай Арміі Яўген Лугін. БСП патрабавала вяртання зямельнай уласнасці і такой дзяржаўнай палітыкі, якая спрыяла б станаўленню фермерскіх гаспадарак, выказвалася за незалежнасць, прафесійную армію і захаванне нейтральнасці беларускай дзяржавы. Слабасцю гэтай партыі было тое, што большасць яе сяброў не мела дачынення да сялянскага асяроддзя. Да яе праграмы не праявілі цікавасці ні калгаснікі, ні калгасная наменклатура. Апошняя, якая распараджалася гаспадаркамі на некалькі тысяч гектараў, бюджэтнымі датацыямі, вялікім уплывам у мясцовых уладных структурах і амаль дармовай рабочай сілай, не баялася банкруцтва. А калгаснікі ў сваю чаргу ўжо, як правіла, не імкнуліся працаваць на ўласных гаспадарках. Яны не валодалі адпаведнай інфраструктурай: будынкамі, прыладамі, машынамі, цяглавай сілай, неабходнай для аднаасобнага гаспадарання. Прапагандаваная БСП ідэя сямейна-фермерскіх гаспадарак не знаходзіла шмат прыхільнікаў.

Створаная ў чэрвені 1991 года Беларуская хрысціянска-дэмакратычная злучнасць (БХДЗ) абвясціла сябе пераемніцай Беларускай хрысціянскай дэмакратыі, якая дзейнічала ў II Рэчы Паспалітай. У злучнасці пераважала інтэлігенцыя каталіцкага веравызнання, але былі там і прадстаўнікі праваслаўных і пратэстанцкіх колаў. Сваёй мэтай БХДЗ дэкларавала пабудову хрысціянскай мадэлі грамадскага жыцця, якая характарызавалася б дэмакратычным спосабам станаўлення ўлады, павагай да прыватнай уласнасці, палітычным плюралізмам і сацыяльным забеспячэннем маламаёмасных. Але вялікай актыўнасці ў ёй не было, і партыя паступова сышла з палітычнай арэны.

У канцы 1991 года ў Беларусі існавала 20 арганізацыяў, якія лічылі сябе палітычнымі партыямі. Паводле словаў лідэраў, яны налічвалі па некалькі сотняў сяброў. У сапраўднасці ў большасці гэтых арганізацый актыўна дзейнічалі па некалькі дзесяткаў асобаў. У сярэдзіне 1993 года адбылася фармальная рэгістрацыя палітычных партый. Неабходныя дакументы — статут, праграму і спісы мінімум 500 сяброў — здолелі падаць

12 арганізацый. У іх ліку былі таксама экалагічныя рухі, напрыклад Партыя зялёных, і згуртаванне расейскіх нацыяналістаў Славянскі сабор "Белая Русь".

Большасць лідэраў беларускіх апазіцыйных партый найважнейшай справай незалежнай дзяржавы лічылі стварэнне нацыянальнай арміі. Толькі 20 % афіцэраў, размешчанай у Беларусі Савецкай Арміі былі беларусамі. Больш за палову афіцэрскага корпуса складалі расейцы, 20 % — украінцы[11]. Тым часам некалькі тысяч беларускіх афіцэраў служылі ў гарнізонах па ўсёй тэрыторыі Савецкага Саюза за межамі бацькаўшчыны. У кастрычніку 1991 года з ініцыятывы БНФ і БСДГ адбыўся першы з'езд беларускіх вайскоўцаў, у якім удзельнічалі прадстаўнікі большасці савецкіх гарнізонаў. З'езд заснаваў Беларускае згуртаванне вайскоўцаў (БЗВ), якое ўзначаліў сацыял-дэмакратычны дзяяч, падпалкоўнік Мікола Статкевіч. Мэтай БЗВ было стварэнне беларускага нацыянальнага войска і абарона суверэнітэту Беларусі.

Рэальная ўлада ў арміі, якая дыслакавалася на тэрыторыі Беларусі, заставалася ў руках савецкіх генералаў. Генералы давалі прысягу Савецкаму Саюзу і з новай дзяржавай не мелі і не хацелі мець нічога супольнага. Канфлікт паміж БЗВ і расейскімі генераламі быў непазбежны. У выніку прыдзірлівасці начальства частка сяброў БЗВ мусіла пакінуць вайсковую службу. Толькі ў лютым 1992 года з прапановы дэпутатаў ад БНФ і Дэмакратычнага блока Вярхоўны Савет з невялікай перавагай галасоў прыняў пастанову аб падпарадкаванні размешчанага на тэрыторыі Беларусі войска ўраду рэспублікі. Парламент ухваліў таксама тэкст новай прысягі, якая адгэтуль давалася на вернасць Рэспубліцы Беларусь і яе народу. Расейскія афіцэры, якія адмовіліся даць новую прысягу, не былі адразу звольненыя з вайсковай службы, хоць гэтага дамагаліся дэпутаты ад БНФ.

Палітычным пераломам на тэрыторыі СССР, у тым ліку і ў Беларусі, стала няўдалая спроба ваеннага путчу ў Маскве ў жніўні 1991 года. Партыйны апарат імкнуўся вярнуць камуністычны лад, які панаваў да гарбачоўскай перабудовы. Ён атрымаў падтрымку часткі беларускай наменклатуры, у тым ліку некаторых камандзіраў Беларускай ваеннай акругі — генера-

[11] Запруднік Я. Беларусь на гістарычных скрыжаваннях. С. 166.

лаў Анатоля Кастэнкі і Паўла Казлоўскага. На баку путчыстаў былі таксама старшыня Вярхоўнага Савета Мікалай Дземянцей, новы першы сакратар ЦК КПБ Анатоль Малафееў, міністр юстыцыі Леанід Лашук і намеснік міністра нутраных спраўаў Віктар Кавалёў. Палітыку чакання абралі шэф беларускага КДБ Эдуард Шыркоўскі і прэм'ер-міністр Вячаслаў Кебіч. 20 жніўня, калі вызначаўся лёс старога ладу, а таксама Гарбачова, Ельцына і Савецкага Саюза, Кебіч загадаў падначаленым сабе чыноўнікам устрымацца ад выканання загадаў з Масквы.

19—21 жніўня БНФ, сацыял-дэмакраты і лібералы арганізавалі масавыя дэманстрацыі ў абарону незалежнасці, на якія войска, міліцыя і КДБ не адрэагавалі[12]. Паведамленні з Масквы пра перамогу прэзідэнта Расеі Барыса Ельцына над путчыстамі і прыпыненне дзейнасці КПСС выклікалі паніку сярод беларускай наменклатуры. Камуністы, баючыся рэпрэсій з боку лагера Ельцына, ухвалялі ўсе незалежніцкія прапановы, якія вылучаў Беларускі народны фронт.

Нечарговая сесія Вярхоўнага Савета, скліканая 24 жніўня па патрабаванні дэпутатаў ад БНФ, з прапановы камуністычных парламентароў Аляксандра Лукашэнкі і Віктара Ганчара адклікала з пасады старшыні Вярхоўнага Савета Мікалая Дземянцея. Абавязкі старшыні перайшлі да яго намесніка Станіслава Шушкевіча. На другі дзень парламентары прынялі пастанову аб выхадзе Беларусі з складу СССР і абвясцілі незалежнасць дзяржавы. Вярхоўны Савет забараніў дзейнасць палітычных партый на прадпрыемствах, у войску і адміністрацыі ды загадаў беларускаму Міністэрству нутраных спраўаў парваць усялякія сувязі з гэтакім жа ўсесаюзным ведамствам. Тады ж была забаронена дзейнасць КПБ і камсамола.

28 жніўня 1991 года прэм'ер-міністр Вячаслаў Кебіч асудзіў падтрымку, аказаную беларускімі камуністамі правадырам маскоўскага путчу і разам з членамі свайго Кабінета абвясціў пра выхад з кампартыі. На дзень пазней Вярхоўны Савет прыпыніў дзейнасць КПСС на тэрыторыі Беларусі. За гэтую пастанову прагаласавалі таксама камуністычныя дэпутаты. Кароткі час БНФ быў самай значнай арганізаванай і легальнай палітычнай сілай у Беларусі.

---

[12] Мікалайчанка А. Эпіцэнтр, што прывёў Беларусь да свабоды // Полацак. 1991. № 9. С. 6.

Пад час другой нечарговай сесіі Вярхоўнага Савета, якая адбылася 17—19 верасня, старшынёй і заадно кіраўніком дзяржавы быў выбраны падтрыманы Беларускім народным фронтам Станіслаў Шушкевіч. Парламент памяняў найменне дзяржавы на Рэспубліку Беларусь, вярнуў старажытную нацыянальную сімволіку — герб "Пагоня" і бел-чырвона-белы сцяг. Аднак апазіцыйныя сілы ў Вярхоўным Савеце былі занадта малалікія, каб пераняць выканаўчую ўладу.

На працягу некалькіх месяцаў пасля жнівеньскіх падзеяў у Маскве палітычная сітуацыя ў Беларусі стабілізавалася. Колішняя наменклатура, якая пераўтварылася ў калектыў беспартыйных спецыялістаў, пачала ствараць "рэгуляваную рынкавую эканоміку"[13]. Гэтаксама як і ў Расеі, хутка павялічвалася маёмасць асобаў, звязаных з уладнымі элітамі. Сістэма канцэсій, дазволаў, мытных льготаў, фіктыўных кантрактаў стварала заблытаны вузел нефармальных сувязяў на сутыку гаспадаркі і палітыкі[14]. "Рэгуляваная рынкавая эканоміка" давала магчымасць удзельнічаць у станаўленні гаспадарчых працэсаў зусім невялікай колькасці грамадзян, галоўным чынам звязаных з уладнымі структурамі. Залежнасць гаспадарчых суб'ектаў у Беларусі ад расейскіх сыравінных і паліўных рэсурсаў ды расейскіх рынкаў збыту прымушала ўрад Кебіча наноў усталёўваць парваныя сувязі з Масквой.

Былыя члены КПСС сталі цяпер шчырымі прыхільнікамі дэмакратыі і палітычнага плюралізму. Дэмакратыі ў Беларусі, на іх думку, пагражала сур'ёзная небяспека з прычыны прыпынення дзейнасці камуністычнай партыі і патрабаванняў нацыяналізацыі партыйнай і камсамольскай маёмасці. Заўзятымі абаронцамі маёмасных правоў арганізацыі камуністычнай моладзі аказаліся дэпутаты Аляксандар Лукашэнка ды Анатоль Лябедзька[15]. У выніку іх намаганняў Ленінскі Камуністычны саюз моладзі Беларусі, перайменаваны ў Саюз моладзі Беларусі (СМБ), захаваў свае структуры, памяшканні, бюджэтныя датацыі і вя-

[13] Тым тэрмінам карысталася каманда Кебіча пры фармулёўцы праграмы гаспадарчага развіцця летам 1991 года // Советская Белоруссия. 1991. 21 июля.

[14] Owsiannik S., Striełkowa J. Władza a społeczeństwo. Białoruś 1991—1998. Warszawa, 1998. S. 49—62.

[15] Лукашенко А. Демократия и сегодня под угрозой // Знамя юности. 1991. 6 сент.

лікую маёмасць. Праз некалькі гадоў СМБ стане моцным звяном выбарчага штаба Лукашэнкі пад час ягонай прэзідэнцкай кампаніі.

Кантроль урада Кебіча за гаспадаркай і сродкамі масавай інфармацыі ставіў апазіцыю, асабліва БНФ, у вельмі нявыгаднае становішча. Рэжымная прапаганда сістэматычна ўнушала грамадству, што няўхільнае пагаршэнне матэрыяльнай сітуацыі — гэта вынік дэмакратыі, перарваных саюзных сувязяў і нязгоды апазіцыі папраўляць гаспадарку. Увосень 1991 года не было ўжо ніякіх шанцаў, каб шляхам парламенцкіх дзеянняў замяніць урад Кебіча. Вярхоўны Савет, у якім пераважалі прадстаўнікі намеклатуры, лічыў гэты ўрад фактарам, які стабілізуе эканамічнае і палітычнае становішча ў Беларусі.

8 снежня Станіслаў Шушкевіч разам з прэзідэнтамі Расеі Барысам Ельцыным і Украіны Леанідам Краўчуком падпісалі пагадненне аб фармальнай ліквідацыі СССР і стварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД). Новая дамова давала Расеі права трымаць сваю армію на тэрыторыі Беларусі і абавязвала Беларусь каардынаваць замежную палітыку з Масквой. Гэта стала прычынай сур'ёзнага расколу ў самой апазіцыі. БНФ лічыў, што інтарэсы Беларусі патрабуюць унікаць якіх-колечы палітычных і ваенных сувязяў з Расеяй, а падпісанае Шушкевічам пагадненне абмяжоўвала суверэнітэт рэспублікі. БСДГ і АДПБ мелі сваю думку на гэты конт, адначасова яны стварылі блок партый і арганізацый "Новая Беларусь".

Сацыял-дэмакраты і лібералы лічылі, што без БНФ ім будзе лягчэй паразумецца з наменклатурай і распрацаваць праграму рэформы, якая дазволіла б стрымаць лавіну гаспадарчага крызісу. Партыі, якія ўваходзілі ў склад "Новай Беларусі", чакалі прапановы правядзення беларускага "круглага стала" і перадачы наменклатурай часткі ўлады і ўплываў апазіцыі. Аднак такога не адбылося, і БСДГ ды АДПБ вярнуліся да супрацоўніцтва з БНФ і далучыліся да акцыі збору подпісаў пад патрабаваннем роспуску Вярхоўнага Савета і абвяшчэння новых парламенцкіх выбараў. Апазіцыйныя партыі меркавалі, што ў той эканамічнай сітуацыі ім будзе лёгка атрымаць перамогу на выбарах, а потым адклікаць карумпаваны ўрад Кебіча.

У адпаведнасці з дзейным заканадаўствам для адклікання Вярхоўнага Савета трэба было сабраць 350 тысяч подпісаў выбаршчыкаў. У красавіку 1992 года апазіцыя даставіла ў Цэнтральную выбарчую камісію 450 тысяч подпісаў грамадзян, якія

патрабавалі абвяшчэння новых парламенцкіх выбараў. Справа трапіла на разгляд у Вярхоўны Савет. Парламент незалежнай Беларусі, ігнаруючы ўстаноўленыя ім жа законы, пераважнай большасцю галасоў адкінуў магчымасць правядзення рэферэндуму. Супраць гэтай акцыі выступіў таксама старшыня Вярхоўнага Савета Станіслаў Шушкевіч, які шукаў паразумення з прэм'ер-міністрам Кебічам і апорай прэм'ера — былымі камуністамі. Шушкевіч верыў, што парламент пад ягоным кіраўніцтвам — надзейны вартавы незалежнасці, здольны правесці структурныя рэформы.

29 кастрычніка 1992 года Шушкевіч быў абраны старшынёй Канстытуцыйнай камісіі, якая мусіла падрыхтаваць законапраект аб дзяржаўным ладзе Беларусі. Канфлікт паміж апазіцыяй і парламенцкай бальшынёю, якая падтрымоўвала Кебіча, разгарэўся вакол пытання прэзідэнцтва. Лагер улады, спадзеючыся на перамогу Кебіча на прэзідэнцкіх выбарах, імкнуўся надаць кіраўніку дзяржавы як мага большыя паўнамоцтвы. Апазіцыя, баючыся вяртання камуністычнай дыктатуры, у якой пасада першага сакратара партыі была б заменена прэзідэнтурай, намагалася мінімалізаваць значэнне кіраўніка дзяржавы. На думку дэпутатаў ад БНФ, палітычная традыцыя Беларусі патрабавала парламенцкага кіравання. Праўрадавая большасць, аднак, прыняла такі варыянт канстытуцыі, у якой будучы прэзідэнт надзяляўся правам поўнага кантролю выканаўчай улады, прызначаў членаў урада, старшыняў Вярхоўнага Суда, Канстытуцыйнага Суда і Нацыянальнага банка (арт. 100). Праўда, усе названыя пасады патрабавалі на тое згоды парламента.

У чэрвені 1992 года былі зарэгістраваныя Партыя камуністаў Беларусі і Аб'яднаная аграрна-дэмакратычная партыя Беларусі. Апошняя бараніла інтарэсы дырэктароў калгасаў і саўгасаў і выступала супраць усялякіх формаў раздзяржаўлення зямлі. У красавіку 1992 года ўзнікла Партыя народнай згоды, сябрамі якой стала частка наменклатуры ніжэйшых інстанцыяў, зацікаўленая і правядзеннем прыватызацыі, і ўзмацненнем беларускіх дзяржаўных структураў. Увесну 1993 года дырэктары вялікіх прадпрыемстваў заснавалі Беларускі навукова-вытворчы кангрэс — партыю, якая гэтаксама як і прэм'ер-міністр Кебіч, выказвалася за захаванне шчыльных палітычных і гаспадарчых сувязяў з Расеяй.

У 1992 годзе былая партыйная і дзяржаўная наменклатура

ўжо ўяўляла сабой даволі кансалідаваны лагер, згуртаваны вакол прэм'ер-міністра Кебіча. Яна кантралявала фінансы, эканоміку, сродкі масавай інфармацыі, усе дзяржаўныя ўстановы, мела абсалютную бальшыню ў Вярхоўным Савеце. У такой сітуацыі Кебіч мог дазволіць сабе поўнасцю ігнараваць апазіцыю. На кіраўнічыя пасады ў арміі вярнуліся генералы, якія раней абвінавачваліся ва ўдзеле ў змове супраць Гарбачова. Анатоль Кастэнка стаў першым намеснікам міністра, а Павел Казлоўскі — міністрам абароны. Казлоўскі замяніў на гэтай пасадзе генерала Пятра Чавуса — прыхільніка стварэння беларускай нацыянальнай арміі.

20 ліпеня 1992 года Кебіч падпісаў з прэм'ер-міністрам Расеі Ягорам Гайдарам шэраг ваенных дамоваў, якія забяспечвалі шчыльную мілітарную сувязь абедзвюх дзяржаў. З гэтае прычыны дайшло да рознагалосся паміж Кебічам і старшынёй Вярхоўнага Савета Станіславам Шушкевічам. На думку Шушкевіча, падпісаныя прэм'ер-міністрам пагадненні моцна абмяжоўвалі суверэнітэт Беларусі.

На пачатку 1993 года беларуская армія налічвала 130 тысяч вайскоўцаў. Большасць камандзіраў складалі расейцы. Тым часам 13 тысяч беларускіх афіцэраў, якія праходзілі службу на тэрыторыі Расеі і іншых былых савецкіх рэспублік, заявілі пра сваё жаданне служыць у беларускім нацыянальным войску. Прынятая ў снежні 1992 года праграма рэарганізацыі ўзброеных сілаў прадугледжвала скарачэнне колькасці арміі да 60 тысяч. Абарончую сістэму Беларусі мела дапаўняць 100-тысячная расейская армія, дыслакаваная на тэрыторыі краіны. Улетку 1992 года генерал Чавус спрабаваў падпарадкаваць расейскія гарнізоны беларускаму Міністэрству абароны, аднак гэтая акцыя закончылася ягонай адстаўкай.

У арміі, якой камандавалі Кастэнка і Казлоўскі, неўзабаве пачалася чыстка. У выніку яе войска развіталася з тымі афіцэрамі, якія выказваліся за незалежнасць і дэсаветызацыю. Сяброў Беларускага згуртавання вайскоўцаў масава пераводзілі на ніжэйшыя пасады, пазбаўлялі кантактаў з жаўнерамі або проста звальнялі з службы. У траўні 1993 года звальненне атрымаў старшыня БЗВ падпалкоўнік Мікола Статкевіч, якога абвінавацілі ў "дыскрэдытацыі афіцэрскага гонару". Прычынай абвінавачання стала ўскладанне ім разам з лідэрамі апазіцыйных партый вянкоў да помніка ахвярам Менскага гета ў той час,

калі адбываліся афіцыйныя ўрачыстасці з нагоды дня перамогі над фашызмам. Расейскія генералы не маглі цярпець беларускай мовы і нацыянальных сімвалаў у арміі. Актыўна дзейнічаў Саюз афіцэраў Беларусі (САБ), заснаваны з ініцыятывы генерала Казлоўскага ў красавіку 1992 года ў процівагу БЗВ. САБ не ўнікаў палітыкі. Ён быў калектыўным сябрам новага посткамуністычнага палітычнага блока — Народнага руху Беларусі, патрабаваў змяніць у канстытуцыі запіс аб мовах і надаць расейскай мове статус дзяржаўнай.

26 сакавіка 1993 года Вярхоўны Савет пачаў дэбаты па вызначэнні палітычнага статусу дзяржавы. Камуністычныя дэпутаты, аб'яднаныя ў дзвюх фракцыях "Саюз" і "Беларусь", распараджаліся амаль 90 % мандатаў і сталі моцным палітычным апірышчам для прэм'ер-міністра Кебіча. Хоць старшыня Вярхоўнага Савета Станіслаў Шушкевіч не згаджаўся з незалежніцкімі канцэпцыямі БНФ і выказваўся за канфедэрацыю былых савецкіх рэспублік, ён, аднак, супраціўляўся падпісанню вайскова-палітычнай дамовы з Расеяй, бо гэта ішло насуперак ранейшым пастановам парламента аб нейтралітэце дзяржавы. Шушкевіч, намагаючыся замарудзіць ратыфікацыю падпісаных прэм'ер-міністрам трактатаў з Расеяй, прапанаваў правесці па гэтым пытанні ўсенародны рэферэндум. Фракцыі "Саюз" і "Беларусь" адхілілі прапанову старшыні і абавязалі яго як кіраўніка дзяржавы распісацца пад ратыфікаванымі дакументамі.

Працэс інтэграцыі Беларусі і Расеі праходзіў незвычайна марудна, а тармазіў яго расейскі бок. Кіруючыя віцэ-прэм'еры Сяргей Шахрай і Ягор Гайдар, якія кіравалі расейскімі фінансамі і эканомікай, лічылі трактат з Беларуссю лішнім абцяжараннем Расеі. Расейцы, хоць і не спяшаліся даваць датацыі для крызіснай беларускай гаспадаркі, былі, аднак, зацікаўленыя ў захаванні палітычнага і мілітарнага кантролю за гэтай тэрыторыяй, пакідаючы за Кебічам поўную свабоду развязання нутраных пытанняў. З вядомых прычынаў Расея не была зацікаўленая ростам значэння згуртаванай вакол Беларускага народнага фронту нацыянальнай і празаходняй апазіцыі. Інтэграцыйнаму працэсу не спрыялі таксама кастрычніцкія падзеі ў Маскве і драма вакол тамтэйшага парламента. Шушкевіч падтрымаў прэзідэнта Ельцына, а беларуская парламенцкая большасць — ягоных праціўнікаў Руцкога і Хазбулатава.

Восеньская сесія Вярхоўнага Савета, якая пачалася 9 ліста-

пада 1993 года, завяршала перыяд застою і таптання на адным месцы беларускай палітыкі. Дэпутаты фракцыяў "Саюз" і "Беларусь" паўторна прапанавалі заключыць пагадненне з Расеяй, якое б наблізіла абедзве краіны ў палітычным і гаспадарчым плане. Апазіцыя заклікала парламент да самароспуску і правядзення дэмакратычных выбараў. Сімвалам працы Вярхоўнага Савета ў 1993 годзе стала бясплённая дыскусія. У дзяржаве не развязваліся наспелыя праблемы. Уся рэальная ўлада апынулася ў руках Кебіча, які, аднак, не прапанаваў ніякіх спосабаў выхаду з эканамічнага крызісу, апрача ўлучэння беларускай фінансавай сістэмы ў расейскія структуры. За сабою ён пакідаў неабмежаваны кантроль на тэрыторыі фармальна незалежнай Беларусі. Усе сталі рыхтавацца да прэзідэнцкіх выбараў.

9 верасня БСДГ, АДПБ і БСП падпісалі ідэйна-праграмнае пагадненне "Вясна-94". Новая кааліцыя ад пачатку карысталася падтрымкай Станіслава Шушкевіча, які сярод ліберадаў і сацыял-дэмакратаў шукаў палітычнай апоры на час прэзідэнцкіх выбараў. Да кааліцыі не далучыўся БНФ — фармальнай прычынай быў прыняты кааліцыяй прынцып зверхнасці інтарэсу асобы над інтарэсам народа. У сапраўднасці "Вясну-94" і БНФ раз'ядноўвалі розныя канцэпцыі змагання за ўладу, а таксама стратэгічныя мэты. На думку сяброў "Вясны-94", актыўнае прапагандаванне лозунгаў нацыянальнага адраджэння ва ўмовах невялікага зацікаўлення гэтымі пытаннямі з боку беларускага грамадства не прадвяшчала поспеху на бліжэйшых выбарах. Для БНФ адрачэнне ад асноўных мэтаў было б перакрэсліваннем сэнсу існавання гэтай арганізацыі і прымірэннем з наяўным станам культуры і нацыянальнай свядомасці.

Пачатак 1994 года ў Беларусі быў незвычайна багаты на палітычныя падзеі. Прэзідэнцкія выбары, прадугледжаныя на чэрвень, прымушалі паасобныя лагеры да ўзмоцненай актыўнасці. У пачатку студзеня БНФ і Свабодныя прафсаюзы Беларусі спрабавалі арганізаваць усеагульную забастоўку з патрабаваннем адстаўкі прэм'ер-міністра Кебіча і хуткага правядзення гаспадарчых і структурных рэформаў. Тым часам Кебіч аб'ядноўваў вакол сябе ўсіх прыхільнікаў аднаўлення старога ладу ды інтэграцыі з Расеяй. Атачэнне прэм'ер-міністра палічыла, што сур'ёзнай перашкодай на шляху да аб'яднання з Расеяй з'яўляецца старшыня Вярхоўнага Савета Станіслаў Шушкевіч. Фармальна ад яго подпісу залежала прыняцце або адхіленне ўсіх

міждзяржаўных дакументаў. З асобай Шушкевіча былі звязаны міністр нутраных справаў Уладзімір Ягораў і шэф беларускага КДБ Эдуард Шыркоўскі. Прыхільнікі хуткай інтэграцыі з Расеяй фактычна пачалі адхіленне Шушкевіча ад пасады кіраўніка дзяржавы з адстаўкі абодвух сілавых міністраў. Зручнай прычынай для гэтага стала гэтак званая справа летувіскіх камуністаў, што жылі ў Менску, — Нікаласа Буракявічуса і Ёзаса Ермалавічуса, якіх шукалі летувіскія следчыя органы за здраду радзіме. Выдача летувісам уцекачоў моцна абурыла камуністычных дэпутатаў, якія паспешліва прагаласавалі за адстаўку міністра нутраных справаў і шэфа КДБ. Дэпутат Аляксандар Лукашэнка патрабаваў яшчэ прагаласаваць за адстаўку Станіслава Шушкевіча, але яго прапанова тады не была прынятая. Неўзабаве Аляксандар Лукашэнка як старшыня парламенцкай камісіі па барацьбе з карупцыяй атрымаў магчымасць вынесці больш красамоўныя аргументы супраць старшыні Вярхоўнага Савета. Ён абвінаваціў Шушкевіча ў раскраданні дзяржаўнай маёмасці — быццам бы шэф парламента не аплаціў рахункі вартасцю каля 100 даляраў за матэрыялы, якія пайшлі на будаўніцтва ягонага лецішча.

26 студзеня дэпутаты (209 галасоў "за" і 39 – "супраць") адклікалі Шушкевіча з займанай пасады. Праз некалькі дзён новым старшынёю Вярхоўнага Савета стаў генерал міліцыі Мечыслаў Грыб. 15 сакавіка Вярхоўны Савет ухваліў тэкст першай канстытуцыі незалежнай Беларусі.

Згаданае выступленне Аляксандра Лукашэнкі стала пачаткам яго маланкавай кар'еры. У якасці прызнання ён атрымаў магчымасць часцей выступаць на кантраляваным урадам тэлебачанні. Лукашэнка скарыстаў гэты шанец і пры кожнай нагодзе гаварыў людзям тое, што яны хацелі пачуць, — пра карупцыю сярод дзяржаўных чыноўнікаў, пра змову дэмакратаў, аб здрадніках, якія разам з замежнымі выведкамі разбурылі Савецкі Саюз. Нечакана ў посткамуністычным лагеры з'явілася асоба, якая ў рэйтынгах папулярнасці неўзабаве абагнала прэм'ер-міністра Кебіча, хоць за ім стаяў увесь прапагандысцкі апарат дзяржавы. Лукашэнка раней працаваў у сектары прапаганды камсамола, затым быў палітруком у памежных войсках. Потым нейкі час узначальваў саўгас, выконваючы адначасова абавязкі дэпутата Вярхоўнага Савета БССР. Пад час шматлікіх публіч-

ных выступленняў вясной 1994 года яму ўдалося стварыць вакол сябе міф чалавека з народа, які смуткуе з прычыны дэмаралізацыі палітычнай эліты суверэннай Беларусі.

У ліку сур'ёзных кандыдатаў на прэзідэнцкае крэсла апрача Аляксандра Лукашэнкі і прэм'ер-міністра Вячаслава Кебіча былі лідэр БНФ Зянон Пазьняк і Станіслаў Шушкевіч, якога падтрымоўвалі сацыял-дэмакраты, лібералы і некаторыя свабодныя прафсаюзы. У першай палове 1994 года, якраз у часе выбарчай кампаніі, беларуская гаспадарка апынулася ў катастрафічным становішчы. Усё гэта ўскладняла становішча Кебіча. Яго вобраз у вачах грамадства не змаглі паправіць сродкі масавай інфармацыі, якія безупынна паказвалі яго як пасланца лёсу, гаранта эканамічнай інтэграцыі з Расеяй. Амаль тое ж, што і Кебіч, казаў Лукашэнка, але ён мог яшчэ паказваць на вінаватых у складаным матэрыяльным становішчы грамадства. Апрача дэмакратаў, у спісе абвінавачаных за давядзенне гаспадаркі да зруйнавання былі таксама Кебіч і ягонае атачэнне. Станіслаў Шушкевіч, які выступаў з сацыял-дэмакратычнай праграмай, лічыўся палітыкам хісткім і нерашучым. Ён мог перш за ўсё спадзявацца на падтрымку інтэлігенцыі і часткі чыноўнікаў. Апелюючы да незалежніцкага электарату, Шушкевіч такім чынам змяншаў шанцы Пазьняка прайсці ў другі тур галасавання. Свайго кандыдата вылучыла Партыя камуністаў Беларусі. Яе лідэр і заадно кандыдат у прэзідэнты Васіль Новікаў зыходзіў з таго, што Кебіч не надта выразна выказваўся за ліквідацыю прыватнай уласнасці і не меў адпаведнай праграмы грамадскай апекі. Шостым прэтэндэнтам быў старшыня калгаса з Гарадзеншчыны Аляксандар Дубко.

Пераможцам першага тура выбараў 19 чэрвеня стаў Аляксандар Лукашэнка, які набраў 45 % галасоў. Фаварыта, прэм'ер-міністра Вячаслава Кебіча, хоць ён і прайшоў у другі тур, падтрымала толькі 17,4 % выбаршчыкаў. Кандыдаты дэмакратычнай апазіцыі Зянон Пазьняк і Станіслаў Шушкевіч агулам атрымалі 23 % галасоў. За Пазьняка галасавалі 13 %, а за Шушкевіча — 10 %. Васіль Новікаў атрымаў 5 % галасоў, Аляксандар Дубко — яшчэ меней.

10 ліпеня, паводле афіцыйных дадзеных, амаль 80 % выбаршчыкаў, што прыйшлі на выбарчыя ўчасткі, абралі першым прэзідэнтам Беларусі Аляксандра Лукашэнку. Грамадзяне Бе-

ларусі выразна выказаліся за радыкальныя змены, якія ў часе выбарчай кампаніі абяцаў прэзідэнт: за сумленную дзяржаву, грамадскую справядліваць і супраць рынкавай гаспадаркі.

Куды вядзе Беларусь Аляксандар Лукашэнка?

Першыя месяцы прэзідэнцтва Лукашэнкі прайшлі пад знакам фармавання апарату ўлады на аснове поўнасцю адданых новаму кіраўніку дзяржавы людзей. На кароткі час страцілі свае ранейшыя пасады некаторыя супрацоўнікі Кебіча. У кастрычніку пад выглядам удасканальвання дзяржаўнага апарату Лукашэнка атрымаў згоду Вярхоўнага Савета самастойна прызначаць кіраўнікоў мясцовай адміністрацыі. Праз некалькі тыдняў пасля выбараў прэзідэнт падаўся ў першае замежнае падарожжа. У Маскве ён паўтарыў яшчэ раз тое, што казаў пад час выбарчай кампаніі: ягонай палітычнай мэтай з'яўляецца палітычная, эканамічная і вайсковая інтэграцыя з Расеяй. Адначасова першыя рашэнні ў гаспадарчай галіне паказалі, што прэзідэнт, гэтаксама як ягоны папярэднік прэм'ер-міністр Кебіч, не меў ніякай праграмы выхаду з крызісу і здзяйснення перадвыбарчых абяцанняў.

1994 год быў перыядам далейшага скарачэння аб'ёмаў вытворчасці, раптоўнага росту цэнаў на тавары і паслугі, 50-працэнтавай інфляцыі штомесяц і працяглых прастояў на прадпрыемствах ад нястачы сыравіны і паліва, а ў многіх выпадках таксама ад адсутнасці попыту на выпушчаную прадукцыю. Беларускі ўрад з прычыны ўдзелу прэм'ер-міністра Кебіча ў прэзідэнцкай кампаніі не прымаў непапулярных рашэнняў наконт структурных зменаў у прамысловасці. Не змяніўся профіль вытворчасці заводаў-гігантаў, якія за савецкім часам працавалі на патрэбы імперыі. Замарожанне працоўнай структуры і ранейшых кірункаў вытворчасці давяло гэтыя прадпрыемствы да мяжы банкруцтва. Кошты вытворчасці ва ўмовах імпарту сыравіны і паліва сталіся прычынай таго, што вырабы гэтых заводаў страцілі канкурэнтаздольнасць нават на непераборлівым расейскім рынку. Апрача таго, у выніку параўнальна хуткай рэструктурызацыі расейскай прамысловасці рынак гэтай краіны папоўніўся сваімі таварамі, якія раней завозілі туды з Беларусі. Дзеля гэтага вытворчасць беларускай прамысловасці, асабліва

машынабудаўнічай і хімічнай, заставалася ляжаць на складах. Напрыклад, Менскі тактарны завод, які яшчэ ў 1993 годзе даваў на рынак 82 тысячы трактароў, у 1994 годзе ад недахопу вузлоў і дэталяў, энергіі і перш за ўсё збыту выпусціў толькі 43 тысячы машын. З палітычных прычынаў не абвяшчалася банкруцтва прадпрыемстваў, не ажыццяўлялася іх прыватызацыя, не скарачаліся аб'ёмы занятасці, а работнікам на некалькі тыдняў або месяцаў давалі бясплатныя адпачынкі. Такім чынам колькасць беспрацоўных не павялічвалася.

Раптоўны рост цэнаў на энерганосьбіты выклікаў далейшае няўхільнае скарачэнне іх спажывання. У 1994 годзе ў выніку ўвядзення Расеяй свабодных цэнаў кошт аднаго кубаметра прыроднага газу павялічыўся ў 11, а нафты — у 16 разоў. Доля паліва ў агульных коштах вытворчасці павялічылася з 13,5 % пры канцы 1993 года да 24,9 % у снежні 1994 года, а матэрыяльнага складніку — з 69,7 да 80,2 %. Наступствам гэтага стала радыкальнае зніжэнне заробкаў работнікаў, занятых у вытворчай сферы. У параўнанні з 1993 годам рэальная заробная плата панізілася на 25 %.

На пачатку 1994 года больш за 90 % вытворчасці выпускалі дзяржаўныя прадпрыемствы. У 1993 годзе пасля працяглых спрэчак Вярхоўны Савет прыняў закон, які дазваляў частковую прыватызацыю, аднак ні ўрад Кебіча, ні прызначаны Лукашэнкам кабінет Міхаіла Чыгіра не былі зацікаўленыя ў скарачэнні "сацыялістычных формаў уласнасці". Кебіч, як прэтэндэнт на прэзідэнцкую пасаду, баяўся грамадскіх наступстваў прыватызацыі. Лукашэнка супраціўляўся ёй з ідэалагічных прычынаў, бо ў прыватнай уласнасці бачыў крыніцу дэмаралізацыі ўлады і грамадства. Прэзідэнт, адчуўшы непрыхільнасць насельніцтва да рынкавай эканомікі, пачаў атакаваць яе прыхільнікаў. Быў уведзены строгі міліцыйна-чыноўніцкі кантроль прыватнай гаспадарчай дзейнасці. Амаль 300 тысяч малых гаспадарчых суб'ектаў аказаліся падпарадкаванымі прэзідэнцкай гаспадарчай стратэгіі, эканамічная філасофія якой палягала ў словах "рынкавы сацыялізм". Спосабам развязання ўсялякіх эканамічных пытанняў мела стаць дысцыпліна на ўсіх роўнях вытворчасці. У выніку адміністрацыйныя метады замянілі рынкавыя механізмы рэгулявання гаспадарчага жыцця.

Увосень 1995 года была апублікавана прэзідэнцкая "Праграма грамадска-гаспадарчага развіцця Беларусі да 2000 года",

якая прадугледжвала, між іншага, паляпшэнне фінансавага становішча дзяржавы, падвышэнне роўню жыцця грамадзян, усялякія дапамогі для беспрацоўных, поўнае забеспячэнне кватэрамі, датацыі для прамысловасці і сельскай гаспадаркі. "Праграма" была спісам нерэальных пажаданняў і служыла пашырэнню ўлады чыноўнікаў у сферы гаспадаркі, прычым ім стваралася магчымасць карыстацца матэрыяльнымі выгадамі ад гэтага нагляду. У асноўным план Лукашэнкі прадугледжваў вяртанне мадыфікаванага сацыялістычнага ладу з цэнтралізаваным кіраваннем эканомікай і элементамі капіталізму на яго ўзбочынах.

У 1995 годзе адмоўныя тэндэнцыі ў беларускай гаспадарцы паглыбіліся. Валавы нацыянальны прадукт знізіўся на 10 %, а 18 % прадпрыемстваў сталі нерэнтабельнымі. За дванаццаць месяцаў 1995 года намінальная заробная плата павялічылася ў 6,3 раза, а цэны на тавары і паслугі — у 8,1 раза. На практыцы гэта азначала чарговае зніжэнне рэальнай заробнай платы на 20,5 %[16]. Вынікам адмоўных працэсаў у эканоміцы стаў хуткі рост ценявой гаспадаркі. Значная частка грамадзян Беларусі атрымоўвала даход ад кантрабанды тавараў, якія завозіліся ў суседнія краіны або вывозіліся з іх, асабліва з Польшчы і Расеі. Ва ўмовах маланкавай інфляцыі ашчаджанне страціла сэнс, і таму людзі пачалі скупляць валюту, якая стала для іх своеасаблівым капіталаўкладаннем. У цяжкім становішчы апынуліся пенсіянеры, якія не маглі мець дадатковых крыніцаў даходу. Менавіта таму яны наймацней тужылі па Савецкім Саюзе і страчаным дабрабыце.

Сур'ёзнай крыніцай папаўнення сямейнага бюджэту для гараджанаў сталі зямельныя ўчасткі, якія можна было купіць па даступнай цане ў суседнім калгасе. Калгаснікі на прысядзібных участках гадавалі свіней і свойскіх птушак на свае патрэбы. Гэта быў параўнальна танны спосаб забеспячэння харчамі, тым больш што зямля апрацоўвалася амаль выключна з дапамогаю калгаснай сельгастэхнікі, а аплата гэтых паслугаў была нашмат ніжэйшая за сапраўдны кошт. У Беларусі амаль 30 % прадуктаў харчавання паходзіць з малых, пераважна 1-гектарных гаспадарак.

[16] Mironowicz E. Białoruś. Sytuacja ekonomiczna // Europa Środkowo-Wschodnia 1994—1995. Warszawa, 1997. S. 47.

Пераможаная на прэзідэнцкіх выбарах апазіцыя БНФ не адмовілася ад барацьбы за новы дзяржаўны лад. Нагодай для рэваншу сталі парламенцкія выбары, якія адбыліся вясною 1995 года. У лістападзе 1994 года арганізаваўся выбарчы блок незалежніцкіх і дэмакратычных партый, у які апрача БНФ увайшлі БСДГ, АДПБ, НДПБ і БСП. Палажэнне аб выбарах прадугледжвала падзел краіны на аднамандатныя акругі, таму было вырашана, што апазіцыя вылучыць па адным супольным кандыдаце ў кожнай акрузе.

Канец 1994 года стаўся вельмі багатым на падзеі. Дэпутат ад БНФ Сяргей Антончык абвінаваціў найбліжэйшых супрацоўнікаў прэзідэнта ў карупцыі, супрацоўніцтве з мафіяй і нелегальных гандлёвых гешэфтах. У адказ прэзідэнт выдаў распараджэнне аб забароне публікацыі выступлення С.Антончыка ў друку. Рэдактары газет, якія не падпарадкаваліся волі прэзідэнта, неўзабаве страцілі работу, некаторыя газеты выйшлі з "белымі плямамі". Гэта быў адначасова канец ілюзіяў і спадзеваў, што прэзідэнт з павагай будзе ставіцца да прынцыпаў дэмакратыі і законнасці.

Пасля некалькіх гадоў некаторай свабоды слова ў 1995 годзе сродкі масавай інфармацыі зноў сталі рупарам дзяржаўнай дактрыны. Красамоўным фактам было зняцце прэзідэнтам з пасады Іосіфа Сярэдзіча — галоўнага рэдактара "Народнай газеты" (фармальнага органа Вярхоўнага Савета). На практыцы выйшла, што парламенту не пад сілу запэўніць незалежнасць нават сваёй газеце. Пашырэнню ўлады прэзідэнта папярэднічала грунтоўная змена кадраў у цэнтральных установах і зліццё кампетэнцыяў прэзідэнцкай і дзяржаўнай адміністрацый. Лукашэнка вельмі хутка пазбавіўся ад тых супрацоўнікаў, якія хоць і паспяхова правялі ягоную выбарчую кампанію, аднак спрабавалі захаваць свае погляды на асноўныя пытанні дзяржаўнай палітыкі. Галоўным крытэрам кадравай палітыкі стала падвышэнне па службе людзей, асабіста адданых і паслухмяных. Беспасярэдняе ўмяшанне Лукашэнкі ў кадравыя справы не абмежавалася толькі цэнтрам, але датычыла таксама вобласцяў і раёнаў. На пачатку 1995 года сфармавалася гэтак званая "вертыкальная ўлада" ("вертыкаль") — сістэма дзяржаўнага кіравання на вайсковы ўзор.

Кантралюючы сродкі масавай інфармацыі, войска, спецслужбы і адміністрацыю, Лукашэнка мог ігнараваць заканадаў-

чыя органы і правасуддзе. У грамадскім уяўленні прэзідэнцкая ўлада зрабілася сінонімам дзяржаўнай улады, а парламент — месцам бясконцых і незразумелых спрэчак. Дэмакратыя стала сінонімам дэструкцыі ў палітычнай і эканамічнай сферах ды прычынай парушэння сацыяльнай бяспекі. Савецкае беларускае грамадства з некаторым выняткам гатовае было поўнасцю ўхваліць сістэму, якую стварaў Лукашэнка. Гэта была добра вядомая грамадзянам Беларусі сістэма, прызнаваная імі з сацыяльных прычын. Змаганне прэзідэнта з дэмакратамі не спараджала асаблівага грамадскага абурэння. Нават збіццё ў будынку парламента на загад Лукашэнкі апазіцыйных дэпутатаў ад БНФ спецыяльнымі аддзеламі міліцыі не выклікала вялікай рэакцыі ўнутры краіны. Пра тое, што дзеялася ў сядзібе Вярхоўнага Савета ў ноч з 12 на 13 красавіка 1995 года, насельніцтва Беларусі магло даведацца з замежных сродкаў масавай інфармацыі або з шматгадзінных скрыўленых выступленняў прэзідэнта па тэлебачанні. Паслядоўная манапалізацыя сродкаў масавай інфармацыі, мінімалізацыя значэння палітычных партый і парламента замацоўвалі перакананне грамадзян у тым, што нарэшце выбралі яны некага, хто "навядзе парадак" і верне — як абяцаў — савецкі дабрабыт.

Разам з выбарамі ў Вярхоўны Савет, прызначанымі на 14 траўня 1995 года, Лукашэнка прапанаваў правесці рэферэндум, які меўся быць паказнікам папулярнасці ягонай палітыкі. Грамадзяне мусілі адказаць на чатыры пытанні: ці падтрымоўваюць палітыку прэзідэнта, скіраваную на эканамічную інтэграцыю з Расеяй; ці хацелі б, каб расейская мова побач з беларускай атрымала роўныя правы; ці ўхваляюць адмену беларускіх нацыянальных сімвалаў; ці даюць прэзідэнту згоду на роспуск Вярхоўнага Савета, калі парламент парушыць канстытуцыю.

Напярэдадні выбараў прэзідэнт і людзі з яго атачэння адкрыта заклікалі байкатаваць выбары і браць удзел толькі ў рэферэндуме. Дзеля гэтага быў падрыхтаваны спецыяльны дакументальны фільм "Ненависть, или Дети лжи", які быццам бы на просьбы гледачоў да 14 траўня ажно два разы дэманстраваўся па тэлебачанні. Фільм быў "класічным" творам таталітарнай прапаганды, якая не нясе адказнасці ні за факты, ні за перадаваны змест. Рэжысёр фільма Юры Азаронак даказваў, што ў магілах у Курапатах ляжаць ахвяры беларускіх нацыяналістаў,

якія пад час гітлераўскай акупацыі забівалі там савецкіх грамадзян і жыдоў з усёй Еўропы. Нацыяналісты карысталіся такой жа сімволікай, як незалежная беларуская дзяржава. У фільме Азаронка калабаранты перыяду акупацыі прамаўлялі галасамі дэпутатаў — лідэраў БНФ. Апазіцыя не мела ніякіх рэальных магчымасцяў зняпраўдзіць хлусню, якой на працягу некалькіх дзён кармілі грамадства.

14 траўня было выбрана толькі 18 дэпутатаў, хоць у галасаванні ўдзельнічала 64,7 % выбаршчыкаў. А сталася гэта таму, што палажэнне аб выбарах прысвойвала дэпутацкі мандат толькі тым, хто ў аднамандатных акругах набраў больш за 50 % галасоў пры больш чым 50-працэнтавым удзеле выбаршчыкаў у галасаванні. За кожны мандат змагалася некалькі, а часам нават больш за дзесяць кандыдатаў, таму вызначэнне пераможцаў было вельмі складаным. У 42 акругах горада Менска не абралі ніводнага дэпутата. У сельскіх акругах адпаведную яўку выбаршчыкаў зябяспечвалі старшыні калгасаў і кіраўнікі мясцовай адміністрацыі, якія пакарысталіся багатым арсеналам савецкіх метадаў мабілізацыі грамадства.

Затое рэферэндум, у якім бралі ўдзел і расейскія таварышы ("помогали, чем могли")[17] завяршыўся перамогай Лукашэнкі. Больш за 75 % (паводле афіцыйных звестак) грамадзян, якія ўзялі ўдзел у галасаванні, станоўча адказалі на ўсе пытанні, пастаўленыя прэзідэнтам. Такім чынам ён атрымаў грамадскую згоду на ўзмацненне сваёй улады, умацаванне сувязяў з Расеяй і завяршэнне русіфікацыі краіны.

28 траўня адбыўся другі тур выбараў. На выбарчыя ўчасткі прыйшло 56 % выбаршчыкаў. Прадстаўнікі прэзідэнта зноў падказвалі, што лепей было б, каб парламент наогул не быў абраны. Апазіцыя ж не мела рэальнай магчымасці выказаць свой пункт гледжання ў сродках масавай інфармацыі ці якім іншым спосабам кантактаваць з грамадствам. Пасля двух тураў галасавання было выбрана 119 дэпутатаў, галоўным чынам у сельскіх акругах. У адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь парламент мог пачаць працу пры ўкамплектаванні 2/3 дэпутацкіх месцаў (поўны склад парламента — 260 дэпутатаў).

12 чэрвеня прэзідэнт Лукашэнка падпісаў указ аб новай дзяржаўнай сімволіцы, хоць у адпаведнасці з законам вынікі рэ-

[17] Славянский треугольник // Земляки. 1996. № 2. С. 108.

ферэндуму павінны папярэдне зацвердзіць парламент. Лукашэнка заявіў пра нелегітымнасць дзейнага Вярхоўнага Савета і адмовіў яму ў праве прымаць новыя законы. На яго думку, паўнамоцтвы парламента папярэдняга склікання скончыліся з моманту абвяшчэння новых выбараў. Аднак жа паводле канстытуцыі (арт. 91) паўнамоцтвы парламента папярэдняга склікання канчаюцца з моманту пачатку першай сесіі новаабранага Вярхоўнага Савета. На практыцы прэзідэнт ігнараваў пастановы вышэйшага заканадаўчага органа, прызнаючы зверхнасць сваіх указаў. Канстытуцыйны Суд, які лічыў папярэдні Вярхоўны Савет надалей паўнамоцным, не прызнаваў прэзідэнцкіх указаў. Чарговыя ўказы аспрэчваліся Канстытуцыйным Судом як неадпаведныя канстытуцыі. Паколькі Суд станавіўся галоўным абаронцам дэмакратыі, прэзідэнт прыгразіў чарговым рэферэндумам, на якім грамадзяне мелі выказацца пра яго кампетэнцыю.

Параза апазіцыі ў абодвух турах галасавання давяла да зменаў на беларускай палітычнай сцэне. Невялікія партыі, якія да гэтай пары супрацоўнічалі з БНФ, адыходзілі ад яго, змянялі лідэраў і ствараліновыя кааліцыі. Некалькі партый і груповак сацыял-дэмакратычнага кірунку стварылі Сацыял-дэмакратычны саюз, а дзве ліберальныя групоўкі заснавалі Аб'яднаную грамадзянскую партыю, якую ўзначаліў Станіслаў Багданкевіч — адхілены ад пасады старшыня праўлення Нацыянальнага банка. На чарговы тур дадатковых выбараў, прызначаных на 29 лістапада, апазіцыйныя сілы пайшлі аслабленыя партыйнымі міжусобіцамі. Апрача калгаснага лобі, якое прадстаўляла Аб'яднаная аграрна-дэмакратычная партыя Беларусі (30 мандатаў пасля травеньскіх выбараў), другой сілай у парламенце была Камуністычная партыя Беларусі (27 мандатаў). КПБ прапагандавала тыя ж лозунгі, што і прэзідэнт, аднак ніколі не дайшло да фармальнага паразумення паміж імі. Прычынай таму было нежаданне Лукашэнкі дзяліцца з кім-небудзь уладай. Апрача таго, лідэры добра арганізаванай і ўплывовай камуністычнай партыі маглі абагнаць яго ў прапагандаванні лозунгаў пра вяртанне ў савецкую рэчаіснасць. Праграмы шматлікіх арганізацыяў, якія ўдзельнічалі ў выбарах, напрыклад Славянскага сабору "Белая Русь", Саюза афіцэраў, Патрыятычнага руху Беларусі ці беларускай філіі Ліберальна-дэмакратычнай

партыі Жырыноўскага, у прынцыпе зводзіліся да падтрымкі палітыкі прэзідэнта.

29 лістапада 1995 года змаганне за 141 дэпутацкае месца распачалі 826 кандыдатаў. Лукашэнку патрэбны быў самы нізкі ўдзел выбаршчыкаў у галасаванні, бо ў выпадку адсутнасці выбранага парламента стварыліся б падставы для ўвядзення гэтак званага "прамога прэзідэнцкага кіравання". З гэтае прычыны ў беларускіх сродках масавай інфармацыі, гэтаксама як і ў траўні, паведамленні пра выбары з'яўляліся спарадычна. Прэзідэнт публічна заявіў, што нават калі і пойдзе на выбарчы ўчастак, абавязкова выкрасліць усіх кандыдатаў. У дзень выбараў звычайна нуднае беларускае тэлебачанне амаль безупынна дэманстравала выдатныя творы сусветнай кінематаграфіі.

Не зважаючы на інфармацыйную блакаду і безупыннае кампраметаванне інстытуцыі парламентарызму, грамадзяне Беларусі ўсё ж пайшлі на выбарчыя ўчасткі і ў двух турах дадатковых выбараў — 29 лістапада і 10 снежня — выбралі 79 дэпутатаў. Гэта былі пераважна беспартыйныя, падтрыманыя адміністрацыяй, камуністы і кандыдаты ад аграрнай партыі. У гарадах апазіцыя атрымала бясспрэчную перавагу, але з прычыны недастатковага (менш за 50 %) удзелу выбаршчыкаў у галасаванні яна не набыла дэпутацкіх мандатаў. У новым парламенце дэпутаты, які называлі сябе незалежнымі, распараджаліся 96 мандатамі. На першай сесіі 60 "незалежных" дэпутатаў стварылі фракцыю "Згода" для падтрымкі прэзідэнта.

Склад парламента стварыў шанец наладзіць гарманічныя дачыненні з прэзідэнтам на прынцыпе паслухмянага ўхвалення ягонай палітыкі і спосабу кіравання. Прыхільнікі незалежніцкай плыні складалі нязначны працэнт дэпутатаў. Вярхоўны Савет без супраціву ўхваліў чарговыя падпісаныя Лукашэнкам дакументы аб інтэграцыі з Расеяй. Выбраны старшынёю Вярхоўнага Савета прадстаўнік калгаснага лобі Сямён Шарэцкі, як і пераважная большасць парламента, згаджаўся з асноўнымі крокамі палітыкі прэзідэнта, скіраванымі на аднаўленне сувязяў з рэспублікамі былога Савецкага Саюза. Не было таксама прынцыповых разыходжанняў паміж парламенцкай большасцю і прэзідэнтам у справах нутраной палітыкі. Аднак канфлікт паміж імі нарастаў дзень пры дні.

Галоўнай крыніцай супярэчнасцяў паміж парламентам і прэзідэнтам стала лукашэнкаўская філасофія ўлады. Усе дзяржаў-

ныя органы ён прызнаў дапаможнымі ўстановамі сваёй адміністрацыі. Лукашэнка даводзіў, што яго выбралі 5 мільёнаў грамадзян, а за кожнага з дэпутатаў галасавалі ўсяго некалькі тысяч выбаршчыкаў. На ягоную думку, гэта яму, а не парламенту, па волі народа належаць большыя заканадаўчыя паўнамоцтвы.

У адпаведнасці з Канстытуцыяй 1994 года раўнапраўнай з прэзідэнтам уладай надзеленыя былі парламент, Канстытуцыйны Суд і Вярхоўны Суд. Апрача таго, парламент у выпадку сцверджання антыканстытуцыйных дзеянняў прэзідэнта мог адклікаць яго з займанай пасады (арт. 104). Неадпаведныя асноўным законам рашэнні прэзідэнта меў права аспрэчваць Канстытуцыйны Суд. Менавіта таму кожны з гэтых уладных цэнтраў мог пагражаць прагнаму да неабмежаванай улады Лукашэнку.

Затое Канстытуцыя цалкам і поўнасцю аддавала прэзідэнту кантроль за выканаўчым сектарам: адміністрацыяй, міліцыяй, спецслужбамі, арміяй, замежнай палітыкай. Прэзідэнцкія ўстановы — сакратарыят Савета бяспекі і адміністрацыя прэзідэнта (паводле ягоных жа ўказаў) — былі для Савета Міністраў вышэйстаячымі органамі. Таму ўказы Лукашэнкі, часта неадпаведныя Канстытуцыі і аспрэчаныя Канстытуцыйным Судом, на практыцы набывалі законную сілу. У 1996 годзе ігнараванне пастановаў Канстытуцыйнага Суда стала нормай паводзінаў Лукашэнкі. У Беларусі не было ніводнай сілы, ніводнага цэнтра ўлады, які змог бы прымусіць яго шанаваць законы. Толькі парламент большасцю галасоў мог адклікаць яго з прэзідэнцкага крэсла.

Ад самага пачатку Лукашэнку не быў патрэбны Вярхоўны Савет. Гэта вельмі добра разумела частка дэпутатаў, і думка пра адкліканне прэзідэнта, хоць выразна не фармулявалася, ад вясны 1996 года знаходзіла шораз больш прыхільнікаў[18]. Выкананне гэтага плана ўскладняла тое, што большасць дэпутатаў новаабранага Вярхоўнага Савета складалі былыя функцыянеры савецкай дзяржавы, прызвычаеныя да традыцый папярэдняй эпохі, калі парламенты служылі фігавым лістком усемагутнасці партыйнага апарату. Лукашэнка вярнуў добра вядомы гэтым

[18] Карпенка Г. Пытанне імпічменту абмяркоўваецца амаль усімі дэпутатамі // Свабода. 1996. 28 ліпеня.

дэпутатам спосаб ажыццяўлення ўлады. Навізной было прыніжэнне і высмейванне дэпутатаў у прэзідэнцкіх сродках масавай інфармацыі. А тыя не мелі рэальнай магчымасці абараняцца.

Да рокашу супраць прэзідэнта заахвочвалі дэпутатаў дэманстрацыі на вуліцах беларускай сталіцы. Заява аб маючым адбыцца 2 красавіка 1996 года ў Маскве падпісанні чарговых дакументаў пра стварэнне дзяржаўнай супольнасці Расеі і Беларусі стала прычынай 40-тысячнай дэманстрацыі ў Менску, на якой гучалі патрабаванні адстаўкі Лукашэнкі. Яе арганізатарамі была пазапарламенцкая апазіцыя — БНФ, сацыял-дэмакраты і лібералы. Яшчэ больш людзей выйшла на вуліцы 26 красавіка, у дзесятую гадавіну катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Аддзелы спецназа і КГБ арыштавалі тады сотні чалавек, а ў выніку вулічных сутычак сотні ўдзельнікаў дэманстрацыі атрымалі целавыя пашкоджанні[19].

Травень 1996 года стаў месяцам дэманстрацый пратэсту, якія адбыліся амаль ва ўсіх абласных гарадах рэспублікі. Прычынай гэтага стала пагаршэнне матэрыяльнага становішча большасці насельніцтва. Змаганне з дробнымі прыватнымі прадпрымальнікамі давяло да заняпаду большасць фірмаў, уласнікі якіх не здолелі дамовіцца з прадстаўнікамі прэзідэнцкай вертыкалі. У адпаведнасці з указам прэзідэнта ад 24 траўня 1996 года аб гаспадарчым кантролі пачалася абавязковая перарэгістрацыя ўсіх прыватных прадпрыемстваў. Атрыманне ліцэнзіі на далейшае вядзенне гаспадарчай дзейнасці звычайна патрабавала ўнясення неафіцыйнай аплаты на карысць адміністрацыі прэзідэнта. Указ стварaў асабліва выгадныя ўмовы для карупцыі, фармавання ценявых, цьмяных дачыненняў на сутыку ўлады і гаспадаркі.

У 1995 годзе ў Беларусі ўзнікла яшчэ адна форма ўласнасці — прэзідэнцкая, якая ахапіла найбольш прыбытковыя прадпрыемствы, рэстараны, будынкі. Адміністратар прэзідэнцкай уласнасці Іван Ціцянкоў пад выглядам забеспячэння патрэбаў адміністрацыі прэзідэнта па чарзе забіраў лепшыя будынкі ў Менску, якія пасля здаваліся ў арэнду фірмам пад офісы.

У найбліжэйшым атачэнні прэзідэнта апынуліся работнікі савецкай выведкі, КГБ і партыйнага апарату — Уладзімір Замя-

[19] Менская вясна 1996. Падкова-Лесна — Менск, 1996.

талін, Сяргей Посахаў, Віктар Шэйман, Іван Антановіч. Яны замянілі "камсамольцаў" — Анатоля Лябедзьку, Аляксандра Фядуту, Дзмітрыя Булахава і Віктара Ганчара, якія спадарожнічалі Лукашэнку на ягоным шляху да прэзідэнцтва. Згуртаваны вакол прэзідэнта калектыў даволі паспяхова рэалізаваў усялякія канцэпцыі ўмацавання ўлады. Ва ўмовах нарастальнага гаспадарчага крызісу, ізаляцыі ў свеце і перспектывы імпічменту Лукашэнка яшчэ раз намерыўся "параіцца з народам" — правесці чарговы рэферэндум. Ён хацеў даказаць, што ўсе ягоныя дзеянні з'яўляюцца ўсяго толькі выкананнем волі народа.

20 чэрвеня 1996 года прэзідэнт вынес на разгляд Вярхоўнага Савета прапанову аб правядзенні рэферэндуму ў справе ўнясення зменаў у Канстытуцыю і перанясення нацыянальнага свята з 27 ліпеня (дзень абвяшчэння суверэнітэту ў 1990 годзе) на 3 ліпеня (дзень вызвалення Менска Чырвонай Арміяй у 1944 годзе). Два чарговыя пытанні датычылі абыходжання з зямлёй (купля-продаж) і адмены смяротнага пакарання. Прапанаваныя Лукашэнкам змены ў Канстытуцыю палягалі ў стварэнні другой палаты парламента, якую часткова меўся прызначаць сам прэзідэнт.

Дэпутаты спрабавалі давесці да склікання "круглага стала" з удзелам прэзідэнта і пазапарламенцкай апазіцыі. "Круглы стол", праўда, адбыўся, але без удзелу прэзідэнта. Прадстаўнікі партый — ад камуністаў да БНФ — заклікалі Лукашэнку вярнуцца на шлях законнасці. У адказ адміністрацыя прэзідэнта і ўрад узмацнілі прапагандысцкую кампанію, у часе якой грамадству тлумачылася, што на рэферэндуме трэба станоўча адказаць на прапанаваныя Лукашэнкам пытанні.

19—20 кастрычніка прэзідэнт склікаў у Менску гэтак званы Нацыянальны сход, на які з'ехаліся 5 тысяч наўперад адабраных ягоных прыхільнікаў. Сход, спасылаючыся на волю народа, аднадушна выказаўся за правядзенне планаванага рэферэндуму. Тым часам апазіцыя арганізавала таксама прадстаўнічы Нацыянальны кангрэс, які вылучыў камісію для вывучэння злачынстваў рэжыму. Канстытуцыйны Суд прызнаў, што вынесеныя на рэферэндум пытанні парушаюць канстытуцыйны лад. Такім чынам, Вярхоўны Савет атрымаў законную падставу пачаць працэдуру адхілення Лукашэнкі ад пасады прэзідэнта.

Запланаваны на 24 лістапада рэферэндум на самой справе ў гэты дзень завяршыўся, бо галасаванне пачалося ажно 9 ліста-

пада. Грамадзяне маглі ўдзельнічаць у рэферэндуме датэрмінова. У многіх акругах была зарэгістравана большая колькасць галасуючых, чым было іх папраўдзе. У сельскіх акругах выбарчыя камісіі вазілі скрынкі па дамах, дапамагалі выбаршчыкам даваць "правільныя" адказы. Супраць такога фарсу выступіў старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Віктар Ганчар і ў выніку быў гвалтам адхілены ад пасады.

17 лістапада Вярхоўны Савет пачаў працэдуру імпічменту, а прэм'ер-міністр Міхаіл Чыгір разам з двума іншымі сябрамі Кабінета Міністраў падалі ў адстаўку. Усё паказвала на тое, што кар'ера Лукашэнкі набліжаецца да канца. Нават журналісты прэзідэнцкага тэлебачання спынілі паклёпніцкую кампанію супраць апазіцыйных дэпутатаў. Прэзідэнт стараўся зацягнуць гульню. Найбольш шчырыя ягоныя прыхільнікі з фракцыі "Згода" 20 лістапада не з'явіліся ў парламенце. У гэты дзень мелі адбыцца дыскусія і галасаванне ў справе адклікання прэзідэнта. Адсутнасць дэпутатаў фракцыі "Згода" стала прычынай таго, што Вярхоўнаму Савету не хапіла патрэбнага для прыняцця правамоцных рашэнняў кворуму — 2/3 саставу парламента. Вярхоўны Савет карыстаўся ў гэтай справе падтрымкай пазапарламенцкай апазіцыі, якая ўвесь час на вуліцах Менска ладзіла дэманстрацыі, пікеты, мітынгі.

У палітычных умовах Беларусі вырашальным фактарам сталася пазіцыя Масквы. Лукашэнку выратавалі расейскія "медыятары", якіх узначальвалі старшыня Дзяржаўнай Думы Генадзій Селязнёў і прэм'ер-міністр Віктар Чарнамырдзін. 21 лістапада яны схілілі старшыню Вярхоўнага Савета Шарэцкага і старшыню Канстытуцыйнага Суда Ціхіню на саступкі, а ў сапраўднасці далі Лукашэнку бласлаўленне на далейшы працяг місіі. Узбунтаваныя посткамуністычныя і камуністычныя дэпутаты на чале з Шарэцкім, Карпенкам, Грыбам, Новікавым і Багданкевічам не ўмелі дзейнічаць насуперак пазіцыі Масквы. На другі дзень пасля візіту расейскіх пасярэднікаў Лукашэнка заявіў па тэлебачанні, што ў выніку пагаднення з старшынёю Вярхоўнага Савета аб'яўлены рэферэндум прызнаецца легітымным. Апазіцыя не мела магчымасцяў публічна азнаёміць грамадства з сваёй пазіцыяй у гэтай справе.

Паводле афіцыйных дадзеных, у рэферэндуме ўдзельнічалі 84,2 % выбаршчыкаў. Больш за 70 % удзельнікаў галасавання быццам выказаліся за ўвядзенне прэзідэнцкіх паправак у кан-

стытуцыю. Амаль 88 % тых, хто галасаваў падтрымалі пастулат Лукашэнкі ў справе перанясення нацыянальнага свята на 3 ліпеня, 82,1 % — выказаліся супраць адмены смяротнага пакарання, 84,7 % не жадалі свабоднага абыходжання з зямлёю (купля-продаж).

Умацаванне пазіцыі Лукашэнкі стала прычынай таго, што большасць дэпутатаў, нават тых, якія раней гатовы былі галасаваць за адхіленне яго ад пасады прэзідэнта, перайшла ў новаствораны Нацыянальны сход. Вярхоўны Савет, у якім засталося 85 парламентароў, не прызнаў законнасці рэферэндуму і працягваў працаваць. Аднак з прычыны адсутнасці кворуму, Вярхоўны Савет не мог прымаць правамоцных пастановаў. Неўзабаве пад выглядам рамонту ў будынку Вярхоўнага Савета былі адключаныя электрычнасць, ацяпленне, тэлефоны і вада. Парламент, у якім няўхільна скарачалася колькасць дэпутатаў і ў якім кіравалі Сямён Шарэцкі, Станіслаў Шушкевіч і Станіслаў Багданкевіч, лічыўся ў свеце адзіным легальным нацыянальным прадстаўніцтвам Беларусі. Але дома заставаўся ўсяго малазначнай установай, якая не мела рэальнага ўплыву на сітуацыю ў краіне. Лідэры і дэпутаты Вярхоўнага Савета, гэтаксама як іншыя грамадзяне, падвяргаліся адміністрацыйнаму пакаранню за ўдзел у несанкцыянаваных дэманстрацыях, траплялі ў следчыя ізалятары, плацілі вялікія штрафы за "парушэнне правапарадку".

Новая ніжэйшая палата Нацыянальнага сходу, званая Палатай прадстаўнікоў, налічвала 110 дэпутатаў, якія перайшлі сюды з Вярхоўнага Савета. Яе старшынёю быў выбраны былы першы сакратар ЦК КПБ Анатоль Малафееў. Вышэйшая палата Нацыянальнага сходу — Савет Рэспублікі — налічвала 64 асобы і, паводле новых законаў, у яе ўвайшла частка дэпутатаў, прызначаных Лукашэнкам або выбраных абласнымі саветамі, дзе дамінавалі ягоныя "вертыкальшчыкі".

Адсутнасць падтрымкі ў парламенце ўскладніла становішча Канстытуцыйнага Суда, які аспрэчваў большасць прэзідэнцкіх указаў. Хутка, аднак, суддзі памянялі свае перакананні на апартунізм. Яны адмянілі ранейшыя свае пастановы, а таксама прызналі, што рэферэндум быў праведзены ў адпаведнасці з канстытуцыяй. Кіраўнік Канстытуцыйнага Суда Валерый Ціхіня быў адхілены ад пасады.

Сфальшаваны рэферэндум, які надзяліў Лукашэнку амаль абсалютнай уладай, стаў прычынай ізаляцыі Беларусі ў свеце. Дзяржавы Заходняй Еўропы не прызналі ні вынікаў рэферэндуму, ні новастворанага Нацыянальнага сходу. Адначасова ізаляцыя Беларусі ў Еўропе вяла яе да далейшага набліжэння да Расеі. Альтэрнатыўныя стасункі спрабаваў стварыць прэзідэнт Украіны Леанід Кучма, які рашуча выказваўся за стаўленне да Беларусі як да поўнасцю суверэннай дзяржавы[20]. Лукашэнка ў сваіх доўгіх тэлевізійных прамовах часта казаў пра шматвектарную замежную палітыку, аднак на практыцы ён быў асуджаны на пашырэнне палітычных кантактаў з Расеяй, Югаславіяй, Малдовай, Лівіяй, Кітаем, В'етнамам, Іранам, Іракам.

Ад пачатку свайго прэзідэнцтва Лукашэнка праявіў сябе гарачым прыхільнікам адзінства славянскіх народаў і неабходнасці іх інтэграцыі перад пагрозай НАТО. Паводле ягоных заяваў, славянскасць вызначалася не этнічнымі прыкметамі, а прыналежнасцю да візантыйскай культурнай прасторы. У такой "славянскасці" не было месца для палякаў, чэхаў, затое было яно для армянаў і грузінаў, мардвы. Арганізаваны штогод прэзідэнтам Беларусі фестываль славянскай культуры ў Віцебску стаў у прынцыпе аглядам творчасці народаў былога СССР.

У Расеі ідэя аб'яднання з Беларуссю знайшла шмат прыхільнікаў, асабліва ў камуністычных і нацыяналістычных колах. Нягледзячы на непрыхільнае стаўленне да Лукашэнкі расейскіх дэмакратычных сродкаў масавай інфармацыі, ён карыстаўся вялікай папулярнасцю тамтэйшага грамадства. Ён быў антыподам нямоглага Ельцына, а ягоная антызаходняя рыторыка станоўча ўспрымалася і значнай часткай расейскай палітычнай эліты. Аднак найбольш захапляліся Лукашэнкам за своечасовую выплату пенсій і заробкаў бюджэтнікам. Ён бачыўся людзям як правадыр, які здольны вярнуць савецкі дабрабыт. Крамлёўскім элітам прэзідэнт Беларусі быў гарантам бясплатнага доступу да транзітных шляхоў у Заходнюю Еўропу, забяспечваў магчымасць размяшчэння вайсковых гарнізонаў.

Фармальнае далучэнне Беларусі да Расеі ў якасці адміністрацыйнай адзінкі Федэрацыі, пра што часта пісалі журналісты, не

[20] Raich D. Szczyt w Homlu: zwrot w polityce zagranicznej Białorusi? // Biuletyn Białoruski. Styczeń 1987. № 8.

было рэальным. Такога далучэння не хацела, з фінансавых прычын, і Расея. А Лукашэнка часта паўтараў, што выказваецца за інтэграцыю "суверэнных" дзяржаў. "Суверэнітэт" ён разумеў як свабоду менскіх уладаў развязваць нутраныя пытанні на тэрыторыі рэспублікі. На практыцы гэта азначала захаванне асобнай юрыдычна-палітычнай сістэмы ў Беларусі і выключэнне нутраных справаў Беларусі з-пад кантролю крамлёўскіх кіраўнічых колаў. Зрэшты, ніводзін палітычны лагер у Расеі асаблі-ва й не цікавіўся ні лёсамі дэмакратыі ў Беларусі, ні шанаванне правоў чалавека ў гэтай краіне. Калі ў чэрвені 1998 года Захад закрыў межы для Лукашэнкі і ягонага чынавенства, добрыя стасункі з Расеяй сталі адзіным козырам кіраўніка Беларусі на міжнароднай арэне.

Фінансавы крызіс, які ў жніўні 1998 года паралізаваў жыццё ў самой Расеі, з прычыны цесных гаспадарчых сувязяў з усёй сілай абрынуўся на Беларусь. За такое становішча ў Расеі Лукашэнка 25 жніўня 1998 года пад час тэлевізійнага выступлення абвінаваціў расейскіх палітыкаў, якія спрабавалі ажыццявіць у сваёй краіне заходнюю мадэль палітычнага і эканамічнага развіцця. Ён заявіў, што самай лепшай канцэпцыяй арганізацыі грамадскага, палітычнага і гаспадарчага жыцця на постсавецкай прасторы ёсць беларускі варыянт. Хоць у Расеі за падобны варыянт выказваецца пэўная частка грамадства, аднак экспарт "беларускай дэмакратыі" і "рынкавага сацыялізму" ў гэтую краіну не паступіў.

1999 год

Асноўная літаратура

Аляхновіч Ф. У капцюрох ГПУ / Прадм. А.Бяляцкага. Мінск, 1994.

Арлоў У., Сагановіч Г. Дзесяць вякоў беларускай гісторыі (862—1918): Падзеі. Даты. Ілюстрацыі. Вільня, 2002.

Белорусская ССР в цифрах: К 10-летию существования БССР (1919—1929). Минск, 1929.

Васілеўская Н. Абвінавачваецца ў нацыянал-дэмакратызме. Мінск, 1995.

Волаціч М. Насельніцтва Заходняй Беларусі і яго перасяленне між сучаснай Польшчай і БССР // Беларускі зборнік. Мюнхэн, 1956. № 4.

Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 — июль 1944): Док. и материалы. Т. 1—3. Минск, 1967—1982.

Гарэцкі М. Гісторыя беларускае літаратуры. Мінск, 1992.

Геніюш Л. Споведзь / Прадм. М.Чарняўскага. Мінск, 1993.

Документы и материалы по истории Белоруссии. Т. 4. Минск, 1954.

Доўнар-Запольскі М. Гісторыя Беларусі / Прадм. Дз.Карава. Мінск, 1994.

Запруднік Я. Беларусь на гістарычных скрыжаваннях. Мінск, 1996.

Іваноў М. Нацыянальная палітыка ў БССР і беларускае зменавехаўства 20-х гадоў // Studia polsko-litewsko-białoruskie. Warszawa, 1988.

Ігнатоўскі У. Гісторыя Беларусі ў XIX і ў пачатку XX сталецьця: Лекцыі, чытаныя студэнтам Беларускага Дзяржаўнага Універсытэту. Менск, 1925.

Ігнаценка І., Кароль А. Усевалад Ігнатоўскі і яго час. Мінск, 1991.

История рабочего класса Белорусской ССР. Т. 2. Минск, 1985.

Калубовіч Я. "Айцы" БССР і іхны лёс. Кліўленд, 1985.

Карский Е. Этнографическая карта белорусского племени. Петроград, 1917.

Касяк І. З гісторыі праваслаўнай царквы беларускага народу. Нью-Ёрк, 1956.

Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Т. 1. Минск, 1973.

Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Т. 1—6. Минск, 1983—1987.

Круталевич В. Рождение Белорусской Советской Республики. Минск, 1975.

Курапаты: Арт., навук. справаздача, фотаздымкі / З.Пазьняк, Я.Шмыгалёў, М.Крывальцэвіч, А.Іоў. Менск, 1994.

Лёс аднаго пакалення: Успаміны. Беласток, 1996.

Лісты да Гарбачова. Лёндан, 1987.

Луцкевіч А. За дваццаць пяць гадоў (1903—1928): Успаміны аб працы першых беларускіх палітычных арганізацый: Беларуская рэвалюцыйная грамада, Беларуская сацыялістычная грамада / Паслясл. А.Сідарэвіча. Мінск, 1991.

Лыч Л., Навіцкі У. Гісторыя культуры Беларусі. Мінск, 1996.

Менская вясна-1996. Падкова-Лесна; Менск, 1996.

Найдзюк Я., Касяк І. Беларусь учора і сяньня: Папулярны нарыс з гісторыі Беларусі / Пасьлясл. А.Грыцкевіча. Менск, 1993.

Народное (национальное) собрание Западной Белоруссии 28—30 октября 1939 г.: Стеногр. отчет. Минск, 1946.

Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. Ч. 2. Мінск, 1995.

На суд гісторыі. Мінск, 1994.

Палажэньне ў Лідзкай акрузе Генеральнага Камісарыяту "Беларусь" // Летапіс. Нью-Ёрк, 1985. № 28.

Победа колхозного строя в Белорусской ССР. Минск, 1981.

Праграмныя дакументы БНФ "Адраджэнне". Менск, 1994.

Сообщения Советского Информбюро. Минск, 1944.

Станкевіч А. Беларускі хрысьціянскі рух. Вільня, 1939.

Станкевіч А. Да гісторыі беларускага палітычнага вызваленьня. Вільня, 1934.

Сыны і пасынкі Беларусі. Мінск, 1996.

Сямашка Я. Армія Краёва на Беларусі. Менск, 1994.

Тарашкевіч Б. Аўтабіяграфія // Спадчына. 1996. № 4.

Туронак Ю. Беларусь пад нямецкай акупацыяй. Мінск, 1993.

Турук Ф. Белорусское движение: Очерк истории национального и революционного движения белоруссов. М., 1921.

Хрестоматия по истории БССР. 1917—1983. Минск, 1984.

Цвикевич А. Беларусь: Политические очерки. Берлин, 1919.

Цьвікевіч А. "Западно-руссизм": Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в. / Пасьлясл. А.Ліса. 2-е выд. Менск, 1993.

Чарнобыль: Погляд праз дзесяцігоддзе. Мінск, 1996.

Bergman A. Rzecz o Bronisławie Taraszkiewiczu. Warszawa, 1977.

Bergman A. Sprawy białoruskie w II Rzeczypospolitej. Warszawa, 1984.

Chojnowski A. Koncepcje polityki narodowościowej rządów polskich w latach 1921—1939. Warszawa etc., 1979.

Czekanowski J. Stosunki narodowościowo-wyznaniowe na Litwie i Białorusi. Lwów, 1918.

Darski J. Białoruś: Historia, współczesność, konflikty narodowe. Warszawa, 1993.

Eberhard P. Przemiany narodowościowe na Białorusi. Warszawa, 1993.

Głogowska H. Białoruś 1914—1929. Kultura pod presją polityki. Białystok, 1996.

Gomółka K. Białorusini w II Rzeczypospolitej // Zeszyty Naukowe Politechniki Gdańskiej. Ekonomia. № 31. Gdańsk, 1992.

Gomółka K. Między Polską a Rosją. Białorusini w koncepcjach polskich ugrupowań politycznych 1918—1922. Warszawa, 1994.

Gomółka K. Polityka rządów polskich wobec mniejszości białoruskiej w latach 1918—1939 // Białoruskie Zeszyty Historyczne. Białystok, 1995. № 4.

Jurkiewicz J. Rozwój polskiej myśli politycznej na Litwie i Białorusi w latach 1905—1922. Poznań, 1983.

Krótki zarys zagadnienia białoruskiego. Opracowanie II Oddziału Sztabu Generalnego. Warszawa, 1928.

Lewandowski J. Federalizm. Litwa i Białoruś w polityce obozu belwederskiego (XI 1918—IV 1920). Warszawa, 1962.

Łatyszonek O. Białoruskie formacje wojskowe 1917—1923. Białystok, 1995.

Łuckiewicz A. Okupacja polska na Białorusi. Wilno, 1920.

Maliszewski E. Białoruś w cyfrach i faktach. Piotrków, 1918.

Mironowicz E. Białoruś. Sytuacja ekonomiczna // Europa Środkowo-Wschodnia 1994—1995. Warszawa, 1997.

Owsiannik S. Striełkowa J. Władza a społeczeństwo. Białoruś 1991—1998. Warszawa, 1998.

Polska—Białoruś 1918—1945 / red. W.Balceraka. Warszawa, 1994.

Prawdzic-Szlaski J. Nowogródczyzna w walce 1940—1945. Londyn, 1976.

Społeczeństwo białoruskie, litewskie i polskie na ziemiach północno-wschodnich II Rzeczypospolitej w latach 1939—1941 / red. M.Giżewskiej i T.Strzembosza. Warszawa, 1995.

Srokowski K. Sprawa narodowościowa na Kresach wschodnich. Kraków, 1924.

Straża A. Ataman Chmara-Razumowicz — biografia białoruskiego irredentysty. Warszawa, 1928.

Świda J. Wyjaśnienia dotyczące okresu 1943/1944 // Zeszyty Historyczne. 1985. № 73.

Tomaszewski J. Robotnicy Białorusini w latach 1919—1939 w Polsce // Acta Baltico-Slavica. 1967.

Tomaszewski J. Z dziejów Polesia. Zarys stosunków społeczno-ekonomicznych. Warszawa, 1963.

Tomaszewski J. Rzeczpospolita wielu narodów. Warszawa, 1985.

Traczuk J. Prasa białoruska w II Rzeczypospolitej (1918—1939). Bibliografia // Studia polono-slavica-orientalia. Acta literaria. T. XIII. Warszawa, 1992.

Turonek J. Wacław Iwanowski i odrodzenie Białorusi. Warszawa, 1992.

Wasilewski L. Litwa i Białoruś. Przeszłość-teraźniejszość i tendencje rozwojowe. Kraków, 1912.

Wierzbicki M. Powstanie skidelskie 1939 r. // Białoruskie Zeszyty Historyczne. 1997. № 7.

Żarnowski A. Społeczeństwo Drugiej Rzeczypospolitej 1918—1939. Warszawa, 1973.

Навукова-папулярнае выданне

Мірановіч Яўген

Найноўшая гісторыя Беларусі

Падпісана ў друк 19.05.03. Фармат 60x90$^{1}/_{16}$. Папера афсетная.
Гарнітура School Book. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 16,25.
Ул.-выд. арк. 16,7. Наклад 3000 асобнікаў. Замова № 3313.

Выдавецтва «Неўскі прасцяг» ИД № 05720 ад 30.08.2001 г.
Адрас: 194100, г. Санкт-Пецярбург, пр-т. М. Тарэза, 6.

Друкарня фірмы «Паліграфіст»
Адрас: 160001, г. Волагда, вул. Чалюскінцаў, 3.



Яўген Міpановіч —
прафесар Беластоцкага універсітэта,
публіцыст тыднёвіка "Ніва",
рэдактар Беларускіх Гістарычных Сшыткаў.

Аўтар кніжак:

Białorusini w Polsce, Warszawa, 1993;
Mniejszości narodowe w Polsce (суаўтар), Warszawa, 1998;
Historia państw świata XX wieku. Białoruś, Warszawa, 1999;
Навейшая гісторыя Беларусі, Беласток, 2000;
Polityka narodowościowa PRL, Białystok, 2000;
Historia Białorusi (X—XX w.). Podręcznik dla liceów ogólnokształcących, Białystok, 2001;
Historia Białorusi od połowy XVIII do końca XX wieku (суаўтар), Białystok, 2002.

ISBN 5-94716-032-3
9 785947 160321

Яўген Мірановіч

Найноўшая гісторыя Беларусі